ARCHE Зьмест № 2’02 НАШЫ ДЗЕТКІ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Прадмова. Сяргей Дубавец у ARCHE 2(22)-2002. "…"
3. Згадкі пра дзяцінства. Зінаіда Бандарэнка ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
4. Згадкі пра дзяцінства. Юлія Дранчук у ARCHE 2(22)-2002. "…"
5. Згадкі пра дзяцінства. Максім Клімковіч у ARCHE 2(22)-2002. "…"
6. Згадкі пра дзяцінства. Ігар Марачкін у ARCHE 2(22)-2002. "…"
7. Згадкі пра дзяцінства. Валянціна Палевікова ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
8. Згадкі пра дзяцінства. Іван Пінігін у ARCHE 2(22)-2002. "…"
9. Згадкі пра дзяцінства. Ганна й Павал Севярынцы ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
10. Згадкі пра дзяцінства. Уладзімер Цэсьлер у ARCHE 2(22)-2002. "…"
11. Згадкі пра дзяцінства. Ірына Шаблоўская ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
12. Дворык пад нямецкім домам. Аляксей Бацюкоў у ARCHE 2(22)-2002. "…"
13. Ня варта азірацца. Ева Вежнавец у ARCHE 2(22)-2002. "…"
14. Пяць вершаў. Леанід Галубовіч у ARCHE 2(22)-2002. "…"
15. Мамчына цыцка. Севярын Квяткоўскі ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
16. Я нарадзіўся ў Шклове. Зьміцер Магілеўцаў у ARCHE 2(22)-2002. "…"
17. Давай запросім на мой Дзень народзінаў Бога. Агата Мацейка ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
18. Тры абразкі пра дзяцінства. Сьвятлана Нячай у ARCHE 2(22)-2002. "…"
19. Рэстаўрацыя вясёлкі. Людміла Рублеўская ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
20. Дзяцінства чалавека. Сакрат Яновіч у ARCHE 2(22)-2002.

"…"

21. Выхаваньне — гэта ня толькі мова. Зьміцер Саўка ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
22. Дачка. Адам Глёбус у ARCHE 2(22)-2002. "…"
23. Алесіны прыгоды ў дзівоснай краіне. Люіс Керал у ARCHE 2(22)-2002. "…"
24. Забытыя творы для дзяцей. ARCHE 2(22)-2002. "…"
25. Дзёньнік Севярына Квяткоўскага. ARCHE 2(22)-2002. "…"
26. Лірыка. Аляксей Знаткевіч у ARCHE 2(22)-2002. "…"
27. Лірыка. Юрась Пацюпа ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
28. Лірыка. Вольга Гапеева ў ARCHE 2(22)-2002. "…"
29. Лірыка. Сяргей Жадан у ARCHE 2(22)-2002. "…"
30. (Не)чаканыя ўкраінцы. Франк Сысін у ARCHE 2(22)-2002. "…"
31. Ліставаньне. Васіль Рагуля, Юрка Віцьбіч у ARCHE 2(22)-2002. "…"
32. Становішча з правамі нацыянальных меншасьцяў. Фэлікс Гавін у ARCHE 2(22)-2002. "…"
33. Літаратура для добраахвотнага чытаньня. Даніла Жукоўскі ў ARCHE 2(22)-2002. "…"

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (22) – 2002**
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[illegible][image]2002
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]

З ь м е с т

Ад рэдакцыі
Сяргей Дубавец. **Прадмова**
згадкі пра дзяцінства
Згадкі пра дзяцінства *Зінаіды Бандарэнкі*, *...Юліі Дранчук*, *...Максіма Клімковіча*, *...Ігара Марачкіна*, *...Валянціны Палевіковай*, *...Івана Пінігіна*, *...Ганны й Паўла Севярынцаў*, *...Уладзімера Цэсьлера*, *...Ірыны Шаблоўскай*.
аповеды пра дзяцінства
Аляксей Бацюкоў. **Дворык пад нямецкім домам**
Ева Вежнавец. **Ня варта азірацца**
Леанід Галубовіч. **Пяць вершаў**
Севярын Квяткоўскі. **Мамчына цыцка**
Зьміцер Магілеўцаў. **Я нарадзіўся ў Шклове**
Агата Мацейка. **Давай запросім на мой Дзень народзінаў Бога**
Сьвятлана Нячай. **Тры абразкі пра дзяцінства**
Людміла Рублеўская. **Рэстаўрацыя вясёлкі**
Сакрат Яновіч. **Дзяцінства чалавека**
гутарка
Зьміцер Саўка: Выхаваньне — гэта ня толькі мова
дзёньнік
Адам Глёбус. **Дачка**
кніга
Люіс Керал. **Алесіны прыгоды ў дзівоснай краіне**
архіў
Забытыя творы для дзяцей

вожык
Дзёньнік Севярына Кваткоўскага
лірыка
Вершы *...Аляксея Знаткевіча*, *...Юрася Пацюпы*, *...Вольгі Гапеевай*, *...Сяргея Жадана*.
суседзі
Франк Сысін. **(Не)чаканыя ўкраінцы**
ліставаньне
Лісты Васіля Рагулі да Юркі Віцьбіча
праблемы
Фэлікс Гавін. **Становішча з правамі нацыянальных меншасьцяў і навучаньнем дзяцей на роднай мове ў Гарадзенскай вобласьці**
крытыка
Даніла Жукоўскі. **Літаратура для добраахвотнага чытаньня**

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2002/11/29
[image]

Сяргей Дубавец

Прадмова

Практыкаваньне № 1

З усяго ўласнага досьведу выхаваньня вылучу адзін стары, але цалкам рабочы прынцып: ад самага нараджэньня дзіцяці кожны чалавек у ягоным атачэньні мусіць быць носьбітам пэўнай мовы. Нашы дзеці гадуюцца ў блытаным моўным сьвеце, але мы самі здольныя зрабіць гэты сьвет для іх больш спарадкаваным і зразумелым.

Першай моваю, якую маё дзіця пачула ад зачацьця, была беларуская — так і толькі так заўсёды гаварылі мы з жонкай. Пасьля нараджэньня да нас далучыліся дзяды гарадзкія (толькі расейская) і дзяды вясковыя (трасянка). Гэтак дзіця вучылася гаварыць паралельна на дзьвюх мовах, выразна адрозьніваючы адну ад адной. Далей далучыўся літоўскі дзіцячы садок, дзе зь першых дзён размаўлялі толькі па-літоўску. Школа была беларуская віленская, а двор — віленскі літоўскі. У выніку сёньня ў свае 17 гадоў дзіця амаль дасканала гаворыць і піша і па-беларуску, і па-расейску, і па-літоўску.

Ня маю сумневу, што вынік мог быць і большы. Калі б, скажам, бацька гаварыў зь дзіцём толькі (!) па-беларуску, маці — толькі

па-ангельску, бабуля — толькі па-японску, дзядуля — толькі на суагілі... Дзіця вырасла б праўдзівым паліглётам, але пры тым — зусім нармальным чалавекам са здароваю псыхікай.
Мой уласны прыклад выхаваньня — адваротны.
У псэўдарасейскамоўнай менскай сытуацыі даводзілася разоў пяць ці нават дзесяць брацца за ангельскую — кожнага разу з розным імпэтам і ад пачатку (школа, унівэрсытэт, усялякія курсы). Аднак, трапляючы ў Англію ці Амэрыку, я пераконваўся, што вывучаў нешта зусім іншае ад той мовы, на якой там гавораць людзі. У даведцы лёнданскага аэрапорту ў мяне не зразумелі, што такое “мэтро”, бо яно там называецца “андэграўндам”, а ў першым лёнданскім бары я не знайшоў “тойлету”, які там называецца “лэвэтэры” (у Штатах, дарэчы, — “рэструм”) — слова, якое ў мяне асацыявалася хутчэй зь бібліятэкай — “лайбрэры”. Такіх прыкладаў — сотні, але мой асабісты досьвед засваеньня моваў, на жаль, — тыповы для нашых краёў.
Маё дзіця ня стала паліглётам. Яму цяжкавата даецца што ангельская, што японская, што польская, што лаціна. Аднак тры мовы, засвоеныя ў маленстве, як той казаў, адлятаюць ад зубоў. Гэткі прынцып быў вычуты намі з жонкай ці то ў паветры, ці то ў нашай нацыянальнай сьведамасьці, а мо навеяны літаратурай XIX стагодзьдзя, калі дзіцяці наймалі гувэрнантку-француженку і настаўніка-немца. Так ці інакш, але гэткае няхітрае практыкаваньне даступнае любой беларускай сям’і і дазваляе кожнаму дзіцяці, незалежна ад здольнасьцяў, палегчыць ягонае наступнае жыцьцё.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

ЗІНАІДА БАНДАРЭНКА — народная артыстка Беларусі, дачка доктара і дэзінфэктаркі

Зінаіда Бандарэнка

Згадкі пра дзяцінства

Нарадзілася я ў Менску, у 1939 годзе. Маці мая працавала ў сталоўцы, а бацька скончыў мэдычную ардынатуру і ўладкаваўся ў ваенны шпіталь, што на цяперашняй вуліцы Варвашэні. Па тым часе ў сем'ях было так: ці яна вучыцца, ён працуе, ці — наадварот. Абое вывучыцца не змаглі б ніяк. Таму было вырашана: мама працавала, а бацька атрымаў адукацыю. Калі майму брату было восем гадоў, а мне — два гадкі, пачалася вайна. Менск пачалі бамбіць ужо 23 чэрвеня. Мы жылі побач з вакзалам у мэдыцынскім інтэрнаце. Маці працавала, бацька быў на дзяжурстве ў ваенным шпіталі, як пачалі бомбы сыпацца. На цяперашняй вуліцы Сьвярдлова ёсьць бамбасховішча, і мама ўвесь час цягала нас, малых, туды. Мы то хаваліся ў гэтым бамбасховішчы, то сядзелі дома, і ўсе гэтыя дні ня ведалі, што з бацькам. На трэці дзень вайны прыбегла адна мэдсястра, габрэйка, і кажа маме: "Маша, зьбірайся і ўцякай, бо Сашы ўжо няма, бомба трапіла ў апэрацыйную, усе там загінулі". Ну, што рабіць? Мама ўзяла нас, і мы пешшу выйшлі зь Менску разам з гэтай мэдсястрой Марыяй Ісакаўнай.

Яна ішла да Бабруйску, таму што ў яе там былі родзічы, а мы рушылі да Гомелю. Мы дабіраліся амаль два месяцы. Мне было два гады, і мама несла мяне ўвесь час. Ноччу ішлі, днём адсыпаліся. Хто на возе едзе — той падвязе. Елі, што давалі. Мама несла на сабе нейкія клункі, нешта прадавала, выменьвала. Людзі дзяліліся апошнім. У жніўні мы дайшлі да места. У Гомелі якраз тады быў урад наш, беларускі, яшчэ пошта працавала, яшчэ савецкая ўлада была. І мама напісала ліст на Лоеўшчыну да брата, што “вось я прыехала, Мікола; Саша загінуў, і я з дваімі дзеткамі, што нам рабіць — ня ведаю”. І літаральна праз тыдзень прыехаў на возе дзядзька ды забраў нас на Лоеўшчыну, самае глыбокае Палесьсе.
Калі мая мама памерла (гэта было ўжо пасьля Чарнобылю, у 1987-м), я папрасіла зрабіць на яе помніку такі надпіс: “Дзякуй, матулечка, за выратаванае жыцьцё”. Менавіта яна выратавала нас. Адчувала, як хавацца, уцякаць: за намі ішлі фашысты і маглі нас забіць. Усю вайну мы правялі ў вёсачцы Ўборкі. З вайны я толькі памятаю, як аднойчы прыляцелі фашысцкія самалёты і памахалі нам крыламі. Немцы асабліва нас не чапалі, толькі ў адказ на партызанскія дзеяньні праводзілі карныя акцыі, асабліва ўвосень 1943 году, калі пачалося іх адступленьне. Мы жылі ў хаце дзядзькі Міколы і цёткі Соні, вельмі дружнай і спагадлівай сям’і. І ўся вёска такая. У вёсцы быў адзін толькі паліцай, дый ён памагаў тутэйшым людзям. У ягоным паліцэйскім пастаруначку працавала жанчына, якая мыла там падлогу. І вось аднойчы, калі фронт падыходзіў, яна пастукала ранічкай у акенца і сказала маме: “Марыя, уцякай зь дзецьмі, бо ўсе лічаць, што ты замужам за габрэем і камуністам”.

Бацька мой — Бандарэнка Аляксандар — украінец, такі быў чарнявы, вельмі прыгожы мужчына, і сын ягоны Ігар нарадзіўся такі ж чарнявенькі, яго й звалі жыдочкам. Вось маці і вырашыла: трэба ўцякаць.
Дзядзька Мікола даў нам карову, прывязаў яе да мамінай рукі і кажа: “Ідзіце на Лесуны. Там вялікія лясы, я думаю, туды карнікі ня дойдуць. А самі мы схаваемся ў балотах, мо там ацалеем”. Так і разыходзіліся па дарожках-сьцяжынках, частачкамі, шукалі сабе паратунку. Я ніколі не забудуся, як людзі ляпілі курані: рабілі нешта кшталту будану, накідалі

туды галінак, уцяплялі нейк, зьверху рабілі дзірачку для дыму ад вогнішча. Лес ратаваў людзей.
Вёскі тады адна ля адной ляпіліся. Вось тут Клімавічы, за імі — Васюкі, за імі йшлі Мар'янцы, за Мар'янцамі — Грамыкі. Вось той самы Грамыка — былы міністар замежных справаў СССР — і нарадзіўся тут. Калі партызаны адведвалі нас, на дзяцей ускаладаўся вялікі абавязак: трэ было зьбіраць маладыя дубовыя лісты для самакуркі.
Нашу сям'ю выратавала карова. Аднойчы прыйшлі партызаны, каб яе забраць, але пабачылі дваіх дзяцей і яшчэ суседзкіх, якія пілі ад гэтай каровы малачко, і пашкадавалі нас, не ўзялі.
Я памятаю дзень вызваленьня, калі раптам мама прыбегла... Што мы елі? Малако і бульбу несалёную. А вось тады мама прыйшла такая шчасьлівая: "На табе хлеб белы, салдацкі, — менавіта белы". А я яго і ня бачыла ніколі. Яна мне ламанец такі вялікі і кубак малака дала, я сяджу, намінаю гэта з такою смакатою, і раптам на мяне ігліца зьверху сыплецца — я ў жаху крычу. А гэта вусаты чырвонаармеец зьбірае з кураня коням гэтую зеляніну, галінкі. Мы ж ужо ўсё роўна адтуль павінны былі сыходзіць, і мама сказала: "Зьбірайцеся, мы зараз вернемся ў вёску". Вось так мы вярнуліся ў нашыя Ўборкі, якія я не пазнала. Яны былі цалкам спаленыя.
Калі мы ўцякалі ў лес, я запомніла царкву ўва Ўборках. Ведаеце, я ня памятаю, колькі там было купалоў, — я была яшчэ зусім малая і не магла палічыць, але мне здавалася, што купалоў шмат і ўся царква пазалочаная, вялікая, большая за менскі Чырвоны касьцёл. І калі ўжо прыйшлі ў вёску, я ўбачыла, што царквы гэтай больш няма. Людзі стаялі, хрысьціліся і казалі: але ж яе не фашысты разьбілі, а чырвоныя, бо там сядзеў фашысцкі кулямётчык, нельга было падступіцца, і таму наша авіяцыя ўшчэнт разьбіла царкву. Вось такое было маё самае раньняе дзяцінства.

А потым нас чакала самае трагічнае для нас, прынамсі, для мамы. Мы даведаліся, што быцька наш жывы і мае іншую сям'ю. Мама ўсю вайну па ім плакала і расказвала, які быў добры муж і бацька і як ён загінуў у самым пачатку вайны. Але аднойчы маме наваражылі, што яе муж жывы і што каля яго жанчына, і дзеці ўжо ёсьць. Мама гэтаму не паверыла. Але так яно і было. Як толькі пачалі бамбіць Менск, авіяцыйная бомба

сапраўды ўпала ў апэрацыйны пакой, але не разарвалася. Ад яе ніхто не загінуў. Усе паўцякалі і потым расказвалі, што ўсіх бомба пабіла. Бацька тады выбег з апэрацыйнага і прыбег да нашага інтэрнату: будынак увесь палаў.
Ён вырашыў, што мы загінулі, а мы — што ён… Так мы тры гады і лічылі. І ў яго ўжо зьявілася іншая сям'я, іншая жонка, дзіця. Вядома, ён мучыўся. І мама страшэнна пакутавала, не магла паверыць у гэта. А ейныя сяброўкі, ягоныя родзічы і сёстры ў адзін голас гаварылі ёй: "Марыя, ты павінна змагацца. Ды пацягай ты яе за валасы, ды выкінь яе прэч. Як ён можа так?" Дзякуючы зьбегу абставінаў, пасьля вайны і мы, і ён з новай сям'ёй атабарыліся ў Гомелі. Тата дайшоў да Бэрліна, і потым яго прызначылі галоўным лекарам Гомельскай тубэркулёзнай абласной бальніцы. І мы ў Гомель вярнуліся, таму што Ўборкі былі спаленыя. Так і жылі: мы ў Гомелі, а цераз раку, у Беліцах, — ён. Страшэнна перажываў мой брат Ігар, для яго гэта была трагедыя. Аднойчы прыбягае бацькава сястра і кажа: "Маша, бяжы! Кажуць, Ігар схапіў ножык і пабег у Беліцы, каб мачысе нос адрэзаць, бо тады бацька ня будзе яе кахаць і вернецца да вас". І мая маці пабегла і пераняла яго літаральна перад уваходам у гэты гарадок. У бацькі быў невялічкі дом на тэрыторыі бальніцы, дзе ён жыў з гэтай жанчынай — Кацярынай Іванаўнай. Зь ёй мы потым нават пасябравалі. Час усё паставіў на свае месцы. Мама працавала звычайнай дэзінфэктаркай, бо ня мела ніякай спэцыяльнасьці, нават сямі клясаў не пасьпела скончыць, як выйшла замуж за тату. Потым, калі ўжо яна пайшла на пэнсію, яе пэнсія склала 32 рублі і 5 капеек, а пасьля павышэньня — 41 рубель. Праўда, бацька плаціў алімэнты за мяне, усяляк дапамагаў. Я адчувала, ведала, што яго сэрца разрывалася. Але што ён мог зрабіць? Нас тут двое, а там ажно трое. Кацярына Іванаўна — жанчына разумная, ведала, чым яго трэба прычараваць. Ён вельмі любіў маю маму, яна была прыгожая, разумная і абаяльная жанчына. Кацярына Іванаўна, можа, і саступала ёй, але ж там дзеці… Цяпер мы сябруем усе, вельмі сябруем. Ужо ніхто з нашых бацькоў не жыве, усе трое пахаваныя на адных могілках. Сьмерць усіх памірыла.
Умовы майго дзяцінства ляпілі зь мяне моцную асобу, я вучылася змагацца за жыцьцё, вучылася кемлівасьці і жыцьцёвай хітрасьці. Я ведала з раньняга дзяцінства, што такое

мана і здрада. А таксама любоў і інтэлігентнасьць. У сваіх гасьцінных Уборках я гасьцявала штолета, балазе дзядзька Мікола адбудаваў свой дом. У дзядзькі Міколы і цёткі Соні расла дачка, мая сястрычка Галачка, і мы зь ёю ўсё лета лёталі, гойсалі, па дрэвах лазілі. Цётка Соня ўвесь час рабіла — карова, сьвіньні… Бывала, прыяжджаю, ужо лета, ні кавалачка сала нідзе няма, усё паелі. Аднак у вёсцы быў такі парадак: хто рэжа кабанчыка, той нясе па кавалачку ўсім, хто яму калісьці прыносіў сьвежыны. Вось і перападае ў сям'ю сала. Заўсёды буду памятаць, як цётка Соня накладае бульбу са скваркамі ў нейкія шаплашкі (посуду тады ў іх не было — які там посуд!) — і ніколі ня дасьць сваёй дачцэ лепшага кавалачка. Яна лічыла, што хоць мой бацька жывы, але я ўсё роўна сірата, і хоць на крышку, але давала мне больш. Сялянская жанчына, неадукаваная, але такая мудрая! Я брала яе сабе за прыклад, калі мае дзеці расьлі. Як прыйдуць да іх сябры — я старалася пакласьці ім лепшы кавалачак.

Пра падман. Неяк у жніўні мы зьбіралі ў калгасе ўраджай і на таку веялі збожжа. Я яшчэ тады ў школе не вучылася і вельмі сябравала зь дзецьмі Бабовіча, старшыні калгасу. Раптам пайшла пагалоска: вечарам прыяжджаюць артысты ў клюб. Мы бегаем вакол клюбу, аж тут ідзе старшыня Бабовіч і кажа на нас: "Во! Чым так гойсаць, лепш папрацавалі б". Работнікаў не хапала, мужчынскую работу рабілі жанчыны — усё трымалася на іхных плячах. Бабовіч і кажа: "Калі адпрацуеце, усё збожжа перавееце, пушчу вас глядзець канцэрт". Ой, як панеслася я тады па вёсцы, як пачала ўсіх зьбіраць. Выцягвалася ў нітку, усім абяцала, што старшыня Бабовіч усіх правядзе на канцэрт. Сабрала: па двое круцілі, нехта насыпаў, потым мяняліся, бо рукі ж нямелі, малыя яшчэ зусім. У мяне быў такі сарафанчык, ярка-пунсовага колеру, і яго зацягнула ў веялку. Нейкая старэнькая бабуля закрычала: "Кіньце, што вы робіце! Міколаву дзеўку зацягне ў веялку". У зваротны бок сукенку адкручваць — выцягнулі. Стаю ўся ў мазуце, сукеначка мая пажаваная літаральна да самай шыі. Але ж вечарам, божа мой, як мы сьпяшаліся на гэты канцэрт! Можа, гадзіны за дзьве да пачатку ўжо стаялі і чакалі: пакуль старшыня ня пройдзе, не пачнецца канцэрт. А дзяцей — паўвёскі.
Старшыня, вядома, збрахаў, калі паабяцаў мне. І вядома ж, ён

прайшоў са сваімі чацьвярымі дзецьмі, нас не заўважаючы. Я плакала ля клюбу ад крыўды, што мы не патрапілі на канцэрт. А мне кажуць: “Дурная, ты што, ня ведала, што ён хлус?!” Хлопцы мяне ледзьве не пабілі, дзяўчаты заступіліся. Я вельмі цяжка перажыла першы падман ад дарослага чалавека — старшыні калгаса.
Затое мая мама была вельмі добрым і сумленным чалавекам. Выхоўвала мяне ад душы.
У Гомелі мы спачатку жылі на кватэры, а потым, калі ўжо мама нанялася дэзінфэктаркай чыгуначных вагонаў, атрымалі пакойчык у камуналцы ў бараку. Мама вельмі часта брала мяне на дэзінфэкцыю. Мы заходзілі ў вагон, залеплівалі стужкамі тонкай паперы вокны, літаральна ўсе шчылінкі, каб не праходзіла паветра, ставілі на падлогу вельмі прымітыўны агрэгат, запальвалі ў ім серу і абкурвалі вагон. Потым наглуха зачынялі яго, і вагон ставіўся ў тупік на суткі-двое, каб у ім падохла ўсялякая жывіна. Мы жылі ў чыгуначным бараку, і, вядома ж, там заўсёды сварыліся жанчыны. Аднаго разу мама прыходзіць пасьля такой сваркі і кажа: “Ты глядзі, зь ёй вітайся, рабі выгляд, быццам ня ведаеш, што мы зь ёй пасварыліся”.
Маці вучыла мяне ўсялякай рабоце. Часам казала так: “Важна не рабіць, важна ўмець. Дык вось глядзі, як я гэта раблю, і запамінай, бо і ў цябе сям’я будзе…” Усё паказвала на асабістым прыкладзе, як у ейнай сям’і здаўна на Палесьсі заведзена было. Як яны паміж сабою там ладзілі — сёстры, браты, так і ў нас, на думку мамы, павінна быць.

Увечары мама чытала Біблію, а на ноч дзьве-тры малітвы. Газэт тады ніхто не выпісваў, кніг у нас не было. (Ня тое, што цяпер. Мы з мужам калі пажаніліся, стаялі ў чэргах на падпіску. Лічылася, што ня мець падпісных выданьняў Астроўскага, Чэхава — гэта дзікунства.) Калі я ў школе вучылася, зьявіўся том Пушкіна, зь якога я вучыла паэмы на памяць.
Яшчэ я вучылася дома, што вельмі заахвочвала мая мама. Тады была такая перадача па радыё, “Тэатар ля мікрафона”. У нас была радыёкропка і прыймачык. Мама рана клалася спаць і вельмі рана ўставала. А я магла паспаць, мяне тады суседка будзіла. Таму я ціхенька ўключала прыймач, які стаяў на століку, — “Тэатар ля мікрафона” пачынаўся дзесьці а 22-й

гадзіне, канчаўся апоўначы. Але я слухала, не магла адарвацца — уяўляла сябе на месцы нейкай артысткі… Потым мне трэ было выключыць прыймач так, каб мамы не разбудзіць, — я гэта нагою рабіла. І аднойчы я не дацягнулася пальчыкам нагі да рычажка, таўханула яго — радыёпрыймачык упаў і пабіўся. Я так спалохалася, што ледзьве не заплакала. Ад шуму прачнулася мама. Яна не сварылася, а толькі сказала: “Ну вось, цяпер я да самай раніцы не засну”. А пасьля сама занесла прыймачык у рамонт.

Мама не атрымала вялікай адукацыі, але была прыродна далікатная. Яна гадавалася ў вёсцы, і ў 16 гадоў яе выдалі замуж за 37-гадовага кулака. Яна яго не кахала, казала, што ў іх не было ўзаемнасьці, і дзяцей таксама не было. Мама проста баялася гэтага чалавека. А ён вельмі яе любіў. Так зь ім яна пражыла паўтара году, а потым зьбегла ў горад — да сваёй стрыечнай сястры. Там, падчас вечарыны ў суседзяў, пазнаёмілася з маім бацькам і выйшла за яго замуж. Ён вучыўся тады ў ФЗН і атрымаў накіраваньне ў мэдінстытут, бо меў пралетарскае паходжаньне. Тады была такая кампанія — рабочая кляса павінна атрымліваць вышэйшую адукацыю ў першую чаргу. І вось ён з мамай паехаў у Менск: яна працавала, ён вучыўся. Дзеткі зьявіліся. Вядома, яна не магла ўмэнт пазбыцца сваёй вясковасьці. Але як яна хораша гаварыла і трымалася зь людзьмі! Колькі сьлёз праліла ў самоце са мной — “Зіначка, ён нас кінуў, кінуў”, але, як хто пастукае ў дзьверы — усе сьлёзы адразу высыхаюць: “Добры дзень, заходзьце, калі ласка”. Яна ўжо завіхаецца, яна гэтага чалавека гатова проста на покуць пасадзіць. Я думала: “Божа! Якая багатая мая мама! Якая ўнутрана багатая жанчына”. Яна ніколі не праходзіла, каб не дапамагчы, ня даць міласьціну, не падтрымаць.

Вось яшчэ такі цікавы выпадак быў у школе. Я вучылася ў 34-й — яна якраз каля чыгункі стаяла, а побач, за плоцікам, — царква. Прыгожая праваслаўная царква, яна і дагэтуль стаіць, і шмат было тады вернікаў. Падыходзіць Велікоднае сьвята. Наш клясны кіраўнік кажа: “Дзеці, заўтра Вялікдзень. Сёньня ўсяночная. Так, надзець піянэрскія гальштукі — і ўсе ў царкву, глядзець, хто з вашых бацькоў там будзе. Заўтра раніцай усё мне дакладзяце”. Мы надзелі гальштукі і пайшлі ў царкву, а ў царкве — як мышкі, стаялі і бачылі ўсіх сваіх бацькоў. Мая мама, яго мама, Шурыка, Пётрыка, Васілька мама і бабуля. І на

наступны дзень, да гонару настаўнікаў, ніхто не пытаўся, хто з бацькоў быў у царкве. Проста гэта быў такі загад з райана. Апрача Вялікадня, у нашай сям'і сьвяткавалі Новы год. Праўда, саветы яго таксама не любілі, але ж дазвалялі: мяшчанскае сьвята, але клясава бясьпечнае.
Харчаваліся мы сьціпла. Аднойчы я захварэла, тата сказаў матцы: "Дачцэ трэба асаблівая дыета, бо ў яе ачаговыя сухоты". І яна карміла мяне мёдам, салам, какавай і супамі. Я цяжка перажывала, што мне даводзілася хадзіць да бацькі, як у госьці. І, вядома ж, вельмі раўнавала яго — пачуцьцё рэўнасьці ў дзяцей вельмі моцнае.
Мы неяк пасяліліся ў мамінай сяброўкі, і тая параіла: "Хай Саша табе паможа, забярэ дзяцей, ты ж зусім не адпачываеш ад працы". Так я жыла нейкі час са сваёй мачыхай, бацькам, братамі. Спала я на рускай печы зь ляжанкай. Недалёка праходзіла чыгунка, і ноччу — толькі засну — там гучаў трывожны сьвісток. Я ўсхопліваюся, і мне здаецца, што мая мама ішла да мяне і патрапіла пад цягнік. Прачынаюся, варочаюся і доўга, да самай раніцы, не магу заснуць. Калі я ведала, што мама павінна прыйсьці, то чакала яе з ночы. Раніцай яна прыходзіла, і я пыталася: "Ці ўсё было ў парадку, як ты праходзіла чыгунку?"
Вучылася я дрэнна: беларуская мова і літаратура, расейская мова і літаратура, ангельская — усе гуманітарныя прадметы ў мяне былі на "5", а фізыку, хімію, матэматыку ледзьве цягнула на "3". На ўроках хіміі я чытала мастацкую літаратуру з-пад парты. Аднойчы матэматычка выхапіла ў мяне нейкі раман з рук і крыкнула: "Знайшлася мне артыстка!" (Артыстка таму, што мы паставілі ў школе чэхаўскі спэктакль "Юбілей", дзе я сыграла Тацяну Аляксееўну, жонку чыноўніка, і вельмі хораша ў мяне гэта выйшла.) Калі праходзілі "На ростанях" Якуба Коласа, нідзе нельга было знайсьці гэтага раману. Я сядзела ў бібліятэцы пасьля заняткаў, мне настаўніца за нейкую правіну выдумала пакараньне: прачытаць трылёгію і штоўрок расказваць урыўкі ў клясе. Я акуратненька хадзіла і чытала, а потым расказвала кожны разьдзел. А ўсе сядзелі і слухалі. І раптам я адчула, што ад таго, як ты расказваеш, залежыць, як цябе слухаюць. Удасца перадаць характары, вобразы літаратурных пэрсанажаў — і ты заваёўваеш увагу слухача. Так дзякуючы мне "На ростанях" прачытала ўся кляса, і я гэта

адчула. Пасьля гэтага самі настаўнікі раілі мне: “Табе, Зіна, трэба чытаць”. Бацька, тады ўжо вельмі аўтарытэтны доктар, вядомы на ўсю Гомельскую вобласьць, не вітаў маіх артыстычных схільнасьцяў.

Захварэла на сухоты я так. Пайшлі мы ў канцы красавіка купацца. Вада халодная, але я і яшчэ два-тры хлопцы пераплылі Сож, які разьліўся ад паводак. Неўзабаве мне паставілі дыягназ — ачаговы тубэркулёз. Я, відаць, ужо насіла бацылы ў сабе. Калі я жыла ў бацькі, для сваіх дзяцей мачыха гатавала ежу сама, а для нас з братам брала са сталоўкі для сухотных хворых. Як толькі я прастыла, бацыла пачала разьвівацца. Бацька страшэнна перажываў, адразу зьмяніў стаўленьне да сваёй новай сям’і, стаў цікавіцца маім лёсам. Празь нейкі час заявіў: “Ты павінна быць толькі доктарам”. Я паступіла ў мэдвучэльню, нават хіміі дала рады. Вучылася, але ўсё адно хадзіла ў тэатральную студыю, наведвала танцавальны гурток. Аднойчы ў фае сваёй вучэльні я пабачыла маленькі тэлевізар. Ішоў 1959 год. Гляджу ў маленечкі экранчык, якога дагэтуль ня бачыла, і дыктар абвяшчае конкурс на дыктараў тэлевізіі. А я якраз хадзіла ў тэатральную студыю, якой кіраваў галоўны рэжысэр Гомельскага тэлебачаньня Сяргей Астравумаў. Вечарам на студыйных занятках ён мне кажа: “Зіна, у нас абвесьцілі конкурс, табе трэба падысьці”. А я яму: “Ой, Сяргею Паўлавіч, мне бацька сказаў — толькі ў мэдінстытут!” (Вучэльню я ўжо заканчвала, налягала на фізыку, хімію і матэматыку, зьбіралася паступаць, хаця сэрца маё хінулася да іншага.) А ён мне адказвае: “Вам жа гэта цікава. А можа, вы і ня пройдзеце. Проста пабачыце, як гэта будзе!” І я прайшла два туры, мы са студыяй падрыхтавалі скетч і вадэвіль зь песьнямі, жартамі, я там грала і танчыла. Скетч называўся “Каханьне і бульба” (адразу, кажуць, шмат водгукаў было ад тэлегледачоў). І вось настаў апошні тур. Стаю я ў Палацы культуры (там быў даўжэразны калідор) і думаю: “Што я тут раблю?” Ля Гомелю тады вельмі шмат было ваенных гарадкоў, і папрыходзілі афіцэрскія жонкі, шмат маладых прыгожых жанчын, усе зь пясцовымі каўнярамі, у чарнабурках, з моднымі завіўкамі. А я стаю ля акна, на мне нейкая манішачка з маленькім банцікам, цёмна-сіняя сукенка. Стаю і прагаворваю маналёг княгіні Балконскай, і раптам чую,

як прыгажуні гавораць між сабою: “Тут рэжысэр Шпанаў працуе, мой сусед, дык ён сказаў: калі прыйдзе Бандарэнка, дык вам тут, дзеўкі, няма чаго рабіць. А калі яна перадумае, бо ў мэдінстытут хоча ісьці, тады прыходзьце, бо ў вас будзе шанец”. Я думаю: “Во, яшчэ нейкая Бандарэнка на маю галаву. Можа, мне зусім не ісьці?” Нават і ня думала, што гэта пра мяне гаворка. Тут мяне выклікалі — я прыйшла і адразу прайшла апошні тур.

Мне прызначылі вялікі заробак — 150 рублёў. Гэта ж было ого-го! Калі я прынесла сваю першую зарплату, мама мая заплакала. Ну і, вядома, быў скандал з бацькам: “Ты што, звар’яцела? Гэта ж усё часова! Што такое дыктар? Вось доктар — гэта вечнасьць. А што такое дыктар? Дыктатар ведаю, дырэктар ведаю, а дыктара ніякага ня знаю”.

Я часта ўспамінаю сваё дзяцінства і думаю, што ўва ўсёй нашай камсамоліі было і нешта вельмі добрае. Нас вучылі любіць сваю Радзіму і сваіх людзей. Я моцна люблю Радзіму, сваё, і гэта акурат адтуль, зь дзяцінства. Я ніколі не забуду пра нашы паходы ў лес, калі мы, зачараваныя, маглі глядзець на вясёлку, якая раптам зьяўлялася пасьля дажджу. Мы не маглі налюбавацца сонечным днём, наслухацца сьпеваў птушак. Дзеля гэтага ўсяго мы на амбразуру кінуцца гатовыя былі, не задумваючыся. Гэтым і вылучаецца маё пакаленьне.

Вось вам параўнальна нядаўняя гісторыя. Справа адбывалася ў 1996 годзе. Іду я цераз дарогу ў Палац чыгуначнікаў у басэйн — я з маленства люблю плаваць, мо ў наступным жыцьці рыбай буду. Ля басэйну пляцоўка, і зь яе нейкі гвалт даносіцца. Стаяць іншамаркі, у іх нікога няма — народ у басэйне плешчацца, толькі ў адной машыне сядзіць шафёр “каўказкай нацыянальнасьці”. Гляджу, тры іншыя каўказцы, дужыя і прыземістыя, цягнуць у машыну бялявага сінявокага мужчынку, худзенькага і маленькага. Тут жа стаяць выпадковыя людзі на вуліцы — жанчына з вазком і мужчына з авоськай. Я бачу, а гэтыя прыхадні каўказкія нашага хлопца зьвезьці некуды зьбіраюцца, пхаюць у іншамарку, а той з адчаем, з жахам такім супраціўляецца. Я кінулася на гэтую іншамарку, а хлопец той убачыў мяне і як за саломінку ўхапіўся, крычыць: “Жанчына, памажэце!”. Гэты крык дагэтуль у мяне ў вушах. Аднак я ня здолела яго адбіць — забралі і павезьлі. А двое каўказцаў на месцы засталіся. Я кажу ім: “Я нумар вашай машыны запомніла

і заяўлю ў міліцыю”. А яны мне кажуць: “Мы б Вам гэтага ня раілі!” А я ўзлавался і кажу: “А мне вашыя парады не патрэбныя! Вы злачынцы, прыехалі на чужую зямлю і мучаеце нашых людзей!” Яны ў мяне пытаюцца: “А Вы ведаеце, колькі ён нам завінаваціўся?” А я адказваю: калі мне рот будзеце затыкаць, дык вунь іншыя заявяць, жанчына зь дзіцём, мужчына з торбаю. Пабегла я дадому, пазваніла дзяжурнаму ў міліцыю. А той пазяхае і кажа: добра, добра, правядзём сьледзтва... Якое сьледзтва, кажу, чалавека ратаваць трэба, кальцавую перакрыць, хады-выхады зь Менску, спыніць іншамарку пад нумарам такім і такім!.. Але, куды я ні званіла, на якое б высокае начальства ні выходзіла, усюды спаткала абыякавасьць да лёсу таго чалавека. Адно прыемна: дзяжурны міліцыянт сказаў, што такія самыя званкі ўжо паступілі ў міліцыю. Гэта азначае, што тыя людзі — сьведкі здарэньня — таксама не маўчалі...

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Юлія Дранчук

Згадкі пра дзяцінства

ЮЛІЯ ДРАНЧУК — журналістка радыё “Рацыя”, дачка журналіста і эколяга Валер’я Дранчука і філёляга Валянціны Дранчук. Брат – Цімох Дранчук, адзін зь лідэраў маладзёжнага руху “Зубр”. Вырасла ў Заслаўі і Менску

Я нарадзілася ў Менску ў чэрвені 1975 году. Бацька мой з адукацыі журналіст і большую частку жыцьця працаваў журналістам. Маці — філёляг, але з моваю праца яе ніколі асабліва ня зьвязвалася.

Пэўны час мы жылі ў Заслаўі; гады, калі дзіцё пачынае ўсьведамляць сябе як асобу, прыйшліся для мяне якраз на гэты пэрыяд. Выхоўвалі мяне згодна з паганскім разуменьнем сьвету. Мне тлумачылі, што ўсё-ўсё ў сьвеце ды Сусьвеце жывое. “І камяні?” — пыталася я. “І камяні”, — адказвалі мне. “А чаму ж яны маўчаць?” — лягічна вынікала маё пытаньне. “Яны размаўляюць, але на сваёй мове, таму ты папросту ня чуеш”, — быў адказ.

Спадзеючыся знайсьці нарэшце калі-небудзь разуменьне ў камянёў ды іншых прадстаўнікоў жывое, але маўклівае прыроды, я ўсяляк старалася прадэманстраваць ім сваё чалавечае да іх стаўленьне: зранку я зь імі віталася, жадала добрага дня, увечары зычыла бачыць цудоўныя сны ды не баяцца цемры. Доўга не магла пагадзіцца з такімі рэчамі, як

сякера й піла. Калі суседзкі хлопчык, зь якім мы сябравалі, стаў выразаць на ліпе ў двары сваё імя — у мяне здарылася амаль гістэрыка, я крычала, што дрэву баліць. Хлопчык мне тлумачыў, што яму ня можа балець, калі яно нежывое. Карацей, быў цэлы канцэрт.
З-за свайго прырадалюбнага сьветабачаньня мне давялося ў маленстве шмат спрачацца й нават біцца, але самы непрыемны выпадак напаткаў мяне ўжо ў досыць сьвядомым веку — мо гадоў у 12. Уся наша вялікая сям'я сабралася на дзедаўскім хутары. Дзядзька паехаў лавіць рыбу на сажалку. Праз пару гадзінаў вярнуўся, з гонарам трымаючы немалую торбу са здабычаю — рыбіны былі яшчэ жывыя, у вадзе. Можа, я б пашкадавала гэтых рыбін ды забылася, каб дзядзька не распавядаў наўмысна, назіраючы за маёй рэакцыяй, што трэба, пакуль зусім сьвежая, то бок жывая, смажыць, а палову трэба кату аддаць і г.д. І я тады падбухторыла брата, якому тады было гадоў шэсьць, сьцягнула крадком тую торбу — і драпу! Пайшлі мы на найбліжэйшую сажалку, кілямэтры чатыры ў адзін бок, і з адчуваньнем уласнае значнасьці тых рыбін павыпускалі ў ваду. Калі вярнуліся, на хутары ўсчаўся ўжо пярэпалах. Бацькі, не знайшоўшы ні нас, ні рыбы, здагадаліся, куды мы падзеліся, і ня ведалі, як дзядзьку ў вочы глядзець, — бо любоў да ўсяго жывога адно, а чужы здабытак назад у сажалку выпусьціць — зусім іншае. Карацей, непрыемнасьці.
І мяне, і брата Цімоха выхоўвалі ў беларускай мове — і гэта было важна. Бацька гаварыў па-беларуску, колькі сябе памятаю. Мама яго падтрымлівала ў гэтым. Яна вучыла нас з братам чытаць па лемантары Клышкі. Расейскі буквар у хаце застаўся неразгартаны.

Мама, філёляг з адукацыі, заўсёды сачыла за маім маўленьнем, папраўляла. Таксама цяпер раблю і я. Не магу іначай. Бацькі сачылі і за лексыкай, якую ўжывалі я і брат.
Нас з братам мама рана навучыла чытаць: спачатку сама нам чытала перад сном — замест калыханкі. Потым аднеквалася: часу няма — самі, маўляў, навучыцеся і самі сабе чытайце. Калі навучыліся — то хацелася нейкіх новых кніжак, і бацькі знайшлі новы мэтад стымуляваньня: хочаш новую кніжку — вывучы верш. Першы верш, які я памятаю, — "Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому". Хто такі Колас, хто такі Купала, я

ўвогуле добра ведала ад самага-самага маленства — Заслаўе паблізу Вязынкі, і мы туды ня раз езьдзілі. Бацькаў радавы хутар знаходзіўся на Стаўпеччыне — і вёску Мікалаеўшчыну ў маім літаратурна-гістарычным выхаваньні таксама не абмінулі. Бацька вельмі любіць Нясьвіж. Мы часта бывалі там у дзяцінстве, і я з малых гадоў чула пра Чорную Панну, пра Радзівілаў. Парк Нясьвіскі застаецца маім улюбёным месцам адпачынку.

Мы жылі яшчэ ў Заслаўі, бацька, капаючы бульбу, знайшоў маленечкі дзіцячы пярсьцёнак — зь нейкага жоўтага мэталу, зь зялёным каменьчыкам. Жартам тады сказаў: Рагнеда, мусіць, гуляючы тут, згубіла. Я, натуральна, паверыла і заганарылася — нос мой задзёрся дагары. Пярсьцёнкі з каляровых дроцікаў — гэта максымум, на які дзяўчынкі ў той час маглі разьлічваць. А тут сапраўдны пярсьцёнак, ды яшчэ Рагнедзін. Рагнеда для мяне сталася першаю постацьцю беларускага гістарычнага пантэону. Да якой хацелася быць падобнай. Хаця як яна выглядала, я ня ведала. Зрэшты, у дзяцінстве князёўны ўяўляюцца аднолькава прыгожымі.

У Менск мы пераехалі ў 1982 годзе, калі зараджалася беларускае Адраджэньне. У сталіцы мы сутыкнуліся з нацыянальна сьвядомай інтэлігенцыяй, якая тады выдаткоўвала сваю энэргію на ладжаньне нацыянальных сьвятаў. Памятаю гуканьне вясны ў парку Янкі Купалы, людзі ў прыгажэнных нацыянальных строях, потым нейкія альтанкі... На ўсё жыцьцё засталося адчуваньне еднасьці з усімі, хто туды прыйшоў гукаць вясну.

Памятаю экскурсію, якую зрабіў мне бацька, — па старым Менску, па Траецкім прадмесьці. Патлумачыў, дзе ў Менску што было раней, паказаў, дзе стаяла сынагога, дзе Дом масонаў. Распавядаў пра Пазьняка, як ён адстаяў Верхні горад ад разбурэньня, што дзякуючы яму захаваўся добры кавалак гістарычнае архітэктуры, якой нас хацелі пазбавіць. Я, можа, ня вельмі разумела на свой дзіцячы розум гэткія тонкасьці, не задумлялася пра барбарства бюракратычнага чынавенства, але гэтую вандроўку запомніла назаўсёды — і пазьней, на занятках гісторыі, крытычна ставілася да аповедаў пра няшчасны Менск, нібыта дашчэнту разбураны немцамі. Ужо тады я ведала, што калі Менск і разбурылі дашчэнту, то ня немцы.

Наш рацыён заўсёды быў вельмі просты. Мама клапацілася пра вітаміны для нашых арганізмаў — увесь час на нашым стале гасьцілі цыбуля, часнык, гарчыца, ад траўня да лістапада не выводзілася зеляніна ды гародніна. З маленства мне даводзілі ўлетку: “Еж вітаміны, каб на зіму назапасіць”.
Мама рабіла куцьцю, пякла на Саракі зь цеста 40 жаваранкаў, у адзін зь якіх клалі шчасьлівую манэтку — так рабіла яшчэ ейная бабуля.
Наша сямейная кухня была вельмі нацыянальнай. Шмат бульбы. Розных страваў з бульбы мама гатуе многа й цяпер — традыцыйныя дранікі, бабку, калдуны. Але мне падаецца, гэта ў любой сям’і гатуюць час ад часу. Калі не лянуюцца, як я.
У самым маленстве я шчэ засьпела самаробны хлеб — яго пякла мая прабабуля. Адзіны раз гэта было, але запомніла я назаўсёды. Хлеб быў неверагодна духмяны, вялізны, абсыпаны мукой, і прожылкі аеру адбіліся на ягоным сподзе. Цёмны — як цяперашні “Нарачанскі”, якога тады яшчэ не выпякалі. А на смак падаўся мне незвычайным ці, хутчэй, нязвыклым.
Наша сям’я была антыалькагольная. Не пілі зусім. А вось я гэтую традыцыю парушаю.
На падставе сямейных традыцый фармуюцца звычкі чалавека. Мне прышчапілі, напрыклад, звычку хадзіць па музэях — асабліва ў чужых гарадох. Хаця ў дзяцінстве я не любіла хадзіць па бясконцых галерэях Эрмітажу — і з паездкі ў Ленінград лепей за карціны памятаю чырвоныя канапы для наведнікаў, дзе я (у першых паездках адна, потым з братам разам) сяджу ды нью, пакуль бацькі аглядаюць чарговую “апошнюю” залю. А цяпер музэі люблю. І менскія, і ў чужых гарадох.
Толькі сям’я можа прышчапіць дух сямейнасьці. Гадоў у трынаццаць мне падрабязна апісалі ўсе галінкі нашага радаводнага дрэва. А бацькава мама, мая бабуля, расквеціла ўсе сямейныя гісторыі па-жаночаму — са здрадамі, каханкамі, каханьнямі... Можна раман было напісаць. Аказалася, што сваякі нашыя раскіданыя па ўсім сьвеце — хто паехаў на заробкі ў Амэрыку, дый так і застаўся тамака, каго ў 1939-м выслалі ў Казахстан, а адтуль яны зьбеглі ў Польшчу, хто ў Нямеччыне... Шмат каго са сваякоў раскулачылі. Некаторым, дзякуй богу, удалося адкупіцца ад новай улады — дзякуючы гэтаму захаваўся мой род...

Бацька заклікаў і мяне сур'ёзна вывучыць свой радавод: знайсьці такія самыя падрабязнасьці па мамінай лініі ды запісаць, бо размовы ўсе хутка забываюцца. Але ж справа неяк не пайшла далей за размовы.
Мне было гадоў пяць, калі мы былі ў гасьцёх з бацькамі ў Менску, я гулялася там са старэйшай за мяне дзяўчынкай. І ня памятаю, ці яна мне расчэсвала валасы ды запляла касу, скарыстаўшы сваю зашпілку, ці мне папросту спадабалася тая зашпілка, а тая мне дала "памераць", але факт, што гэтую заколку мама на мне пабачыла ўжо ў электрычцы. Што там было... Мама плакала. А зь мяне сьлёзы ліліся проста ў пяць ручаёў. Як мяне тады ганілі! Слова "красьці" я запомніла назаўсёды. Мы вярнуліся ў Менск адмыслова, каб аддаць гэтую заколку. Дзяўчынка даказвала, што яна мне яе падаравала, але мама, натуральна, не пагадзілася, а са мной яшчэ доўга не размаўляла.
На ўсё жыцьцё я запомніла і іншы выпадак. Мы з бацькам паехалі на хутар. Мама засталася ў Заслаўі. І вось сядзім мы неяк на ганку надвячоркам, назіраем захад сонца. І татка ціхенька засьпяваў. Тлумачыць мне пасьля: гэта я маме сьпяваў. Я вельмі зьдзівілася і кажу: "Маме? Дык чаму ж так ціха? Мы ж так далёка ехалі! Каб яна пачула, трэба гучна крычаць". А бацька кажа: "Не, яна чуе, я ведаю". Я вельмі ўразілася, але не паверыла. Калі мы вярнуліся дахаты ў Заслаўе, я насамперш кінулася распавядаць усю гэтую гісторыю маме. Так, сказала мама, я чула, як бацька сьпявае мне. Я была ўражаная. Тады мне сказалі: калі людзі кахаюць, то яны чуюць адно аднаго здалёк — нават калі гавораць шэптам.
Так міналася маё дзяцінства.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Максім Клімковіч

Згадкі пра дзяцінства

МАКСІМ КЛІМКОВІЧ — пісьменьнік, сын пісьменьніка Алеся Махнача і філёляга Маі Клімковіч

Ад нараджэньня я жыў у пісьменьніцкім доме на вуліцы Карла Маркса, 36. Мой бацька Алесь Махнач — пісьменьнік, абаронца Берасьцейскай крэпасьці, маці — Мая Клімковіч, дзед — Міхась Клімковіч.

З бацькам была такая гісторыя. Ня памятаю, які там быў год, калі прыехаў Брэжнеў у Менск, і вэтэранаў — абаронцаў Берасьцейскай крэпасьці запрасілі ў ЦК на прыём. А прапускалі

туды толькі па партыйных білетах. І раптам высьветлілася, у бацькі білета няма, хоць усе былі ўпэўненыя, што ён — камуніст. Толькі пасьля гэтага ён вырашыў уступіць у партыю.

Мне бацькі дазвалялі практычна ўсё, але ў разумных межах. Не забаранялі, але гаварылі, як трэба. Вяртайся калі хочаш, але толькі патэлефануй, каб не хваляваліся. За падман мяне таксама асабліва ніколі не каралі. А падманваў я, калі школу прагульваў. Гэта здаралася нячаста. Падманваў, толькі калі разумеў, што праўда бацькам не спадабаецца, пакрыўдзіць. Пэўнага разьмеркаваньня сямейных абавязкаў — кшталту ты нясеш сьмецьце, ты мыеш посуд, ты ходзіш у краму — у нас не было… Хто больш вольны, той і робіць. Бацька сам і гатаваць любіў.

Асноўнымі сямейнымі сьвятамі былі дні нараджэньня дзяцей. На іх ніколі не было, каб дарослыя і дзеці сядзелі за адным сталом. Заўсёды дзеці зьбіраліся разам, а дарослыя стараліся не мяшацца. Новы год, пакуль я быў малы, сьвяткаваўся дома. Потым ужо, клясы з 7-й, нават з 6-й, ішоў да некага ў госьці, туды, дзе сьвяткавалі аднагодкі. Іншых сьвятаў мы асабліва не адзначалі. Афіцыйныя сьвяты — яны ж практычна ўсе былі камуністычныя — мы сьвядома ігнаравалі, апроч 9 траўня. Часам на Дзень Перамогі з бацькам езьдзілі ў Берасьце на ўрачыстасьці.

Са старэйшых сваякоў я засьпеў жывою толькі сваю бабулю — дзедаву жонку, Марыю Клімковіч. У дзяцінстве ў мяне былі зь ёю нармальныя адносіны, асабліва калі яна, мае сёстры і я разам жылі на лецішчы. На лета мы здымалі ў Радашкавічах

дом. Яна жанчына ня тое што вельмі жорсткая, але дужа прынцыповая была. У 16 гадоў я пазнаёміўся зь дзяўчынай, маёй будучай жонкай, вось ужо 25 гадоў, як мы жывём разам, але бабуля яе не ўпадабала. І калі выпадкова пабачыла, як мы цалаваліся ў парку, то перастала са мной размаўляць. І так доўжылася да самай яе сьмерці. Больш за 20 гадоў яна слова да мяне не прамовіла, таму што я ажаніўся зь дзяўчынай, якая ёй не спадабалася. Хаця маці маю ўвесь час распытвала, што там у мяне ды як, асабліва што тычылася літаратурных справаў. А калі быў малы, мы з бабуляй вельмі добра разумеліся. Яна шмат расказвала са свайго жыцьця даваеннага, ваеннага, апавядала і пра літаратурнае асяродзьдзе.

Я навучыўся друкаваць на машынцы раней, чым пісаць рукой. А лічыць навучыўся, гуляючы ў карты з бацькамі. Гэта было абсалютна нармальна — гулялі дома. Да картаў прывучыла бабуля: да яе раз на тыдзень, як норма, прыходзілі ў госьці Марыя Бядуліха і Геня Кацовічыха, дзьве габрэйкі, удовы пісьменьнікаў Зьмітрака Бядулі і Хайма Кацовіча. Першыя гульні, якім бабуля мяне навучыла, былі немудрагелістыя “п’яніца”, “воз”, “сьвіньня”, а тады ўжо “дзявятка”. У “дзявятку”, як і ў “покер”, бяз грошай не згуляеш. Гульня ішла на медзякі. Бядуліха і Кацовічыха, як толькі трэба было вырашаць, якую карту класьці, пачыналі перамаўляцца на ідыш, каб мы не зразумелі.
Сястра мая старэйшая за мяне і стрыечная сястра таксама старэйшая — і ўвесь час я рос з аглядкай на старэйшых. Сястра на тры гады старэйшая была, кузына — на два. А ўвесь час гуляліся разам. Вялікае кола знаёмых было зь іхных сябровак. Дзеля гэтага я дасканала ведаў дзявочы сьвет, розныя жаночыя сакрэцікі. Увесь час круціўся вакол іх. Таму добра разумею жаночую псыхалёгію.
У дзяцінстве я выразна адчуваў адрозьненьне паміж “дваровым” асяродзьдзем і тым, якое склалася вакол сястры з кузынай. Абсалютна два розныя асяродзьдзі, і гульні розныя. Дома мы любілі гуляць у жахі. Футра надзяваць старое, гасіць сьвятло, палохаць адно аднаго. Мы самі прыдумлялі гульні і назвы: гуляць у “махнатку” — палохаць, даводзіць да жаху. Або ставілі нешта накшталт хатніх спэктакляў, напрыклад, паводле матываў “Баляды Рэдынгскай турмы” Оскара Ўайльда.

Паколькі я быў меншы за сёстраў, мне даводзілася граць эпізадычныя ролі і агучваць шумавыя эфэкты. Напрыклад, у О. Уайльда быў такі радок: “И ужас, разевая пасть, смеяся из угла”. І мне адводзілася роля “ужаса”, які сьмяецца з кута. Былі і меньш інтэлектуальныя гульні кшталту “Млынара”: ставілі фатэль у кут і круціліся паміж ім і сьцяной, хто больш выпацкаецца ў крэйду. З дваровых запомнілася такая гульня. Тады нашым суседам быў беларускі драматург Кобец (бацька атрымаў кватэру ў другім пісьменьніцкім доме на вуліцы Чарнышэўскага). Неяк мы гуляліся, а ён выйшаў і кажа: “Хлопцы, нейкія гульні ў вас незразумелыя. Нейкія там “гарады і сёлы” з ножыкамі… Я пакажу вам іншую гульню, файную. Называецца “Пікар”. Выкапайце лункі і закатвайце туды мяч, а хто прайграе — становіцца каля сьцяны, і яго гэтым мячом расстрэльваюць”. У нас мяч тэнісны быў — ім ня вельмі балюча. І Кобец з задавальненьнем гуляў разам з намі, хаця быў для нас ужо стары, як сьвет. На той час яму было, можа, гадоў пад семдзесят.
Прыйшоўшы ў першую клясу ў школу, я пасядзеў на першым уроку пятнаццаць хвілінаў, падняўся і пайшоў да дзьвярэй. Настаўніца спыталася: “Што такое?” Я адказаў: “Мне тут нецікава”. Увогуле ў мяне адзнакі былі тры-чатыры, тры-чатыры. Асабліва не ўлягаў за вучобаю. Толькі ў дзясятай клясе, калі трэба было паступаць у ВНУ, за апошні год нагнаў сабе атэстат да сярэдняга балу ў чатыры з паловай. А да гэтага здавалася, галоўнае — веды, а не адзнакі.

У мяне ў школе даволі кепскія настаўнікі былі, практычна ўсе, за выключэньнем адной — настаўніцы па фізыцы. А яна давала нам пісаць літаратурныя сачыненьні па фізыцы.
Бацькі ведалі, з кім я сябрую, свае парады давалі. Але ў мяне такіх сяброў, ад якіх можна ўсяго чакаць, практычна не было. Бацькі вучылі мяне: добрых хлопцаў шмат — цікавых мала, трымайся цікавых. Але катэгарычных забаронаў кшталту “з гэтым ты не сустракайся” — ніколі не было.
Я сябраваў з Адамам Глёбусам, Юрам Яўменавым — цяпер ён мастак, зь Віталікам Навіцкім, ён у Фінберга ў аркестры, а таксама з Уладзімерам Сьцепаном.
Мне ніхто не навязваў, на якой мове гаварыць. Бацька дома і па-за домам гаварыў па-беларуску, ён наагул амаль не ўжываў

расейшчыны. Маці карысталася дома расейскай. Моўнага прымусу не было. Калі ўжо ў мяне самога нарадзіўся сын, я яго ўвесь час на мітынгі цягаў. Пакуль ён быў малы, я мусам прымушаў яго гаварыць толькі па-беларуску, а цяпер разумею, што, можа, і дарма.

Пытаньне грошай у нашай сям'і вострa не стаяла. Калі было шмат грошай, тады і рабіліся пакупкі. Я быў не патрабавальны, не казаў: мне трэба гэта! Пасьля разводу бацькоў грошы мне давала маці — рубель, тры або пяць. Я проста казаў, на што мне трэба. На білеты ў кіно, на канцэрт ці проста так. Калі ў маці было шмат грошай, то не было праблемаў, калі меней, то і сума рабілася меншай.

Адкуль бяруцца дзеці, мне бацькі патлумачылі, калі я вучыўся ў першай клясе, бо я запытаўся пра гэта. Дакладна памятаю, што спытаўся, а вось што мне адказалі — ня памятаю. Добра помню толькі, што я ў гэта не паверыў. Я зразумеў, што мяне падманваюць. Потым трапіў у больніцу і ляжаў там са старэйшымі хлопцамі — чацьвертаклясьнікамі, нават з адным сяміклясьнікам. І яны актыўна гэта абмяркоўвалі. Ясна, я ня ўсё цяміў — яны не для мяне гаварылі, а паміж сабой. А потым, калі прыйшла да мяне маці ў больніцу, я спытаўся. Яна нешта на гэта выпаліла. Я адразу даўмеўся, што гэта мана, бо хлопцы іначай гаварылі.

Пэўны час я хаваў ад бацькоў парнаграфічную, у тагачасным, вядома, разуменьні, літаратуру, хаця яны ведалі, што яна ў мяне ёсьць. Калі я чытаў пра сэкс у гадоў трынаццаць-чатырнаццаць, мне было няёмка: раптам убачаць. Гэта была кніжка з хатняе бібліятэкі, якую я перахоўваў зь месца ў месца. Пра сьмерць я не пытаўся. Памятаю, як сам упершыню гэта адчуў. На мой погляд, дзіця тады пачынае быць чалавекам, калі яно разумее рэальнасьць сьмерці, калі пачынае баяцца яе. Гадоў у пяць я ўпершыню пабачыў пахаваньне. Тады я зразумеў, што і сам некалі памру. Тады і з бабуляй гаварыў пра існаваньне душы пасьля сьмерці… Яна была даволі пераканаваная атэістка. Я зь ёй спрачаўся наконт гэтага. Мне хацелася, каб нешта пасьля сьмерці было. Бабуля першая са сваякоў памерла — мне ўжо было 40 гадоў. Да гэтага я нікога з блізкіх не хаваў. Іншыя крэўныя памерлі да майго нараджэньня, і таму ў сям'і праблема сьмерці ў размовах не ўздымалася.

Першы раз я прачытаў Эвангельле ў клясе другой-трэцяй. Бацька мне даў у рукі Эвангельле, што належала ягонай маці, маёй бабулі. Сказаў, што гэта Сьвятая кніга, але не налягаў, толькі сказаў. Таму і прачытаў я кананічны тэкст Эвангельля ўпершыню менавіта як твор літаратурны. Уразілі мяне тады дзьве рэчы. У Новым запавеце адныя і тыя ж падзеі апісаныя чатырма аўтарамі — у другіх кнігах такі мастацкі прыём мне раней не сустракаўся. І яшчэ, тэкст быў пададзены ў дзьве калёнкі: па-расейску і на старажытнаславянскай мове. Упершыню я сутыкнуўся зь мёртваю моваю і дзякуючы паралельнаму перакладу шмат чаго зразумеў у ёй, упершыню пабачыў, што кірыліцай пішуць ня толькі беларусы і расейцы. Сьвятасьць жа той кнігі была для мяне ўжо ў тым, што належала яна маёй бабулі-нябожчыцы і трапіла да мяне праз пакаленьне. Вядома, разважаў я тады ў іншых катэгорыях, але сэнс адчуваньняў, пачуцьцяў менавіта такі. Мае першыя ўражаньні ад Эвангельля падпсавала тое, што крыху раней я пасьпеў прачытаць “Забаўную Біблію” Лео Таксыля — таленавітае і дасьціпнае блюзьнерства са Старога і Новага Запаветаў, адсюль, мабыць, і маё жаданьне разабраць маналітны недатыкальны тэкст на асобныя дэталькі.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Ігар Марачкін

Згадкі пра дзяцінства

ІГАР МАРАЧКІН — мастак, сын мастака і настаўніцы Аляксея і Ірыны Марачкіных

Я нарадзіўся ў Віцебску, дзе ў пэдагагічным інстытуце вучыліся мае бацькі: маці — на біялягічным, а бацька — на мастацка-графічным факультэце. Там яны пазнаёміліся і пабраліся шлюбам. Неўзабаве пасьля майго нараджэньня цяжка захварэла мама, і мяне завезьлі ў вёску Барсукі да дзядулі з бабуляй. Бацька ў гэты час быў у войску, яго адпусьцілі ў адпачынак, і ён знайшоў для мяне мамку з гэтай мясцовасьці, каб яна карміла мяне сваім малаком. Але пакарміла яна нядоўга, і, як ацялілася карова, мяне пасадзілі на каровіна малако. Так зь першага году свайго жыцьця я апынуўся ў вёсцы, у матуліных бацькоў. Тут я зрабіў свае першыя крокі: устаў і, на дзіва ўсім, перайшоў праз усю хату. Тады, кажуць, мне было 11 месяцаў.
Маці паступова акрыяла, скончыла інстытут. У гэты ж год вярнуўся з войска бацька, і мы пасяліліся ў Жодзіне. З трох гадоў я рос там. Але кожнае лета мы ўсёй сям’ёй бавілі свой вольны ад вучобы і працы час у бабулі зь дзядулем.
У Жодзіне мяне ўладкавалі ў дзіцячы садок. У нас сваёй кватэры не было. Мы жылі ў школе, спачатку ў разьдзявалцы

спартовай залі, а потым на трэцім паверсе, у лябаранцкім пакойчыку. Зусім невялікім, з адным акном. Толькі калі я пайшоў вучыцца ў гэтую самую школу, мы атрымалі кватэру на вуліцы ці то 40-годзьдзя, ці то 50-годзьдзя Кастрычніка. Бацька размаляваў алейнымі фарбамі самую вялікую сьцяну ў нашай новай кватэры: помніцца, што гэта быў профіль дзяўчыны з залацістымі косамі на тле нейкай абстрактнай дэкаратыўнай выявы. (Тады ён вучыўся, быў студэнтам тэатральна-мастацкага інстытуту.) Гэта, бадай, самы вялікі твор у ягоным жыцьці, які зь вялікай цяжкасьцю зафарбавалі маляры, калі мы мянялі сваю кватэру на пакойчык у Менску. Цяпер бы сказалі: “Гэта твор Марачкіна. Трэба рэстаўраваць”. Тады ж пра гэта ніхто ня думаў, трэ было ўсё ідэальна вычысьціць для новых жыхароў.
У 4-ю клясу я пайшоў ужо ў менскую школку № 13. Жылі ў хрушчоўцы на Валгаградзкай, 31, трэці паверх. У нас быў большы пакойчык, у меншым жыла самотная жанчына. Маленькая кухня, супольныя туалет і ванны пакой. Цяжка было. Да гэтай жанчыны сноўдалі розныя непрыемныя асобы, адбываліся п’яныя разборкі, а з кухні маглі і ўкрасьці што. Памятаю, быў выпадак, калі скралі ўкрыжаваньне — падарунак маёй прабабкі Марылі. На шчасьце, рэліквію ўдалося вярнуць. Цяпер яна стаіць у маёй майстэрні.

З усіх цацак я аддаваў перавагу “машынкам”. Увесь час ад гэтых айчынных машынак чамусьці адляталі колы. І я бясконца іх ладзіў. Што да гульняў, якія памятаюцца, дык гулялі мы ў лапту, або апуку: такія зробленыя з дрэўца палачкі, трэба было іх падбіваць і адшпульваць колькі сілы. У ножыкі таксама гулялі. Малявалі кола і дзялілі зямлю — сэнс гульні палягаў у тым, хто сабе больш нарэжа зямлі: кідалі ножык і рэзалі кола на сэгмэнты. Трэ было замаляваць чужыя рысачкі і атрымаць большы кавалак. Асабліва ж мы любілі гуляць у хованкі. Балазе, у вёсцы прастор! І ў казакоў гулялі. Зь няменшай ахвотай мы рабілі з дроваў буданчыкі каля дарог — такія сабе штабы ладзілі. Бацькі ня ведалі, што яны наагул ёсьць, мы гэта ў сакрэце трымалі. У такі штаб заносілі ўсе свае хлапечыя каштоўнасьці. Падчас цераблень лёну мы складалі сабе ніштаватыя хаткі са снапкоў. Можна было ў гэткім стозе зрабіць цэлыя пакоі, па чацьвёра-пяцёра сядзець там спакойна.

Я любіў гуляцца зь сярнічкамі. Рабіў зь іх прыпяканкі. Для гэтага трэба было пару пачкаў сярнічак счысьціць, забіць шомпалам, пару шарыкаў ад падшыпніка пакласьці мэталёвых. Гэтая “стрэльба” добра бабахала. Магла нават прасадзіць двое дзьвярэй. Дзед гэта заўважыў, і прыйшлося гэтую прыпяканку схаваць.
Было й такое: кладуся спаць, а мяне цягнуць на скокі. Ня тое каб у мяне была цікавасьць да гэтых скокаў, але дзьве мае старэйшыя стрыечныя сястры любілі танцаваць. Трэба было за 5 кілямэтраў ісьці, у суседнюю вёску. Я быў замалы для скокаў, але над імі апекаваўся. Завяду іх, сяду на арэлях і чакаю, калі вяртацца будуць. Сястрычкі баяліся ісьці празь цёмны бор, а для мяне гэты лес што родны дом: не баяўся, лётаў па ім, памятаў кожную сьцежку, кожную паваротку.
Адзін раз стаю на лузе, чакаю сясьцёр з танцулек. Пад’яжджае матацыкл, падвозіць Сьвету да ракі. Там у нас кладачка. Чую, хлопец-матацыкліст кажа: “Я цябе перавяду”. Яна: “Не-не. Я сама пайду”. — “Ну добра, тады я пасьвячу табе, каб ты перайшла кладку”. Ён ідзе да матацыкла, заводзіць яго, сьвеціць фарай на кладку, а Сьветы на ёй ужо няма: аступілася і ў раку зьляцела. Нараніцу была такая карціна: я сплю, сястра сьпіць, а на шнурах у садзе яе апратка сушыцца.
Маёй любімай стравай была поліўка. Гатуецца яна так: каўбаска, ужо падсохлая, кладзецца ў кіпень, і варыцца тлусты булён. Туды дабаўляецца бульба (цэлая, ня рэзаная), некалькі грыбкоў, морквачка. І пасьля гэта кісьліцца расолам, капусным ці з агуркоў, і з мукой праціраецца. Гэта чыста вясковая страва. Каўбасу даставалі і кожнаму — па кавалачку.

Ірына, Ігарава жонка: *Блінкі ў іх таксама заўсёды былі на стале. Тоненькія — “божыя анучкі” называліся. А калі іх крапалі тварагом — гэта ўжо былі налісьнікі. Бульбяныя клёцкі, як правіла, гатаваліся з душамі. Душа — гэта розная накрапка. Яе рабілі з сальца, грыбоў, кілбаскі, мяса ад кумпяка, усё з цыбулькай, перчыкам ды іншымі прыправамі. На досьвітку падымалася ўся жаночая палова сям’і: трэба бульбачку наскабліць, надзерці, адціснуць, дадаць да яе крыху звараной бульбы, падрыхтаваць душы, накрапаць — і ў круты вар, каб не апаўзьлі. Клёцкі выходзілі такія вялікія. Больш за чатыры ніхто з мужыкоў не зьядаў. Гэта надзвычай трывалая і смачная*

страва, якую мы дагэтуль любім гатаваць у сьвяточныя дні. А ўсё адтуль, з Барсукоў.

Ігар: Штодня мы абавязкова гатуем першую страву. Гэта — ад бацькі. Ён з Магілёўшчыны, а там, ён казаў, суп ці боршч ядуць тры разы на дзень. Кожны раз рознае: крупеня, кулеш, бацьвіньне, заціркa, поліўка.

Мой дзядуля Сяргей быў музыкам ад Бога. Ён меў тонкі музычны слых. Любую мэлёдыю паслухае і тут жа зайграе. Ня ведаючы нотаў, іграў на цымбалах, скрыпцы, мандаліне, балалайцы. Але захапленьнем ягонага жыцьця быў гармонік. Слынны на ўвесь раён музыка, ён іграў на вясельлях і на вечарынах, якія ладзіла мясцовая моладзь. А яшчэ дзядуля сам рабіў шматгалосныя гармонікі — петраградкі, як іх у нас называлі. Гэтаму ён навучыўся ў Івана Лютынскага, вядомага на ўсю акругу майстра-самародка, які жыў у Лужках, поблізу ад вёскі Барсукі. Кіраўнік фольк-групы “Ліцьвіны” Ўладзімер Бярбераў вывучаў мясцовы мэляс і выявіў школу Лютынскага, якая на сёньня стала прадметам дасьледаваньня музыказнаўцаў і фальклярыстаў. Гармонік дзедавай работы — наша найдаражэйшая сямейная рэліквія.

Дзед мяне вучыў культуры працы, бо сам быў пэдант ува ўсім. Калі косіць, дык косіць, калі дроў насячы трэба, то каб падрыхтаваны інструмэнт быў, каб усё заточана. Каб каса была вострая. Некаторыя дровы сякуць — сьмецьце пакідаюць. Ён — не. У кучку складзе, яно падсохне, і тады дзед у шчыток (грубку) укіне, спаліць. Пасьля сябе заўсёды трэба пакідаць парадак. І, калі мяне касіць вучыў, ён так казаў: “Глядзі, Ягорка, як я гэта раблю”. Мяне, дарэчы, ня звалі Ігарам, неяк гэтае імя было нязвыклым для вяскоўцаў. З таго часу мяне і цяпер у сям’і называюць Ягорам, Ягоркам, як некалі дзядуля з бабуляй...

Песьціць?... Мяне ніхто ня песьціў. Я рабіў усё, што трэба было па гаспадарцы. Калі я падрастаў, дык мяне самога цягнула дапамагчы, таму што я бачыў: старэюць бабуля і дзядуля, слабыя становяцца.

У жыцьці дзед кіраваўся прынцыпам: ні ад кога не залежаць. Што сам нажыў, тое — тваё. Аднаго разу я нешта прынёс у хату з чужога двара (мне проста далі, ня тое каб я ўкраў), дык дзед мне сказаў: “Не бяры ніколі чужога, таго, што ты не зарабіў”. Вось я так і жыву. Як бы цяжка ні было, нічога ні ў кога не

пазычаю, і чужое да мяне не прыстае. Сапраўды, лепей перацярпець, калі табе цяжка.
З усіх сьвятаў маленства асабліва помніцца Купальле. Гэта запамінальнае відовішча і вольніца, калі можна цэлую ноч бегаць! На Купальле пануе сапраўдная весялосьць. Людзі пяюць песьні, скачуць цераз вогнішча, паляць апоны ад машын і скочваюць іх зь вялікіх курганоў. Нават цяпер, калі мы бываем моцна занятыя, усё адно стараемся на Купальле трапіць у вёску.
Пасьля Яна — сьвята Пятра і Паўла, а неўзабаве жнівеньскія — Іспас і Дажынкі. Дажынкі ў нас завяршаюцца старажытнымі сьпевамі, а на зжатай ніўцы прыгожымі восеньскімі кветкамі ўпрыгожваецца “барада”. Пад гэты адмысловы букет закопваюць хлеб і соль — дары Духу поля. Жнейкі сьпяваюць: “Раю, Раю хадзіў па вуліцы”. Я любіў слухаць працяглыя жніўныя песьні і асабліва вось гэту: “Не пайду дамоў, я тут заначую...”. Мой бацька, натхнёны гэтым абрадам, намаляваў карціну, якую так і назваў — “Рай”. Гэтае жывапіснае палатно — падарунак маёй дачушцы Хрысьціне — сёньня ўпрыгожвае нашае жытло.
Цяжкую працу ў вёсцы рабілі талакой. А калі трэба было прыняць нейкае важнае рашэньне, то казалі: “Пойдзем да Аляксандрачкі, пасаймуемся”. Вёска жыла натуральным жыцьцём, са сваімі інтрыгамі, складанасьцямі. Былі тут і радасьць, і жалоба. Але ўсё роўна гэта быў адзіны зладжаны арганізм, як адна сям’я. І шкада, што яна сёньня вымірае. Шкада такіх мясьцінаў у Беларусі. Ды я шчасьлівы, што мае дзіцячыя гады прайшлі ў вёсачцы Барсукі, на беразе маляўнічай Мнюты. І цяпер, як надарыцца вольная часіна, я вязу сваю сямейку ў той чароўны, мілы майму сэрцу родны куточак, любоў і замілаваньне якім перадаліся майму сыну Злату. Там я бачу ў ім сябе малога. Як некалі. Як тады...

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Валянціна Палевікова

Згадкі пра дзяцінства

ВАЛЯНЦІНА ПАЛЕВІКОВА — старшыня Аб’яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі, вырасла ў Любанскім раёне ў сям’і настаўніцы і мэдработніка

Мой самы першы ўспамін: я, маленькая, ляжу ў драўлянай калысцы (не такой, якая гойдаецца пад стольлю, а што куляецца з боку на бок: бух-бух, бух-бух!). Наш дом вельмі сьветлы: надыходзіць вясна і сонца лезе ў вялізнае акно. Усё здаецца мне такім радасным, такім зіхоткім! І тут да нас прыходзіць шмат людзей: у нас адзіных на ўсю вёску ёсьць дэтэктарны прыймач. З прыймача кажуць, што памёр Сталін, і мая маці, і бацька, і аднавяскоўцы плачуць. А я не разумею, навошта плакаць у такі ясны дзень? Сэрца маё сьціскаецца ад жалю, і я пачынаю плакаць таксама. Гэта было 5 сакавіка 1953 году.

Я нарадзілася ў 1950 годзе ў Любанскім раёне Менскай вобласьці, у вёсцы Касьцяшы. Акурат над ракой Арэсай. Спачатку там стаяў хутар, дзе жыў мой бацька са сваімі бацькамі. Хутар пабудаваў мой дзед-лясьнічы. На жаль, нашага хутару цяпер няма — гэтыя мясьціны затапіла Любанскае вадасховішча. Пазьней дзед пабудаваў вялікі дубовы дом у вёсцы Касьцяшы, куды перабралася мая сям’я. Мне часта

кажуць цяпер: не бывае дамоў з дубу. Але наш быў менавіта дубовы. Ён быў прасторны, нашмат большы за звычайную вясковую хату, і вельмі, вельмі сьветлы. Да майго акна штолета прылятаў дзяцел, вялікая пярэстая птушка ў чырвонай шапачцы. Я нецярпліва чакала яго штогод, і ён не падводзіў. Дзяцел таксама любіў наш дом. Зрэшты, сьветлым ён быў толькі ўдзень, а ўночы я баялася выходзіць у сенцы. Мне здавалася, што ў пустой, недабудаванай палове хтосьці або штосьці жыве. За нашай сядзібай пачыналася поле з васількамі, яшчэ далей — поплаў. Я зналася на травах дзякуючы майму дзеду. Ён быў траўнік, лячыў людзей з усяе ваколіцы.
Самыя раньнія мае ўспаміны зьвязаныя з бацькам. Ён браў мяне з сабою ў грыбы, і я памятаю, якія гэтыя грыбы падаваліся вялізныя. Ня тое што цяпер.
Потым, калі я стала дарослаю, я захапілася турызмам і вазіла групы на сваю радзіму. Там ужо стаяла гэтае вадасховішча. Мы ехалі на дызэлі да Старых Дарог, адтуль да вёскі Вярхуціна, дзе ёсьць турбаза, і ўжо тады на лодках па канаве акурат на тое вадасховішча, пад якім пахаваныя мае родныя мясьціны. Там мы ставілі палаткі, лавілі рыбу, зьбіралі грыбы й ягады. Любанскі раён — дзікі. Я гэта адчувала яшчэ ў дзяцінстве. Мне падавалася, што я жыву на ўскрайку вялізнага лесу. З часам маленства робіцца ўсё даражэйшае і даражэйшае для мяне. У мяне такое пачуцьцё, што я нарадзілася ў самым прыгожым кутку сьвету. Мяне туды ўвесь час цягне.

Мая маці працавала настаўніцай у Касьцяшоўскай пачатковай школе. Я ў яе й вучылася. Тата мой хацеў стаць лекарам, аднак яму не пашчасьціла атрымаць мэдычнай адукацыі. Ён быў 1924 году нараджэньня, а гэта тое ваеннае пакаленьне, зь якога мала хто выжыў, а хто выжыў, той падымаў гаспадарку, таму і вывучыліся ня ўсе. У вайну тата служыў мэдбратам, выносіў параненых зь перадавой. Дайшоў да Бэрліна. Як глядзіць кіно пра вайсковых мэдыкаў — заўжды плача. Працаваў блізка да любімай справы: быў рэнтген-тэхнікам і тэхнічным супрацоўнікам у раённай больніцы.
Калі я вучылася ў старшых клясах, мы пераехалі ў Любань. Мая мама не знайшла працы ў горадзе, да таго ж ёй ня надта падабаліся гарадзкія дзеці пасьля вясковых, і яна яшчэ доўгі час ездзіла штодня працаваць дырэктаркаю ў школе —

спачатку ў Касьцяшы, потым у Чабусы і Абоз. Калі мама была маладою дзяўчынай, яе забралі гастарбайтаркаю ў Нямеччыну, яна працавала там на заводах. Пасьля вайны гэтых людзей доўгія гады не паважалі. У мамы застаўся сур'ёзны комплекс. Можа, гэта таксама было прычынаю таго, што яна не пераходзіла ў вялікую гарадзкую школу. Лічыла сябе грамадзянкай другога гатунку.

У мяне таксама ўзьнік комплекс. Калі я вучылася ў Касьцяшох, у нас была беларуская школа, а ў Любані школы былі расейскія. Я пайшла ў расейскую школу ў сёмую клясу, калі асоба ўжо амаль сфармавалася, але яшчэ была ўразьлівая. А ў школе зь мяне пачалі сьмяяцца. На ўроках я казала "лічнік", "назоўнік", дый увогуле па-расейску гаварыла з акцэнтам. З тае прычыны, што я была прыгожая дзяўчынка, хлопчыкі сталі аддаваць мне шмат увагі. Тады дзяўчаты пачалі цкаваць мяне з-за маёй "вясковасьці". Я пакутавала, пачала выціскаць зь сябе беларускія словы. Цяпер я ведаю, што я не адна так рабіла. Зрэшты, цкаваньне працягвалася нядоўга. Я стала выдатніцаю і ў Любані. У сваім выпуску я была адзіная на раён, хто атрымаў залаты мэдаль. Калі я паехала ў Менск паступаць, побач са мною ў аўтобусе сядзела жанчына, мы разгаварыліся, і яна сказала: *"Вам будет очень тяжело учиться, у Вас такой проблемный русский язык!"* Я памятаю, мне стала тады вельмі балюча. Русіфікацыя — вельмі дрэнная рэч.

Бацькі мяне выхоўвалі на ўласным прыкладзе. Тата быў з намі добры і вясёлы. Мама больш строгая, я яе пабойвалася. Яны хацелі, каб я была працавітая, і выхавалі мяне такой. Я рабіла тое, што ня кожны падлетак патрапіць, спрытная была да ўсякай працы. Ягады зьбірала хутчэй за ўсіх. Пачала зьбіраць чарніцы яшчэ дашкольніцай і магла тры вядры набраць за дзень. Мы жылі небагата, і чарніцы, што мы прадавалі ў Любані, былі добрым заробкам. Я рана пачала абслугоўваць сама сябе: навучылася шыць, плесьці кручком і на прутках, вельмі добра вышывала, асабліва гладзьдзю, мярэжкай, рабіла сабе прыгожую вопратку. У мамы недзе схаваны чамадан з падузорнікамі, пакрышкамі, прасьцінамі, якія я вышыла. Гэта якасная праца, якой я ганаруся. Ад свае бабулі Фядосі я навучылася плесьці з саломы. Умею рабіць гэта і цяпер — і куфэркі, і кілімчыкі. Мая бабка па бацьку Фядося была найлепшая ў ваколіцы ткачыха. У яе былі тады яшчэ ўласныя

кросны, і акрамя традыцыйных ўзораў яна прыдумляла свае ўласныя.

Памятаю, што я цяжка перажывала беднасьць свае сям'і. І нават калі была студэнткаю, прыяжджала на лета зьбіраць і сушыць чарніцы.
Мае бацькі не хадзілі да царквы. Яе ў нас у Любані і не было тады. Але яны вучылі мяне галоўнаму: быць добрай да людзей, ня несьці зла — і паказвалі прыклад. Вялікдзень сьвяткавалі як належыць. Зь пірагамі. Дарэчы, мая мама і нарадзіла мяне на Вялікдзень, калі мясілі і пяклі пірагі. Магчыма, таму я так люблю гатаваць, асабліва пячы. Сьвяткавалі ў нашай сям'і ўсе буйныя праваслаўныя сьвяты — Каляды, Спас, Вялікдзень. Ну і, натуральна, Новы год. Харчаваліся мы надзвычай проста: дранікі, поліўкі, бульба, мяса рознае, супы, гародніна. Звычайная беларуская кухня. Мая мама шмат працавала, сьпяшалася ранкам у школу, таму сьняданкі былі на хуткую руку. А вось бабуля Фядося гатавала гэтак добра! Смак яе бліноў памятаю дагэтуль.
Сяброў у мяне было шмат. Я была лідэркаю кампаніі, у тым ліку хлапчуковай. Выдумляла розныя гульні. З маіх сяброў выйшла шмат добрых, адукаваных і пасьпяховых людзей, але ніхто зь іх ня стаў вядомым. Ня стала вядомай і я. Цяпер мае сябры падтрымліваюць мяне ў цяжкі час. Калі быў надрукаваны гэты гнюсны паклёп у "Народнай газеце", калі мяне пачалі абліваць брудам, вінавацячы ў амурных сувязях з Ганчарыкам, ніхто з маіх сяброў ня кінуў у мяне каменя.
Забаронаў у нашай сям'і было ўвогуле няшмат. Адзінае, што забараняла мне маці, — хадзіць на танцы ды вечарынкі і сябраваць з хлопцамі. Яна баялася, што я "прынясу ў падоле" і не паступлю ў інстытут. Я яе пабойвалася — і не хадзіла на гулі.
Ці хлусіла я, калі была дзіцем?.. У маленстве я любіла перабольшыць. Хваліла сваю працу, "упрыгожвала" яе вынікі. І цяпер, бывае, не ўтрымаюся. Але хлусьнёй гэта не лічу. Мне ня трэ было хлусіць. У мяне была добрая, любая сям'я. Тата, мама, трое дзяцей. Калі паступіла і атрымала першую стыпэндыю, то палічыла, што ў мяне процьма грошай і купіла падарункі. Маме сукенку, тату, бабулі, сястры абноўкі, гасьцінцы. Праз тыдзень стыпэндыя скончылася, і я не

заплаціла ў краме за сасіскі: не хапіла грошай. Я вынесла іх з крамы, іду і чакаю, калі мяне схопяць і зганьбяць. Са мною быў мой будучы муж. Пытаецца: ты заплаціла за сасіскі? А я слова сказаць не магу. Потым мне тыя сасіскі ўсё адно ў горла не палезьлі. Гэта быў урок: не ўкрадзі. Я запомніла яго на ўсё жыцьцё.

Пра грошы гаворкі ніколі не вялося, у нас іх заўсёды было няшмат, асабліва пасьля таго як набылі дом у Любані. Мой мілы, дарагі тата заўсёды вылучаў нейкія пляны ўзбагачэньня: то трусоў разьвядзе, то нутрый, і ўсё ў яго неяк не выходзіла. Мама глядзела на гэта скептычна. Калі ж тата выйшаў на пэнсію, ён стаў вырошчваць ружы і аказаўся цудоўным садоўнікам. Наш дом патанае ў найпрыгажэйшых кветках найлепшых сартоў, і да таты прыходзяць людзі — на 1 верасьня, на вясельле. Ён прадае кветкі. Багатым ня стаў, а свае ружы любіць моцна. А я люблю езьдзіць у свой квітнелы дом. Шкада, што я ня ведаю гісторыі свайго роду: у нас на Любаншчыне і Случчыне моцна пагарэлі архівы. Затое ведаю, якія добрыя людзі мае дзяды і бацькі.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Іван Пінігін

Згадкі пра дзяцінства

ІВАН ПІНІГІН — тэлерэжысэр, брат тэатральнага рэжысэра Мікалая Пінігіна, вырас у тэатральна-тэлевізійнай сям'і

Я нарадзіўся ў 1961 годзе ў Менску, у 1-м раддоме, што каля Акадэміі навук. Прычым дзень майго нараджэньня супаў з братавым. Калі маці перад тым 5 жніўня сыходзіла ў радзільны дом, яна спыталася ў майго брата: “Што табе падараваць на дзень народзінаў?”. Ён сказаў: “Падары мне браціка”. Я быў у сям’і трэці, паскрэбак ужо.

Маці ў мяне з Украіны, тата — сібірак, Ганна і Мікалай. Яны то пераяжджалі ў Львоў, то зноў вярталіся ў Менск. Тут спачатку жылі каля цырку, а я нарадзіўся ўжо на вуліцы Калініна. На перасячэньні яе з вуліцай Якуба Коласа, якую ў нас па-старому называлі Лагойскім трактам, стаяў генэральскі дом — клясычная камуналка, адна з рэдкіх у Менску, дзе людзі існавалі настолькі шчыльна, што дом уяўляў нібы адзіны арганізм. Усе ведалі, хто што варыць на кухні, у каго якія адносіны, да каго ходзіць каханка. Такая атмасфэра сталінскай эпохі. На савецкія сьвяты жыхары выносілі сталы на двор і рабілі гіганцкую бяседу — гарэлка, баяны, песьні, скокі. Поўнае яднаньне!

Насупраць дому грувасьціліся паветкі са сваім асобным

сьветам, вульгарнае месца, дзе зьбіраліся ліхадзеі, дзе ўвечары нехта нешта адмыкаў, выносіў, цурчэла самагонка, зьвінела пілка, нехта хроп на канапах. Своеасаблівы Шанхай. А побач, тут жа за плотам, Маскоўская вайсковая часьць. І я маленькі, гады тры, там згубіўся: залез цераз плот, і мяне шукалі цэлы дзень. Усю міліцыю паднялі, а я там вандраваў па часьці. Потым салдацікі мяне прывялі.
З намі жылі Ліпкіны — сям'я вайскоўцаў, і ў іх былі вельмі прыгожыя дзеці. Зь імі ў нас была супольная кухня. Ладзілі, сябравалі. Як быццам іншыя ўзаемаадносіны тады былі: здаецца, мы разьдзеленыя пакоямі, а ў той жа час свабодна перасоўваліся ў прасторы абедзьвюх кватэраў. Можна было зайсьці ў пакой, калі там гэтыя Ліпкіны займаліся сэксам. Тады яны проста казалі: "Выйдзі, Ваня". Гэта быў зусім іншы сьвет, які ня меў аніякіх сёньняшніх межаў. У часьць можна было трапіць, перайшоўшы цераз дарогу. Тут жа прымыкаў да гораду лес: два прыпынкі — і ты ўжо ў лесе. Менск у сёньняшніх межах — гэта шчыльна забудаваны мэгаполіс, а тады ён быў правінцыйны горад, толькі-толькі адбудаваны пасьля вайны. І тады было яшчэ шмат габрэяў зь іхнымі шумнымі шматдзетнымі сем'ямі, што стваралі асаблівы мікраклімат у грамадзтве, прыўносячы ў жыцьцё асаблівыя калярыт і цеплыню ў адносінах.

Дзявочае прозьвішча маёй матулі — Цыката. Ганна Цыката. Яна два гады таму памерла. А бацька — Пінігін Мікалай Міхайлавіч, зь сібіракоў. Ягоны дзед арцельнікам быў, займаўся пушнінай. У мяне ёсьць вялізны дагератып, дзе іх сядзіць чатыры кампаньёны ў краме і тысячы розных футраў вісіць. Бацька ваяваў у разьведцы, быў узнагароджаны мэдалём. Пасьля вайны ён паступіў у тэатральны інстытут. Артыстычны быў, на баяне граў. Маці маю ён стрэў падчас гастроляў ва Ўкраіне. Яна тады грала ў Львоўскім ТЮГу — 20 роляў мела. Прыма, гераіня, бляндынка, з прыгожымі валасамі. Ён убачыў і закахаўся. І калі ўжо трэба было ад'яжджаць, цягнік пайшоў і апошні вагон каля яго праехаў, ён сказаў: "Я нікуды не паеду, калі ты не прыедзеш да мяне ў Менск. Ты прыедзеш? Прыедзеш?". Яна яму: "Ды прыеду я", — каб толькі ён пасьпеў заскочыць у вагон. І бацька заскочыў. А потым маці прыехала ў Менск, яны ажаніліся, і яна кінула ТЮГ.

Тут яны былі сярод пачынальнікаў Беларускага тэлебачаньня. З 1956 году працавалі на тэлестудыі: бацька — у літаратурным вяшчаньні, у навінах, а маці — у дзіцячай рэдакцыі. Яна ўзначальвала дзіцячую драматычную студыю, зь якой, дарэчы, выйшла потым 15 актораў і многа знакамітых рэжысэраў, у тым ліку Ўладзімер Бокун — мастацкі кіраўнік кампаніі “Фіт”. Тады перадачы ішлі толькі ўжывую, запісаў не практыкавалася. Разыгрываліся спэктаклі — гэтым маці займалася — і тут жа ўжывую трансьляваліся. Сапраўдныя тэатральныя пастановачныя спэктаклі з касьцюмамі, дэкарацыямі, студыя трыста мэтраў — тая, якая цяпер перададзена каналу АНТ.
А раней у гэтай студыі праходзілі навіны ды ўвогуле ўсе жывыя этэры. Атмасфэра была камэрная, пэрсанал усёй студыі складаў каля 100 чалавек. Гэта цяпер тэлебачаньне — вялізны мэханізм, 3000 чалавек, сярод якіх мала хто каго ведае, мала сустракаюцца, стасункі пераважаюць тэхналягічныя. Раней жа ўвесь калектыў быў адной добрай цёплай кампаніяй. І як толькі вялікае сьвята — у студыі (300 мэтраў) накрывалі стол, людзі сядзелі, выпівалі. У мяне ў сямейным альбоме ёсьць фатаздымак, на якім зафіксаваны момант, калі падчас такой п’янкі маці нахілілася да бацькі — а ў бацькі такі кок, модны закручаны чуб — і нешта яму крычыць, выгляд у іх узбуджаны, і на стале стаяць усялякія бутэлькі. У той час экспартавалі багата розных вытанчаных вінаў — грузінскіх, малдаўскіх...
Маці сышла на пэнсію галоўным рэжысэрам рэдакцыі моладзевых праграмаў. У той час гэта была культавая рэдакцыя, да 1980 году там працавалі Радунскі, Чуланаў, Вінаградаў, Гаравы — найкруцейшыя журналісты, цьвет Беларускага тэлебачаньня.

Памятаю, што я цяжка перажывала беднасьць свае сям’і. І нават калі была студэнткаю, прыяжджала на лета зьбіраць і сушыць чарніцы.
Мае бацькі не хадзілі да царквы. Яе ў нас у Любані і не было тады. Але яны вучылі мяне галоўнаму: быць добрай да людзей, ня несьці зла — і паказвалі прыклад. Вялікдзень сьвяткавалі як належыць. Зь пірагамі. Дарэчы, мая мама і нарадзіла мяне на Вялікдзень, калі мясілі і пяклі пірагі. Магчыма, таму я так люблю гатаваць, асабліва пячы. Сьвяткавалі ў нашай сям’і ўсе буйныя праваслаўныя сьвяты — Каляды, Спас, Вялікдзень. Ну і,

натуральна, Новы год. Харчаваліся мы надзвычай проста: дранікі, поліўкі, бульба, мяса рознае, супы, гародніна. Звычайная беларуская кухня. Мая мама шмат працавала, сьпяшалася ранкам у школу, таму сьняданкі былі на хуткую руку. А вось бабуля Фядося гатавала гэтак добра! Смак яе бліноў памятаю дагэтуль.

Сяброў у мяне было шмат. Я была лідэркаю кампаніі, у тым ліку хлапчуковай. Выдумляла розныя гульні. З маіх сяброў выйшла шмат добрых, адукаваных і пасьпяховых людзей, але ніхто зь іх ня стаў вядомым. Ня стала вядомай і я. Цяпер мае сябры падтрымліваюць мяне ў цяжкі час. Калі быў надрукаваны гэты гнюсны паклёп у “Народнай газеце”, калі мяне пачалі абліваць брудам, вінавацячы ў амурных сувязях з Ганчарыкам, ніхто з маіх сяброў ня кінуў у мяне каменя.

Забаронаў у нашай сям’і было ўвогуле няшмат. Адзінае, што забараняла мне маці, — хадзіць на танцы ды вечарынкі і сябраваць з хлопцамі. Яна баялася, што я “прынясу ў падоле” і не паступлю ў інстытут. Я яе пабойвалася — і не хадзіла на гулі.

Ці хлусіла я, калі была дзіцем?.. У маленстве я любіла перабольшыць. Хваліла сваю працу, “упрыгожвала” яе вынікі. І цяпер, бывае, не ўтрымаюся. Але хлусьнёй гэта не лічу. Мне ня трэ было хлусіць. У мяне была добрая, любая сям’я. Тата, мама, трое дзяцей. Калі паступіла і атрымала першую стыпэндыю, то палічыла, што ў мяне процьма грошай і купіла падарункі. Маме сукенку, тату, бабулі, сястры абноўкі, гасьцінцы. Праз тыдзень стыпэндыя скончылася, і я не заплаціла ў краме за сасіскі: не хапіла грошай. Я вынесла іх з крамы, іду і чакаю, калі мяне схопяць і зганьбяць. Са мною быў мой будучы муж. Пытаецца: ты заплаціла за сасіскі? А я слова сказаць не магу. Потым мне тыя сасіскі ўсё адно ў горла не палезьлі. Гэта быў урок: не ўкрадзі. Я запомніла яго на ўсё жыцьцё.

Пра грошы гаворкі ніколі не вялося, у нас іх заўсёды было няшмат, асабліва пасьля таго як набылі дом у Любані. Мой мілы, дарагі тата заўсёды вылучаў нейкія пляны ўзбагачэньня: то трусоў разьвядзе, то нутрый, і ўсё ў яго неяк не выходзіла. Мама глядзела на гэта скептычна. Калі ж тата выйшаў на пэнсію, ён стаў вырошчваць ружы і аказаўся цудоўным садоўнікам. Наш дом патанае ў найпрыгажэйшых кветках

найлепшых сартоў, і да таты прыходзяць людзі — на 1 верасьня, на вясельле. Ён прадае кветкі. Багатым ня стаў, а свае ружы любіць моцна. А я люблю езьдзіць у свой квітнелы дом. Шкада, што я ня ведаю гісторыі свайго роду: у нас на Любаншчыне і Случчыне моцна пагарэлі архівы. Затое ведаю, якія добрыя людзі мае дзяды і бацькі.

Бацька памёр у 1971-м, на той час ён з маці быў ужо разьведзены. Перад сьмерцю ён вандраваў па сьвеце, зафрахтаваўшыся мараком. Дапамагаў нечым, але, вядома, жыцьцё было даволі беднае. Да таго часу мы перасяліліся на вуліцу Каліноўскага, у дом, дзе давалі кватэры супрацоўнікам двух камітэтаў: адна частка дому належала Камітэту дзяржбясьпекі, а другая — Камітэту тэлебачаньня і радыёвяшчаньня. Напрыклад, нашым суседам быў палкоўнік КДБ. У нашай сям'і былі рэпрэсаваныя сваякі, бацькі расказвалі, колькі людзей загінула ў лягерах, колькі Сталін нарабіў бяды, а побач — натуральны сталінскі сьвет, з поўным зборам твораў правадыра, ягонымі бюстамі... Сьвет, дзе ўсе баяліся бацькі-палкоўніка. Варта яму было прайсьці каля дому — і ўсе, хто сядзеў на лавах, заміралі: "Глядзі, хто пайшоў". Такая была атмасфэра: усюды панаваў камуністычны страх, людзі шапталіся. З аднаго боку, здаецца, яшчэ браталіся ўсе, дапамагалі адзін аднаму, зь іншага — гэты страх перад карнымі структурамі і тым болей КДБ — жахлівай канторай... Я даношваў вопратку за братам, брат — за сястрой. Кофты пераходзілі, рэйтузы. Пазыкаў мама ніколі не рабіла, хіба што на буйныя пакупкі. Гэтаксама мне і сястра дапамагала, і брат у штодзённым жыцьці… Маці сыдзе на цэлы дзень на працу, я прыйду са школы, а на стале ляжыць запіска: боршч разагрэць і г.д. Пры тым, што брат і сястра моцна пасаблялі мне, мы жылі досыць аўтаномна. Розьніца з братам у мяне чатыры гады, зь сястрой пяць, таму ў кожнага былі свае зацікаўленьні. Гэта дарослыя людзі могуць хаўрусавацца зь людзьмі старэйшымі альбо маладзейшымі на 10—15 гадоў, раней усё было інакш. Адны слухалі — у нас вялікі лямпавы прыймач быў, "Мір", — "Бітлз", пісалі на касэтнік з гіганцкімі бабінамі, другі Севу Наўгародцава лавіў з BBC, "Голас Амэрыкі", асабліва навіны. Мы зьбіраліся ўвечары каля гэтага прыёмніка. У яго быў індыкатар настройкі — такое зялёнае вока мігціць, глушылка

шуміць, мы падстройваем.
Мы дружна жылі, таму што нас аб'ядноўвала праца: мы ўвесь час нешта рабілі, прыбіралі, чысьцілі, мылі. Штолета мы разам выяжджалі да бабулі ва Ўкраіну, дзе расьлі велізарныя чарэшні ў тры абхваты. Мы і там шмат працавалі, час праходзіў у несупынным клопаце. Потым, калі я быў у 1-й клясе, маці атрымала лецішча, дык і на лецішчы мы таксама працавалі.
Я прыгадваю Чыпаліна: там у яго дзядзька Гарбуз нешта будаваў з адной цагліны, так і мы. У пуні жылі. Памятаю выпадак, калі да маці прыехала на дзень нараджэньня ўся рэдакцыя — пад 30 чалавек. Тут пачалася травеньская навальніца — і ўсе заскочылі пад гэты дашок (ён быў 2x2). Усе зьмясьціліся! З чаркамі, з гарэлкай, пелі песьні. Былі тады сярод гасьцей журналісты Грыгаровіч, Мяркур'еў — культавыя асобы. Цяпер такіх няма. Цяпер сапраўдная пустэльня на тэлебачаньні: няма яркіх асобаў, бо няма пераемнасьці пакаленьняў.
У той час падлеткаў падсьцерагалі шматлікія небясьпекі. У наш раён прыходзілі дзецюкі са Сьляпянкі з кастэтамі, прэнтамі. Бойкі адбываліся сорак на сто чалавек, раён на раён. Прыяжджала па 15 міліцэйскіх "уазікаў". У такіх гарадзкіх бойках маглі забіць чалавека, але гэта замоўчвалася. Праўда, шмат хуліганаў садзілі, бо зэкі былі патрэбныя як працоўная сіла для пабудовы таго ж БАМу. Страшны ішоў "сенакос", калі садзілі людзей за бойкі, — проста веерам. Я ведаю, як з маіх двароў хлопцаў садзілі. Мы самі ня ўдзельнічалі, былі крыху быццам інтэлігенцкія дзеці.
У нас была іншая пастаянная гульня: у цюшку — на грошы. Мы рабілі форму і адлівалі з волава ці сьвінцу цюшку — нешта накшталт перніка. У цэнтар пляцоўкі клалі 10, 15, 20 капеек — гэта называлася кон. Людзі станавіліся і здалёк (мэтраў з дваццаці) кідалі цюшку, каб яна па зямлі кацілася. Чыя спыніцца бліжэйшая да кону, той першы б'е. У кожнага была свая цюшка. Ты цюшкай б'еш па манэце, і яна павінна падскокваць і класьціся арлом. Калі атрымалася, ты забіраеш грошы. Тады квіток на сэанс у кіно каштаваў 40 ці 20 капеек, 22 капейкі — найлепшае марозіва, 18 капеек — сок. Можна было разжыцца, стаць супэрбагатым чалавекам, граючы ў гэту цюшку. Але большыя хлопцы маглі запраста адабраць гэтыя грошы.

Была і прасьцейшая гульня — у коркі. Мы цягалі ў кішэнях аграмадныя запасы жалезных коркаў.
Потым прыйшоў іншы вар'яцкі павеў — усе хадзілі з маркамі, вялізнымі марачнымі альбомамі, кралі маркі. Вялізная калекцыя значкаў захавалася да гэтага часу. Я зьбіраў "Знакамітых людзей". Гэта быў час, калі, з аднаго боку, усе сфэры жыцьця кантраляваліся дзяржавай, зь іншага — нараджаўся нейкі ўнутраны рамантызм. У піянэрскім лягеры, напрыклад, адно жыцьцё — "рэчоўкі", маршыроўкі і пад., а другое — начное, калі лезеш у стагі зь дзяўчатамі цалавацца. Жыцьцё было разьдзелена на публічнае і патаемнае — тое, што ў сям'і, і тое, што ў кампаніі…
Мы былі навідавоку ў маці, і яна прыблізна ведала, хто што… Немагчыма было схавацца. Са школы дакладалі: я быў двоечнік, пяцёркі меў толькі па гісторыі і літаратуры. Падросшы, я заявіў: "Буду займацца рэжысурай. Мне матэматыка, дакладныя навукі не патрэбныя". Прапускаў заняткі, нарываўся на скандалы. А вось сястра з братам у мяне былі выдатнікамі.

З цацкамі было цяжкавата. Сям'я бедна жыла, і не было такога, каб нам цацку падаравалі. У мяне быў жалезны аўтамабіль ледзь ня 1947 году выпуску, потым у нас былі дзьве культавыя цацкі, якія цяпер жывуць на лецішчы (нават дзеці мае зь імі гуляліся), — чорны сабака Тузік і Міша. Мелі мы таксама каркасныя лялькі, што набіваліся пілавіньнем. Толькі недзе з 60-х гадоў было шмат ГДРаўскіх канструктараў ды пластыкавых пісталетаў, якія стралялі прысоскамі. За цацкі былі рагаткі, зь якіх мы пулялі па вераб'ях, птушках, катах. Мы бралі драўляную стрэльбу, мацавалі да яе гумку на рулю і рабілі скабу зь цьвіка — біла вельмі балюча. З такой зброяй мы гулялі ў вайнушку ў сутарэньнях прыблізна з 4-й клясы да 6-й. Потым усе гэтыя гульні абрыдлі, і мы распаўзьліся па пад'ездах цалавацца.
Разам з дарослымі мы сьвяткавалі ўсе савецкія, камуністычныя сьвяты, чакаючы падарункаў. А падарункі тады былі — шкарпэткі, шалікі, рукавічкі. Усё было практычна — каб можна было апрануць.
Што да ежы — многа ўжывалі гародніны, таму мала хварэлі ў дзяцінстве. Харчаваліся проста: маці буракоў надзярэ —

паставіць боршч, бульбы наварыць. У хаце не выводзіліся кіслая капуста, агуркі, салёнае, бабуля прысылала сухафрукты. Так і здаровыя былі. Я потым і сваіх дзяцей прывучыў да цыбулі, часныку. Найбольш падабаліся мне бульба смажаная і катлеты, якія мама рабіла з часнычком.
Маці была вельмі рэлігійная, як на тыя часы. Гэта перадалося ёй ад дзеда — сьвятара і бортніка. Рэлігійнай была і сібірская лінія. Наша бабуля Аўдоцьця Пракопаўна — маці майго бацькі — доўгі час жыла ў Менску, нас маленькіх гадавала. Яна і перадала сваю веру нам. Гэта яна пахрысьціла нас у катэдральным саборы (патаемна — маці як супрацоўніцы тэлебачаньня такога не даравалі б). Мы традыцыйна сьвяткавалі Вялікдзень. Былі абразы і ў нас, і ў бабулі. Бог прысутнічаў у нашым дзяцінстве. Мама мне казала: “Не рабі таго, не рабі гэтага, Бог бачыць усё”. Альбо: “Ты ведаеш, калі чалавек крадзе, то ён можа вельмі моцна захварэць”. Усё перакладалася для дзіцячай сьвядомасьці, каб было зразумела. Гэта перадалося ўсёй нашай сям’і — і сястра верыць, і брат, і я. Сьмерці ж не было ў дзіцячым жыцьці ўвогуле. Яшчэ не было. Усё нашае знаёмства са сьмерцю — гэта калі кагосьці хавалі: аркестар ідзе, людзі плачуць. Адчуваньня сьмерці не было. Жыцьцё ў дзяцінстве — заўсёды сьвята. Я ня бачыў сьмерцяў нічыіх — ня бачыў, як памёр бацька. Упершыню ўбачыў, як нехта ляжыць у труне, калі мне было ўжо дваццаць шэсьць год. Мы гадаваліся бяз бацькі — і я вырас маторным, нэрвовым чалавекам. Маці мне заўсёды казала: “Стрымлівайся, думай, будзь мужчынам”. Ейнай любімай фразай было: “Хіба ты можаш судзіць людзей, калі сам недасканалы?” “Чаму ты кажаш, што ён кепскі, калі ты сам... Хіба ня бачыш, які неідэальны ў цябе характар, і ты можаш таксама так рабіць”. Яна ўвесь час паказвала на мае хібы. (Пабіўся — сам вінаваты, давёў справу да бойкі.) Такім чынам яна выхоўвала ў нас адчуваньне, што трэба ўзважваць свае ўчынкі, унікаць благога. Мы займаліся спортам, я ўваходзіў у склад моладзевай зборнай рэспублікі па гандболе. Адначасова нас вучылі музыцы. Калі штосьці не атрымлівалася, маці не папікала. Не — дык не. Яна аддала мяне вучыцца ў школу пры кансэрваторыі па клясе баяну (мы не маглі купіць фартэпіяна, купілі баян з растэрміноўкай у 4 месяцы), а я не хацеў. Я прыходзіў, бачыў свайго пэдагога ў холе кансэрваторыі і сыходзіў. Потым казаў:

“Я яго не знайшоў. Яго не было”, — і сыходзіў гуляць у цэнтар гораду. Хадзіў у такіх аксамітных рэйтузах, штоніках да калена, з папачкай, нотамі для сальфэджыё. Потым прыйшоў на іспыт і сказаў прафэсарам у лоб: “Я ненавіджу вашу музыку”. У іх пэнснэ пападалі: “Як гэта ненавідзіш?” — “Я не хачу граць”. — “Ідзіце, малады чалавек”. Я выйшаў — мой пэдагог стаіць. Я ўбачыў ягоныя вочы і ўцёк. Увечары ён патэлефанаваў маці і сказаў: “Вы ведаеце, што ваш сын зрабіў на іспыце?” Яна кажа: “Ага. Ну, прабачце, калі ласка”, — і за дзяркач. Гэта быў выключны выпадак, калі яна ўжыла фізычны гвалт. Часьцей маці сарамаціла.
Што датычыць сэксу, дык маці на ім ніколі ўвагі не акцэнтавала (людзі былі савецкія, больш стрыманыя, камуністычнае выхаваньне, дый прыродна былі цнатлівыя), але вельмі рана падсунула мне адпаведную літаратуру. Кніга Хмялінскага “Псыхагігіена полавага жыцьця” адкрыла мне нямала сакрэтаў. Калі яна зрабіла гэта, мне ўжо даводзілася цалавацца і сэкс для мяне здаваўся нейкім касьмічным жыцьцём, дзе трэба ведаць шмат нюансаў. Брату ж нейкія порначасопісы паказвалі сябры. Заняткі па полавым выхаваньні праводзіліся і ў школе: клясы разьдзяляліся — асобна дзяўчынкі, асобна хлопчыкі. На тых занятках нам апавядалі, што каханьне — гэта найперш гармонія, а калі вы будзеце сустракацца з выпадковымі жанчынамі… І далей пра вэнэрычныя хваробы. Асноўная задача была напалохаць. У самых апошніх клясах нас вадзілі ў цэнтар па прапагандзе гігіены, санітарыі і мэдычных ведаў, што месьціўся за цыркам. Там ізноў пра вэнэрычныя захворваньні… І пра ананізм — што гэта кепска, парушаецца псыхіка. Мы гэтым займаемся ўвесь час — і раптам нам кажуць, што ад гэтага памерці можна, бо высыхае сьпінны мозг. А перад гэтым яшчэ паўлекцыі: вы яшчэ маладыя людзі, нясьпелыя, павінны сасьпець для стварэньня сям’і. Як у фільме жахаў. Вось камуністычнае выхаваньне! Ніхто ж ня ведаў тады прэзэрватываў. Гэта цяпер усе ідуць у аптэку і купляюць. А тады, па-першае, іх мала дзе было, а потым — зайсьці ў аптэку, набыць прэзэрватыў!.. Да таго ж, яны ўсе рваліся, наколькі я памятаю. Мы надзімалі іх, як шары, сьмяяліся.

Маці адзначала мне, падабаецца ёй мая сяброўка ці не. Маім

першым каханьнем была дзяўчына з Батайску (неяк паехаў у Анапу, а яна там працавала важатай). Зь іншай дзяўчынай я ўцёк у Вільню, проста з пробаў у Рубінчыка, падчас здымак “Вянка санэтаў”. У Вільні нас пасялілі ў адзін нумар, бо я сказаў, што яна мая стрыечная сястра… Я мару зьняць фільм пра 60-я гады — пра сэксуальную рэвалюцыю. Каханьне, сэкс, сыстэма запалохваньня, забароны!.. Калі мы вярнуліся зь Вільні, бацькі паклалі яе на абсьледаваньне, ці не зацяжарыла. А мяне выклікалі настаўнікі: “Іване, ты павінен сказаць, што ў вас было зь Людмілай у Вільні”. — “Нічога не было”. Допыт з заўзятасьцю. Намёкі. Усё спрабавалі выпытаць. Пасьля не дазвалялі зь Людай быць. Мы перазвоньваліся зь ёй. Вось такое каханьне.

У маці адна бяда была: кім стане Ваня? Сястра доктарка, брат — тэлеапэратар, а я захапіўся тэатрам. Я ж быў як бы з пэрыфэрыйнай моладзі — з пасялковага раёну. А тэатар — сталіца. Мы, маладыя акторы, зьбіраліся ў кавярні “Вясна”, пілі каву з малаком, размаўлялі — і гэта было амаль як на Захадзе. Цяпер гэта норма, а тады горад быў разьбіты на зоны, якія кантралявалі розныя групоўкі. Паехаць у цэнтар тусавацца было мужным учынкам… Ці быў яшчэ такі раён — Абісінія (парк Горкага), дзе цябе маглі зьбіць, а маглі і правесьці з табой інтэлектуальную гутарку нейкія сталічныя хлопцы. Потым я паступаў у тэатральны, але не паступіў. Паспрабаваў на рэжысуру Інстытуту культуры, год адвучыўся, забраў дакумэнты, зноў паступаў на тэлевізійную рэжысуру тэатральна-мастацкага інстытуту і там ужо давучваўся.

Што да кніг — дык я ішоў хвастом за братам. Брэдбэры чытаў. Картасара. Потым чытаў ужо Эфраса — “Мая прафэсія — рэжысэр”, “Рэпэтыцыя — любоў мая”. І шмат расейскай клясыкі — Чэхава найперш. Па маміным пасьведчаньні хадзілі ў Дом кіно, што месьціўся ў Чырвоным касьцёле, на прагляды. Мы ўсёй сям’ёй любілі Фэліні, вельмі любілі Таркоўскага, Данэлія. Глядзелі шмат, бо мелі магчымасьць наведваць закрытыя кінапрагляды і на тэлебачаньні. Пасьля дадаліся паказы для сяброў Саюзу кінэматаграфістаў і рэжысэраў у тэатральна-мастацкім інстытуце. Памятаю, як уразіў мяне Мілаш Форман, “Увесь гэты джаз”. Мы выхоўваліся таксама на стужцы “Ісус Хрыстос — супэрзорка”. Клясыкі ў нас мала ў доме гучала, усё больш — “Beatles”, “Deep Purple”. Брат на заробак зь першай

бульбы купіў магнітафон, і ў нас увесь час грымела калёнка. Я моцна адрозьніваюся ад мамы. То былі людзі зусім іншай эпохі, людзі, якія спазналі трагедыі, перажыўшы вайну, эвакуацыю, рэпрэсіі. Яны жылі з заўсёдным прадчуваньнем “засады”, нестабільнасьці. У мяне інакш. Я аб’езьдзіў 40 краінаў сьвету, што й казаць... Таму сваім дзецям я імкнуся прышчапіць толькі пэўны стыль адносінаў, стаўленьне да іншых людзей і да працы. Яны бачаць, што тата працуе ўвесь тыдзень, і разумеюць, што, каб нечага дасягнуць, трэба шмат працаваць. У нас з жонкай такая сабе італьянская сям’я, вялікая нэапалітанская сям’я: крычым адно на аднаго, лаемся, але ўсе адзін аднаго любяць. Я перадаю дочкам тое, што ёсьць у маёй прыродзе. У вярблюда два гарбы, я ім заўсёды кажу. Таму што жыцьцё — змаганьне, трэба выжываць. Трэба агрэсіўна ставіцца да жыцьця, каб нечага дасягнуць.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Ганна й Павал Севярынцы

Згадкі пра дзяцінства

ГАННА й ПАВАЛ СЕВЯРЫНЦЫ — Ганна — настаўніца расейскай мовы і літаратуры, Павал — лідэр “Маладога фронту”. Вырасьлі ў Барані і Віцебску, у сям’і выпускнікоў філфаку.

Ганна: Я нарадзілася ў Менску, у “чацьверцы”, інтэрнаце БДУ. *Павал: А я ў Воршы, бо бацькі ўжо пераехалі. Бацьку далі пасаду дырэктара школы ў адной зь вёсак — Пагосьце. Ён скончыў філфак і паехаў туды.*

Маці кажа так: “Я ня ведаю, як вы расьлі, я вас не выхоўвала”. Было так: спазьніўся на абед — не паабедаў, спазьніўся на вячэру — не павячэраў. Пакуль самі не навучыліся гатаваць. Калі навучыліся, то ўжо елі, калі хацелі. *Атмасфэра ў сям’і была вельмі добрая. Бацька вершы пісаў*. Маці на нас адпрацоўвала ўсе магчымыя пэдагагічныя мэтады. Нам доўгі час — гадоў да дванаццаці — пісаў лісты Чабурашка. Прачынаешся — і з-пад падушкі дастаеш ліст. Там напісана: “Ты, Ганька, учора посуду не памыла. Твая маці прыйшла з працы і мыла посуд сама, таму Чабурашка вельмі засмучаны. Напішы яму, калі ласка, адказ”. Я яму пісала ўвечары, што, маўляў, так і так, прабач, ды клала назад. Потым у нас была яшчэ такая штука: за кожную добрую справу маці давала нам

рысавае зернейка. Прычым калі ты рабіў яе толькі дзеля гэтага зярнятка, без душы, ты яго не атрымліваў. Мы зьбіралі іх у мяшэчкі, пералічвалі, у каго болей. *Але гэта ўсё ўрэшце скончылася карупцыяй. Рысінкі сталі зьяўляцца незалежна ад добрых справаў.* Нарэшце мама зварыла нам зь іх вялікую каструлю рысавага “супу сяброўства”.
Абавязкі ў сям’і дзяліліся так: каму сказалі, той і пайшоў рабіць. Але прыбіраць нам ня надта падабалася. Мы пісалі на паперцы: прыбраць на паліцы, памыць падлогу, падмесьці дыван, паліць кветкі. Гэтыя паперкі клаліся ў шапку, і кожны цягнуў пэўную колькасьць. Хто што выцягнуў, той тое і рабіў. А потым была дзяржпрыёмка: адзін у аднаго прымалі працу.
Маці ўвогуле ніколі ў дэкрэце не заседжвалася. Хадзіла ў школу, на перапынку прыбягала паглядзець, цікавілася, як і што.
Месяцаў у восем у мяне была дызэнтэрыя. І мяне адвезьлі да бабулі ва Ўнорыцу, яна мяне конскім шчаўем адпаіла.
Адшаптала. Маці прывезла і сказала: “Я ня вытрымаю, калі ён памрэ ў мяне на руках”, — аддала бабулі і паехала. Бабуля нейкай гарбатай выпаіла, нейкіх бабак вакол сябе склікала, яны адшапталі. Карацей, мама прыехала — а Павал вельмі тоўсты ходзіць. Мама два дні праплакала. *Мала таго, яна кінулася да мяне, а я да бабулі з крыкам “Мама!” — не прызнаў.*
Нас заўсёды адпраўлялі да бабуляў: матцы трэ было то дыплём абараняць, то потым Павал нарадзіўся — мяне зноў на паўгоду адправілі. Дарка нараджалася, нас таксама некуды падзелі.
Я ўжо і Жэню сваю да прабабці звазіла.

Бабуля нас выхоўвала так: гуляйце, дзіцяткі, нічога не рабіце, бо дома наробіцеся. Пасьля абеду трэба паспаць, перад вячэрай трэба паляжаць, пасьля вячэры — таксама. Нічога не рабіце. Толькі калі бабуля пачынала казаць: “Ты чуў? Ты бачыў? Якую шкоду нарабілі!” — мы беглі куды-небудзь хавацца. А бабка з дубчыкам — за намі. Гэта быў адзіны выхаваўчы момант. *А ў цэлым у бабулі было вельмі добра.* Там адразу нейкую адказнасьць адзін за аднаго адчуваеш. Даша, праўда, ледзь на рэчцы не патанула, калі мы ўтраіх былі… Маці ж нас прывучала — вады прынясіце, на сене дапамажыце, гной павыкідайце. Уся вёска зьбіралася, глядзела, як мы, дзеці, працуем. А мы яшчэ як засьпяваем разам! І ўжо ўсе стануць, і баба стане, і ўжо плача

ад радасьці, а мы той гной ганарліва кідаем. *Конкурсы моды праводзілі.* Самі сабе ладзілі фэстывалі лялечных тэатраў. Два чалавекі ў журы, а адзін паказвае тэатар. Потым мяняемся. Афішы пісалі, дыплёмы малявалі, давалі адзін аднаму. Канкурэнцыя жорсткая была!
Яшчэ мы гралі ў ленінскія куткі. Вырываеш дзёран, зямля голая атрымліваецца. Лавачка зь дзёрну зроблена. Кветкі. Мятлушак лавілі. Адну забівалі, каб пахаваць. А другую прывязвалі за пуза побач з крыжам, маўляў, гэта муж і жонка, муж памёр — і жонка ня можа яго пакінуць. Так яны віселі ў нас на нітцы гэтай. *А потым хадзілі, адзін у аднаго правяралі, дзе лепш.* Таксама кшталту дзяржпрыёмкі. А яшчэ прыгадалася, як мяне мама выдатніцай зрабіла. У першай клясе яна мне паказала вялікі партрэт і сказала: “Скончыш першую клясу на пяцёркі, я табе над ложкам павешу партрэт Валодзі Ўльянава”. Я ўсю першую клясу працавала, як немаведама хто. Дзеля партрэту, пра які марыла. І калі прыйшоў травень, у мяне ўсе пяцёркі, а яна, пэўна, забылася — дык я падумала: ну што ж, відаць, не заслужыла. Клясы да пятай перажывала. *Нашыя бацькі нас так настройвалі, правяралі дзеньнікі. Усе трое залатымі мэдалістамі сталі.* У мяне мама праверыла адзін раз у жыцьці хатняе заданьне, прымусіла мяне яго перапісаць разоў дванаццаць, бо там было выкананае неахайна. *Маці ж настаўніца была.* Насамрэч нас і ня трэ было правяраць. Нам як заладзілі зь дзяцінства за партрэт Леніна вучыцца, мы і вучыліся.
Я асабіста памятаю, што ў мяне матывацыяй быў залаты мэдаль. А ў мяне такое адчуваньне, што ад пачатку было вырашана: у нас будзе вышэйшая адукацыя. Наша малодшая сястра Даша — у яе дзіця і яна ўжо скончыла вучэльню — цяпер будзе паступаць, хаця ёй асабліва гэта і ня трэба. Проста таму, што так настроілі.

Мяне адгаворвалі ад філфаку і тата, і мама. І сяброў сям’і прыводзілі, каб яны адгаварылі. Ня тое каб нейкімі рэпрэсіўнымі мэтадамі. Тлумачылі: “Ганька, навошта? Ты ўсё гэта ўжо ведаеш. Паглядзі на нас”. Я на іх паглядзела і пайшла вучыцца. А Павал, дык той зь дзяцінства каменьчыкі зьбіраў. Яму мама давала грошы на нейкія даламіты, на нейкія раскопкі. *Натуральна, цікавіўся хіміяй, біялёгіяй і геаграфіяй.*

Мы вырасьлі ў Барані, гэта пад Воршай, там, дзе завод “Лёс” на 15 тысячаў чалавек. Бацька быў там галоўным рэдактарам заводзкай шматтыражкі, а гэта было прадпрыемства Міністэрства абароны, там выпускалася прадукцыя касьмічнага прызначэньня. Бацьку неяк выклікалі ў КДБ, далі яму друкарку, каб потым па літарах вызначаць — спэцыяльная была, з дэфэктам, — дзе надрукавана. Гарадок Барань вельмі цікавы. Я цяпер усьведамляю: там велізарны навуковы патэнцыял, шмат народу з вышэйшай тэхнічнай адукацыяй. Цяпер, праўда, прамысловасьць там у заняпадзе, але тысяч дзесяць чалавек яшчэ працуюць. І цікава, што ў Барані дзейнічае больш за дваццаць няўрадавых арганізацый. Само мястэчка знаходзіцца ў катлавіне, побач Аршанскае ўзвышша, прыток Дняпра і ўнікальны векавы бор. Мясьціны там рамантычныя! Нас маці вадзіла — брала са сваімі вучнямі ў паходы.

Я ўсё сваё сьвядомае дзяцінства праседзела з кніжкамі ў фатэлі. Потым мяне ў 9 клясе ўжо сарвала: я перастала чытаць зусім. Нам не забаранялі, мы самі не хацелі ісьці на двор. Калі я першы раз пайшла на дыскатэку ў вайсковую часьць, маці ня тое што забараніла, наадварот — накрычала на мяне, прымусіла вочы, пазногці падфарбаваць. *Інтарэсы ў нас былі іншыя. У нас у Віцебску была кампанія аднадумцаў — мы гулялі ў стварэньне сваіх дзяржаваў.* У нас было тры дзяржавы. *Дашу, праўда, мы потым далучылі. Была цэлая сыстэма. Кожны чалавек — асобная дзяржава і свой кавалак зямлі. Інфрастуктура была: нейкія дарожкі, плянтацыі. Вельмі цікава.* Зьбіралі дзьмухаўцы, потым сушылі дома, малолі, з гэтага заварвалі каву. Мама ўвесь час за голаў хапалася. *Сушылі карані чароту. Мы з Алегам Баршчэўскім… Баршчэўскія — ад каторых Лявон Баршчэўскі, ён малодшы брат Вадзіма Баршчэўскага, які зь Віцебску, — жылі літаральна цераз вуліцу. Да іх нашыя бацькі хадзілі ўвесь час. І вось з Вадзімавым сынам, з Алегам, мы былі найлепшыя сябрукі. Аднойчы ён адкапаў нейкую кніжку, у якой расказвалася, якая трава для чаго ўжываецца, што робяць з гусінай лапкай, а што зь дзьмухаўцом. Мы там разгарнулі сельскую гаспадарку.*

Чыталі ўсё, пачынаючы з клясыкі. Жуля Вэрна, Лява Касіля, вядома. Я пачала з “Узаранай цаліны” ў гады чатыры. Мне неабходна было вочы трэніраваць: акуляры заклейвалі. Адно шкельца заклеяць, потым другое. І так трэ было чытаць. Мама

мне падсунула “Ўзараную цаліну”, і я зь яе пачала. *А я ніколі не забудуся кніжкі, дзе на адной старонцы было па-расейску, на другой — па-беларуску. Дарэчы, гэта першая кніжка, якую я прачытаў усьвядомлена. Там пра вайну, пра Хатынь.* Мы заўсёды чапляліся: “Мама, што мне пачытаць?” А яна — альбо “адчапіся”, альбо адкрывала шафу і казала: “Шукай”. Магла спытаць у гуморы: “А што б ты хацела?” — “Вось тое, тое і тое”. — “Ну, пачытай”. У нас бібліятэка дома вельмі вялікая.
Я, напэўна, да гэтага часу ўсё не перачытала. А ў некаторых кніжках, дарэчы, я, чытаючы, разьдзірала старонкі: бацькі купілі, потым дзеці пайшлі — і яны іх не чыталі. Я была першай, хто іх дома ў нас прачытаў.

...Што мы елі на сьвяты?.. Канечне, салату “Аліўе”, шпроты і ўсе стравы на 1 мая і 7 лістапада. На сёмага ў нас заўсёды быў булён зь піражкамі, заўсёды. З таго часу кожнага сёмага лістапада — і ў мяне булён зь піражкамі. Як дэманстрацыя сканчалася (мы па тэлевізары абавязкова глядзелі), мама заўсёды казала: “Вось, усе дзеці з Масквы пайшлі піць булён зь піражкамі. І мы пойдзем”. *Потым, пасьля закліку Гайдара на 7 лістапада заклейваць вокны, мы заклейвалі вокны.*
На бацькоўскі дзень нараджэньня (тата з мамай амаль адначасова нарадзіліся — 1 і 4 верасьня) мы рабілі канцэрт. Гралі на піяніна і сьпявалі, малявалі, нейкія вершы пісалі. Памятаю, першы Паўлаў верш быў “Голубок, голубок, почему ты одинок? Ты лети к своим друзьям в теплые края”. Ці: “Дорогой мой друг Саддам, танков я тебе не дам”. Мы яшчэ на кожнае сямейнае сьвята выпускалі газэту “Пятачок”. Іх выйшла нумароў дванаццаць.
Рэлігійныя сьвяты пачалі адзначаць толькі ў сярэдзіне 90-х. Хоць на Вялікдзень яйкі малявалі заўсёды. Але тата ў нас ваяўнічы атэіст да гэтага часу. *Цяпер ужо не ваяўнічы.* Так, ён пасталеў. Біблію мы, здаецца, у дом прывезьлі.
У маці і бацькі розныя кухні. У маці больш будзённая. Яечня, галубцы. *А бацька шмат што гатуе. Як бабуля. Тая шмат нагатуе, паставіць на стол — і бацька так.* Грунтоўна падыходзіць. Паглядзеў, падсмажыў, паліў, пераклаў. Пашынкаваў. Шынкуе дробненька-дробненька. Калі тата зь нейкіх прычын не гатаваў, дык мама купляла пачак пяльменяў, і яны з коткай (тады была яшчэ наша котка жывая) тыдзень іх

елі. *Я найбольш любіў сырнікі.* А я яечню. Прычым я туды сабе хлебчыка крышыла. Катэгарычна не падабалася манка — проста жах. Дарэчы, яе і варыць перасталі. *Я селядцоў ня еў ніколі.* А я, наадварот, селядзец люблю. Малочныя супы мы ня елі. Мама іх таксама перастала варыць.
З цацак было больш за ўсё кубікаў. Мы іх цьвікамі да падлогі прыбівалі. У нас былі добрыя цацкі — конь-гушкалка, нейкія мядзьведзікі, зайцы, усякае такое… З цацкамі, дарэчы, была зьвязаная такая гісторыя. У нейкай мамчынай супрацоўніцы згарэў дом. А ў яе таксама дзеці малыя былі. Здаецца, трое. І мама прыйшла дахаты і кажа: “Вось, у тых дзетак нічога не засталося, трэба ім дапамагчы. Давайце аддамо ім цацкі”. Ну, мы спачатку назьбіралі тое, з чым самі не гуляліся. Але мама сказала — “не”. Вось туды і пайшлі наш конь-гушкалка, любімыя зайцы, мядзьведзікі. Нам, канечне, было шкада.
Я ня памятаю, каб мы падманвалі ў маленстве. Адзін раз было так: нейкая дзяўчынка ў клясе сказала, што я ў яе скрала пераводныя карцінкі. Я маме клялася, што ня брала, а яна крычала: “Калі гэта ты, я цябе заб’ю і сябе таксама!”. Калі потым высьветлілася, што гэта ня я, то мама вельмі добра зрабіла, мне спадабалася — перад усёй клясай гэтую дзяўчыну наганіла: “Як ты магла сваю сяброўку абгаварыць?!” А ўвогуле, мы не падманвалі, я такога ня памятаю. Цяпер, бывае, падманваем, калі ня хочацца бацькоў расстройваць. Неяк мы з Паўлам праводзілі маму на цягнік зь Менску. Ёй нешта падалося, што мы “ня так” выглядаем. І яна заплакала і пытаецца: “Павал, дзе твой швэдар?”. А Павал б’е сябе ў грудзі і кажа: “Тут!”. І мама паехала. А мы з Паўлам ідзём назад, і ён мне кажа: “Каб жа яна ведала, што і швэдра на мне няма”. Бацькі нас добра выхоўвалі. Усё, што ўва мне ёсьць добрага, гэта ад іх.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

УЛАДЗІМЕР ЦЭСЬЛЕР — мастак, сын вайскоўца і служачай з Слуцку

Уладзімер Цэсьлер

Згадкі пра дзяцінства

Я нарадзіўся ў Слуцку. Вуліца, на якой я гадаваўся, раней называлася Могілкаваю, а потым яе перайменавалі ў гонар нейкіх партызанаў, прычым герояў, здаецца, яшчэ савецка-польскай вайны. Таму ўсё маё дзяцінства прайшло на пагосьце — вялізных старадаўніх могілках, у цэнтры — польскіх, з краёў — праваслаўных і габрэйскіх. Лічыцца, што, калі ты бачыш нябожчыка, то гэта на шчасьце. А я іх назіраў па тры ў дзень. Памятаю, напрыклад, такі эпізод з “маленства на магілах”. Старэйшыя хлопцы, якія навучылі мяне граць у ножычкі, аднаго разу ўзялі мяне на Радаўніцу з сабой — дапіваць віно. Я тады вучыўся ў трэцяй клясе. Карацей, я напіўся і заснуў паміж магілаў. А тыя на мяне забыліся. Прачынаюся я ўначы на кладах... Але не збаяўся, бо добра ведаў “мясцовасьць”. Пайшоў дамоў. Вось такі памятны ўспамін.
У цэнтры могільніка зелянеў ставок, над ім схіляліся вербы, па якіх можна было пералазіць зь берага на бераг. Там мы і гулялі ў вайну.
Людзі вакол могілак жылі розныя. Сем’і таксама былі вельмі

розныя — шчасьлівыя й нешчасьлівыя. Цікава, што ў шчасьлівых сем'ях расьлі кепскія дзеці, а зь сем'яў алькаголікаў выходзілі добрыя дзеці. Кампанія была адна на ўсіх, усе гулялі ў ножычкі, старэйшыя вучылі красьці, хаваць ножыкі. І тым ня менш, ніякай пасьлядоўнасьці я не заўважыў: маўляў, дрэннае выхаваньне — дрэнныя дзеці. Неяк самі разабраліся. Хто сядзеў, а хто вывучыўся ў інстытуце.
Побач з могілкамі стаяў касьцёл. Потым ён згарыць, і мая бабуля скажа, што гэта камсамольцы яго падпалілі. А цераз два дамы жыў ксёндз. У двор да яго зьяжджаліся фурманкі, і мша правілася проста на двары. Я памятаю, ксёндз быў адзіным дэндзі на ўвесь горад Слуцак. Вось цікава! Ксёндз — дэндзі. Неяк я маленькі іду, спыніўся — конь стаіць. Я рукавічку зьняў, каня пакратаў — храпа цёпленькая. І я аддаў сіваму свой бутэрброд. Раптам чую ззаду: "Ты любіш коней?" — "Так". Гэта быў ксёндз. І ён адсыпаў мне з кішэні чакалядных цукерак. Дзецьмі мы гуляліся ў штандарты і гарадкі. Штандарты — гэта калі падкідаеш мячык, потым прызначаеш кагосьці, і ўсе разьбягаюца ў розныя бакі. Потым прызначаны павінен злавіць мяч і кінуць у іншага. Увогуле, шмат розных гульняў было. Усіх не пералічыш. Усе разам гуляліся. Дзяўчынак шкадавалі, дужа не ганялі. Памятаю, напрыклад, гульню, якая называлася "ў жопу". Кідалі мячыкі, і абавязкова трэба было трапіць ці ў задніцу, ці ў сьпіну. А там, дзе гулялі, гусі пасьліся во такія, дык пасьля гульні будуць ня толькі рукі, але і сам увесь у гусіным гаўне.

Мой бацька быў афіцэрам — Слуцак жа вайсковы горад, — а пасьля тут жа і асеў; маці ж была служачай. Так выйшла, што мае маці з бацькам разьвяліся, і маё выхаваньне ўзяла на сябе бабка, адыграўшы ў маім жыцьці самую вялікую ролю.
Яна нарадзілася ў Пагосьце Старобінскага раёну — цяпер, напэўна, Салігорскага. За царскім часам габрэі ня мелі права набываць зямлю, але бабулін дзед быў млынаром, а Старобін насялялі спрэс каталікі. Дык яны ўмовіліся, купілі на нечае імя зямлю і ўраблялі яе.
Паводле бабуліных словаў, жылі вельмі добра. Мелі шмат кароў, а птушкі ніхто не лічыў. Нават расказвала, што бывалі такія гады перавытворчасьці, калі, каб ня зьбіць цэнаў на прадукты сельскай гаспадаркі, яны закопвалі масла ў зямлю. Я

тады быў піянэрам, калі яна мне пра гэта гаварыла. “А чаму нельга было аддаць бедным?” — пытаўся яе. А яна кажа: “Дык дзе іх было ўзяць?” Гэта значыць, трэ было ехаць некуды, каб адшукаць тых бедных. У самім жа Старобіне ўсе добра жылі. Я пасьля паказаў бабулі нейкі стары часопіс з карцінкай “Чэскія сяляне ідуць на танцы”, 1910 год. Там усе — з матылькамі на шыі. “Во, — кажу, — як чэхі жылі”, а яна мне: “Дык і тут было тое самае”.

Яна добра ведала ідыш, дасканала, вельмі прыгожа гаварыла па-беларуску, ведала польскую. Гумарыстка была!.. Вакол бабці заўсёды зьбіраліся людзі. Я са школы прыходжу, а яна нешта гатуе, як заўсёды, і расказвае, а ўсе, хто там у яе на кухні, сьмяюцца.

Пайшлі мы неяк у краму садавіны-гародніны зь ёй. Паставіла яна мяне ў чаргу, а сама пайшла пахадзіць-паглядзець, што там. А там бульбу насыпаюць, дык і яна авоську запоўніла і на вагі паставіла. А ў краме страшна халодна. Пара ідзе з носу, батарэі, напэўна, паляцелі. І ціха-ціха. А сантэхнік з пагаслым недапалкам у роце гэтак марудна-марудна корпаецца з той батарэяй. Бабуля падыходзіць да яго і ціхесенька пытаецца: “Скажэце, гэта вы грэеце батарэю ці яна вас?” Гэта ў бабкі гумар такі быў.

Калі яна памерла, то яе на могілкі праводзіў вялізны натоўп. І я пачуў фразу: “Памерла жанчына, зь якой можна было пагутарыць”.

Яна нічога не баялася, вось у чым справа. Яна ніколі нідзе не працавала, была хатняй гаспадыняй, а казала такія рэчы… Пасьля вайны ў нас жыла нейкая цётка, мы здавалі — нават не здавалі, а аддавалі — пакой, бо многім людзям тады не было дзе прытуліцца. “Цётка — Варварай яе клікаць — прыйшла з працы і, чую, вые. (Гэта маці мне расказвае.) А баба прыйшла дамоў зусім стомленая: “Ну што ты зрабіла, што выеш?” — “Сталін памёр”. — “Гэта ж ня твой сын, што ж ты выеш?” — “А што ж цяпер будзе?” Бабка кажа: “Ну, адным бандытам менш”. Я спалохалася жудасна”, — маці кажа… Але ўсё абышлося.

Памятаю, выйграў я ўсесаюзны конкурс нейкага малюнку. Прыходзіць папера з гербам, загад на падарунак — ровар “Арлянё”. А мне тою парой так карцела займець ровар! Чую, бабка зь некім размаўляе: “Бандыты, ніякага “Арляняці” не

падораць, а дзіця будзе перажываць". І праўда — ніякага прызу ніхто не даслаў. Ну, разумніца!
У нас быў сад, добры сад, а форткі ніколі не замыкалі. І людзі, ідучы на могілкі, бачылі яблыкі і падыходзілі. Ніхто не пытаўся: "Можна купіць?" Толькі: "Можна ўзяць?" Заходзілі, бралі.
Памятаю таксама Вялікадні, гасьціны суседзяў. Да нас прыносяць яйкі-пісанкі, бабка ім мацу нясе, яны разам трушчаць усё гэта. Бабка намагалася трымацца рэлігійных сьвятаў, я часам у календары знаходзіў яе азнаку на сьвяты. А дзед камуністам быў, дык выкрэсьліваў, што яна пазначыць. Я бабці кажу: "А з кім мне жаніцца, калі я вырасту?" Яна мне: "Хоць на кітаянцы". Не любіла кітаянак.
Бабка гатавала, як у Брэдбэры. Я ніколі не разумеў, што яна робіць, каб выйшла вось настолькі смачна! І суседка Ніна Хадаровіч заўсёды глядзела: "Ханачка (бабулю звалі Хана), я ўсё зрабіла, што й ты, а ўсё адно ня тое, відаць, забыла штосьці". На што бабка казала: "Ай, ты забыла кавалачак сэрца, і ўсё". Я прыгадваю: яна з кухні не вылазіла. І струдэлі, і пячонасьці пякла. Зь нейкай такой цеплынёй да дзяцей.
А вось іншая згадка: мяне ў піянэры прынялі. Прыходжу дадому, а яна пячэ. Ну, я перад ёй з гальштукам шпацырую, а яна нават не глядзіць. Тады я падыходжу і кажу: "Бабуля, а мяне ў піянэры прынялі". А яна: "Ну дык што я магу зрабіць?" У яе быў выраз "зялёная сапля з чырвоным гальштукам". Гэта значыць — спалучэньне колеру і інтэлекту. Яшчэ яе вельмі раздражнялі мае аднаклясьніцы, якія насілі страшна кароткія спадніцы і танюткія панчошкі. Яна заўсёды перажывала: як гэта можна выстаўляць напаказ такія чырвоныя каленкі?
У мяне была яшчэ цётка Геня, якая жыла ў Варшаве, а потым пераехала ў Парыж. І ў яе былі два хлопчыкі. Аднаго звалі Вадзік, другога — Гелік. Гелік быў гадамі як я. І цётка часта прысылала з-за мяжы пасылкі. Памятаю, адзін раз у школе фізкультура была, кляса 4-ая ці 5-ая. І баба мяне адправіла ў белым касьцюме — беласьнежныя нагавіцы, ваўняны швэдар зь белымі гузічкамі, рукавічкі, шалік, шапачка. Так я выйшаў на фізкультуру коўзацца на лыжах. Мяне абсьмяялі, што я "ў кальсонах". Я сказаў бабці: "Я гэта болей не апрану".

Наша харчаваньне было вельмі разнастайным. Розьніца ў

параўнаньні з тым, што цяпер у сем'ях гатуюць, проста калясальная. Гатавалі гарбузы, бабы, якія вырошчвалі проста дома, фасолю, штосьці з кукурузы рабілі, ды бог ведама яшчэ што. Гара страваў, якіх я цяпер не сустракаю. У прынцыпе, з усяго, што расьце, гатавалася ежа. А цяпер — бульба ды мяса. А вось каб проста фасолю пабачыць, дык не... А боб? Гэта ж фантастычная ежа! Бабка прымушала мяне перабіраць яго па мяшэчках. А стравы з грыбамі? А боршч з кіслай капусты? А кілбаскі, для якіх купляліся гусіныя шыйкі, фаршаваліся гусінымі вантробкамі і мукой, зашываліся, смажыліся, потым укладаліся ў чыгунок, ставіліся ў печку і тушыліся? Дый бабку і дранікі бабуля гатавала такія, якіх я да гэтага часу болей нідзе не каштаваў. А зь белым сырам розныя блінцы!.. Добра жыць, калі ты ня думаеш пра тое, што ясі, мяркуючы, што так будзе заўжды.

Былі запрасілі мяне на дзень нараджэньня да адной дзяўчынкі. Мы гуляліся, і тут бабуля мяне кліча, пачынае апранаць. "Што такое? Мы гуляемся". — "У Каці дзень нараджэньня, ты павінен ісьці". — "Не хачу я". — "Не, гэта непрыгожа. Я вам сьпякла такі добры піражок". Гэта першая кляса была. Я з гэтым піражком у скрынцы з банцікам пацягнуўся ў госьці. Прыходжу, а там кажуць: "Ой, што так позна прыйшоў? У нас ужо і стол быў, і дзеці ўжо пагулялі". А я кажу: "Ну і добра", — і пабег назад з гэтым піражком.

У бабулінай мамы (што жыла ў Пагосьце) адняліся абедзьве нагі. І бабка казала, што тая паўзком усё вычышчае ў хаце. Такую чысьціню трымалі!

А ў майго дзеда ў целе сядзеў асколак з імпэрыялістычнай вайны. Пайшоў маладзенькі на фронт, і там у раёне Кёнігсбэргу немцы паланілі амаль паўмільёна расейскіх салдатаў. Немцы надзвычай кепска кармілі: кацёл грэчкі навараць, кінуць туды жывёльнага тлушчу, і ўсё. А ў каву дадавалі цукору. Дзед быў мэханікам. Увогуле ў ягонай сям'і ўсе залатыя рукі мелі. Дык з палону яго ўрэшце аддалі на завод у Франкфурце-на-Майне. Там у выходны дзень зламаўся станок. А абслугоўвалі той станок чацьвёра ваеннапалонных. І ўсё: мэханіка няма, завод спыніўся. Дзеду давялося разабраць увесь агрэгат, вычысьціць, адрамантаваць. На заўтра выклікае дзеда фабрыкант у свой белы мармурова-люстраны пакой з пальмамі, перад белы мармуровы стол, на стале цыгары, лікёр,

кава. Так і так, вы застаяцеся ў мяне працаваць. Пытаюся: “І чаму ж ты не застаўся?” А ён адказвае — а на халеру мне? Ён уцёк з палону. Купіў новы гарнітур, новы пашпарт, квіток на цягнік і ўцёк. Прыехаў — тут цікава, рэвалюцыя, усе пагалілі сабе вусы.

У нас у хаце нічога не забаранялася. У сувязі з гэтым прыгадваецца вось якая гісторыя. У мяне быў сябар Лёня Трасьцянецкі. Купілі мы зь ім папяросаў “ТТ”, накурыліся. Мая маці нас убачыла — нічога не сказала. Тое самае з показкамі. Я прыходзіў дадому і пераказваў показкі — як чуў, з матамі. І ўсе толькі сьмяяліся. А Гена, наш сусед, як распавёў такі анэкдот — дык сямейнікі так зьбілі яго, хадзіў зь сінякамі на твары.
Адзін раз, праўда, і мне дасталося. Мы, дзеці, хутка схоплівалі ўсе прымаўкі. Памятаю, абедаем, і ставяць талерку сьліваў. Я яе ўзяў адразу на сябе. Дзядуля сядзіць: “А мне?” А я яму: “У цябе нос у гаўне”. Ён як уваліць мне, памятаю, аж іскры з вачэй пасыпаліся, на ўсё жыцьцё запомніў.
Дзеду паліць забаранілі дактары, а бабці падабаўся тытунёвы дым, дык, калі хто-небудзь прыходзіў у госьці, яна заўсёды попельніцу ставіла правакацыйна, каб панюхаць дыму. А ў мяне жаданьня паліць не было. Я пачаў гэта рабіць толькі калі бабуля памерла, у 23 гады. А выпіваць... Аднойчы праводзіў сябра ў войска, і зранку, калі мяне будзілі а шостай уранку, каб ісьці на праводзіны, я ўпершыню ня змог устаць. Мне было так блага! Ну і сьмяяліся ж зь мяне! А лаяць ніхто моцна ня лаяў. Ці хацелася мне ў маленстве гуляцца са зброяй? Мне ў дзяцінстве ўвесь час хацелася мець аўтамат, сапраўдны. І мне падаравалі пісталет. Сапраўдны “Вальтэр” са зьбітым байком. Ён быў нікеляваны, маленькі, дамскі. Яго, пэўна, недзе бацька здабыў.
А пра сьмерць я ўпершыню падумаў у дзіцячым садку.
Я маленькім ня мог і да гэтай пары не магу спаць пры сьвятле. Так прывучаны: у мяне цяжкія фіранкі былі ў пакоі, дзе я спаў. Таму я ўдзень ня мог спаць у садку, проста ляжаў. Мяне прымушалі, і я ляжаў. Ляжаў гэтак аднойчы і раптам зразумеў, што такое сьмерць. Садок месьціўся ў нейкім былым фальварку, у старым палацыку з высокімі вокнамі, а за акном шумела старая ліпа. Я глядзеў на яе і раптам зразумеў, што я

памру. І пачаў плакаць. Да мяне падбеглі: “Што такое? Што такое?” — “Не скажу!” Якое гэта было ўзрушэньне!..
Адтуль жа, зь дзіцячага садка, да гэтага часу памятаю пах абхаскіх мандарынаў. Цяпер гішпанскіх, мараканскіх я есьці не магу. Цукеркі былі тады таксама смачнейшыя. Гэта стопрацэнтна! Цяпер жа іх есьці немагчыма! Раней іх рабілі больш сумленна. Вось толькі нядаўна я быў у Маскве і пакаштаваў “Бабаеўскіх”. Во гэта дык смак — проста дзяцінства.
Самая памятная хвароба майго маленства зьвязаная з каварствам. У нас хлопчык адзін быў, і аднойчы пасьля дажджу ён мне прапанаваў: “Ці зможаш ты прабегчы басанож па гэтых лужынах?” — “Змагу”. А ён, паскуда, набіў бутэлек, раскідаў па калюжах шкло. Я й распаласаваў нагу капітальна, ды так, што пайшло заражэньне крыві. Прыйшлося доўга праваляцца ў больніцы.
Разумны, здольны я рос, але не хацеў вучыцца. У школе як першы ўрок адседзелі, я пачаў лічыць, колькі ж мне гадкоў у яе хадзіць. За сем год я пражыў гіганцкае жыцьцё, а ў школе, аказваецца, трэба пражыць столькі ж і яшчэ столькі. Я заплакаў. Так мяне ламала.
А потым была мастацкая студыя, неблагая слуцкая студыя. Уладзімер Садзін вёў яе. Вучыліся ў ёй Басалыгі, Скрыпнічэнка, Вячаслаў Дубінка.
Я згубіў кантакт з хлопчыкам, зь якім зь дзіцячага садка да самай апошняй клясы школы правучыўся — Валерам Брачнікам. Ня ведаю, што зь ім. Таленавіты быў хлопец: калі яму было 16 гадоў, ён у Смыслова выйграў у шахматы па перапісцы і атрымаў першы грасмайстарскі бал. Апошні раз я меў ад яго вестачку, калі служыў у войску. Тады я раптам атрымаў ад яго ліст з Хабараўску. У гэтага хлопца над галавой заўсёды вісела шахматная дошка. Калі я пытаўся: “Навошта?” — ён заўсёды рагатаў. Я казаў: “А што там у ёй такое?” — “Ты што, ня бачыш? Там клеткі пераблытаныя. Тут мае быць белая, а замест яе — чорная”. Такі быў мой антипод. Высокі... Нейкі час ён вучыўся ў Суворaўскай вучэльні (ягоны бацька загінуў), потым вярнуўся ў школу.
У дзяцінстве я лічыў, што Слуцак — вялікі горад. А вырас... Нічога падобнага. Гэта быў маленькі дагледжаны горад, дзе не было асфальту, а ўсюды пясочак, бялёныя цаглінкі, брукаванка.

Усё патанала ў кветках, прычым такіх пахкіх… У парку заўсёды граў духавы аркестар. Мужчыны гулялі ў белых нагавіцах, жанчыны — у пальчатках, вуалях... Вакол гораду разьмяшчаліся шматлікія вайсковыя гарадкі, афіцэры тады несьлі культуру, цывілізацыю. Цяпер бачыш афіцэра — ён альбо п’яніца, альбо хтосьці такі… А раней — падцягнуты чалавек. Канцэрты давалі ў Слуцку, прывозілі атракцыёны. А цяпер я зьезьдзіў і не пазнаў гораду…

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002

ІРЫНА ШАБЛОЎСКАЯ — прафэсарка Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту

Ірына Шаблоўская

Згадкі пра дзяцінства

Я нарадзілася ў 1939 годзе ў раддоме на Валадарцы. Там жа я потым нараджала сваіх дзяцей. Доктар сказаў: тут усе не сьпяшаюцца выйсьці на сьвет, бо з аднаго боку — турма, з другога — КДБ, а дзеці кемлівыя.

Мы з братам былі дзеці вайны і наеліся ліха поўнай лыжкай. У нас не было шмат цацак і лялек. Магчыма, таму самы востры ўспамін майго дзяцінства — першая лялька. Яе пашыла мама. Яна была добрая швачка і ў іншых умовах стала б на чале ўласнага Дому мадэляў, бо пераняла майстэрства ад жанчыны, якая вучылася ў Варшаве. Маці шыла ўсё жыцьцё, бо ёй даводзілася гадаваць мяне і майго брата адной — была вайна і дзеці расьлі без бацькоў. Пасьля, калі вайна скончылася, генэралы, палкоўнікі навезьлі з Германіі ўсяго, і іхныя жонкі прыносілі да мамы перашываць шыкоўныя строі з чужых плячэй або шылі нешта новае з адрэзаў. Я хадзіла апранутая, як мадэлька, бо мама шыла мне сукеначкі з акрайкаў, што заставаліся ад тканіны кліентак. Але маміна лялька была яе шэдэўрам: валасы зь нітак, шыкоўная сукенка, гузічкі. Што там

тыя Барбі! І вось я паехала да бабулі ў вёску Гуту, што пад Ракавам. У Гуце некалі аўстрыйцы пабудавалі шклозавод — адсюль і назва. Там пасябравала зь дзецьмі. Усе былі сіроты, бацькоў не было. Адна дзяўчынка была круглаю сіратою і жыла з бабуляй у галечы. Штодня я гулялася са сваёй лялькай на вачох у гэтай дзяўчынкі, а па вечарах клала ляльку ў бабулін куфар, дзе ляжалі самыя прыгожыя і дарагія рэчы ў доме. І аднойчы я не знайшла лялькі ні ў куфры, ні ў ложку, ні пад печчу, ні за печчу. Сяджу, плачу. Бабуля ўправілася па гаспадарцы, узяла мяне за руку і павяла. Яна ведала, што робіць. Прыйшлі мы да тае хацінкі, дзе жыла бедная дзяўчынка. Мая бабуля пашапталася зь ейнай — і тая нешта сказала дзяўчынцы, якая стаяла, апусьціўшы галаву, а пасьля пайшла да свайго куфра. Калі яна адчыніла яго, я ўбачыла, што там, як найвялікшая каштоўнасьць, на купе розных апратак ляжыць мая лялька. Я забрала ляльку бяз словаў і сышла. А цяпер мне вельмі шкада гэтай дзяўчынкі...
Цацкі тады ня ў краме куплялі. Іх звычайна рабілі дзяды і бацькі. Але мужчын у вёсцы Гута даўно не было. Калі няма бацькоў і дзядоў, няма нейкай заслоны перад вечнасьцю. Маіх дзядоў арыштавалі яшчэ да майго нараджэньня.

Недалёка ад Гуты праходзіла савецка-польская мяжа, і вёска нашая была ў памежнай зоне. Я часта згадваю выдатны французскі фільм “Закон ёсьць закон” зь Люі дэ Фюнэсам, дзе мяжа праходзіла празь вёску і палавініла хату. З Гутай было нешта падобнае. Палова сваякоў, палова магіл засталіся за мяжой, і хлопцы часта хадзілі туды. А Саветы гэта расцэньвалі як шпіянаж. Пасадзіць іх было лёгка. У 1994 годзе я напісала ў КДБ, каб даведацца, як быў забіты мой дзед, Язэп Карлавіч Садоўскі, 1885 году нараджэньня. (Калі НКВДысты яго арыштавалі, то забралі і ўсе ягоныя 24 фатаздымкі.) Мне ветліва адказалі, што ёсьць папера: “*Садовский И.К. арестован за то, что являлся агентом польской разведки*”. Дзед, які быў проста вартаўніком калгасу “Зара камунізму”, займаўся шпіянажам! А дзе ягоныя здымкі? Мабыць, іх камісары проста выкінулі па дарозе. Гэты казуістычны загад — канфіскоўваць фатаздымкі, які тонкі інтэлектуальны ход! — быў аддадзены некім зьверху, хутчэй за ўсё, з імпэрскай сталіцы. Забраць фатаздымкі — значыць, зусім сьцерці памяць. Двойчы забіць

чалавека.
Саветы параскідалі шмат гнёздаў. Вакол Гуты было многа хутароў — вялізныя дамы, дзе жылі сялянскія роды. Сьветлыя, сонечныя дамы пад высачэзнымі ліпамі, над якімі лёталі пчолы. На ліпах — высокія лятучыя арэлі, і дзеці з усяе ваколіцы сыходзіліся да тых арэляў. Людзі былі добрыя, усьмешлівыя. Жылі нармальным жыцьцём, пакуль іхныя дамы і лёсы не пусьцілі па ветры. Пазабіралі мужчын, засталіся адныя жанчыны. А адразу як пачалася вайна, павымярзалі і велізарныя гутаўскія сады.
У 1937-м, якраз калі забралі майго дзеда, добра ўрадзілі вішні і яблыкі. Мой брат, старэйшы за мяне на шэсьць год, памятае дзеда: той нясе два цэбры з малаком, і брат малы ўчапіўся ў адзін цэбар. Такі ў яго застаўся ўспамін...
У майго дзеда было 12 дзяцей. Жыла вялізная сям'я ў сваім доме. Есьці хапала, яшчэ і на продаж вазілі, на кірмаш. Дом быў не такі ўжо шыкоўны, палова была з драўлянай падлогай, палова — зь земляной. Брат расказваў, як бабуля зь дзедам зьбіраліся на кірмаш, абодва любілі прычапурыцца. Ён падкручваў вусы, боты ваксаваў, бабуля надзявала пышную спадніцу, сьвяточную хустку. І тут дзед казаў бабулі: я буду гандляваць, а ты сядзі і маўчы — бо ён не любіў прывозіць тавар з кірмашу назад. Ён зьніжаў цану, а калі пакупнік яму падабаўся, то мог аддаць і задарма. І бабуля не пярэчыла. Яна таксама была добрая жанчына. У тым пакаленьні амаль усе людзі былі добрыя, некрыклівыя. Гэта потым ужо жыцьцё папсавала: людзі імкнуліся выжыць у цяжкіх умовах і рабіліся трошкі нелюдзямі.
Дзеда з бацькавага боку таксама забралі. Я ў 1994-м не пасьпела другі запыт напісаць, а цяпер чакаю.

Бацька быў старшынём сельсавету паблізу Гуты. А потым, калі пачалі арыштоўваць "ворагаў народу" і ён пабачыў, каго бяруць, — вырашыў кінуць пасаду і ўцякаць. Забраў жонку, сына (мяне яшчэ не было) і паехаў у Менск. Там працаваў сьлесарам (у яго былі цудоўныя рукі), шафёрам. Кожныя два-тры месяцы яго выклікалі на зборы, і мая маці ўсё часьцей заставалася зь дзецьмі адна. Помню: тата сядзіць і цалуе мне ўсе пальчыкі на ручках... (Ой, ня думала, што мне будзе так цяжка гэта згадваць!)

Каб не пазабівалі нашых дзядоў і бацькоў, Беларусь была б іншая. Разам зь імі зьнішчылі дух Беларусі. Бо забівалі ж найлепшых — моцных і разумных, хто ня верыў ува ўсю гэтую хлусьню. Цётка Лёля мая згадвала: зьбяруць іх усіх у калгасе і расказваюць, як у Польшчы кепска, як там бацька сына прадаў. Потым ідзе яна са сваім дзедам са сходу, а той ёй шэпча: “Ты ня слухай, дзетка, лухта ўсё гэта!” А калі іх усіх вынішчылі, не было каму такое дзецям сказаць.
Пасьля вайны мая маці засталася зусім адна. На бацьку прыйшлі тры ці чатыры “пахаронкі”, потым зьявіўся нейкі вайсковец і расказаў маме, як загінуў бацька. І яна выйшла замуж другі раз — за мужчыну-інваліда, які страціў усю сваю сям’ю: баялася, што дзяцей адна не падыме. А бацька ўсю вайну правёў у палоне, у канцэнтрацыйным лягеры. Выжыў толькі дзякуючы сваім залатым рукам. Калі ён вярнуўся, была драма для ўсіх. Але яны вырашылі пакінуць усё так, як ёсьць.
Мая маці была незвычайная жанчына. Бацька да вайны ўвесь час на зборах, а яна зь дзецьмі вандруе з кватэры на кватэру. Жылі мы і на Мясьнікова, і на Розы Люксэмбург, у старым Менску, толькі назвы вуліц былі іншыя, новыя. (Я мару сабраць клюб са старых і малых, каб вандраваць па горадзе і вывучаць ягоныя былыя назвы.) Суседнічалі з габрэямі. Мама іх любіла. Жанчыны былі цудоўныя — кампанейскія, дзяліліся рэцэптамі, заўсёды за дзецьмі прыглядалі. Калі немцы загналі іх у гета, мая маці хадзіла да іх, насіла вараную бульбу, іншую ежу і карміла. Яна нашывала сабе на сукенку жоўтую зорку. Вось якая была сьмелая. Потым маці хавала ў нашым пограбе габрэйскую дзяўчынку Раю з Быхава. Потым нехта данёс — і немцы Раю забралі, але маці яна ня выдала.
Увесь час жылі і чакалі няшчасьця. Як сказаў на сваім вечары Андрэй Макаёнак (я вельмі паважала Андрэя Ягоравіча): “Едзеш на кані, і тут выскачыць табе пад ногі рабенькі парсючок, і ты звалішся з каня!” Мы выжылі толькі дзякуючы маме. Адна ў ліхалецьце ў нейкіх таварняках езьдзіла па мястэчках і вёсках і прадавала або выменьвала пашытае на ежу. О, мы яшчэ гэтай вайны ня ведаем. Слушна кажа геній нашай зямлі Быкаў: праўду пра вайну ведае толькі народ.

Адразу пасьля вайны жылі мы ля чыгункі, дзе цяпер Тэатар музычнай камэдыі. Там ёсьць малы жоўты будынак — былое

памяшканьне мікрабіялягічнага інстытуту, а там, дзе цяпер вялікія дрэвы, якія мы саджалі з братам, ляпіліся баракі. Іх было вельмі многа, і ў адным зь іх жылі мы.
Маці любіла сваю справу і была ў ёй артысткаю. А ў мяне быў іржавы цацачны прасік, і аднойчы я ім “папрасавала” адрэз дарагога крэпдэшыну — гэта было ўжо пасьля вайны. Дык нават за тую сапсаваную тканіну мама ня ганіла мяне. Яна ўвогуле не сварылася, калі дзеці рабілі шкоду не наўмысна. Такая была і бабуля: калі я аднойчы ў Гуце не зачыніла куранятаў і яны ўсе патанулі ў цэбры, бабуля мне ані слова не сказала. Ня тое што цяпер: бацькі на дзяцей крычаць, настаўнікі крычаць… Сёньняшняя пэдагогіка не заснаваная на любові да дзяцей.
Так і праходзіла маё маленства ў дзьвюх прасторах: Менск і Гута. У Гуце былі свае вар’яты, свае закаханыя, свае забойцы. І калі я чытаю “Койданаўцаў” Адама Глёбуса, я яму страшна ўдзячная, бо такі твор можна было б напісаць і пра Гуту. Там жыцьцё было сьвятам: Каляды з валачобнікамі і казою, Вялікдзень, калі качалі яйкі, вячоркі з танцамі да ўпаду. Але самае сонечнае сьвята — Сёмуха. Хаты ўпрыгожваліся зелянінаю, а ў лесе на вялізнай патэльні для ўсіх смажылася вялізная яечня… Потым у нашай генэрацыі проста скралі сонца. Ува ўсіх савецкіх людзей шмат што скралі. Асабліва горка чалавек перажывае страту асабістай прасторы. Тады былі дамы і зямля, сем’і, роды жылі ў сваёй прасторы. А цяпер людзі сьціснутыя, сагнаныя разам.
Я помню: на нашай вуліцы, калі прыходзіў хтосьці з вайны, то склікаў дзяцей з усяе вуліцы і частаваў пасьляваеннымі смачнотамі: ліманадам і цукеркамі. Якія гэта былі сьвяты!
А на нашай менскай вуліцы ў маё дзяцінства яшчэ цякла Нямiга. Гэта быў ручай, абапал якога расьлі высокія дрэвы. Туды спускалі ваду, якой мылі паравозы, таму ён быў вельмі сьмярдзючы. Мы, дзеці, скакалі цераз ручай, і я неяк туды ўвалілася — доўга не магла адмыцца ад бруду і паравознага масла. Наагул увесь сьветлавы дзень мы лёталі па двары, гулялі ў лапту, скакалі цераз вяровачкі, расказвалі розныя жахлівыя гісторыі... У бараку няўтульна, месца мала, усе свае ўрокі я рабіла на маленькай этажэрачцы. Таму, відаць, я так люблю старадаўняе дойлідзтва, бываць у Вільні, Празе, а адно з самых моцных уражаньняў дзяцінства — Нясьвіскі замак. Не,

нас не вазілі тады на экскурсіі, я многа хварэла і адну зіму правучылася ў Нясвіжы, у так званай Лясной школе. Памятаю, як мы лёталі па ваколіцах, зазіралі ў сутарэньні, дзе былі труны... І ніхто не распавёў пра сівую даўніну. Так, як і ў школе, вельмі добрай, сёньня б сказалі — элітнай (хаця ў нармальнай краіне ўсе школы павінны быць элітнымі дзеля будучыні нацыі), не распавядалі нам пра Скарыну, толькі пра Івана Фёдарава... Усё далейшае жыцьцё ёсьць пераадольваньнем непісьменнасьці, так бы мовіць…

Вучылася я ў школе № 12 на вуліцы Мясьнікова. Гэта была жаночая школа, але ў старэйшых клясах нас аб'ядналі з мужчынскай. Ангельскую мову, да слова, мы вывучалі з трэцяй клясы. Пра піянэрскі лягер у мяне добрых уражаньняў не засталося. Я не любіла калектыўнага побыту і адсутнасьці элемэнтарнай гігіены. Аднойчы я прывезла зь лягеру адначасна сьвінку і вошы. Мама ледзь адхадзіла мяне.
Непадалёк ад нашага дому стаяла на ўзгорку драўляная царква. Гэта было, па-мойму, на цяперашнім пляцы Багушэвіча. Там адпявалі нябожчыкаў. І гэта таксама адно з наймацнейшых уражаньняў майго жыцьця. Аднойчы адпявалі вельмі маладзенькую дачку сьвятара, ва ўбраньні маладой. А вакол яе твару круцілася вялікая муха. Памятую нейкую жанчыну, што памерла ад аборту. Тады гэта было забаронена, і многа жанчын паміралі ад падпольных абортаў. Я дасюль памятаю, як ляжала яна ў труне зь ненатуральна складзенымі адна на адну нагамі. Так і цяпер стаіць уваччу.
Чужога я ня брала за ўсё жыцьцё. А вось мой брат аднойчы прынёс карткі хлебныя дамоў. Сказаў, што знайшоў, але мама яго ўсё роўна адлупцавала. Можа, і сапраўды ён іх знайшоў. Яму, беднаму, часта перападала, бо вельмі ж быў непаседлівы, а ў акупаваным горадзе забіралі хлопцаў у Нямеччыну, вось матуля і берагла яго, як магла.
Мой брат памёр два гады таму. Шкада, што я не запісала ягоных аповедаў пра ваенны Менск. Ён быў малым хлапчуком, калі пабачыў, што на дрэвах пасьля бамбёжкі вісяць часткі целаў дзяцей і жанчын, каптурыкі. Такія жахлівыя "ўпрыгожаньні" былі па ўсім Менску — бамбілі і "нашы", і "немцы". У Антона Адамовіча ёсьць цудоўны твор "Каханы горад", які мы яшчэ не асэнсавалі. Там расповед вядзецца ад

імя чалавека, які ляціць бамбіць Менск: забі сто сваіх — затое хоць адзін вораг загіне! А потым, пасьля вайны, мы аказаліся вінаватыя: навошта жылі пад акупацыяй? Мая маці ў камэндатуры прышывала гузікі, дык што, яна пасобніца акупантаў? А чаму ж нас не эвакуявалі зь Менску? Усё высокае начальства паўцякала: вывозілі сем'і, фікусы, піяніны, скарб усялякі. І ў Менск вярнуліся з тымі фікусамі і піянінамі. А мы елі хлеб з гарэлай мукі (разбамбілі хлебазавод у Хлебным завулку, што за цяперашнім гандлёвым домам на Нямізе). Я і цяпер помню пах таго хлеба.
Не, ніхто не кампэнсуе бязбацькавага і бяздомнага дзяцінства беларускіх дзяцей ваеннага пакаленьня.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Аляксей Бацюкоў

Дворык пад нямецкім домам

Замест апавяданьня

У 60-я гады “Хімвалакно” ў Магілёве будавалі немцы. Іх расьсялялі ў трох пяціпавярховіках, адмыслова пераробленых пад гасьціницы. З часам немцаў стала менш, гасьціницай пакінулі толькі адзін дом, у двух астатніх пасялілі супрацоўнікаў заводу, у тым ліку маю маці.

80-я гады. Савецкі дворык — мы гуляем, дарослыя з засяроджанымі тварамі пазіраюць на нас, праходзячы міма. Нарэшце чаканы крык праз фортку: “Лёша, Лёшычак, ужо восем пятнаццаць!” Я даўно ўжо павінен вячэраць, але ў дрогкім паўзмроку яшчэ добра відаць і пясочніца, і машынкі, і нават твар Ганькі Сямёнавай. Прыхаваныя сутоньнем хлопчыкі нагадваюць хутчэй цені продкаў, але адчайна працягваюць гуляць.

Штозіму — хакей на аўтамабільнай пляцоўцы, ды часам — паміж самімі аўтамабілямі. Да дзесяці-дванаццаці гадоў — з прамой шэрай клюшкай, што так ніколі й не зламалася, пасьля, здаецца, зь літоўскай. Лаянка, рукі ў парваных пальчатках здубелі. Падножка ззаду — зорка нашага дворыку Сяргей

Гацэнка ўсьміхаецца, паказваючы, што я мушу не зьвяртаць на гэта ўвагі. Некалькі ўдараў хваравітага маленькага цела аб вострыя кулакі старэйшага на два гады Сяргея (ён і ў нейкую сэкцыю ходзіць). Ад хакейнае пляцоўкі да пад'езду — крыкі "дурань" і сьлёзы, потым роспыты маці і бацькі: хто цябе пакрыўдзіў? Бацька страшнейшы за маці, нарэшце прыводзяць спалоханага Сяргея. "Ты яго біў?" — "А ён матам на мяне казаў!" Ад такога нечаканага павароту ня маеш нічога сходу сказаць, і Сяргея адпускаюць. "А ён першы палез!" — "Ну што ж ты адразу не сказаў?" — маці і супакойвае мяне, і ня радая, што я лаюся матам.

Нямецкі дом заўсёды насупраць.
Аднойчы, на самым пачатку эпохі гумак і відзікаў, немка выйшла на свой трэці балькон, агледзела нас на арэлях і, выразна махнуўшы рукой, кінула нам "Wrigley's spearmint". Дзяніс Лабадаеў і Вова Б. кінуліся, ірвалі доўгі бялявы пачак адзін у другога з рук, урэшце Вова псіхануў і зьбег, а пераможца вярнуўся да нас. Грэблівае "падбіраеш" плюс лёгкая зайздрасьць — і пад шчыльным ціскам Дзяніс ідзе класьці гумкі на месца, толькі крыху пакаштаваўшы. Але немкі ўжо няма, мы толькі пагардліва пазіраем на пусты балькон. Назаўтра Вова жуе гумку ("...хадзіў з братам, знайшлі...") і паказвае нам яе белае сьлізкае цельца скрозь зубы.
"А вы знаеце, немцы фатаграфіруюць такімі інфракраснымі лучамі, што ўся адзежда прасьвечваецца, і выходзяць голыя!"
"А-а-а!" — немцы выйшлі на балькон курыць, мы заўважаем штосьці ў іхных руках — і ўвесь двор хаваецца за вялікую таполю ці стараецца хаця б павярнуцца задам.
Разам зь сябрам Пашам і яшчэ двума хлопчыкамі з клясы, Алегам М. і Дзянісам К., сустракаем некалькі нямецкіх дзяцей нашага веку, але спакайнейшых за нас. Запомніўся Ян, ён навучаў нас казаць "я" і "найн". Зь ім я спрабую гуляць у сілавыя гульні, каб паказаць сваю перавагу, — адчуваючы адказнасьць перад усім Савецкім Саюзам. Ян ухіляецца, праводзіць у свой двор. Дзяніс просіць у яго "інастранных" цукерак, той крычыць пра гэта сваёй маці, і яна частуе нас маленькімі рознакаляровымі мішкамі. Назаўтра ў школе паказваю пару японскіх манэт — мая маці працавала тады зь

японцамі. Алег і Дзяніс кажуць, каб я падарыў адну манэту ім. Адмаўляю, і Алег падымае руку. Мая першая настаўніца, Ганна Георгіеўна, уважліва слухае: “А Лёша Бацюкоў учора з Пашам Бубновым выпрошвалі ў немцаў цукеркі...”. Сорак адна хвіліна ганьбы, сьлёз, грэблівых і спалоханых позіркаў. Нам ніхто не паверыў.

Да ночы гуляем у “пекара” і заўважаем нізенькую п’яную жанчыну пад вокнамі рэстарану нямецкага дому. Яна хістаецца, грукае ў шкло, перашкаджаючы нам гуляць, просіць кагосьці, каб яе ўпусьцілі. Прыстае да нас, каб мы папрасілі сваіх бацькоў дапамагчы ёй, але спачуваньня ад нас не дачакаецца. На новае слова “прастытутка”, кінутае Сяргеем Гацэнкам, рэагуе бурна, але Сяргей спрытна адбівае ўсе яе ўдары нагамі. Хутка яе адводзяць старэйшыя хлопчыкі з нашага двара.

Нягледзячы на такое блізкае суседзтва зь немцамі, эўрапейская музыка прыйшла ў наш дом бязь іх дапамогі. У адно лета сястра майго сябра Валеры ўзяла напракат прайгравальнік і кружэлку “Europe” зь іхным найлепшым гітом. Гітара, ці што там, раўла на ўсю вуліцу Шміта, і, як толькі сканчаўся першы пройгрыш, Валера бег да акна і крычаў: “Таня! Пастаў снова!”.

Неяк прызвычаіліся сядзець да ночы з Пашам С. і Ганькай Сямёнавай на арэлях, нават гадзіны да адзінаццатай. На трэці дзень такіх сустрэч, адразу пасьля майго сыходу дамоў (“Лёшычак!..”) у двары зьяўляецца легкавік, перасьледуе Аню да яе пад’езду і потым Пашу С. да ягонага дому, прычым маўклівы кіроўца нават спрабуе дагнаць Пашу ў пад’езьдзе. Узважваем на слых новае слова — “маньяк”.

Пачатак 90-х, першыя дэмакратычныя выбары мэра гораду. Перамагае наш сусед зь першага пад’езду Габрусеў. Нядаўна даведаўся ад Васількова, што ён быў свайго роду настаўнікам Лукашэнкі саўгаснага пэрыяду. Раніцой другога дня пасьля

перамогі на выбарах Габрусеў выходзіць з пад'езду, і мы ўсе, хто толькі сядзеў на лаўцы, хорам вітаемся зь ім. Праз пару гадоў ён незаконна выдзеліць кватэру для свайго сына і са скандалам вылеціць.

Патрыятызм у мяне ўваходзіў зь відам на гэты дворык — неяк аднойчы на кухні маці сказала, што, маўляў, цяпер давайце раз на тыдзень гаварыць дома па-беларуску. Мы зь сястрой цяжка варушым купалаўска-коласаўскім словам, бацька нечакана хоча спаць, маці ўрэшце пераходзіць на давыд-гарадоцкую гаворку свайго дзяцінства.
Іншы ўрок патрыятызму — штомесяц, атрымаўшы пэнсію на хворую дачку, суседка-алькагалічка напіваецца, прыходзіць пад пад'езд і раве на ўвесь двор добрым басам: "Я люблю сваю родзіну! Сацыялісьцічэскую! Камунісьцічэскую! Родзіну!" Кожны мінак падазраецца ў здрадзе ідэалам і атрымоўвае ў плечы крык "Сука!".

У 2002-м, ужо не жывучы ў сваім доме, пачынаю разумець яго важнае стратэгічнае значэньне. Ходзяць чуткі, што ў нямецкім доме можа спыніцца Лукашэнка падчас летняга наведаньня Магілёва, як ён рабіў гэта ўжо аднойчы. Так што не зьдзіўляе, што ЖЭК вырашыў зрабіць наш дом домам "высокай культуры побыту". Пафарбавалі арэлі, пасадзілі клюмбы замест кустоўя, кладуць новы асфальт. Двор цяпер чысты, прыгожы, праўда, амаль безь дзяцей.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**

[image]

Ева Вежнавец

Ня варта азірацца

Даруйце, што забіраю ваш час,
апавядаючы пра незнаёмае вам дзіця.

Шэрая хатка

Я нарадзілася ў малой хаціне, у страшна глухой вёсцы. Першыя пяць гадоў жыла з бабкаю. Бацькі працавалі далёка. На той час (1970-я) нашай хаце было ўжо больш за паўстагодзьдзя, яна была нефарбаваная, з шэрага дрэва. Потым мы яе спалілі ў катле нашай трэцяе хаты — двухпавярховага прасторнага катэджу, акружанага садам. А шэрая хатка была ня нашая. У яе пераехала бабка з братамі, калі памёр мой прадзед Іван. Той Іван быў багаты хутаранін, меў вялізную гаспадарку, але потым яму заманулася ўлады, ён дастаў ад Саветаў наган ды мандат і гэтым наганам загнаў у Сібір мноства сем’яў разам зь дзеткамі. Скляпаў у вёсцы калгас. За гэта ягоную сям’ю пасялілі ў маёнтак паноў Зубрыцкіх, дзе адных вокнаў, кажа бабка, было 18 штук. Пакуль Іван поначы гойсаў па раскулачваньнях ды разьвёрстках, да глухога маёнтку падыходзілі ваўкі і, паставіўшы лапы на нізкія францускія вокны, прагна разглядалі ягоных жонку й дзяцей. А вось “ворагі народу”

замаху на Івана ды ягоную сям'ю не зрабілі ні разу. Іван памёр сам, заўчасна і вельмі павучальна. Пакляпаў касу і пайшоў касіць на чужы палетак (гаспадары парылі косткі на Салаўкох). Там у яго здарыўся разрыў сэрца (у 40 гадоў). Ніхто не пайшоў на магілу "пустадомка", яму нават крыжа ня ставілі — так моўчкі пастанавіла вёска. Жонка ягоная (другая, бо першая даўно памерла), кінула маю бабку, тады 14-гадовую, з двума малымі братамі ў маёнтку Зубрыцкіх. Адтуль іх забраў калгасны старшыня і выдзеліў ім шэрую хатку-падсьлепаватку. Чаму я пачала здалёк? Бо гісторыя маёй сям'і і была маім раньнім дзяцінствам. Бабка, лушчачы на прызьбе квасолі, плетучы на прутках шкарпэткі, прадучы воўну, катаючы бялізну, цягаючы чыгуны зь печы, расказвала пра наш род і пра наш Сусьвет. На бабіну думку, увесь сьвет быў заселены дробнымі й малымі ворагамі, якія жадалі мне зла. Мне было лёгка паверыць у гэта. Хата нашая была канцавая, ад астатніх дамкоў яе аддзяляў густы рабінавы гаёк. У нас была толькі адна суседка — тоўстая Надзя, у якой адняліся ногі. Яна поўзала па сядзібе на карачках, уся ў чорным, страшная, як жук-гнаявік. Вёска зьненавідзела яе за тое, што падчас блякады яна кінула недзе ў балоце сваіх двайнят-немаўлят. "Праз гэта ў яе й адняліся ногі", — гаварылі людзі. Такім чынам, я жыла ў варожым атачэньні: з аднаго боку — рабінава-крапіўныя джунглі, што аж роіліся катамі й вераб'ямі, з другога — страшная Надзя, з трэцяга — вуліца й хата Костуся Жура, героя апошняй вайны, які нават у хлеў хадзіў пры ардэнох. Костусь мо й праўда быў герой і добры чалавек, але я баялася яго: пабачыўшы мяне, ён даставаў з рота сківіцу й палохаў. Я, як ні намагалася, адказаць яму тым жа — спалохаць яго — не магла. І нарэшце, з чацьвертага боку нашае сядзібы — на загуменьні — стаяла нядзейная старая кузьня, чорная, закурэлая наскрозь, запханая павутой і старым жалезьзем. Там жыў шашок. Нам, цеплакроўным, ня варта спрабаваць зразумець ці ўявіць шашка. Шашок непрадказальны, у ім няма крыві, душы ці розуму. А ёсьць адно жаданьне нашкодзіць. Ён нараджаецца ад гнілі й грахоў. Шашок лазіў да нас у сенцы, спаў у нашай муцэ, пакідаючы хвастатыя адбіткі й чорную поўсьць, уночы з грукатам скідаў зь цьвікоў на гарышчы цыбульныя вязанкі, жор паляндвіцу, тупатаў у падпольлі і выў у коміне, краў грошы й пацеркі з бабуліных схованак. Адгрызаў галовы курам.

Выварочваў малако. Бабуля вяла зь ім несьціханую вайну й помніла яму кожны ўчынак. І я, і мама, калі прыяжджала на пабыўку, выслухоўвалі скаргі на шашка. Бабцы не ўдалося давесьці маме, што тхор існуе. Мама вінаваціла катоў і птушак. Але мне ніхто ня здолеў давесьці, што шашка няма. Неяк бацькі нарэшце сьцямілі, што я расту букаю, баюся вылезьці за брамку, пакінулі далёкую працу ды забралі мяне. Было, аднак, ужо позна. Я звыклася лічыць навакольны сьвет котлішчам жахаў. І нават цяпер вельмі млява й мала змагаюся з шашкамі ў маёй галаве.

“Хмарачос”

Мы з татам і мамай перасяліліся ў іншую вёску. Гэта была ўрбанізаваная вёска: асфальтаваныя дарогі, лятарні, двухпавярховыя шматсямейныя дамы-”шанхаі”, тры крамы, школа, бібліятэка, больнічка, пошта й двое могілак. Мы атрымалі трохпакаёўку на другім паверсе. Наш цагляны шанхай быў як тры шэрыя хаткі, пастаўленыя адна на адну. Я ганарылася нашым хмарачосам і плакала, калі менская кузынка Ядзя сказала, што гэта маленькі дамок, а вось яна дык жыве ў вялізным гмаху. Наш хмарачос так і застаўся ў маёй памяці недасяжным. Лятучыя талеркі, бадмінтонавыя валяны й малыя мячыкі ня скочваліся, як з двусхільных дахаў, а заставаліся на хмарачосе назаўжды. Думаю, яны й цяпер ляжаць там, выцьвілыя ад сонца й дажджу. Мэтраў за 50 ад хмарачосу былі хлявы, куды гаспадыні цягалі вёдры паранкі для сьвіньняў і курэй; мэтраў за 200 — бульбяны “пограб”. Лёх я па звычцы хуценька зьненавідзела. Мне было важна ненавідзець які-небудзь бок сьвету і не хадзіць туды. Я ненавідзела пограб за цемру й макрыц, за мышыныя гнёзды, за гнілыя анучы, каравыя мяхі, гумовыя боты, холад і бульбу. Да самай студэнтчыны я ня ела бульбы.

У такім хмарачосе нарадзіўся мой брат, і бацькі ўпрасілі бабку пераехаць да нас. Самі яны любілі працаваць, не маглі сядзець дома зь дзецьмі. У хмарачосе бабчын шашок аб’явіўся толькі аднойчы. Бабка закруціла чатыры дваццацьпяткі ў насоўку і прышпіліла за накоўдранік. У суботу вынесла выбіваць коўдру, і скрутачак адарваўся ды ўпаў пад таполі. Насоўку з грашыма падняла мая маці. Вечарам яна радасна абвесьціла сямейнікам пра знаходку. Усе павіншавалі яе, і бабка таксама. Мама

павесіла аб’явы каля клюбу, пошты й крамаў, каб уладальнік зьявіўся па сваю страту. Мы чакалі некалькі дзён, ніхто не зьявіўся. Мама набыла за сотку дзьве тахты. Бабка дзеля перасяленьня на новы выгодны ложак пачала мяняць пасьцельнае хусьце. Празь некалікі хвіляў у кватэры пачуўся крык і кляцьба. Бабка плакала й кляла шашка, які й тут яе дастаў: скраў сто рублёў з накоўдраніка. Маці працяла здагадка. “А ці не былі яны ў паласатай анучцы навязаныя?” — запытала яна. “Ох, нявестачко, былі, былі! — радасна загаласіла бабка. — На сьмерць зьбірала, Божа, Божа!” — “Дык я вам за іх ложак купіла, а на труну шчэ назьбіраеце, — сказала маці. — І не расказвайце больш дзецям абы-чаго. Ніякага шашка няма”. Бабка надзьмулася, некалькі дзён ні з кім не размаўляла, але ад шашка не адраклася.

Мама і тата

Я ўдзячная маім бацьком за ўсё: і за любоў, і за абыякавасьць. Адно не магу дараваць: нашто яны адбіралі ў мяне кнігі? Калі бацькі забралі мяне ад бабкі, я была закончаная маўглі. Мяне пачалі абчэсваць. Дасталі са спадніц з “хвальбонамі” і “кофтак”, якія шыла мне бабця, пагарджаючы “куплёнай” вопраткай. Навучылі чысьціць зубы, апранулі ў штонікі й куртачкі, накуплялі новых цацак і кніжак і падарылі мне брата. Самі пайшлі ў школку на паўтары стаўкі і пакінулі мяне ў спакоі. Бабка мяне таксама забыла-закінула, бо была ў захапленьні ад майго брата Лёдзі (Валодзі). Ён быў увесь бяленькі, пяшчотненькі й мякенькі, сінявочанькі — узорнае дзіця, цяпер бы яго ўзялі ў рэкляму кашы ці пампэрсаў. А я сядзела сабе з кніжкамі й кубікамі і, як булгакаўскі Шарык, аднойчы склала літары. Атрымалася “Настаўніцкая газэта”. Чорны газэтны загаловак быў маёй першай Эўрыкай. З тых часоў я чытала днямі. Калі бацькі адбіралі кніжкі, хавалася ў гародчыку, прыбіральні, пад коўдраю зь ліхтарыкам, на бальконе за выварку. Жыцьцё мінала як у сьне. Я ня памятаю, як пайшла ў школу. Прачытала школьную й вясковую бібліятэкі аж да ваенных мэмуараў і зайцом пачала езьдзіць у раённую. Па-за кнігамі існавала толькі прырода: лес, луг, балота, возера, поле. Туды я, зрэшты, патрапляла рэдка. Не любіла спадарожнікаў, а без спадарожнікаў баялася: ваўкі, цыганы, хохлікі й шашкі трывала сядзелі ў маёй галаве. Гэтая

калекцыя папоўнілася жахамі й жашкамі, вычытанымі з Уолпла, Рэдкліф, Вэрна. Асабліва я ўпадабала Стывэнсана. Мяркуйце самі, што цікавейшае для дзіцяці: ягоныя блізкія ці выспа скарбаў са шкілетам Алардайза?
Таму я слаба памятаю крызыс маёй сям'і: у вёсцы загаварылі, што ў мамы раман з дырэктарам школы Туміловічам, а мой брат — быццам бы ягоны сын. Бацька аж учарнеў, я пару разоў бачыла, як ён уважліва разглядае Лёдзю. З ганарлівасьцю кніжнай молі я думала: якой дробязьзю цікавяцца гэтыя людзі — мае бацькі і ўся вёска. Тым часам бабка падгаворвала бацьку разьвесьціся. Яна не размаўляла з маці і ня ела нагатаванага ёю. Зрабіла сабе "сталоўку" на падваконьні, купляла ў краме памідоры, масла, цукеркі, рэдкія тады бананы, марозіва, клікала нас зь Лёдзем, карміла смачнотамі і гладзіла па галовах: "Сіроткі вы мае". Відаць, бабка ўсё ж ня верыла, што Лёдзя — ня ейны ўнук. Лёдзя жор пачастункі і плакаў са шкадобы да сябе. А я трушчыла бабчыны дары ды пасьміхалася зь яе. Я тады нікога не лічыла сабе роўным, людзкія клопаты й гароты здаваліся мне марнасьцю. У маміны "раманы" я ня верыла. Мая маці была няздольная да каханьня. Яна нават сваіх дзяцей любіла як праз кісяю. Што б ні рабіла — мыла посуд, правярала сшыткі, варыла есьці, — яна мармытала пад нос вершы ці мроіла ўслых. На людзей яна глядзела зіхоткімі або замглёнымі вачыма, зялёнымі, вільготнымі, закаханымі. Гэта многіх падманвала. Насамрэч мама тых людзей і ня бачыла, а цешылася сваімі лятункамі. Яна магла, ідучы сярод белага дня, урэзацца ў слуп. Праз пару год пасьля сямейнае крызы бяленькі Лёдзька ператварыўся ў бацькаву копію — панурага насатага шатэна-бамбізу. Ня ведаю, ці прасіў бацька ў маці прабачэньня. Адное, што ведаю: яны жывуць паміж сабой ціха й добра ўжо трыццаць пяць год. Туміловіч пайшоў на павышэньне ў райана, а потым у аблана. Я сустрэла яго ўжо дарослай на менскім аўтавакзале. Ён пазнаў мяне імгненна і, заглядаючы ў твар так уважліва, што, здавалася, пакідаў сьляды, спытаў: "Як твая мама?" Позірк ягоных цёмных, дзівосна прыгожых, як у каровы, вачэй, быў такі хцівы й тужлівы, што я ўмомант здагадалася, што гэта была за гісторыя: ён пакахаў маю маці, а тая ня ведала, што зь ім рабіць. Нездарма таго далёкага году ў паэтычным разьдзеле райгазэты так часта зьяўляліся вершы, прысьвечаныя "далёкай,

як зорка ў тумане”, М. В.
Туміловіч хаваўся пад псэўданімам “Янка Крынічны”, але аўтара ведалі ўсе.

Школа
Паскудзтва! Пра свае школьныя гады я ўзгадваць не люблю. У школе мяне не любілі. Для аднаклясьнікаў я была мутантам: я ўсё ведала, была круглаю выдатніцай, аж пакуль не пачаліся складаныя дакладныя й натуразнаўчыя прадметы. Прытым (парадокс!) мяне па чарзе палюбілі тры галоўныя хуліганы клясы. Яны ўсе ўрокі зіркалі на мяне сьветлымі вочкамі, а на перапынку чапіліся, біліся й зьдзекаваліся. Дзякуючы кніжкам пра каханьне, я разумела, што зь імі адбываецца, але ня ведала, што з гэтым рабіць. Маці, вядома, парады даць не магла. Так я й трывала. Пакутаў полавага высьпяваньня не памятаю. Адно што сьпераживалася з-за вясновак, якія грамузьдзіліся на маім гаротным тварыку. Ды праз рост. Ён, зрэшты, перастаў мець значэньне, калі зьявіўся Андрэй. Мы зь ім былі самыя высокія людзі ў вёсцы — 178 ды 183 см. А да Андрэя я амаль не жыла рэальным жыцьцём. Слухала *Курёхіна* ды *Гребеншчікова*.
А татаў вялізны прымач лавіў радыё “Свабода”, Бі-Бі-Сі, “Нямецкую хвалю”. Я залюбіла кельцкую й сярэднявечную музыку, яшчэ ня ведаючы, што менавіта гучыць. Былі ў мяне любімыя кніжкі — Гільен, Сапфо, Ахматава. Быў Максім Багдановіч, Уладзімер Караткевіч. Мама расказвала пра яго, ён пару разоў выступаў у іх на курсе. Лішне казаць, што я ўжо тады жыла ў Беларусі, а не ў СССР. Маці выкладала беларускую. Вакол гаварылі па-беларуску. Расейскае я зьнелюбіла праз дыктарак ЦТ і іхныя шырокія фальшывыя ўсьмешкі. Менавіта так я ўяўляю сабе імпэрскі ашчэр. Цэнтральнае *телевіденіе* грашыла навязьлівай апалягетыкай усяго “рюссссского” (дух, мужество, душа, хлебосольство, удаль, прірода, сарафаны ўшыркі зь печ і г.д.).

Прырода
Выспы, азёры, буяковыя балоты. Дрогкія, зялёныя, дрымотныя палі. Сасновыя лясы. Альшанікі-на-тарфе. Навошта Бог узьвёў тут такія захапляльныя, прыгожыя дэкарацыі, думала я. Няма героя, які варты зьявіцца сярод іх.

Каханьне

Ён зьявіўся з Рудабелкі, прыйшоў да нас навічком у 8 клясу, высокі, у школу насіў карычневы касьцюм і карычневыя ў палоскі кашулі. Зялёны гальштук. Камсамольская значка. Астатнія хлопцы не насілі значак, іх у камсамол ніхто ня браў за іхную гадкасьць: выпіўкі, паленьне за прыбіральняй, бойкі ў вёсцы і за вёскай. Камсамол трэ было заслужыць. Але калі ты яго заслужыў — не адкруцішся.

Я выразна памятаю момант, калі зразумела, што ён кахае мяне, а я — яго. Нашыя фулюганы на бульбе спрабавалі запхаць мяне ў мяшок. І я раптам адчула ўпэўненасьць, што ён ня дасьць. Ён быў лідэр з прыроды, ён іх так спрытна паставіў на месца, што яны й не заўважылі. А я заўважыла. Сьвет для мяне ўвадначас перакуліўся з ваўкалака ў чалавека. Але звонку паводзінаў я не зьмяніла. Бо так і ня ведала, што зь ім рабіць. Усьміхацца? Какетаваць? Стаяць пад плотам? Ціскацца ля клюбу? Цалавацца на лаўках? Нічога з гэтага набору я не хацела. У мяне быў іншы набор. Прайшоў год. Раз на пачатковай вайсковай падрыхтоўцы ён узяў трубу ад процігазу, адзін канец прыставіў да рота, а другі даў мне і папрасіў слухаць. Я пачула, як ён шэпча ў трубку: “Ну колькі ты будзеш мяне мучыць?” Я засьмяялася й перавярнула справу ў жарт. Я адвярнулася. Больш ён не спрабаваў прызнацца ў каханьні ніколі. Мы кахалі адно аднаго моўчкі, аднак я заўсёды адчувала яго. Можа, гэта трубка з процігазу ператварыла нас у спалучаныя сасуды, якія мы вывучалі на хіміі?

Канец эпохі туманоў

Была ў нашай клясе Людка. Ніколі потым ні ў кіно, ні ў часопісах я ня бачыла такіх прыгажунь. А самае дзіўнае, што я не сустракала іх у рэальным жыцьці. Людка была яблыня — тонкае і стройнае, як дрэўца, цела, яблыкападобныя грудзі й клубы; смарагдавыя вочы акружаныя патройным шэрагам веек (я не жартую — сама бачыла). Валасы — танчэйшыя за мае ўтрая, густыя і зіхоткія. Самі клаліся ў прычоску. Пад’ём нагі такі, што пад ім мог прабегчы струменьчык. Ня думайце, што бедныя вясковыя жыхары ня ўмелі цаніць гэтага. Раз мы зь іншай такой жа брыдзілкаю, як я сама, селі і з зайздрасьці

склалі сьпіс закаханых у Люду. Аказалася, каля 60 чалавек. І хлопчыкі, і хлопцы, і сямейныя мужыкі. Двойчы яе спрабавалі ўкрасьці матацыклісты. Другі раз яна ўцякла, апаліўшы нагу аб выкідную трубу. Хадзіла, шнару не хаваючы. Парадаксальным чынам ён яшчэ й упрыгожыў тонкую залацістую нагу. Адзін хлапец, старэйшы на год, назіраў за Людчынай хатай зь ліпы празь бінокль, чакаючы, што выйдзе ягоны анёл. Калі яна адмовіла яму ў сяброўстве, ён павесіўся ў хлеўчуку, маці пасьпела выцягнуць зь пятлі, і сям'я выехала зь вёскі. Ля Людчынай хаты вечарам абавязкова хтосьці стаяў, вычэкваў, ці ня выгляне прыгажуня. Толькі Андрэй не глядзеў на яе. Хаця паводле папулярнасьці якраз ён і мусіў стаць ёй парай: першая лэдзі й першы джэнтэльмэн. Я лёгка апісваю Люду, але не магу апісаць Андрэя. Колькі разоў спрабавала, а не магу. Больш за ўсё ён падобны да Біла Клінтана. У яго такі, як быццам мясісты, твар. Я ў свой час спачувала якраз Клінтану, а ня гэтай зьмяюцы Моніцы. Такі тып мужчын вельмі маскулінны, яны любяць жанчын і ня могуць працівіцца ім.
На Андрэю, што б ён ні апрануў, усё клалася неяк па-мужчынску. У яго былі вельмі мужчынскія пастава, рукі, усьмешка, і ўсё гэта бяз грама выставучасьці, качаньня цягліцаў ці вырошчваньня валасяных прыкрасаў на твары. Андрэя кахала ўся акруга. Я ведала, што ён сябруе зь дзяўчынай, на клясу маладзейшай ад нас, але мяне гэта не турбавала. Я адчувала яго як майго. На яго не падзейнічала нават Люда. І тут да Людкі прыбыло падмацаваньне ў выглядзе мае сястрыцы Ядзі. Калі Людка была шатэнка, дык Ядзя — натуральная бляндынка з хвалістымі валасамі да клубоў. Абедзьве дзеўкі былі афрадыцкага замесу. Іхныя целы гарманічна зьліваліся з асобамі; яны не пацелі, не стамляліся, не злаваліся, не крывіліся, заўсёды разам, заўсёды дасканалыя. Непераможны дуэт таго лета! Хлопцы зь вёскі й ваколіц пашалелі, і нам, брыдзілкам рознага калібру, не засталося нават якога смаркача. Мужчыны хадзілі за Людкаю й Ядзяю сабачым вясельлем. У тое лета я страціла Андрэя. Перастала яго адчуваць. Ён прыходзіў да маёй хаты, але ўжо да Ядзі. Ён штоночы краў кветкі з садочкаў. Нават у сквапнюгі Рынейскага, які пільнаваў свой гарод з дубальтоўкаю, Андрэй скраў букет лілеяў і кулёчак суніц. Усё гэта клалася на наш ганак і прызначалася Ядзі. Я не магла супернічаць зь ёю. Мала таго,

Ядзька адбіла ў мяне і бабулю. Як я насіла шорты, то бабуля плявалася і называла іх “чорты” (“выстанавіла ляжкі, як на кірмаш”). А як прыехала Ядзя ў шортах, бабка пачала велічаць іх “шорсамі” й тлумачыла суседцы Тамары: “Цяпер у горадзе ўсе так носяць. Мода такая, сястрыцо!” Бабка не цікавілася, што ямо мы зь Лёдзем, затое, выйшаўшы на ганак, крычала на ўсю голаў:
— Ядзё-о-оў! Ідзі кушаць!
Страціўшы цярпеньне, я з плачам спаліла свой дзёньнік, збольшага прысьвечаны Андрэю, заварыла цэлы чайнік “крумкачовага вока” і ў бязьлюдны чэрвеньскі поўдзень выпіла адвар кубкамі ды легла ў бульбяную разору за хатаю (мы тады ўжо пабудавалі асобны катэдж, і ніхто з суседзяў ня мог скамячыць урачыстасьць майго самагубства). Ляжала я ў разоры з гадзіну, назірала жыцьцё калярадзкіх жукоў і ўважліва прыслухоўвалася, “ці не нясу я сьмерць, як плод”. Але мяне нават не званітавала. Хаця мая хлусьлівая бабуля казала, што “крумкачовым вокам” зьвяла з тузін суседзкіх сабак ды катоў, якія елі куранят.
Ядзя гуляла з маім каханым цэлае лета. Яны прыходзілі на вэранду і шушукаліся, і цалаваліся, і елі семкі, і на лаўцы перад домам сядзелі, так што я выбіралася праз акно, каб толькі іх ня бачыць, каб раптоўным румянкам, дрыготкай ці грымасай ня выдаць, як я кахаю Андрэя. Аказалася, што маё каханьне й пакуты было таямніцай Полішынэля. Усе кпілі зь мяне. А шоўкавалосая, яблыневая Люда падышла й сказала: “Ён быў адзіным, хто ня клюнуў на мяне. З-за цябе. Хаця, шчыра кажучы, перада мной ты памяло. Вось я і папрасіла Ядзю прычараваць яго, а потым зьехаць”. Я не спыталася, нашто Люда зрабіла такі сьвінізм. У такіх гульнях, як падлеткавае каханьне, прымаецца ўсё. Гэтым летам, як ні банальна гучыць, завяршылася маё дзяцінства. Тады ж скончылася і праца майго сэрца. Цяпер яно на пэнсіі. Спакой і халадок.
У 17 год я зьехала зь вёскі. Не было рамантычнага разьвітаньня. Я не цягалася па навакольлі, з плачам абдымаючы дубы. Разьвітаньня няма й цяпер. Я проста вырашыла трохі пажыць у іншым месцы. Там, дома, маё й ягонае прозьвішча на помніку загінулым партызанам стаяць побач. Яшчэ дрыжыць вада ў яміне ад капыта ягонага каня. Я

ня бачыла яго амаль 15 год. Чула, ён ганяе машыны з Чэхіі. Ёсьць жонка, сын, двое няшлюбных дзяцей. Хачу яго пабачыць, на хвільку, ня болей. Бо і цяпер ня ведаю, што мне зь ім рабіць. Ня варта азірацца, Ева.
Занавіньне — Гута — Менск.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Леанід Галубовіч

Пяць вершаў

Казаць, што ты любіш дзяцей, — гэта ўсё адно як сцвярджаць, што ты — чалавек. Дзяцей любяць нават людаеды...
Чужых жа любіш з найбольшай асалодай, паколькі яны не сядзяць штодня на тваім карку...
Так любіў я свайго пляменніка, калі ў мяне яшчэ не было свайго дзіцяці. Мне было трыццаць пяць, яму паўтара. Яго пакідалі са мной на ўвесь дзень, бо анічым людскім я больш не займаўся, а толькі “чорт ведае для каго складаў вершыкі”. Пасля абеду да мяне прыходзіў стрыечны брат Васіль з трыма бутэлькамі таннага “чарніла”, і мы вельмі хутка закалыхвалі пляменніка. Ён засынаў ці то ад віннага чаду, ці то ад нашага п’янага беларускага бубнення...
Так, палюбіўшы “чужое” дзіцё зблізу, зажадаў я здалёк усімі фібрамі душы і цела займець сваё. Таму праз год пакінуў піць назусім, а праз восем стрыечны брат насмерць захлынуўся бурачнай самагонкай на ганку нашай вясковай бібліятэкі...
Пляменнік жа сёлета канчае баранавіцкую экалагічную гімназію і збіраецца паступаць на журфак БДУ. Завуць яго Кірылам. Але тады я, напісаўшы нечакана колькі дзіцячых

вершыкаў, для свайго героя чамусьці абраў імя Костусь (так бацька зваў майго “селядоршага”, то бок сярэдняга брата, якога сам жа ахрысціў патаемна ў местачковай царкве Міколам, мяне зваў Леўкам, а малодшага, Мішу, — Мішэлем; бацьку з германскага палону вызвалялі саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі...)
Быў сярод тых маіх дзіцячых вершыкаў і гэты — іранічны, які да сёння ў арыгінале не друкаваўся, а толькі ў перакладзе на расейскую. На вялікі жаль, ён усё яшчэ актуальны:

Пляменнік мой жуе што ёсць, падрад.
Ды хітры — не глытае ўсё на веру.
Зжаваў паў-“ЛіМу” — выплюнуў назад.
І вось, маю дажоўвае паперу.
Ну-ну, давай, смакуй маё чарніла!
А ён смяецца кіславата-міла...
І дажаваў, і выплюнуў назад.
Маўляў, прабачце, дзядзька, — сурагат!..
Цяпер пішу, ды ўжо не без аглядкі...
Нарэшце крытык ёсць, што мне не плешча ў ладкі.

Усе гэтыя вершыкі, напісаныя ў маёй роднай вёсцы Вароніна ў 1985 годзе, якраз напярэдадні гарбачоўскай перабудовы, так і валяліся ў маіх паперах...
Цяпер я вытрас з іх пыл амаль дваццацігадовай даўніны... Але мне здаецца, што да гэтага часу яны так і засталіся там — маладымі, нават малечымі па сваім узросце...

Ранак

— Мама, — кажа Костусь маме, —
Я пайду на поле з вамі...

— Што ж, сынок, давай, ідзі,
Ды дарогай не ўпадзі,
Ямы й куп’е — абыдзі...

Костусь думае ля брамы:

“Як жа я патраплю ў яму
На руках у роднай мамы?..”
Здарэнне

Дождж заспеў іх блізу поля.
Костусь з мамай — пад таполю.
Толькі капае і там...
Сын у мамы запытаў:
“Хто ж ваду так з неба лье?
І ці многа там яе?
Ножкі ўжо прамоклі трошкі...
Мабыць, льюць з вя-лі-кай бочкі?!”

Поўдзень

Перастала зверху ліць.
Больш зямля не просіць піць.
Сонца ззяе, як люстэрка...
А зірнеш — і ў воку стрэмка...

— Дзе ты, мамачка, прапала?!
Сонца ў вочы мне папала!
Даставай яго як хоч,
А то будзе ноч і ноч!..
Вечар

— Паглядзіце ў неба, тата, —
Месяц выгнуўся над хатай...

Бацька Костусю й гаворыць:
— То яго прагнулі зоры.
Бач, чапляюцца за рожкі
І з краёў сагнулі трошкі.
Як збяруцца ўсе наўкола,
Стане круглым ён, як кола.
Дый самі мы, дзякаваць Богу, найбольшай сваёй, хоць і не заўжды найлепшай, часткай пакідаемся ў сваіх дзецях, каб не сысці бясследна...
в. Варонiна, 1985 г.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Севярын Квяткоўскі

Мамчына цыцка

“Асьцярожна, дзьверы зачыняюцца, наступная станцыя — “Плошча Незалежнасьці”. Менавіта на Незалежнасьці я выходжу амаль штовечар — “выхад да чыгуначнага вакзалу”. Паралельна чыгуначным рэйкам я еду альбо іду ў паўднёвым кірунку да прыпынку “Вуліца Лясная”, што на вуліцы Маякоўскага (колішні Ігуменскі тракт).

Прыпынак існуе, а сама вуліца Лясная зьнікла ў часе пабудовы ўздоўж чыгункі блёчных пяціпавярховікаў — у 1973 годзе. Менавіта ў гэтым годзе я нарадзіўся. Не на Лясной — колькі кілямэтраў ніжэй на поўдзень, ля Камвольнага камбінату. (Увесь раён ад Чэрвеньскага рынку да Лошыцы завецца “Маякоўкай”.) Зрэшты, толькі народжанага чалавека мала цікавіць геаграфія. Навазьяўленую асобу найболей вабіць мамчына цыцка. З цыцкай атрымалася цэлая гісторыя.

Я нарадзіўся ў пятніцу ўвечары, на золку ўікэнду. Нарадзіўся — і адразу напужаў прысутных сваім маўчаньнем. Загадка маўчаньня высьветлілася вельмі хутка, у часе кармленьня. “Кармлю дзіця, — распавядае маці сваякам на адной зь сямейных урачыстасьцяў. — Пасмактала, пасмактала ды вочы

заплюшчыла. Зьбіраюся пакласьці спаць, а яно зноў да цыцкі. Пасмактала, вочы заплюшчыла… І так бясконца. Гультаюга!”. А куды было сьпяшацца? Нясьпешна й удумліва я ўсмоктваў першыя ўражаньні ад рэчаіснасьці.

Кожны можа распавесьці пра свае першапомныя ўражаньні — ранейшыя ці пазьнейшыя: першае слова, што было ня “мама” ці “тата”, а “дай”, першы самалёцік у небе, упершыню вымаўлены гук “р”. “Ур-р-ра! Я юный пионер-р. Я буду жить в СССР-р-р! Учиться на пятёр-р-рки!”. Я ж хачу распавесьці пра сорам за гук “г” (выбуховы).

Я стопрацэнтна гарадзкі хлопец у другім з паловай пакаленьні. Але мяне заўжды перасмыкала, калі я чуў ад даслага чалавека: “Я никогда в жизни не был в деревне”. Падворак Квяткоўскіх у вёсцы Дусаеўшчына пад Капылём стаўся тым усясьветам першых некалькіх гадоў жыцьця, якія мне сьняцца дагэтуль. Ужо ў сем гадоў я хвацка кіраваў коньмі. Раз ехаў да вёскі, а ў возе ляжалі “электрапастух” і два непрытомныя ад чарнілкі “проста пастухі”; мы, вясковыя хлопцы, самі гналі калгасны статак “на базу”. Каб ня мы, няўдаліц-пастухоў чакалі б непрыемнасьці.

Я раблюся нераможны ў любой “цывілізацыйнай” спрэчцы з “гарадзкімі”, калі прыгадваю, як лазіў да цялятак у стойла ці скакаў з трохмэтровых скірдаў. (Маці дагэтуль ня ведае пра шмат якія “геройствы”.) Мне трэ было навучыцца многім трукам, каб прыстойна выглядаць у кампаніі жвавейшых і спрытнейшых вясковых хлапчукоў. Але героямі гісторыі пра выбуховы “г” сталіся не хлапчукі, а гусі.

Калі рымляне былі ўдзячныя гусям за выратаваньне ад ворагаў, дык я ўдзячны гэтым паважным птушкам за паскарэньне маёй беларусізацыі.

Мне было чатыры гады, калі я ўпершыню патрапіў на падворак Квяткоўскіх (да брата майго дзеда Адама — дзеда Аркадзя). Першыя самастойныя крокі па двары былі ў кірунку дашка, пад якім месьціўся сабраны дзедам Аркадзем трактар. Пры канцы 1970-х гэта быў адзіны прыватны трактар у вёсцы, сабраны з запчастак, якія калгас выкідаў на звалку. За трактар дзеда Аркадзя звалі “адзінаасобнікам”. Пазьней я вельмі ганарыўся і трактарам, і словам “адзінаасобнік”. А ў першы свой прыезд я хацеў зблізу разгледзець дзіва-машыну, бо мне сказалі, што я

нават змагу сесьці за стырно.
На падворку Квяткоўскіх у Дусаеўшчыне жытлаваў поўны збор свойскае жывёлы. Я зрабіў колькі крокаў да трактара, і мой шлях перакрыла цэлая хеўра гусей ростам зь мяне. Я з радасьцю паведаміў сьвету, што “гуси гогочут”. Тады гусі засіпелі й пайшлі ў наступ. А суседзі, што прыйшлі паглядзець на “гарадзкіх”, зарагаталі: “Чуў? — “Гогочут”!”. Тады маці мяне ад гусей выратавала. А сьмех суседзяў паўплываў такім чынам, што мне з таго моманту пачалі чытаць беларускія кніжкі. У шэсьць гадоў я цьвёрда заявіў, што я “белалус”, а пазьней выставіў бацькам прэтэнзію — маўляў, чаму са мной не гаварылі па-беларуску? Пасьля выпадку з гусямі я вельмі палюбіў свойскую птушку. Яна асацыюецца ў мяне зь беларускасьцю, а самі гусі — з трываласьцю й годнасьцю.
З годнасьцю зьвязаны выпадак з гасьцяваньня ў бабы Ганькі ў пасёлку Кунцаўшчына пад Менскам. Я спаліў стог сена ў суседзяў. Мне было цікава паглядзець, што будзе, калі сунуць у сена запаленую сярнічку. Нічога. А дзьве? Нічога. Вядома, з трох сярнічак стог запаліўся. Маці дала мне вой якога рэменя! Я стрываў і не пакрыўдаваў. Гэта быў, бадай, адзіны выпадак, калі маці мяне адлупцавала па-сапраўднаму.
“Мала цябе лупцавалі ў дзяцінстве”, — гэтую, прамоўленую са шкадаваньнем, фразу я чуў часьцяком. Але наўрад ці лупцаваньне паменшыла б маю цягу да вандраваньняў. Бацькі й сваякі шукалі мяне часта, аднаго разу нават зь міліцыяй. Калі мне абрыдала ў дзіцячым садку, я сыходзіў гуляць. Калі мяне перавялі ў садок за тры мэтры ад дому, я хадзіў “на абед”. Адну зь першых вымоваў ад выхавацелькі мая маці атрымала не за ўцёкі сына. Раз я прыйшоў у групу, сабраў дзетак і падрабязна распавёў пра сакрэт нараджэньня чалавека. Пераказаў тлумачэньні маці пра тое, што дзеці бяруцца не з капусты ці дроваў, а з мамчынага жывоціка. І што да справы мае дачыненьне тата. Што нейкім загадкавым чынам часьцінка таты трапляе да мамы, і так нараджаецца новы чалавек. Дзеткі аслупянела слухалі, а выхавацелька была ў шоку — на дварэ ішоў 1977 год. На думку выхавацелькі, ТАКІ расповед пра ГЭТА быў больш жахлівы, чым анэкдот пра “дзедушку Брэжнева”, якім я аднойчы парадаваў дзетак. Калі бацькі паслухалі показку, яны пасьмяяліся і сказалі, што, калі я буду распавядаць такія рэчы, іх — бацькоў — пасадзяць у турму. Пра

турму я ня верыў. А калі крыху пазьней у другой клясе школы да нас зайшла настаўніца й паведаміла, што “дзедушка Брэжнеў” памёр, мне стала сумна. Сьледам настаўніца сказала, што з тае нагоды заняткаў ня будзе — і кляса грымнула працяглым “ур-р-р-а-а!”.

Школа — асобная гісторыя. У школу мяне павёў бацька, там пачаліся “цалкам іншыя прыколы”…
Дагэтуль мае вокны выходзяць на дзіцячы садок, куды я самастойна хадзіў колькі гадоў. Тое, што я чую з-за акна, нічым не адрозьніваецца ад маіх дзіцячых успамінаў. Гучыць той самы голас выхавацелькі: хрыплаваты капральскі покрык, суворыя загады: “Куды пайшоў? Сюды! Я каму сказала — сядзі побач! Так, сабралі рэчы й марш у групу! Хутчэй!”. Маці кажа, што выхавацелька пачала працаваць, калі я прыйшоў у садок. Што яна добрая жанчына і я вельмі любіў тую “цёцю”. Зь дзетсадаўскіх дынамікаў раздаецца тая самая музыка — “the best of the pioneer’s songs”: “Пусть бегут неуклюже”, “От улыбки…”, “Взлетая выше елей…”, “Если с другом вышел в путь…” *etc.* Кружэлкі круцяцца, колькі я сябе памятаю, штогод па шмат разоў на тыдзень, па некалькі разоў на дзень. Да песень дадаецца гульня “калімбамба, прыдзі сюда, пятага дзясятага, Васю сюда”. У дзяцінстве я вельмі любіў гэтую простую гульку, калі сябра адной каманды мусіць з разьбегу разарваць ланцуг другое каманды. Не прарваўся — пераходзь да каманды супернікаў.
Ад вясны “калімбамба”, “куда пашол?!” і “прыліціт вдруг валшэбнік” гучаць пад вокнамі кожны дзень. Нязьменнымі засталіся й раённыя алькаголікі, якія ў будныя дні зранку пахмяляюцца ў палісадніку між маім домам і дзіцячым садком, а ўвечары — на лавах самога садка. Часам дзеці “застукваюць” небаракаў і хорам крычаць на ўвесь двор: “П’яніцы!”. Але ёсьць зьмены: замест “дзедушкі Леніна” ў пакоях садка вісіць партрэт “дзядзі Лукашэнкі”.
Зрэшты, у адрозьненьне ад майго дзяцінства, у сучасных наведнікаў садка бываюць новыя — часовыя — гульні. Мы бавіліся “калімбамбой” і “вайнушкай”. Улетку 1994 году дзеткі пад маімі вокнамі гулялі ў “Кебіча й Лукашэнку”, а ў 1996 годзе — у разгон дэманстрацыі. А яшчэ многія дзеткі цудоўна ведаюць свае электронныя адрасы, кшталту <lenka@tut.by>. Я

ўпэўнены, што выхавацелька-капраліха ня ведае, што такое “save”, “print”, “ctrl-alt-delete” і што на Камароўку яна едзе, сядаючы на станцыі “Плошча Леніна”.
А я сядаю на “Плошчы Незалежнасьці” і дзякую ня партыі, а маці за сваё шчасьлівае дзяцінства.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Зьміцер Магілеўцаў

Я нарадзіўся ў Шклове

Я нарадзіўся 1 лістапада 1969 году ў горадзе Шклове Магілёўскай вобласьці. І пражыў там амаль семнаццаць гадоў. Мае бацькі былі настаўнікамі, маці і цяпер настаўнічае, хаця і на пенсіі ўжо.

Вы пытаецеся, як мяне выхоўвалі. Я чухаю патыліцу, раблю выгляд, што нешта намагаюся ўспомніць… Не, насамрэч, не выхоўвалі мяне. Мне толькі час ад часу казалі, каб не рабіў таго ці іншага, бо будзе дрэнна. І я звычайна згаджаўся, бо і было дрэнна. Напрыклад, з беларускай мовай. Магілёўшчына гаворыць на мове, якую ані расійскай, ані беларускай назваць нельга — вы ж ведаеце. Мая маці добра ведала беларускую мову, бо й выкладала на ёй. Але ж у хаце яна ніколі па-беларуску не гаварыла і мне забараняла, даволі жорстка, калі я намагаўся сказаць нешта такое, бо, “што скажуць” мае таварышы па гульнях.

Рабі добра або не рабі зусім. Шкада, што я дагэтуль не заўсёды трымаюся гэтага прынцыпу. Дый сам я даволі хутка пачаў, шмат чытаючы ды слухаючы добрую расійскую мову — а ў нас былі добрыя настаўнікі, — сачыць за словамі. Нам выкладалі

беларускую мову і, як я цяпер разумею, вельмі добра выкладалі. І хаця я атрымліваў на занятках “выдатна” — уважаў яе за дзіўную, дурнаватую, амаль нікому не патрэбную “трасянку”. Мне здавалася, што гэтая мова нават гучыць неяк грубавата, брыдка, нібы лаянка. А потым неяк я разам з маці ехаў у Вільню да сваякоў. Ехаў на аўтобусе. І вось у Ашмянах у аўтобус ускочыў вясёлы дзядзька — такі светлы, абпалены сонцам, жвавы, гучны, моцны — і гукнуў камусьці на вуліцы: “Бывай, хлопча, я да Вільні!”. І так гэта прагучала добра, што я адразу паспрабаваў пагаварыць з маці па-беларуску. Але яна скрывілася і сказала мне, што перадусім трэба навучыцца гаварыць, як гэты дзядзька, а ўжо потым спрабаваць размаўляць. Ну, гэта было цалкам слушна, але ж я прытрымаў дулю ў кішэні.
На выпускным іспыце я прачытаў верш аднаго даволі вядомага, нават знакамітага беларускага паэта родам з Магілёва. Вы яго ведаеце. Верш у арыгінале быў на расійскай, я ж яго сам пераклаў на беларускую і выдаў за твор Язэпа Семяжона. Мой настаўнік усміхнуўся, але ж паставіў “выдатна”. Наступным разам я сказаў нешта па-беларуску і не надта добра — прабач, матуля, — толькі праз дзесяць з нечым гадоў (калі не ўлічваць заняткаў у аспірантуры, дзе мне неяк пашанцавала здаць мову экстэрнам). Але ж я тады ўжо навучыўся хутка й кепска размаўляць па-ангельску, амаль не саромеючыся гэтага.

Ці хлусіў я? Натуральна. Любіў хлусіць, люблю і цяпер. Толькі цяпер знайшоў крыху іншае імя для гэтага. Я ўсяму класу пісаў эпіграфы для сачыненняў, а на пытанне кшалту: ці казаў, напрыклад, Д’Аламбер гэтыя словы — адказваў пытаннем: “А хто дакажа, што ён іх не казаў?” Праўда, непрыемна атрымалася, калі я параўнаў Паўла Карчагіна з пратапопам Авакумам ды спаслаўся на нейкага савецкага класіка. Зразумела, настаўнік не паверыў. Ён ведаў савецкіх класікаў лепей за мяне. Тут мне было і за хлусню, і за ідэю параўнання. Ці браў не сваё? Браў. Хаця часцей не тое каб праз глупства — праз непаразуменне. Калі быў у першым класе, пасябраваў з дзяўчынкай, дапамагаў ёй несці ранец дахаты. І вось яна аднойчы кажа мне: “Табе патрэбныя нутрыі?” А я ўжо быў у яе ў гасцях, бачыў і ведаў, што гэта здаравенныя, страшэнныя пацукі з зубамі памяранцавага колеру, а іхнія пярэднія лапы

нагадвалі маленькія дзіцячыя ручкі. Пацукі жылі за кратамі і дошкамі. Здаецца, было іх там тузіны тры, а мо і болей, я не лічыў. Хутка высветлілася, што гаспадары таксама не лічылі. Дык вось, дзяўчынка прапанавала падараваць мне аднаго, бо “надта шмат, да ўсёру, і падзець іх няма куды, хіба што параздаваць”. Параздаваць — дык параздаваць.
Прыйшоў да яе з тарбінкай, калі бацькоў не было. Ледзь не самлеўшы ад жаху — гэтыя зубы, голыя гідкія хвасты, лапы-ручкі, яшчэ і сіпелі, нібы гадзюкі, — я скочыў у смярдзючую цемру клеткі, ухапіў найбліжэйшы хвост, пацягнуў. А яно як ірванецца, зубамі на мяне — клац, клац! Бацюхна! Але ж я моцна трымаў хвост пачвары і выцягнуў яе з клеткі. Удваіх з дзяўчынкай мы запхалі нутрыю — старую, вялізную пацучыху — у авоську. І я пацягнуў яе дахаты. Як я дабраўся, для мяне і цяпер таямніца. Мне было сем гадоў, а пачвара важыла амаль палову пуда. І ў яе былі жахлівыя зубы. Калі авоська парвалася, нутрыя кінулася ў канаву, і я паўгадзіны лавіў яе за хвост. Злавіў, нарэшце, і далей ужо цягнуў проста за хвост. Дабраліся ўжо прыцемкам, знясіленая нутрыя і знясілены я. Брат хацеў адлупцаваць мяне, але ж звяруга яму ледзь не адкусіла палец, і ў яго з’явіўся іншы клопат. Адлупцаваў мяне бацька, раніцою, але ж для праформы, не сур’ёзна. Бо, ведаючы нораў нутрыяў, не мог даўмецца, як жа я здолеў яе даперці. Гераізм, карацей кажучы. Бацькі праз дзень пацягнулі нутрыю назад, стаміліся, пачвара ледзь не пакусала маці. А гаспадары вельмі здзівіліся: дзяўчынка маўчала, а колькі было нутрыяў (тыя пладзіліся, як хацелі, а калі не хапала ежы, напэўна, елі адна адну), дакладна не ведалі і ведаць надта не жадалі.
Яшчэ я неяк сцягнуў братава лязо, паклаў у кішэню, схлусіў, што не браў. А потым сунуў у кішэню руку — і парэзаўся да косткі.

Гульні? Былі гульні. Мы вар’яцелі ад усяго, што лятала, выбухала, іскрылася, гарэла, страляла і рабіла дыму й смуроду на ўсё наваколле. Мы лазілі на сметнік зубной клінікі і там набіралі бліскучых рэчаў, падобных да прыладаў для катавання. Былі там яшчэ хімікаты, шмат гіпсу, нейкі пластык, дужа шмат зубоў — я нават збіраў калекцыю сапраўдных і пластыкавых, ненатуральных, ружовых і пунсовых, падобных чымсьці да гузікаў жаночых паліто. Любіў я сметнікі, і сябры

мае таксама любілі. Памятаю, мы лазілі на сметніку птушкафабрыкі, куды выкідалі квёлых куранятак, каб яны ў яме паздыхалі. А жанчыны падгаворвалі хлапцоў, каб тыя лазілі ў гэтыя вялізныя яміны, адкуль жудасна смярдзела тухлымі яйкамі, ды выцягвалі яшчэ жывых куранятак. Тыя жанчыны гадавалі з іх нядрэнных курэй. Дык вось, хлопцы лазілі і самі: таксама выцягвалі малых, ліпкіх ад тухлых яек куранятак… Але ж далей я пра тое распавядаць не буду. Дастаткова сказаць, што, калі я пабіўся там з сябрам, ён… ну, карацей, ён раструшчыў яшчэ жывое кураня аб маю галаву. Яшчэ мы збіралі на стрэльбішчы аўтаматныя гільзы і кідаліся імі, любілі набраць поўныя абоймы гільзаў. Капаліся ў гліне за мішэнямі, шукаючы пісталетныя кулі, цяжкія, круглыя, бліскучыя тупамордзенькія кавалачкі, і потым стралялі імі з рагатак. Пісталетная куля біла добра, галубы падалі толькі так. Стралялі з рагатак і па жабах, але камянямі — куляў шкадавалі. Гуляліся ў вайну, страляючы рабінаю, самі выраблялі такія стрэльбы, што нават цяпер не сорамна было б узяць у рукі, з матацыклетнае помпы. Руля — са штоку, які рушыць поршань, — біла не горш за фабрычную пнеўматычную стрэльбу, і чым біла! Тоўстай голкаю з пластылінам замест пыжа, на трыццаць крокаў, і ў дрэва ўваходзіла! Засмокчаш туды зарад, нацягнеш гумку, ляжаш недзе на даху, чакаеш — дзе ж даражэнькі паўзе з рагаткай. Ага, вось ты! Хлоп — і пляма на кашулі. І ўсё — забіты ці паранены, выбыў. Аднак, калі мазаў ці не паспяваў першы, магло быць і наадварот. Рагатка біла хутчэй, і сярод маіх сяброў былі сапраўдныя віртуозы, не горшыя за каўбояў Дзікага Захаду. “Выдатную сямёрку” ўсе ж бачылі. Дык вось, мой сябар Алесь, калі ў яго знайшлі вошай і прымусілі хадзіць увесь жнівень лысым, казаў, што ён — Юл Брынер, і страляў наўскідку. Пабіў мне акуляры аднойчы, калі, спяшаючыся, замест пластылінавага шарыка выхапіў з кішэні каменьчык.

Што да сэксуальнага выхавання, дык акрамя ананізму ды сапраўднага палявання на няякасную правінцыйную парнаграфію, аніякага сэксуальнага выхавання не было. Дый ананізму не надта любіў — ніколі кончыць не ўдавалася. А калі спаў — калі ласка, уся прасціна ў брыдоце. Саромеўся жудасна, потым прызвычаіўся. Калі мне было гадоў дванаццаць, бачыў адну вядомую вам асобу ў парылцы шклоўскай лазні. Асоба

была вельмі скурлатая, прапараная, з венікам і вялікім лілова-чырвоным посікам, які высоўваўся з мокрай кучаравай поўсці, нібы хобат з кустоў. Асоба сыходзіла па прыступках і, убачыўшы, што я пачырванеў, зарагатала дый ляпнула мяне па плячах венікам.

Ведаеце, вось цяпер пішу і думаю, што пра сваё дзяцінства распавядаў бы гадзінамі, калі не днямі. Праўда. Але ж — пакіну пакуль і кар'ер, дзе мы знайшлі сапраўдны снарад і, пацеючы ад жаху, пілілі той снарад нажоўкай. І лес на пагорках, і серу, якую збіралі на рэйках ды рабілі з яе порах. І як уцякалі са стрэльбішча, і як рабілі намёты, і як я згубіўся ў лесе пад Добрушам, і як мы выліі ў старым, яшчэ зорычаўскім парку, нібы ваўкалакі, каб перапалохаць адзін аднаго дый тых, хто ішоў ноччу праз парк… Шмат яшчэ чаго было. Усё пакуль што толькі маё.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Агата Мацейка

Давай запросім на мой Дзень народзінаў Бога

Ува ўсіх маіх дзетках штосьці ад малых зьвяркоў. Як бы іх ні песьціў, ні лашчыў — усё адно ў пэўны момант праяўляюцца рысы малых драпежнічкаў. Іхны дзіцячы сьвет — густы лес з хвоямі па імені “Задзяры хмару” і елкамі “Зачапі неба”. Калі ёсьць патрэба ўпэўніцца, што дзіця жыве ў іншым вымярэньні, варта паглядзець на свае фатаздымкі, а таксама на фатаздымкі сваіх сяброў. Гэтая надзіманая малеча ў цесных гольфіках з сачком у пульхных далоньках — я? А гэты дваровы задзірака з такімі бліскучымі вачыма і гарачым румянцам, што ажно пячэ рукі чорна-белая картка — мой сябра? Дзіцё, якое здаўна насіла маё імя і прозьвішча, ці дзеці, якія выраслі і ператварыліся ў маіх сяброў, жылі сапраўды побач, і ўсё ж такі ў іншай цывілізацыі. Там шмат што было інакш. Памеры і колеры, словы і рэчы. Там прыходзілася аднолькава часта задзіраць галаву ўгору і пільна ўглядацца ўніз, пад ногі. Чым бліжэй да зямлі, тым больш пачуваеш сябе Гулівэрам. Адчуўшы, што вялікі навакольны сьвет крочыць па сваіх

законах, дзеці заўжды рушаць па сваіх.
Дзеці ўмеюць думаць. Увесь навакольны сьвет спрыяе ім. Чым больш убярэш у сябе гэтага сьвету змалку, тым даўжэй ён не адвярнецца ад цябе ў старасьці.
Дзеці любяць, калі іх песьцяць ды галубяць, а таксама любяць, калі іх слухаюць і чуюць.
Калі Сярэднявечча амаль не пакінула пісьмовых сьведчаньняў пра дзяцей альбо зьвесткі гэтыя былі вельмі скупыя, то наш час фіксуе факты існаваньня дзяцей на ўсю поўніцу... Паліклінікі, школы, гурткі ствараюць і захоўваюць горы абавязковых папераў, дзе дзіця характарызуюць, апісваюць, інтэрпрэтуюць згодна з патрабаваньнямі блянкаў і фармуляраў. Але ёсьць яшчэ адзін тып пісьмовых сьведчаньняў пра дзяцей. Гэта бацькоўскія занатоўкі выпадкова пачутага ад сваіх дзяцей у іх самым пяшчотным узросьце, недзе ад трох да шасьці.
“Спачатку нарадзіліся Адам і Эва, потым ты і я, а потым — усе астатнія людзі...”
“Заплюшчу адно вочка — і бачу мамку, заплюшчу другое — і бачу татку...”
“Мама, мне прысьнілася, што ты мая размалёўка і я цябе размалёўваю”.
Сядзім з дачкой за сталом на лецішчы. Грае радыё. Сьпявае Вальжына Цярэшчанка “Авэ Ойча”. У вокны глядзяць кветкі, пакой працінаюць касыя промні цёплага жнівеньскага сонца:
“Мне здаецца, што ўсё гэта — ну, ня толькі гэта, а ўвогуле ўсё — гэта сон”.

Радуемся, што перайменавалі праспэкт Леніна ў праспэкт Скарыны, плошчу Леніна — у плошчу Незалежнасьці. Дачка скача, пляскае ў далонькі і крычыць:
“Хай будуць яшчэ пляц Францішка і Радасьці!”
“Я вось думаю, думаю і ніяк не магу сказаць словамі. Вось я жыву, думаю, кажу — а навошта? Можа, лепш, каб мяне не было?”
“Хто я такая? Тое, як мяне завуць, — я ведаю, а ўсё ж такі, хто я такая?”
“Афрыка, Кітай, лес, пячоры — самыя таямнічыя для мяне месцы на зямлі, а імя Карнэлій — як уваход у пячору...”
“— Навошта на небе сьвеціць месяц?
— Каб асьвятляць шлях начным вандроўнікам. Як начны

ліхтар.
— А як ён узьнік?
— Яго Бог стварыў. Калі Бог стварыў Сонца, у яго застаўся кавалак. Зь яго ён і зрабіў месяц.
— А зоркі адкуль?
— Яны — дзеткі. Іхная мама — Сонца, тата — Месяц.
— А чаму ж сонца гарачае і грэе, а месяц халодны?
— Бог на яго дзьмухнуў, ён і астыў...”
На сьмерць Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пеюна:
“У яго душа дзіцёнка. Іншыя старыя бурчаць, хмурныя ходзяць, а ён добры быў, гуляўся, сьпяваў, сьмяяўся! Ягоная душа ў раі. Гэта я пэўна ведаю. Так і бачу, як ён сядзіць у раі на лавачцы і газэтку чытае, а вакол белыя анёлы закрываюць крыламі сьцежку ў пекла...”
“Мама! Я цябе так люблю! Я на тваёй магілцы хатку пабудую”.
“Мне сьніцца сон, што на мяне напалі волаты, а я на іх пачала пляваць — і яны зрабіліся маленькімі-маленькімі”.
Ужо чула пра Чарнобыль. Кропля дажджу ўпала на тварык:
“А ў Афрыцы дожджык чысты ідзе? Ну, дык паедзем у Афрыку, я так хачу папіць там чыстага дажджу!”
“На Нарачы я бачыла кіта. Ён мяне панюхаў. А што калі мы ўсе — усярэдзіне кіта? І наш дом таксама...”
“Самая вялікая таямніца для мяне — што думае іншы чалавек. Ці можна пра гэта даведацца?”
Пасьля прачытаньня Данііла Хармса:
“А чаму паэтаў заўсёды першымі забіваюць?”

“...і Дзеда Мароза вы прыдумалі, і Бога, напэўна, таксама...”
Сон: **“Заходжу я ў старадаўні замак... Там усе людзі ў нейкіх белых і чорных адзеньнях. А мне ня страшна. Тут адзін зь іх бярэ мяне і кідае ў акно... Я лячу, лячу, чапляюся за дрэва і саскокваю на зямлю. І мне ня страшна. Але ў Мірскі замак я цяпер баюся ехаць...”**
“Дзядзька Хведар, мой хросны, падобны да вялікай літары А”.
“Разумееш, Ісус Хрыстос — гэта Бог чалавечы для ўсіх людзей. Вось пакуль будзе чалавецтва, датуль будзе Ісус Хрыстос. А ёсьць яшчэ Вечны Бог, ён — бацька Ісуса. Ён будзе заўсёды!”
Сны: **“Я была зусім маленькай і ўсё роўна перамагла нейкіх злачынцаў. Яны на мяне кідаліся, вочы анучкай перавязвалі. А я іх перамагла. Тую анучку ў мора кінула, і**

зь яе ўсе фарбы змыліся...”
“Бачу цябе, мама, ля акна. Ты нешта шыеш. А міма расчыненага акна ляцяць пад моцным ветрам розныя трэскі, лістота, галінкі абламаныя. Ты выцягваеш рукі ў акно і выхопліваеш з гэтай віхуры дзіцёнка — цудоўную дзяўчынку”.
“А я ведаю, які ў мяне лёс — рознакаляровы”.
Прайшло колькі часу — і я зноў сьведка сьвету, у якім цяпер жыве другая дачка.
“У сярэдзіне зямлі — зямля, у сярэдзіне каменя — камень, а ў сярэдзіне чалавека — чалавек?”
“...Я залезу на дрэва, потым яшчэ на дрэва, потым на неба, вазьму савок, разграбу хмару і знайду маланку і гром...”
“А ці ёсьць такое сьвята — “Дзень нараджэньня Сусьвету?”
“Давай запросім на мой Дзень народзінаў Бога”.
“Мая думка блытаецца з дыханьнем”.
“Душа — гэта маленькі ветрык. Ён належыць Богу”.
“Ці ёсьць у чорта душа?”
“Мне здаецца, што наш сьвет знаходзіцца на языку сабакі”.
Рыхтуецца да школы:
“Больш за ўсё на сьвеце я люблю тату і пропісі”.
Маім дзецям выпала нарадзіцца ў Беларусі, пры канцы XX стагодзьдзя. Празь іх мне значна прасьцей пазнаць дзяцей XVI-га, бо падобна на тое, што яны насельнікі аднаго мацерыка.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Сьвятлана Нячай

Тры абразкі пра дзяцінства

Праз два пакаленьні

Здаўна вядома, што паміж бацькамі і дзецьмі гармонія цяжка дасягальная. Бакі не разумеюцца, але прымаюць адзін аднаго — таму што любяць, таму што адна сям'я, таму што ўсё адно нікуды ня дзенешся ад супольнага побыту.

Варта ж прапусьціць адно пакаленьне, і сытуацыя мяняецца на процілеглую: бабулі-дзядулі любяць унукаў бязьмерна.

Але ж па-сапраўднаму цудоўныя адносіны складваюцца паміж прабабкамі і праўнучкамі. Старую і малую аднолькава зьдзіўляе шматаблічнасьць навакольнага сьвету, яны спрабуюць знайсьці ў ім сваё месца, усьведаміць сваю значнасьць, давесьці сямейнікам сваю карыснасьць. Іхны жыцьцёвы досьвед зьліваецца і ўзаемадапаўняецца. Абедзьвюм надараецца рабіць дробныя промахі, і ў такіх выпадках між старой і малой падпісваецца "пакт аб нявыдачы". У адрозьненьне ад астатніх чальцоў сям'і, "сяброўкі" маюць досыць вольнага часу, задумваюцца над аднымі пытаньнямі і любяць пагаварыць. Узроставая розьніца ў 70—80 гадоў не замінае ім знаходзіць згоду ва ўсім.

— У мяне зуб хістаецца.
— У мяне таксама.
— Дык у цябе малочны хістаецца, а ў мяне пастаянны.
— Калі ён на пастаянна, то чаго хістаецца?
Завялі размову пра мастацтва.
— Разумееш, Тэрмінатар толькі ўсярэдзіне машына. А зьверху ён з жывой скуры, як сапраўдны чалавек, толькі вельмі страшны.
— Ай, не люблю я гэтых замежных карцінаў. Мне нашыя больш падабаюцца.
— А якія нашы?
— Ну, “Дзікая ружа”, “Багатыя таксама плачуць”. А іншаземцы кіно здымаць зусім ня ўмеюць.
І старой жанчыне, і дзіцяці хатнія шмат кажуць пра карыснасьць кашы й тварагу, а смажаніны, салодкага і тлустага даюць мала.
— Мама ўчора смачных цукерак купіла, гэта на сьвята.
— А дзе яна іх паклала? Нясі — паспытаем па адной. І мацеры потым не кажы.
Дзеляцца страхамі і падтрымліваюць адна адну.
— Я старая зусім, хутка памру.
— Ты так заўжды кажаш, а сама не паміраеш. Напэўна, і далей будзеш жыць.
Трохі памаўчалі.
— Цяжка табе з кіем хадзіць? Я не хачу быць старой.
— Ты й ня будзеш. Застанешся здаровай і прыгожай.
— Трэ было і табе так пастарацца. Не змагла? Проста раней ня ведала, так?
— Так, золатка, так.
Пра пляны на будучыню.
— Я вырасту і замуж выйду. Нараджу сабе шмат дзяцей. Будзеш гуляць з намі?
— Не, але ты ім пра мяне раскажаш. Я цікава жыла.
— А як жыць цікава?
— Нічога ня бойся. Запомніш?
На тле сьвітанку ўласнага жыцьця вастрэй адчуваеш захад жыцьця чужога. Таму звычайна і запамінаюць, і расказваюць.

Трыпутнік
Тры 6-гадовыя сяброўкі на двары спрабуюць вырашыць

мэдычную праблему: адна зь дзяўчынак упала і да крыві параніла далонь. Вядома, моцнага крывацёку няма й блізка, але пакінуць драпіну без увагі юныя дамы не жадаюць. Усе тры ведаюць, што да раны трэба прыкладаць трыпутнік, але ніхто ня ведае дакладна, як ён выглядае. Урэшце, “кансыліюм” вырашае, што падыдзе любы лісьцік, што расьце на дарозе. “Ваша Каця ўпала, мы ёй трыпутнік на руку паклалі!” — крычаць хорам, заўважыўшы мяне. Я азіраю двор. Дажджу даўно не было, трава закурэла ад пылу да брудна-брунатнага колеру, і я з надзеяй пытаюся: “Але ж вы яго памылі?”
Мне адказваюць: “Не, але ты не хвалюйся. Мы яго аблізалі”.

Шкляны каптурык дзяцінства

Гады сталеньня нашых дзяцей — калі яны ня могуць бяз нас абысьціся, ідэалізуюць нас і ва ўсім стараюцца пераймаць — прыпадаюць на гады нашай катастрафічнай занятасьці на працы. Атрымліваецца, што дзеці нашыя растуць самі сабою, як тая трава: сонейка вызірне і сагрэе, дожджык трохі паліе — і добра. Разьвязваць дзіцячыя спрэчкі і праблемы мы вымушаныя літаральна мімаходзь. А яшчэ адказваць на пытаньні, часта нялёгкія, бо не на кожнае зь іх мы самі маем адказ.
Адныя грошы чаго вартыя! Дзіця фіксуе нашу неабыякавасьць да грошай і задумваецца: ці не яны і ёсьць шчасьцем? Дзеці — вельмі катэгарычныя людзі. Бацькам не падабаецца такая пастаноўка пытаньня. Яны пачынаюць актыўна пералічваць астатнія жыцьцёвыя вартасьці. Але прытым адчуваюць нейкі ўнутраны дыскамфорт: ці то ад крывадушнасьці, ці то яшчэ ад чаго.
Дачка радасна паведамляе мне:
— Мне бабуля грошай дала. Дзесяць.
— Тысяч?
— Грошай!
— ?
— Ну, дзесяць усялякіх розных паперак.
З сэксам, дарэчы, разабрацца прасьцей, чым з грашыма. Таму што патрэбнай літаратуры дастаткова, застаецца толькі прачытаць і пераказаць дзіцяці. А калі потым што-небудзь будзе ня так, застаецца тэлевізія, вуліца і доктар Спок — мы за гэта не адказваем.

Дзіцячая псыхіка — датклівая, а эмоцыі нясьпелыя. Аднак дзеці абароненыя ад нашага дарослага сьвету нібыта шкляным каптуром. Які, бы фільтр, адсейвае лішняе. І сьвет дзяцей застаецца сьветлым і вясёлым.
Вечарам ідзём з дачкою з садка. Я пачынаю са звыклых пытаньняў: “Што ты сёньня ела ў садочку? Ці добра спала?” і г.д. На наступны дзень ужо яна спрабуе праявіць клопат:
— Мама, ну-тка распавядзі мне, што ты ела сёньня на працы?
— Амаль нічога, не было калі.
— А хіба выхавацелька цябе не прымушала?
— На працы ў мяне не выхавацелька, а начальнік.
— Ну, дык ён цябе есьці не прымушае?
І я ўяўляю свайго начальніка, які ласкава ўгаворвае мяне што-небудзь зьесьці, перад тым як зноўку ўзяцца за працу.
Сьмешна!

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Людміла Рублеўская

Рэстаўрацыя вясёлкі каляровыя рэфлексіі

Колер марской хвалі

Першае, што я ўзгадваю такога колеру, — новая сукенка з бліскучага шоўку. Мне гадоў восем. Каснікі і гольфы ў тон сукенкі. Я сабе падабаюся. Нахіляюся паглядзець на спалучэнне колераў сукенкі і гольфаў, між якімі мае белыя каленкі здаюцца загарэлымі. У мяне прыгожы вялікі мяч. Маці і бабуля расчулена назіраюць з балкону, як на тле пустога двара, між дзвюх пяціпавярховых хрушчовак — таксама колеру марской хвалі, толькі вельмі бруднай, разведзенай шэрым паветрам — рухаюся я, нібы лялька.

Суседскі хлопец Мішка хоча згуляць са мной у мяч. Мішка — хуліган. З ім лепш не звязвацца. Гуляем у “казла”. Я станаўлюся перад шэрай сцяной трансфарматарнай будкі, Мішка разбягаецца і моцна б’е па мячы нагой, каб “выбіць” мяне. Раз за разам брудны мяч са свістам пралятае побач, часам са страшэнным грукатам трапляе ў жалезныя дзверы будкі...

Мішка чамусьці б’е асабліва злосна і моцна, не так, як у звычайнай гульні. Я раптам усведамляю, што гэта менавіта ад таго, што на мне такая бліскучая, новая сукенка і гольфы пад колер, і акуратныя коскі...
Мішка сеў у турму, як усе і прарокавалі, крыху пазней за старэйшага брата, крываногага Іллюка. Іхняя маці, тоўстая швачка з гучным голасам, патрапіла ў аварыю, калі ехала на электрычцы з Зялёнага. Яна з цяжкасцю ходзіць і таму больш часу праводзіць на балконе. Бачыць мяне і абвяшчае на ўвесь раён:
— Вось ідзе добрая дзяўчынка!
Я ўціскаю галаву ў плечы і бягу ў пад’езд.
Колеру марской хвалі драўляны куфэрачак, абклеены ракавінкамі. Мне дораць яго сваякі, калі мы гасцюем у іх у Кагуле, на мяжы Малдовы і Румыніі. Куфэрачак прывезены з мора. Калісьці мора даходзіла аж да Кагулу. За горадам пачынаюцца кукурузныя палі, роўная глеба ўкрытая ракавінкамі — бледна-шэрымі, напалову перацёртымі ў пясок. Паміж кукурузных плантацыяў — забрасьнелыя канавы. Мой дзядзька Сяргей, галоўны мясцовы аграном, а колісь гераічны партызан Ігуменскага павету, плёхаецца ў гэтай муці. Водарасці чапляюцца на яго загарэлы, як высечаны з каменю, твар. Я грэбую “купацца з жабамі”. У васьмідзесятых з гэтых канаў вылавілі чалавека-мутанта, напалову пакрытага луской. Нават з перапонкамі паміж пальцаў. Гэты небарака хаваўся ад паслявaенных сталінскіх рэпрэсіяў у мутнай вадзе, дыхаў праз трасцінку. Так і не наважыўся выйсці на людзі, пасля звыкся з канаўным існаваннем.

Ружовы
Гэта таксама сукенка “з натуральнага шоўку”. Шоўк робяць маленькія вусені. Яны выпускаюць з сябе чуць значную павуцінку, каб захутаць, абараніць сябе. Шоўк прывезены маміным стрыечным братам з Англіі. Краіны, дзе робяць жуйкі ў выглядзе цыгарэтаў і несалодкія цукеркі.
Сукенка нагадвае адначасова малако і ружу. На пероне станцыі Пухавічы мы чакаем электрычкі на Менск. Стары інвалід на адной назе, з мыліцай, у бруднай балотнай вопратцы — мабыць, яшчэ ваеннай, — з захапленнем разглядае мяне і патэтычна кажа, што вось дзеля таго, каб дзеці апраналіся як

лялечкі, “яны” (за гэтым словам паўстае мноства няголеных аднаногіх дзядоў у падраных галіфэ) і ваявалі, і пакутавалі... Мне сорамна і чамусьці прыкра.
Ружовая гафраваная папера, з якой мы з бабуляй робім кветкі. Кончык шурпатага аркушыка накручваецца на пруток, пасля сярэдзіна расцягваецца, напінаецца, і чоўнік пялёстка чакае злучэння з іншымі вакол абкручанага зялёнай палоскай дрота. Кветак патрэбна шмат — для пахавальнага вянка. На Пабеду мы едзем у вёску, на могілкі, дзе пахаваны попел адзінаццаці маіх сваякоў. Сярод іх — прадзед Максім, які некалі ездзіў на заробкі ў Амерыку. Прадзед зрабіў для партызан млын, пра што маецца адпаведная даведка. Для вянка патрэбна яшчэ дзераза. Мы рвём яе ў лесе, які называецца Белая Лужа.
Я ўрачыста бяру з брацкай магілы трусачку пяску і загортваю ў насоўку з жоўтым зайчыкам. Так робяць персанажы патрыятычных кніг, адпраўляючыся помсціць ворагу.
Ружовыя вусны ў негра, які прыйшоў у нашу санаторна-лясную школу (дэлегацыя замежных студэнтаў). Піянерскія атрады разбіраюць гасцей па класах, асабліва палюючы на гэдээраўцаў, бо тыя даюць значкі. Негр стаіць сярод пустога школьнага калідору і жаласна ўсміхаецца. Нарэшце старшыня нашага атраду Ірка, чуллівая дзяўчына, у якой таксама тоўстыя ружовыя вусны, бярэ самотніка за руку і вядзе ў наш клас, дзе немцы ўжо раздаюць сувеніры.
Ружовыя кветкі растуць на выгане бабулінай вёскі. Яны называюцца пеўнікі. У маёй бабулі ўжо даўно няма свайго дому ў гэтай вёсцы, спаленай падчас вайны разам з жыхарамі. Там жыве толькі бабуліна сястра. Яе лічаць вядзьмаркай. Бабуля Ліда ўмее варажыць і загаворваць хваробу. Дарослыя ейныя дзеці, што з’ехалі хто ў мястэчка, хто ў сталіцу, звяртаюцца да яе на “Вы”.
Ружовы нос паказваецца з круглай дзірачкі драўлянай скрынкі. Скрынку мы знаходзім сярод бутафорыі для здымкаў фільму “Брама неўміручасці” па п’есе Кандрата Крапівы. Ружовы нос варушыцца і сапе, каля яго відаць пяшчотныя белыя шарсцінкі. Я і яшчэ адзін хлопчык з “масоўкі” соваем у дзірку кавалачкі печыва. Нябачны чароўны звярок хрумсціць імі ў цемрыве сваёй вязніцы.
Падчас здымкаў з таемнай скрынкі дастаюць велізарнага белага пацука. Паводле сцэнару яго завуць Мафусаілам і ён

неўміручы.

Чорны

Чорную метку ўручалі аднаногаму Джону Сільверу. Але гэта была падманная чарната: кружок, выразаны з Біблii, піраты намазалі сажай. Сажа абсыпалася на грубыя пальцы Сільвера, і паказаліся парыжэлыя літары Святога Пісання. Мусіць, таму аднаногі Джон шчасліва пазбягае смерці і нават пакарання. Але мне нашмат больш падабаецца іншае апавяданне з той жа стывенсанаўскай кнігі, “Дом на дзюнах” — пра каханне, абвостранае смерцю.

Чорнага колеру круглая пластмасавая пушка ад цукерак. Яе купілі ў краме насупраць Кальварыйскіх могілак. На краме замест зразумелай назвы “Прадукты” — новая: “Гастраном”. Мама тлумачыць, што гэта на лаціне азначае “страўнік чалавека”. Мне пяць гадоў, але я ўжо ведаю, што камусьці ў горадзе бракуе густу. На празрыстай накрыўцы пушкі выціснутыя выявы дзядзькі і цёткі ў нацыянальных беларускіх строях. Празрыстыя абарыгены весела цягаюць празрыстыя снапы і пры гэтым танчаць. Краёчак накрыўкі адбіўся, і пушка дзякуючы паўмесяцу шчыліны ператвараецца ў скарбонку. Капейкі, што пагрукваюць у пушцы, мусяць калісьці прыўкрасіць нашае жыццё ў двухпакаёвай “хрушчоўцы”. Напрыклад, праз набыццё “часопіснага століка”. Паліраванага, чорнага, на чатырох тонкіх ножках, як аленяня... Гэты столік для мяне — увасабленне дабрабыту. Але на што ўрэшце былі патрачаныя сабраныя капейкі — не памятаю...

Чорныя валасы ў маёй суседкі Іны. Бліскучыя і пушыстыя, як цёмны дождж. Іна заўсёды іграе ў нашых хатніх спектаклях прагную да грошай цыганку Дамарэ. Чапляе на распушчаныя косы папяровую чырвоную кветку. Праз пятнаццаць гадоў Іна з’ехала ў Ізраіль, атрымаўшы ў Беларусі высокааплатную прафесію праграміста...

Разам з вясковымі сваякамі збіраем чорныя ягады — чарніцы. Стрыечная сястра Валя ссоўвае белую хустку са спацелага лба.

— Горача...

Сапраўды, нават чорныя ягады страцілі матавасць і сінь ды хваравіта блішчаць, як маленькія вочкі. Я таксама кажу:

— Горача...

Мая бабуля, якая некалі праз гэты лес бегала ў царкоўна-

прыходскую школку, папраўляе:
—Не “горача”, а “жарко”…
Мяне цягне пярэчыць. Я вымаўляю вядомыя мне беларускія словы, і бабуля злуецца.
— Ай, гадкі язык... Не гавары так. Смяяцца будуць.

Колер слановай косткі

Колеру слановай косткі парты ў нашым класе. Не белыя, не бежавыя, а менавіта слановай косткі. Чарніла ўядаецца ў шматслойную фарбу. Плямы зачышчаюць лязом дзяжурныя.
У шостым класе гэтымі лёзамі некаторыя дзяўчынкі рэжуць сабе вонкавы бок запясця, на згіне. Шык у тым, каб шнары ішлі паралельна і як мага больш густа. Светка Леановіч, двоечніца, якая займаецца конным спортам, усмешліва паласуе сябе пад партай на ўроку ангельскай мовы. Яе сяброўка, выдатніца Міхнавец, спрабуе рабіць тое самае, але войкае і зайздросна паглядае на мужную Светку.
Я прыходжу дадому і рэжу сябе лязом. Чырвоныя ніткі кладуцца адна ля адной. Кроў сцякае і капае на пісьмовы стол. Я не войкаю, не моршчуся, што і адзначаю з самазадавальненнем. Толькі пальцы халадзеюць. Усведамляю, што мая скура набыла колер слановай косткі. У высакародных іспанскіх прыгажунь твары такога ж колеру. Гэта, напэўна, прыгожа спалучаецца з чорнымі кудзерамі. Спыняюся не ад болю. Чамусьці робіцца страшэнна сорамна. Мажу шнары ёдам і закручваю бінтам. Пасля два тыдні апранаю пад школьную брунатную сукенку гольф з доўгімі — аж да пальцаў — рукавамі.
Вершніца Светка Леановіч патрапіла ў турму. У ружавашчокай прыгажуні Міхнавец знайшлася радня ў Фінляндыі, і сляды яе губляюцца на радзіме Ахола-Вялы й Сібеліуса.

Бэзавы

Бэзавы — гэта Ўрубель і прыцемак, гэта снег пад вокнамі прыватнага сектару. Мы блукаем тут з аднакласніцай.
Бэзавы снег лёгка лепіцца ў снежкі. У адным з дамкоў жыве Ленчын каханы, яму трыццаць, ён разведзены, лячыўся ў псіхлякарні ў Навінках і не ведае, што Ленка — непаўналетняя. Мая сяброўка сапраўды выглядае самавіта, у адрозненне ад мяне. Мы кідаем снежкі ў вокны дому, дзе жыве ейны сябар, і

ўцякаем.
Потым сваякі таго сябра даведаюцца, што насатай дзеўцы іхняга няўдалага родзіча чатырнаццаць гадоў, і дзверы драўлянага дамка ля чыгункі назаўсёды для яе зачыняцца. Марозным вечарам, калі снег быў бэзавы і Ленчын доўгі нос, відаць, таксама набыў той жа колер, выпадковы мінак адпіхне маю зарумзаную сяброўку ад рэйкаў з-пад самай электрычкі. Праз тры гады Ленка выйдзе замуж за будаўніка-інтэрнатаўца з залатым зубам па мянушцы Лісапет. Лісапет, ажаніўшыся з Ленкай, атрымаў менскую прапіску, але не збіраўся развітвацца з вясёлымі інтэрнатаўскімі дзяўчатамі. Пасля чарговай сямейнай сцэны ён паспрабуе “разабрацца” па-вясковаму, кулакамі. Ленка вычакае, пакуль ён засне, звяжа і адгваздае пранікам. У паліклініцы, куды Ленку выклічуць, яна з парогу заявіць, што пабіла мужыка сама і, калі хочуць, хай здаюць яе ў міліцыю. Доктаркі з раённай паліклінікі Ленку не здадуць. Бэзавы нос — у п’янтоса з апошняга пад’езду па мянушцы Сліва. На 9 Мая нас пашлюць да яго як да ветэрана, каб мы запрасілі яго выступіць у школе. На здзіўленне ўсім, Сліва прыйдзе паголены, у ваеннай форме з мноствам ордэнаў і медалёў. Распавядаць будзе цікава. Напрыклад, пра пустыя прасвідраваныя каністры, што скідвалі немцы замест бомбаў. Пустэлькі свісталі і грукаталі жудасней за сапраўдныя бомбы. Потым суседзі раскажуць, што Сліва быў заслужаным энкавэдыстам.
Бэзавыя кусты растуць пад акном хлопчыка, які мне ў шостым класе пачаў страшэнна падабацца. Яго вокны насупраць маіх, і мяне — проста як хвароба нейкая — цягне туды глядзець.
Я абураная такім гвалтоўным абмежаваннем сваёй волі. Прымушаю сябе не падыходзіць да акна. Не думаць пра Яго. Не адчуваць пры сустрэчы гарачага трымцення. Праз тыдні два хвароба адступае. Атрымана першая перамога над уласнымі інстынктамі.

Балотны
Балотнага колеру сшытак, у якім я пішу вершы. Мне чатырнаццаць гадоў, я люблю чытаць пра Авадня і эсэра Андрэя Кожухава. Пішу пра чорныя “Чайкі”, якія ляцяць па праспекце і вязуць свінападобных чыноўнікаў, пра маразматыка-генсека і спецмагазіны... Адчуваю сябе гераіняй

падпольнай барацьбы. Прыходжу са школы. Маці і бабуля моўчкі сядзяць па розныя бакі пакою. На круглым стале ў цэнтры — мой балотны сшытак. Бабуля і мама вельмі асцярожна, баючыся маёй натурыстасці і адначасова датклівасці, тлумачаць, што праз сшытак могуць быць непрыемнасці. Мне жыць ды жыць яшчэ...
Урэшце з маёй згоды балотны сшытак знікае. Наколькі я ведаю, яго спалілі. Дзіўна, але гэта не вельмі мяне засмуціла. Я ведала, што вершы ў ім слабыя.
Пасля я даведаюся, што мама пісала на завочным аддзяленні журфаку дыпломную працу па творчасці Даніэля і Сіняўскага якраз у той год, калі герояў ейных даследаванняў пасадзілі. Напэўна, яе навуковы кіраўнік, вядомы беларускі пісьменнік, гэтак жа асцярожна, але настойліва раіў пачакаць з дапрацоўкай абранай тэмы. Мама так ніколі і не ўладкавалася на працу журналісткай.
У вокладках балотнага колеру ў раённай бібліятэцы самыя цікавыя кніжкі. Іх, зачытаных да дзірак, апраналі ў дэрмацін. На паліцы фантастычнай літаратуры, сарамліва схаванай у куце ля самай падлогі, амаль усе кніжкі ў такіх вокладках. Балотнага колеру сцены на кінастудыі “Беларусьфільм”, дзе масоўка чакае ля дзвярэй касцюмернай. Густы вясковы пах сярод паліцаў з грудамі даматканых світак, хустак у шашачкі і зрэбных кашуль. Балотнага колеру апранаха пераўтварае мяне ў маленькую партызанку.
Пасля ў бутафорскім партызанскім гарадку пад Смалявічамі я бягу ля насілак з параненым чырвоным партызанам, пад бутафорскія стрэлы і бутафорскія выбухі бутафорскіх бомбаў. “Добра бяжыш, дзяўчынка!” — крычыць рэжысёр.
Балотнага колеру нашы шпалеры, на якіх мне дазволена маляваць усё, што захачу. У асноўным гэта чалавечкі і выбухі бомбаў.

Залаты

У нашай сям’і няма сапраўднага ювелірнага золата. Першая залатая рэч, якую я займела, — уласны заручальны пярсцёнак. Але залатога колеру хапае. Залаты маленькі куфар з пластмасавым замком. У ім я захоўваю зробленыя з залатой фольгі мініяцюрныя — не большыя за вішнёвую костку — кубкі, талеркі, вазы і нават лыжкі. Гэты сервіз належыць

ангельскай каралеве Лізавеце Другой. Дакладней, ейнай выяве на паштоўцы. Каралева ў параднай срэбнай сукенцы, з сіняй атласнай стужкай цераз плячо. Паштоўку даслаў з самой Англіі мамін стрыечны брат, той, што прывёз і порт натуральнага ружовага шоўку на маю сукенку.
Я накрываю перад каралевай шыкоўны стол і шчыра веру, што яе Віндзорскай душы прыемнае вяртанне звыклай раскошы. Мне няёмка перад срэбнай Лізаветай за нашу сціплую кватэру з шпалерамі балотнага колеру, бляклы ўзор на якіх нагадвае макароны ў палёце — увасабленне савецкай манны нябеснай. Каралева паглядае разумнымі светлымі вачыма перад сабой. Яе вялікі рот, нафарбаваны неверагодна яркай памадай, крыху ўсміхаецца. Усміхаецца нават цяпер, калі Лізавета даўно пазбаўленая сервізу з залатой фольгі і мае дзеткі падрапалі яе наўскос па твары.
На свяце восені ў трэцім класе я ўвасабляю Залатую восень. На мне кароценькая жоўтая сукенка з нашытымі восеньскімі лістамі. Восені з іншых класаў усе вышэйшыя за мяне, у доўгіх казачных сукенках, у каронах з вэлюмамі. Я губляюся на сцэне між іх, як жоўценькі матылёк у траве. Дырэктарка ледзь знаходзіць мяне, каб уручыць за найлепшы касцюм прэмію — надзіманую ляльку-неваляшку.
Я злаўчылася перадаваць залаты колер, змешваючы белую і жоўтую гуаш, а пасля адцяняючы мазкі цёмным лазуркам.
У мастацкай студыі я малюю казачны каралеўскі двор, кароны і жар-птушак. Але ганаровую грамату мне даюць за праект помніка дзецям-ахвярам вайны. Пень, які сімвалізаваў скалечанае вайной дзяцінства, абвіты парасткамі, што ўвасабляюць неўміручасць жыцця. На пні дзве няшчасныя разнаполавыя ахвяры ўмольна паглядаюць у прастору. Яшчэ, здаецца, ёсць калючы дрот.
Залатыя валасы ў лялькі, якую я сама шыю. Валасы зробленыя з навагодняга дожджыку. Лялька файная, вышытая, размаляваная. Бабуля жахаецца: гэта ж толькі ад беднасці — самаробныя лялькі! А як нехта ўбачыць, што дзіця з такой гуляе! Ёсць жа куплёныя! Бабуля адбірае маю Залатавалоску і хавае на дно валізы з кавалачкамі тканінаў і гузікамі. Калі праз нейкі час я ўспамінаю пра ляльку, яе і след замяло.
Залатыя гузікі на маёй піянерскай форме. У сёмым класе, па развітанні з піянерыяй, мы перафарбоўваем белыя форменныя

кашулькі ў чорны колер. Залатыя гузікі надаюць кашулькам асабліва модны выгляд, але ж і выдаюць іх паходжанне. Залаты герб выціснуты на пашпарце, які мне ўручаецца з нагоды майго шаснаццацігоддзя. Цяпер я дастаткова дарослая, каб ведаць, што гэта — зусім не золата.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Сакрат Яновіч

Дзяцінства чалавека

Радаснае дзяцінства — гэта міт, у якім мала рэальнага. Ягоная памятнасьць палягае ў чымсь іншым, у тым менавіта, што малы чалавек пазнае сьвет, агонь і ваду, смак хлеба і ўсё тое, што яго акаляе і з чым ён будзе жыць. Усенька — першы раз, і таму памятаецца. Прашу зьвярнуць увагу на імглістую памяць у дарослых, у якіх дні, месяцы і гады зьліваюцца, забываюцца. Чаму? У дарасласьць мы мала што адкрываем, нудна паўтараем ужо вядомае. Гэта рутына. Дзень падобны на ўчарашні.

Дзяцінства ўяўляе сабою поўную залежнасьць ад бацькоў, перш за ўсё псыхічную. За што ні вазьміся, усё забаронена або мусіць быць пад кантролем мамкі-таткі ці бабкі. Я вельмі любіў стругаць шавецкім нажом бацькі, асабліва фігуркі зьвяркоў, а ў вайну — самалёты і карабіны (як гэта — хлопец!). Мне не давалі, каб не пакалечыўся, і я рабіў гэта патаемна, зачыніўшыся ў шопцы з дровамі, дзе, фактычна, ня раз рэзаўся. Магчыма, ад патайнога сьпеху...

Колькі памятаю, усё было “ня можна”. Ні хутка бегаць па траве, ні наесьціся яблыкаў, ні пайсьці да цёткі па ласункі, ні купацца

ў рэчаньцы, у якой вады паршуку па калені… Што ні рабіў, рабіў як бы нелегальна. Нават гуляць зь дзецьмі ў хованкі. Гэты сындром недазволенасьці настолькі глыбока залез у псыхіку, што рос я неяк супроць бацькоў. Часам плакаў, дамагаючыся чагосьці, тады нярэдка канчаўся мой пратэст скарабоем. Гэтак ад дбайнасьці маткі, каб мне што благое ня здарылася. Бацька менш зьвяртаў увагі, іншы раз кажучы: “Глядзі, маці, што ён чаўпе!”
Як гэта разумець? Думаю, што адказ на тое дае сама мова. У ёй, народнай, не знаходзім слова “выхаваньне”. Замест яго чулася “гадаваньне”. Дзяцей якраз гадавалі, а не выхоўвалі. У гэтым адчувалася нешта з хлява… Жыў на нашай вуліцы Сакольскай кніжнік Шыманчык, які тым вырозьніваўся сярод сялянскай публікі, што гаварыў “вучонаю моваю”, г.зн. расейскаю. Ён дачку Рэню шпарыў з правіны дзягаю па кульшах, называючы пабой “хорошим воспитанием”. Рэня пасьля “воспитания” пару дзён хадзіла растапыраная, быццам пасьля гульні з падшпаркамі ў маму з татам у пасьцелі… У тадышняй хатняй цеснаце нічога не бывала тайніцаю ці прыватным сакрэтам. Спалі, як снапы на таку.

Дарослыя нават сёньняшнім часам рэдка дураць сабе галаву псыхалёгіяй дзіцяці. Ім неўздагад, што ў малога свая асобнасьць і патрэбы, акрамя ежы ды апраткі. Дзіцячы сьвет не падобны да сьвету бацькоў — ён байкавы ды фантастычны. Выраслага чалавека пачынае гнуць і гарбаціць заклапочанасьць бытам. Так званыя ваенныя дзеці, зазнаўшыя голаду і холаду, бяздомнасьці, надта рана ператвараюцца ў мужчын і ў бабаў. Хто цяпер паверыць, што ў тую ці іншую рэвалюцыю шаснаццацігодкі бывалі за камандзіраў палкоў, а славуты Гайдар у такім веку вёў у бой цэлую дывізію бальшавікоў?! Гісторыя Сярэднявечча ведае дзіцячыя галодныя паходы ў Эўропе, надзвычай крывавыя, накшталт сучасных бойняў у Афрыцы салдатні зь дзесяцігодкаў, якім ледзь пад змогу валачыць карабін, апаясаўшыся лентамі патронаў. Дзеці больш бязьлітасныя, чым дарослыя. Проста садысты. Могуць злупіць скуру з чорнага ката на панадворку. Бо ў дзяцей няма эмоцыяў, якія ў нашай расы зьяўляюцца не раней дванаццатага году ў дзяўчынак і чатырнаццатага ў хлопчыкаў. Зьвязана гэта з пачаткамі полавага высьпяваньня. Таму дзіцячыя арміі чорнае

Афрыкі ня гвалцяць жанчын, бо нашто яны; узяўшы горад, выстрэльваюць да апошняе нагі насельніцтва, пра што мы тут і ня чуем, бо каторая газэта цікавіцца масакрамі на “дзікім” кантынэнце? Сьмерць аднаго палестынца важнейшая за пагібель дваццацітысячнага места ў нейкай Угандзе ці Руандзе. Чаму выстрэльваюць масамі? Ну, дзеці гуляюць у расстрэлы, ім сьмешна, як людзі скурчваюцца ў сьмяротных канвульсіях. Даводзілася бываць з бацькамі на паховінах сваякоў, дзядзькоў і цётак. Заўсёды пачуваўся я сьмешнавата, бо сьмерць уяўлялася мне тэатрам: вось разьлёгся ў труне здаравезны Антон, наўкола яго бабы плачуць, ажно зараз возьме ён ды схопіць ручыскам каторую зь іх за лытку або цыцку... Рогату будзе!
Дзеці несьмяротныя! Ім памірaньне што цырк! І тыя ў чорнай Афрыцы, пэўна, націскаючы на цынгель “калашнікава”, разважалі, відаць, падобным чынам: паласну ім куляй па жыватах, хай трохі “памэнчацца”, каб адхацелася потым шкодзіць вайне. Армія малых, рабуючы крамы, як думаеце, што брала трафэямі? Цукеркі і цацкі, фрукты і смачноты, а не касьцюмы, гадзіньнікі і тэхніку.
Усё, што здарылася з мною ў жыцьці, пачыналася шэсьцьдзесят гадоў таму, у дзяцінстве, на Сакольскай, 27 у Крынках. А выхад з тае дзіцячае “нелегальшчыны”, калі ўсенька трэба было выпрошваць, даў мне пачуцьцё сапраўднае шчасьлівасьці. Першыя заробкі і свае грошы — усё роўна што ўласныя дзесяціны халопу пасьля паншчыны. Дзеці малпуюць бацькоў, і таму, пераважна, добрыя яны ў добрых і благія ў благіх. З гэтым — бы з законам акцыі і контракцыі ў фізыцы. Здараюцца, праўда, адступленьні ад таго правіла, але адступленьні, як вядома, толькі пацьвярджаюць правіла. П’яніца бацька плодзіць п’яніцу сына, а курва маці нараджае курву дачку. Так, як з тым яблыкам, што *ня* падае далёка ад яблыні. Калі я жаніўся, дык мой будучы цесьць слушна пацікавіўся ў людзей, якія ў мяне бацькі: разумныя ці бесталачы, ахайныя ці брыдота калтыжная. Хоць чуць ня чуў ён пра генэтыку.

Што вырашыла ў маім лёсе дзяцінства? Прыклад ішоў ад маіх бацькоў, а былі яны рамесьнікамі (бацька — шавец, маці — краўчыха). Рамесьнікам ня можа быць чалавек зь несамастойным характарам, з псыхалёгіяй савецкага парабка.

Я ўжо ў чацьвертай клясе пачатковае школы — на адзінаццатым годзе жыцьця — сплянаваў будучыню, лепшую. Абавязкова лепшую! Нават запрыкмеціў аднаклясьніцу, зь якой калісьці ажанюся. І што думаеце? Характарам яна была падобная да мае маткі.

Хлопчык больш хіліцца да маці, дзяўчынка да бацькі. Гэта натуральнае і ў згодзе з полавым інстынктам. Да гэтага трэба дадаць вырашальную ў стварэньні сям'і ініцыятыўнасьць мужчыны. Сындром самца, што знаходзіць адбітак у мове. Заўважце фразу "Яе чалавек". Гучыць як "Яе пан". Або, дзеўку "бяруць замуж" — от, ні больш, ні менш: прыходзяць і бяруць. Замужнюю "трымаюць" — у сэнсе: кормяць, апранаюць, даюць кут. Кажуць: "Сьцяпан трымае Зіну", што значыць: Зіна ёсьць жонкаю Сьцяпана. Расеец сказаў бы пра тое вульгарна: "Степан женат *на* Зине" або "Степан взял *в жёны* Зину".

Мужчыну ніхто не бярэ, нават прымака. Толькі ён бярэ, пасаг таксама. Ну што — патрыярхат! А што будзе з намі, самцамі, калі настане... матрыярхат?!

Дзяцінства, асабліва маленства, можна параўнаць зь несьціханым плачам. Малое адчувае сваю бясьсільнасьць, а маючы жаданьні, зазвычай супярэчныя жаданьням бацькоў, плачам вымагае ад іх дазволу. Прычым у нас дзяцей б'юць-шпараць, што вынікае зь нізкае культуры выхаваньня, нясьпеласьці самога бацькоўства. Мы застаёмся варварамі, аб чым ня ведаем ды ніхто нам ня кажа. Дзіця ў нашых умовах уяўляе сабою выпадковае існаваньне, плод сэксуальнага недагляду, памылкі. Нараджаецца, быццам прыкрая выпадковасьць. Пераважна раней, чым таго хацелася б. Даўней людзі жаніліся сур'ёзьней. Была гэта эканамічная зьдзелка, гаспадарчая дамова, матэрыяльны парытэт. Сёньня ж часта жэняцца таму, што ў нарачонай ужо расьце жывот, радзіць будзе! Такія жаніцьбы яшчэ паўбяды ў параўнаньні з савецкімі ці амэрыканскімі — па чатыры-пяць разоў, пакуль мужчына трымаецца на нагах, замест валяцца ў шпітальнай пасьцелі. Гэта вялікая праблема грамадзтва. Прыходзяць на сьвет цэлыя пакаленьні з мэнталітэтам байструка. Фактычна паўсіроты, якія ведаюць толькі матку. Яшчэ антычныя рымляне казалі: ня можаш быць упэўнены ў тым, хто твой бацька. Нармальнаму выхаваньню дзіцяці патрэбна псыхалягічная раўнавага, жаноцкасьць і мужчынскасьць. Ласка і суровасьць.

Пахіснутая раўнавага ў пакінутай жонкі зь дзіцём выклікае ў яе празьмернае жаданьне апекавацца, у выніку чаго вырастае дзіця-лялечка. Вельмі дбайна дагледжанае, таму пазбаўленае самастойнасьці. Выхаванае ў комплексе коціка на канапе. Разам са сьмерцяй маці гэты “коцік” не дае рады сам жыць, ня ўмее. Калі дзяўчына, то ідзе ў прастытуткі, а калі хлопец, то пускаецца ў бандыцтва. Абое хочуць надалей лёгка жыць, як было пры матцы. Грамадзтва з пакінутымі жонкамі — гэта грамадзтва распаду і дэгенэрацыі, алькагалізму. Заўважаем тое ў саветаў, нешта падобнае ўжо ў амэрыканцаў дый тут, у нас саміх. Гэта толькі на дурны погляд забаўна бегаць “па бабах”. Фінал таго трагічны для нацыі, трагічны і для бабніка, які, раней ці пазьней, застаецца ў самоце, непатрэбным з гадамі сьмецьцем. Бачу такіх аж занадта ў свае немаладыя гады.
Маё дзяцінства было ваеннае. Бацька пакутаваў у нямецкай няволі; я пажываў з маці і бабусяй. Бедна вельмі. На ўсё жыцьцё засталося адчуваньне паху варанае ў сагане бульбы, боскі водар каляднай ялінкі, зрубанай дзядзькам у блізкім лесе; духмянасьць матчыных пернікаў, сьлінацёк ад хлебу ў печы і той “хлеб насушчы” ў царкве, што я разумеў як “хлеб насушаны”... Шчасьцем было наесьціся яго, таму і цяпер рука не падымаецца шпурнуць укамянелую скарынку ў сьметнік. Выхоўвае лёс. Раскошны лёс *не* выхоўвае, чаго ня кеміць наша памешчанелае мужыцтва, аддаючы ўсе сілы на стварэньне раю дзецям. Цывілізацыі дабрабыту доўга не трываюць, калі ў іх дзеці бязьмерна разбэшчаныя. Праз дваццаць гадоў старыя памруць, а іх месца зойме якраз разбэшчаная тымі старымі бацькамі моладзь.
Божа, дай нам розум выхаваць дзяцей і ўнукаў у цноце, каб не плявалі на Айчыну і не шукалі амэрыканскага шчасьця!
Не пашкадуй, Усявышні!!!

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Зьміцер Саўка

Выхаваньне — гэта ня толькі мова

Інтэрвію з мовазнаўцам Зьмітром Саўкам аб праблемах выхаваньня, зь якімі сутыкаюцца беларускамоўныя сем’і ў гарадах

—Зь якімі праблемамі выхаваньня сутыкаюцца беларускамоўныя сем’і? Ці можна акрэсьліць, якім мусіць быць нацыянальнае выхаваньне?

— Ня трэба наўмысна выхоўваць дзіця ў беларускай мове. Калі вы ўсе ў хаце будзеце проста гаварыць па-беларуску, дзіця

засвоіць гэтую мову. Ніякіх дадатковых намаганьняў не патрабуецца. У бацькоў, якія гавораць дома на дзьвюх мовах, як правіла, беларускамоўных дзяцей не атрымліваецца. Самая вялікая праблема пачынаецца тады, калі дзіця даведваецца, што існуе яшчэ адна мова, а менавіта — расейская, і што на ёй размаўляе якраз бальшыня. Вось тады дзіця імкнецца спачатку ўстаўляць расейскія словы (бо не дыфэрэнцыюе моваў). Калі ж працэс дыфэрэнцыяцыі заканчваецца, дзіця можа размаўляць па-расейску. Справа ў тым, што дзіця ня можа й не павінна быць носьбітам ідэяў. Можна растлумачыць яму, што мы беларусы і мусім размаўляць на нашай мове, толькі ці будзе яно пераканана? Бо часам бачыць, што бацькі чакаюць ад яго беларускай мовы, і з пачуцьця пратэсту гаворыць ім па-расейску. Гэта нармальны для дзіцяці мэханізм супраціву, азарту: а што будзе, калі я зраблю ня тое, чаго ад мяне чакаюць? Ня трэба акцэнтаваць на гэтым увагу або ціснуць на дзіця. Мы стараемся растлумачыць сваім гадаванцам, чаму варта гаварыць па-беларуску нават з расейскамоўнымі дзецьмі. Мы кажам: яны цябе разумеюць, а калі не разумеюць, хай вучацца, а калі ня хочуць вучыцца, відаць, ты для іх проста не такі каштоўны. Ну, сябруй зь іншымі дзяцьмі, пад якіх табе не давядзецца падладжвацца. Гэта пэдагагічная ўнівэрсалія: калі цябе не прымае кампанія, шукай іншае. Самаму большаму майму дзіцяці 13 гадоў, і я не раблю трагедыі з таго, што яно размаўляе са школьнымі сябрамі па-расейску. Дзіця не павінна быць ані змагаром, ані ахвярай. Дзіця — статкавае стварэньне. Індывідуалізацыя асобы адбываецца значна пазьней, недзе каля 20 гадоў. Штурхаць дзіця, якое не дарасло псыхічна, да выдзяленьня свайго ego з соцыюму — значыць узмацняць ягоныя комплексы і закладаць новыя.

— Выхаваньне — гэта ня толькі мова. Што яшчэ?

— Я выкладчык, і за шмат гадоў стаміўся нешта тлумачыць. Таму я ўласным дзецям не распавядаў штодня пра Вітаўта Вялікага ды Эўфрасіньню Полацкую. Тут як з моваю — ня варта штосьці рабіць адмыслова. Калі ты размаўляеш зь дзецьмі на любую тэму, праступае так ці інакш нацыянальны момант — момант візіі. Візіі жыхара беларускай сталіцы. Напрыклад, едзем мы ў аўтобусе, я кажу: вось такія зручныя новыя аўтобусы ў нас у Менску сталі рабіць. І дзіця ведае: у нас гэта

ўмеюць, у нас гэта робяць. Так на кожным кроку. Якое б ідыёцкае ні было пытаньне, я ніколі не кажу: “Адчапіся!”. Заўсёды адказваю. У побытавых штодзённых гутарках абавязкова прысутнічае тэма “Беларусь і сьвет”. Мае дзеці ведаюць, што былі на нас розныя навалы, а вось цяпер мы маем сваю дзяржаву. Для маіх дзяцей існуе паняцьце “краіна”, “горад”, “дзяржава”. Я ўпэўнены, што для бальшыні дзяцей з нацыянальна індыфэрэнтных сем’яў такія паняткі яшчэ нічым не напоўненыя. Натуральна, мае дзеці ведаюць, што існуе такая праблема, як расейскае прэваляваньне. Але трэба данесьці такую тонкасьць: калі беларус гаворыць па-расейску, гэта абсалютна ня значыць, што ён не беларус. Сяброўкі маіх дачок Юстыны й Караліны (9 і 8 гадоў) гаварылі па-расейску, і дзяўчаты мне кажуць: “Гэта расейская дзяўчынка”. Я адказваю: “Не, проста ў іх у сям’і ніхто не адукоўваўся па-беларуску, але ты можаш іх навучыць”. Для дзіцяці вельмі важна, што яму надаюць ролю настаўніка, мэсіі. Хаця яно гэта не заўжды выкарыстоўвае. Ня кожны любіць пастаянна быць настаўнікам.

— Ці былі Вашыя дзеці дыскрымінаваныя ў асяродку раўналеткаў з-за сваёй беларускасьці?

— Дзеці — стварэньні самыя пяшчотныя й самыя жорсткія. Яны знойдуць 1001 прычыну, каб пазьдзекавацца зь іншага. Калі дадаецца 1002-я прычына, гэта ўжо ня так істотна. Прыбраць усе фактары, па якіх вашае дзіця будзе дыскрымінаванае, вы ня зможаце. І нават сотую іхную частку. Я не баюся адпускаць сваё дзіця ў сьвет. Асоба, якая фармуецца ў Менску, засвойвае расейскую мову рана і ў поўным аб’ёме. У дзіцяці заўсёды хапае інстынкту не канфрантаваць з асяродкам. Увогуле, часьцей дзеці пачуваюцца лепей з-за таго, што на фоне аднамоўных раўналеткаў валодаюць дзьвюма мовамі. Бацькі гавораць дзіцяці: “Ты лепш адукаваны. І ўвогуле, усе прыстойныя людзі ведаюць беларускую мову, глядзі!”

Гутарыла Сьвятлана Курс

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Адам Глёбус

Дачка
Словы пра маю дачку Ядзю

Цацка-Кіцік
Любімая цацка ў Ядзі — блакітны пластмасавы кіт. Ён невялікі — сантымэтраў дваццаць, падрапаны і халодны. Як такога можна любіць? А вось любіць, да грудзей прыціскае, лашчыць са словамі “кіцік, мой кіцік”.
А колькі было крыку і сьлёз, калі кіціка пусьцілі плыць па вясновай ручаіне ўздоўж асфальтавага ходніка. Плыў ён, плыў у іскрыстым сонечным струмені, блішчаў вільготнымі бакамі, пакуль не ўваліўся ў закратаваны вадасьцёк. Кіцік даў ныpца паміж мэталёвымі пруткамі. А Ядзя ўсчала лямант на ўсю вуліцу Янкі Маўра. Добра, што хвост любімца быў значна шырэйшы за галаву. Тым хвастом цацка зачапілася за пруты і павісла над чорна-сьцюдзёным прагалам. Выратавалі мы кіціка, абцёрлі насоўкаю. Занесьлі дамоў. І больш ні разу Ядзя ня брала сваёй улюбёнай цацкі на прагулку.
29.04.2002

Героі

У кожнага дзіцяці свае героі казак і апавяданьняў. Ёсьць супольныя — Сьнежная Каралева, Алядын, Гулівэр і Рабінзон Круза, — але зьяўляюцца і непаўторныя, асабістыя. У Ядзі іх было тры: манэўровы цягнік Манэўруша, Бэтонамяшалка і Вогнетушыцель. Чаму гэтыя рэчы, гэтыя мэханізмы пакінулі найглыбейшы сьлед у яе трох—пяцігадовай сьвядомасьці — ня ведаю. Уразілі, і ўсё! І яна патрабавала ад мяне самаробных казак пра Манэўрушу, Бэтонамяшалку і Вогнетушыцель.

Я імправізаваў… Манэўруша езьдзіў і ў Маскву, і ў Варшаву па запчасткі. Бэтонамяшалка выходзіла замуж за вежавы кран, і ў іх нараджаліся маленькія трактары. Вогнетушыцель выратоўваў лес ад пажару. Зь ім было лягчэй — дастаткова было падпаліць нешта знаёмае. Гэта ўсё станоўчыя і любімыя героі, а быў яшчэ й злосны, гідкі, агрэсіўны Вантуз. Ён ня толькі не хацеў працаваць, прамываць чарупіну і ванну. Ён і шкоду рабіў: Манэўрушы клаў цагліны на рэйкі, у Бэтонамяшалку закідаў цьвікі, падпальваў Палац спорту і Палац мастацтваў… Карацей, жыў паўнакроўным лёсам злачынцы зь вялікай дарогі.

Даўно тое было, а цяпер, чакаючы ўнука, думаю: каго ён абярэ ў свае героі, хто і што ўразіць ягоную душу. Час ня толькі хутка ляціць, ён яшчэ хутчэй мяняе герояў.

29.04.2002

Дзень нараджэньня

Адзін з самых радасных дзён у маім жыцьці — дзень, калі нарадзілася Ядзя, 25 лістапада 1983 году. Сьнегу было шмат, у лесе пад горадам — ледзь не пад пояс. Я вярнуўся ў Менск з сэмінару маладых літаратараў, ішоў па Бранявым завулку ў бок сіняга засьнежанага парку, за які садзілася вялікае й яснае сонца. Жоўты, сіні, чырвоны колеры перапаўнялі мяне. Мароз надаваў усяму існаму крыштальную чысьціню і гармонію. “У мяне нарадзілася дачка. У мяне ёсьць дачка…” — я паўтараў і паўтараў гэта рознымі словамі і з рознымі інтанацыямі, уголас і самому сабе, як запавет, як кленіч, як малітву.

Калі мне цяжка, млосна, маркотна, невыносна, я ў думках вяртаюся ў той дзень, у той стан, да сініх дрэваў, да чырвона-жоўтага неба, да глыбокага чыстага сьнегу, кажу: “У мяне ёсьць дачка”, — супакойваюся і радуюся гэтаму сьвету.

30.04.2002

Ток
Нарадзілася мая Ядзя ня ў дзевяць месяцаў, а ў сем. Не данасіла жонка дзіця, а ўсё з-за празьмернай працавітасьці. Трэба было ёй ставіць экспэрымэнты ў Акадэміі навук зь нейкай там цэнтрыфугай? Трэба было дасьледаваць пярэгарадкі мэмбранаў і іх уплыў на працэсы старэньня чалавечага арганізму? Можа, і трэба. Але празь любоў да ўсяго чалавецтва мы ледзь не згубілі нашае дзіця. Трыклятая цэнтрыфуга ўдарыла Алену токам, ды так лупанула, што арганізм ня вытрымаў і роды пачаліся раней тэрміну. Дачка была зусім маленькая, важыла крышку больш за два кіляграмы. І яе, бедную, адразу зьмясьцілі ў празрысты бокс на цэлыя два не даходжаныя жонкай месяцы.
Акадэмію навук зь яе вайскоўствам, досьледамі над жывёламі, таталітарным мысьленьнем я не любіў даўно, а пасьля выпадку з Аленай узьненавідзеў і зрабіў усё, каб Алена не вярнулася на працу ў Інстытут геранталёгіі. Яна й не вярнулася, стала рэвалюцыйным фатографам і зрабіла безьліч партрэтаў нашай Ядзі.
30.04.2002

Розум
“Не зьбірай дзецям грошы, зьбірай розум”, — казала баба Броня. І ня толькі казала, а і навучыла сыноў.
Гэтым афарызмам-сэнтэнцыяй карыстаюся і я. Зьбіраю, праўда, грошы, каб Ядзя хоць колькі магла павучыцца ў Лёнданскім унівэрсытэце. Наколькі вучоба і веды даюць розум, можна дыскутаваць. Македонскага вучыў Арыстотэль, выйшаў заваёўнік. Нэрона спрабаваў адукаваць Сэнэка, а тыран спаліў Рым. І ўсё ж ангельская адукацыя адрозьніваецца ад беларускай у лепшы бок. Вярнуўшыся зь Лёндану, Ядзя абняла мяне, пацалавала і сказала: “Татачка, я такая табе ўдзячная, такая ўдзячная… Ты сам ня ведаеш, што ты для мяне зрабіў…” Хіба ўдзячнасьць не праява розуму? Праява, самая натуральная.
01.05.2002

Кефір
У Алены не хапала свайго малака, каб карміць Ядзю. На такі

выпадак была ў Менску дзіцячая кухня. Шторaніцы я бег туды з бутэлечкамі, выстойваў чаргу. Чаму ў чарзе амаль не траплялася мужчынаў? Чаму цёмнымі зімовымі ранкамі ў мароз і сьнег па кефір для немаўлят прыходзілі цёткі і бабулькі? Ня ведаю. Але мне ад гэтага было толькі лепш, бо “тату” пускалі без чаргі. З кухні, пазвоньваючы бутэлькамі, я бег у радзільны дом, дзе мая дачка вельмі добра ела і празь месяц стала звычайнай дзяўчынкай, якую мне аддалі ў ружовым кульку вясёлыя мэдсёстры.
01.05.2002

Cool
Як найлепш нашы ўзаемаадносіны можна пазначыць ангельскім словам “cool”. Паміж мной і Ядзяй заўсёды была прахалода, сьвежасьць, не існавала напалу і страсьці. Спакой, празрыстасьць, халаднакроўнасьць застаюцца і цяпер. Часам і я і яна бываем “дзёрзкімі, бессаромнымі, нахабнымі”, але й гэта ўкладаецца ў слова “cool”. Паміж намі няма вуглоў, фактур, шурпатасьцяў. Пасьля ўдару мы разьлятаемся ў розныя бакі, як два більярдныя шары. І астываем хутка, як гарбата на ветры.
01.05.2002

Кручэньне галавы
Заўважалі мы з жонкай, як Ядзя круціць галавою. Мы яе кладзём у ложачак, а яна заплюшчвае вочы і пачынае матляць галавою то ўправа, то ўлева. А як заўважылі, занэрваваліся. І ў каго ні спытаем, ніхто ня ведае. Нават дасьведчаныя дактары кмыкалі і паціскалі плячыма. Нарэшце Алена патэлефанавала ў радзільню і спыталася ў нянек. Тыя адказалі, сьмеючыся: “Гэта яна сама сябе гушкае, закалыхвае, каб хутчэй заснуць”. Сапраўды, хто гэта будзе гушкаць-закалыхваць чужое дзіця ў плястыкавым боксе? Вось яно само і закалыхваецца. А яшчэ гэты бокс прывучыў Ядзю жыць па бальнічным раскладзе: уночы спаць, есьці ў пару, не капрызіцца. Нам ад гэтага было значна лягчэй. Выспацца ўночы пры малым дзіцяці — вялікая раскоша.
01.05.2002

Дзіцячы сад
Уладкаваць Ядзю ў дзіцячы сад, як высьветлілася, вялікая

праблема. Месцаў няма. Загадчыцы гэтага трыклятага садка я паабяцаў расьпісаць калідорную сьцяну, каб яна знайшла месца. Панамалёўваў розных пеўняў ды катоў з сабакамі. Тады і месца адшукалася ў кругласутачнай групе. “Паходзіць спачатку “на суткі”, а потым перавядзём у звычайную групу”. Ядзя адбыла ў тым садку тры дні і захварэла. Прастудзілі гадаўкі-выхавацелькі маё дзіця. І ня толькі прастудзілі… З садка мы забіралі зусім іншую дзяўчынку: мурзатую, прапахлую камбітлушчам і млоснай прэласьцю, маўклівую і злосную. “На сутках” было толькі дзевяць дзяцей: два мурыны, два кітайцы, армяначка і нашы бязбацькавічы. Можна было б і дагледзець, здаецца. Але гэта адно здаецца. Таму, вылекаваўшы Ядзю, мы ў садок яе не павялі, пакінулі гадавацца ў бабы Жэні і дзеда Вані. Ну, а росьпіс, пэўна, дажыў да рамонту.
02.05.2002

Холад
Мая сяброўка Тацяна спытала, чаму мой працоўны кабінэт пазавешаны Ядзінымі фотапартрэтамі. Я сказаў: пішу пра дачку, фоткі мне дапамагаюць. Вось і слова знайшлося, якое характарызуе нашы ўзаемаадносіны, — “cool”. Гэта ж “халодны”. Тацяна нібыта і пакрыўдавала. Не “халодны”, а “прахалодны”. Якая розьніца? Вось магу расказаць пра сваю дачку… Самы запамінальны, самы кранальны для яе эпізод ва ўзаемаадносінах з татам зьвязаны зь цяплом, з шалікам… Ён павёз яе ў больніцу на апэрацыю. Выразаньне апэндыксу. Мэдсястра сказала, каб паабразалі пазногці, і дала нажніцы. Тата разуў дачку, а каб яна ня ставіла босыя ногі на халодны цэмэнт, зьняў шалік і паслаў на падлогу. Холадна было, сьнежань. Дачка запомніла татаў цёплы шалік на ўсё жыцьцё. А ты — “cool”. Правільна, cool. Каб не прахалодная падлога, каб ня сьнежань, не бальнічныя цягі, не адчула б твая дачка цеплыні татавага шаліка.
02.05.2002

Валасы
Адна з самых яркіх праяваў канфлікту пакаленьняў зьвязаная з валасамі. Калі я нашу доўгія валасы, дык дзеці пастрыгуцца “пад нуль”. Калі “нулявая” мода стане традыцыйнай, дык

наступнікі расфарбуюцца ўва ўсе колеры вясёлкі ці надзенуць парыкі. І так зь веку ў век. Ведаючы гэта, чакаў, калі ж Ядзя пачне дэманстраваць сваю дзёрзкасьць і непаслухмянасьць на галаве. Дачакаўся. Дзесяціклясьніцай яна была і чырвонай, і сіняй, і зялёнай, і каштанавай, і ў белыя пёры, і жоўтым вожыкам. Я не абураўся, адно прасіў, каб купляла якасную фарбу і не перапальвала валасы, бо лысая жанчына, як і рэдкавалосая, не зусім прывабна глядзіцца пасьля трыццаці. Мае парады ўспрымаліся кепска, але той цырульна-фрызурны пратэст мы даўно перажылі, і цяпер у дачкі натуральныя цёмна-русыя валасы, якія аздабляюць твар вялікімі кудзерамі.
02.05.2002

Пялюшкі
Цяпер, у часы пампэрсаў з блакітнымі тэлевізійнымі сікунамі і празрыста-зялёнымі тэлекакамі, развагі пра мыцьцё, сушэньне і прасаваньне мяккіх пялюшак выглядаюць архаікай. Такі ўжо ў чалавека лёс — бегчы за хутказьменлівай рэчаіснасьцю, стаміцца і назаўсёды застацца ў мінулым. Толькі мне дарагія ўсе Ядзіны перамытыя мной і Аленаю пялюшкі. Колькі мы іх папаласкалі? Безьліч, сказаў бы я, каб ня ведаў Юр'я Маліноўскага, які палічыў усе пялюшкі, перамытыя за сваім сынам. У яго атрымалася 1700, і амаль столькі ж перамыла ягоная жонка. Ядзіных пялюшак я не палічыў. Пэўна, яно і правільна, ня ўсё трэба падлічваць. І колькі б мы яшчэ перамылі, перапаласкалі, перапрасавалі тканіны, каб толькі Ядзя была здаровая, чыстая і вясёлая? Тут ужо дакладна — безьліч.
03.05.2002

Нянавісьць
Падзелы, перабудовы, пераарыентацыі, што адбыліся ў нашым грамадзтве за апошні час, вельмі моцна ўдарылі па маіх анарха-дэмакратычных пераканаьнях. Адбылося тое празь Ядзю. Яна марыла стаць доктаркаю, паступіць у мэдыцынскі інстытут і лячыць людзей. Таму ў школе для праходжаньня практыкі выбрала больніцу. Там яе на працягу трох месяцаў прымушалі мыць прыбіральні, нібыта іншай працы для мэдсястры і быць ня можа. Ядзя паскардзілася дырэктарцы школы, а тая, паабяцаўшы дапамагчы, насамрэч затаіла сваю

сацыяльную нянавісьць і падчас агульнашкольнага збору сказала, што такія, як Ядзя, калі ня хочуць мыць прыбіральні, хай “валяць” да сваіх багатых бацькоў і ў іх працуюць, і ў іх вучацца, як нажывацца на бедах народу. Ну і якая пасьля гэтага дэмакратыя і талерантнасьць? Вядома, Ядзя пачала працаваць у мяне, і жаданьня стаць мэдыкам у нашай краіне ў яе паменела, а потым і зусім зьнік намер вучыцца на доктарку.
03.05.2002

Несупадзеньні
Чым болей думаю пра Ядзю, чым далей пішу пра яе, тым больш бачу несупадзеньняў паміж створаным мною і рэальнасьцю. Ядзя, якую я напісаў, значна меншая за сапраўдную. Так скульптура, зробленая ў натуральную велічыню, выглядае заўсёды меншай за жывога чалавека. Каб каменная ці бронзавая постаць не была замалой, яе трэба стварыць на траціну большай. Жывы заўсёды ў руху, заўсёды перамяшчаецца ў прасторы, дыхае, перасоўваецца, узаемадзейнічае з асяродзьдзем, падпарадкоўваецца яму і ў той жа час падпарадкоўвае яго сабе. Нават адбітак у люстэрку меншы за таго, хто ў ім адлюстроўваецца. Таму я ніколі не разумеў Нарцыса, закаханага ўва ўласны твар на паверхні вады. Таму напісаць з натуры партрэт любай дачкі, ведаючы наперад пра паразу, цяжка. І ўсё ж…
04.05.2002

Адчужанасьць
Ядзя прынесла відэакасэту “Вяртаньне ў пекла”. Насамрэч у ангельскім варыянце фільм называўся “Зьніклы сын”. Жонка, дачка і я селі глядзець яго пасьля вячэры. Нейкі трылер з мажным французскім кінаакторам, які даволі няўмела грае прыватнага дэтэктыва, што намерыўся перамагчы сусьветную мафію пэдафілаў. Сюжэт фігавасты. Пераможа ён вычварэнцаў, гандляроў мэксыканскімі дзецьмі. Таму разглядаем Лёндан. Стараемся пазнаць гатэлі і вуліцы, дзе здымаўся трылер. Гэтымі размовамі перакрываем сцэны гвалту над хлопчыкамі. І я лаўлю сябе на адчуваньні, што Ядзя зусім дарослая, зусім не дзіця. Уранку, запаўняючы анкеты на новы пашпарт, я з сумам прапусьціў графу “дзеці”, а ўвечары парадаваўся, што мая малодшая і любая дачка выросла. Цяпер яна дарослая і чужая…

Ці, дакладней, не такая блізкая і залежная, як раней.
06.05.2002

Школа
Мая нелюбоў да сваёй школы перарасла ў нелюбоў да Ядзінай школы дый школы ўвогуле. У Ядзінай — я быў усяго двойчы. Першы раз я прывёў яе, упрыгожаную белымі бантамі, у першую клясу, а другі раз занёс дырэктару заяву, каб дачку вызвалілі ад працоўнай практыкі ў калгасе, бо мы ехалі на Балтыйскае мора адпачываць. І ўсё. Вучылася Ядзя добра, паводзіла сябе прыстойна, на бацькоўскія сходы хадзіла баба Жэня. Школу мы пражылі лёгка.
07.05.2002

Кашалёк
Вось яна дарослая, дарослая… А надзявае на руку кашалёчак у выглядзе чорнага каня зь белым хвастом і грываю, засоўвае ў ягоны жывот свой пэйджэр, круціць цацку перад вачыма, любуецца лупатымі шклянымі вочкамі свайго любімца… Дзіця яна, мая Ядзя.
07.05.2002

Грошы
Каму ніколі не шкада даць грошай, дык Ядзі. Даю рублі і даляры нібыта самому сабе. І ня проста сабе на штодзённыя патрэбы, а сабе на сьвята і падарункі. Ядзі шмат што трэба… Урокі вакалу, ровар, набор гелевых ручак, джынсы, ангельскае гліцэрынавае мыла, парфума, начная дыскатэка, карткі для карыстаньня Інтэрнэтам… Але яна не злоўжывае маёй грашадайнасьцю. Зь дзяцінства ёй уласьцівы дарослы разьлік, такая жыцьцёвая мудрасьць, якой ні ў мяне, ні ў жонкі няма.
08.05.2002

Кніжны кірмаш
У суботы мы любім хадзіць па кніжкі. “Ты сягоньня ідзеш?” — “Іду”. — “І я з табой”. Мы праходзім паміж сталоў, застаўленых кнігамі, часопісамі, касэтамі і сыдыромамі. Ядзя заглыбляецца ў контракультуру… Томпсан. Наркаманы. Байцоўскі клюб. Ерафееў. Бэраўз… А яшчэ бліскучыя часопісы… “GEO”, “HAERS”… Купляю ёй Бэраўза, каб пагаварыць пра наркаманію

і растлумачыць, што Бэраўз не наркот, бо наркоты не жывуць па восемдзесят гадоў і ня пішуць разумных і паэтычных кніжак пра лірыку сноў. Выхаваўчы момант? А як безь яго?
08.05.2002

Адказнасьць
Можа, хтосьці і ня мае патрэбы ў чалавеку, перад якім можа быць сорамна, меркаваньне якога вельмі аўтарытэтнае, чые думкі і заўвагі важныя… Зазвычай гэта настаўнікі, сьвятары, начальнікі ці Бог у шматаблічных праявах. У мяне ж ярархія будуецца і будавалася крыху інакш. Думка таты значыла для мяне больш, чым развагі ўсіх начальнікаў разам узятых. Развагі мамы былі дый застаюцца больш каштоўнымі за дыдактыку настаўнікаў. А кожнае значнае рашэньне я прымаю, параіўшыся з братам і абмеркаваўшы яго з дачкой — не цяперашняй Ядзяй, а Ядзяй празь дзесяць гадоў. Ну не хачу я, каб ёй было сорамна за ўчынкі таты ні празь дзесяць, ні праз дваццаць, ні празь пяцьдзясят… А турбаваць Найвышэйшыя сілы па рознай чалавечай драбязе не лічу патрэбным. Дачкі тут больш чым дастаткова.
10.05.2002

Вакал
Ядзя ў кансэрваторыі бярэ ўрокі вакальнага майстэрства. Выкладчыца яшчэ пасьля іспыту безапэляцыйна вынесла прысуд: голасу няма, але ёсьць жаданьне, сьмеласьць і слых, а таму яна будзе займацца зь Ядзяю. Неаднойчы і на маіх мастакоўскіх і паэтычных здольнасьцях ставілі крыж. Але ў кожным крыжыку можна ўбачыць плюсік. Калі загарэцца, калі праявіць характар. Колькі таго характару было трэба, каб прымусіць дачку скончыць музычную школу. І сьлёзы, і капрызы, і лаянкі са зьнявагамі — усё мінула. Школу музычную Ядзя скончыла выдатна. Цяпер неістотныя ні сваркі тыя, ні пяцёркі. Істотна — для каго яна будзе сьпяваць. Бо вершы і песьні не зусім належаць аўтару, у большай ступені яны належаць тым, дзеля каго пішуцца. Як ёй гэта растлумачыць? І ці можна вытлумачыць любоў? Пэўна, не. А бяз гэтага застануцца толькі “пяцёркі” і грошы, і мне будзе сумна.
12.05.2002

Холад
Чаму самыя цёплыя ўспаміны пра Ядзіна дзяцінства ў мяне асацыююцца з холадам? Мусіць, таму, што нарадзілася Ядзя напярэдадні зімы і ўсе хваляваньні былі: каб жа толькі не застудзілася, не замерзла, не захварэла… І робіцца цёпла ад успаміну, як я зь ёю на руках уздымаюся ў пусты намёрзлы тралейбус, дзе ўсе шыбы пазарасталі крыштальнымі кветкамі лёду. Як сядаю на рыпучае крэсла побач з вадзіцельскай кабінай і трасу бразготкаю ля яе сонных вачэй. Ня сьпі, нам весела, мы едзем дадому, там твой цёплы ложачак…
12.05.2002

Неадпаведнасьць
У Рыміні Ядзя пазнаёмілася зь нейкай Анджэлай Боска, сямнаццацігадовай дзяўчынаю зь Міляну. Яны разам хадзілі купацца ў гатэльны басэйн. Мяне вельмі выратоўвала гэтае сяброўства, бо нумар у мяне быў хоць і вялікі, але ж аднапакаёвы. Заставацца з жонкаю можна было, толькі калі Ядзя купалася зь Лесавічкаю (так я пераназваў Анжэлу, бо “боска” па-італійску — “лес”). Сяброўства тое скончылася раптоўна. У басэйн завіталі хлопцы, пазнаёміліся з нашымі дзяўчатамі і не прамінулі ўдакладніць іхны ўзрост. І калі даведаліся, што Ядзі толькі дванаццаць, перасталі зь ёй гуляць. Больш за ўсіх зьдзівілася Боска. Яна нават пакрыўдавала, быццам Ядзя яе падманвала. Ну хто вінаваты, што ўсе італійкі каратканогія і меншыя за беларусак? Чаго крыўдаваць? Добра, што здарылася тое пры канцы адпачынку.
13.05.2002

Імя
Як назваць дачку? Гэтае пытаньне я вырашыў для сябе яшчэ ў юнацтве, яшчэ да знаёмства з Аленаю. Мне хацелася ўзнавіць у гэтым сьвеце сваю любую бабу Ядзю. У гонар яе і назваў дачку. Выдатнае імя для каралевы, тым больш што нашыя каралевы яго і насілі. Дачцэ яно таксама падабалася, толькі не ў памяншальна-вульгарным варыянце. І калі яе, трохгадовую, нейкі сусед-вісус паклікаў: “Ядзька, пайшлі гуляць!”, яна зазлавала і выправіла: “Я — ня Ядзька, я — Ядзенька!” У сям’і ўсе называлі яе толькі так.
14.05.2002

Вось вам!
Баба Ніна прывезла зь лецішча сваёй унучцы шклянку суніцаў. Замілаваньне выклікае відовішча, калі двухгадовае дзіця есьць суніцы. Перамыўшы ўсе ягады, баба насыпала іх на талерку, дала ўнучцы срэбную лыжачку, і яны былі гатовыя да свайго штонядзельнага рытуалу. Тут у кухню ўскочыла мама Алена, і выхапіла з-пад Ядзіных рук талерачку з пачастункам. “Нельга! У яе жывот баліць! А вы тут з сырымі ягадамі!” Нешта падобнае з-за жончынага пляча казаў і я. Ядзя ўзьняла над галавою лыжку і замест таго, каб заплакаць, з усяе моцы кінула яе на падлогу ды гучна крыкнула: “Вось вам!!!” Мы з жонкаю не чакалі такога злоснага крыку і ад нечаканасьці засьмяяліся, толькі тады Ядзенька заплакала.
14.05.2002

Буду!
У кожнага дзіцяці ёсьць свая рэўнасьць. Напэўна, цяпер гэта рэўнасьць да кампутара, які адбірае ў бацькоў час. Пра дакладнасьць свайго меркаваньня я ў хуткім часе змагу сказаць, паназіраўшы за ўнукам. Што да дачкі, дык яна недалюблівала тэлевізар. Не каб зь ёй пагуляць-пагаварыць — уся сям’я глядзіць у тэлескрыню! Таму скрыню трэба сапсаваць! Ядзя выдзерла з тэлевізара панэльку кіраваньня. Гэта быў яшчэ тэлевізар без вынаснога пульту, з умантаваным у сярэдзіну блёкам. Зрабіла яна шкоду дэманстрацыйна, ува ўсіх на вачах. Ніхто і думаць ня думаў, што чатырохгадовая дзяўчынка такое ўчыніць. Давялося выклікаць майстра, які гадзіны са дзьве правалэндаўся з дратамі, пакуль паправіў і настроіў цацку для дарослых. Баба Ніна сказала Ядзі: “Бачыш, як цяжка наладзіць тое, што ты зламала. Дзядзька-майстар дзьве гадзіны працаваў… І ты больш ня будзеш гэтага рабіць?” — “Буду!” Гэтае “буду” і празь пятнаццаць гадоў вельмі цешыць маю маму. “У нашай дзяўчынкі ёсьць характар, а гэта вельмі важна ў жыцьці, і я спакойная за яе”.
15.05.2002

Прыгажосьць
Ці прыгожая мая дачка? Не магу адказаць так, каб нехта іншы пачуў і зразумеў, бо прыгажосьць чужых людзей мае складнікі,

яна нібыта сканструяваная з асобных дэталяў, а дачка для мяне прыгожая ўся. Але ёсьць моманты найбольшай лірычнасьці і прыгажосьці. Гэта калі яна зусім дзіця — і гладжу яе перад сном па галоўцы, нібыта адганяю цяжкія думкі і страшныя сны. Яна вось-вось засьне, на разьвітаньне яна ўсьміхаецца, пазяхае, замірае, сьпіць… Уся прыгожая.
16.05.2002

Вершы
Неяк зьвялася традыцыя сямейных канцэртаў і вечарынаў, калі дзеці граюць на музычных інструмэнтах, сьпяваюць і чытаюць паэзію для вузкага кола сяброў сям'і. Аднавіць традыцыю і зладзіць паэтычную вечарыну мы вырашылі ў Крыме, на дачы Максіміліяна Валошына ў Кактэбелі. Мы жылі на беразе мора разам з крытыкам Аненскім у белым дамку на дзьве сям'і. Унучка Аненскага вывучыла й чытала Пушкіна. А Ядзя ня менш традыцыйна і клясычна дэклямавала Багдановіча:

Проці цячэньня вады
Зможа толькі жывое паплыць,
Хвалі ж ракі заўсягды
Тое цягнуць, што скончыла жыць.
Дзіўна, што яна працытавала апошні радок з той самай памылкай, якую непазьбежна раблю чамусьці і я…

Цягнуць тое, што скончыла жыць.
Трэцім выступоўцам быў сын жывапісца Эсьціса. Пяцігадовы хлопчык адбарабаніў на іўрыце вайсковую маршоўку пра неперажможнасьць салдатаў Ізраілю. Відавочна, памылак ён не зрабіў. А чамусьці прысаромлены бацька пачаў апраўдвацца і гаварыць, што гэтаму вершу сына навучылі ў дзіцячым садку. І мы ўсе разам пагадзіліся з думкаю, што нельга аддаваць паэзію ў рукі садкоў.
16.05.2002

Ролікі
Жонка набыла для Ядзі ролікі. Выпатрабавала. Надта ўжо хацелася. Модна. Коўзалася. Сьмяялася. Весялілася. І — "вось вам"… Каля рэчкі скакала з прыступак. Упала. Няўдала. Зламала руку ў перадплеччы. Сябры і сяброўкі, што дзеразавалі

разам, спалохаліся і паўцякалі. Скурчыўшыся, ледзь прытомная Ядзя праседзела на прыступках больш за гадзіну, пакуль нейкі чужы чалавек не патэлефанаваў жонцы і не расказаў пра няшчаснае здарэньне. Жонка завезла Ядзю ў больніцу, дзе ёй увагналі ў косткі жалезныя пруткі і, паклаўшы на правы бок, зрабілі расьцяжку. На адным баку Ядзя праляжала ў ложку дваццаць тры дні. Схуднела, адны блакітныя вочы засталіся. Выйшла зь лякарні, а празь які месяц зноў на ролікі стала. “Я асьцярожна”. Сэрца халадзее. А цяпер лётае на ровары і марыць пра правы кіроўцы.
17.05.2002

Дакумэнт
Атрымаў новы, чысьценькі, бяз штампаў памежных, бязь візаў замежных, бліскучы, сіне-залаты пашпарт. Дзень змарнаваў на чэргі, сваркі, тэлефанаваньні сябрам. І ўсё ж маю рэч. Пашпарт для новага жыцьця, з пасталелым тварам на фота і адсутнасьцю дзяцей. Так. Дзяцей у мяне больш няма; на думку дзяржавы, па пераканаьнях грамадзтва, па ўсіх дакумэнтах… Вырасьлі. Графы “дзеці да 16 гадоў” больш не запаўняю. Дробязь, фармальнасьць, дэталька… А сумна. Дзеці? І сумеўся. Ёсьць? Няма? Што адказаць? Ясьней яснага, Ядзя ёсьць.
18.05.2002

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Люіс Керал

Алесіны прыгоды ў дзівоснай краіне

Пагодным ранкам залатым Заўвага
Плывём мы на чаўне,
Дзяўчатак тройца спакваля
Вяслуе ля мяне,
І ўсе вандроўкай кіраваць
Стараюцца спраўней.

Няўмольныя! У гэткі час,
У млосную сьпякоту,
Давай ім казку выдумляй —
Прыдумалі работу!
Аднак іх тры, а я — адзін,
Таму спрачацца што тут?

Адна, ўладарная, “пачаць” —
Заданьне мне акрэсьліць.

Другая скажа ласкавей,
Каб “болей нісянеціц”.
А потым трэцяя мой сказ
Пытаньнямі замесіць.

І слухаюць, а не крычаць
Яны, як кагадзе:
Дзяўчынка-мара ў дзіўны край
Трапляе раптам, дзе
Размовы з птушкамі або
З жывёламі вядзе.

Фантан фантазіі маёй
Стаміўся і ўжо згас.
— Я іншым разам раскажу, —
Прашу іх абычас.
Не адпачну, а ўжо яны
Абвесьцяць “іншы раз”.

Вось так узьнік аповед мой
Памалу, пакрысе,
Як мудрагелісты узор,
Я сплёў падзеі ўсе.
Заціхла казка. Ціха ноч
Ступае па расе.

Алеся! Казкі не забудзь,
Мо’ зазірнеш калі.
Маленства сьветлага ўспамін
Да сэрца прытулі,
Як пілігрым засохлы квет
З далёкае зямлі.

Зьмест

Разьдзел
I. Углыб трусінай нары
II. Копанка, поўная сьлёз
III. Перадвыбарная гонка й гісторыя з сумным канцом
IV. Трус запускае Піліпку

V. Вусенева парада
VI. Перац і парасё
VII. Гарбата ў вар’ятаў
VIII. Кракет з каралевай
IX. Гісторыя Недачарапахі
X. Кадрыля з амарамі
XI. Хто скраў пячэнцы?
XII. Алесіна сьведчаньне

Разьдзел першы
Углыб трусінай нары

Алесі надакучыла сядзець пры беразе каля сваёй сястры і нічога не рабіць. Раз ці два яна зазірнула ў кнігу, якую чытала сястра, але там не было ні малюнкаў, ні гутарак. “А чаго вартая кніга, — падумала сабе Алеся, — дзе няма ні малюнкаў, ні гутарак?” Гэтак яна разважала — хоць разважаць было нялёгка, бо гарачыня наганяла на яе сон і млявасьць. Ёй прыйшла ў галаву ідэя сплесьці сабе вянок з рамонкаў, але тады прыйшлося б уставаць і зьбіраць рамонкі, а ахвоты не было ніякае... Як раптам проста побач зь ёй праляцеў Белы Трус з ружовымі вачанятамі.
Ну й што тут *такога* незвычайнага? Алеся й не падумала, што ўсё ж гэта нешта *вельмі* незвычайнае, каб Трус казаў сам сабе:
— А людцы мае! А людцы мае! Як я пазьнюся!
(Перадумваючы пасьля, яна прыйшла да высновы, што павінна была б тады моцна зьдзівіцца, але ў той момант усё здалося ёй цалкам натуральным.) Калі ж Трус *дастаў з кішэні свае камізэлькі гадзіньнік на ланцужку,* зірнуў на яго і паляцеў яшчэ хутчэй, Алеся ўскочыла, спанатрыўшы, што яна ніколі ня бачыла труса ў камізэльцы з кішэнямі, а з гадзіньнікам і пагатоў! Не ўцярпеўшы ад цікаўнасьці, яна кінулася за ім [Заўвага] праз поле і пасьпела адно ўгледзець, што той сігануў у вялізную трусіную нару пад кустом.
Алеся ўмомант пусьцілася за ім, нават не задумаўшыся, як з тае нары можна будзе вылезьці.

Трусіная нара сьпярша нагадвала тунэль і цягнулася роўна, але потым абарвалася гэтак рэзка, што Алеся і ня скмецілася, як паляцела ўніз, нібы ў нейкі калодзеж. Мяркуючы па тым, што падала яна доўга, калодзеж быў даволі глыбокі. І ці то ён сапраўды быў вельмі глыбокі, ці то падала яна павольна, толькі ў яе было дастаткова часу на тое, каб разгледзецца і запытацца ў сябе, што ж мае быць далей. Найперш яна паспрабавала глянуць уніз і ўявіць, куды яна наагул кіруецца. Але ўнізе было занадта цёмна, каб хоць нешта разгледзець. Тады яна зірнула на бакі і заўважыла, што сьценкі калодзежа абстаўленыя шафамі й кніжнымі паліцамі. Дзе-нідзе віселі мапы й карціны. Летучы, яна схапіла з аднае паліцы слоік з цэтлікам “АПЭЛЬСЫНАВАЯ МАРМЭЛЯДА”. Дарма! — ён быў пусьцюткі. І ўсё ж Алеся не хацела ўпускаць той слоік, Заўвага бо баялася забіць каго-колечы ўнізе, а таму злаўчылася паставіць яго на нейкую іншую палічку.

— Ну што ж! — сказала сама сабе Алеся. — Пасьля такога падзеньня мне ня страшна зваліцца і са сходаў! Якой адважнай мяне будуць лічыць усе нашыя! Нават калі прыйдзецца скаціцца з даху нашага дому, я і тое ня пікну! (Што праўда, то праўда!) Заўвага

Уніз, уніз, уніз. Няўжо гэтае спаданьне *ніколі* ня кончыцца?

— Цікава, колькі гэта ўжо міляў я праляцела? — прамовіла ўголас Алеся. — Я мушу цяпер знаходзіцца каля самюткага цэнтру зямлі! Трэба зьлічыць... Думаю... гэта якія чатыры тысячы міляў уніз...

Алеся, як бачым, сёе-тое ў школе засвоіла. Праўда, тут быў не найлепшы момант для паказу сваіх ведаў — вакол не было нікагутка, хто б яе чуў. Такой бяды, паўтарэньне — маці вучэньня!

— Так, нешта блізу таго... Тады незразумела, на якіх Паралелі і Мэрыдыяне я цяпер падаю?

Шчыра кажучы, Алеся ня мела ніякага ўяўленьня, што такое Паралель альбо Мэрыдыян, але ёй падабалася вымаўляць такія складаныя й гожыя словы.

Счакаўшы, яна пачала спачатку:

— А што калі я падаю *скрозь зямлю*! Заўвага Як будзе цудоўна, калі я прылячу да людзей, што ходзяць галовамі ўніз! Здаецца, іх завуць антыпаты...

Цяпер яна нават узрадавалася, што яе ніхтосенькі не пачуў, бо

гучала гэта неяк ня надта слушна.
— Ну, дык я мушу запытацца ў іх, як называецца тая краіна... Вы ж разумееце! Спадарыня, калі ласка, гэта Новая Зэляндыя? Ці Аўстралія?
І пад гэтыя словы яна паспрабавала пакланіцца. Уявеце сабе, што вам прыходзіцца рабіць кніксэн, летучы ўніз! Думаеце, гэта ў вас выйшла б?
“Якое неадукаванае дзяўчо!” — падумае цётачка пасьля такога пытаньня.
Не, пытацца ні ў якім разе ня варта! Мо’ там дзе будзе шыльда з пазначэньнем, што гэта за краіна?
Уніз, уніз, уніз. Раз не было чаго рабіць — Алеся зноў загаварыла сама з сабой.
— Здаецца, Дайна моцна затужыць па мне сёньня ўвечары! (Дайна — гэта котка.) Заўвага
— Спадзяюся, яны не забудуцца наліць ёй сподачак малака пад вечар. Дайна, любачка! Як бы мне хацелася, каб ты была тут, разам са мной. У паветры мышэй няма. Але ж ты магла б злавіць кажана, а яны, як ведама, такія падобныя да мышэй! Цікава, ці ядуць каты кажаны? Заўвага
І тут Алеся нібы пачала засынаць, праз сон гаворачы сама з сабою:
— Ці ядуць каты кажаны? Ці ядуць каты кажаны?
А часам:
— Ці ядуць кажаны каты?
Бачыце, калі адказу на нейкае пытаньне няма, дык хіба істотна, якое слова ў ім ставіць раней, а якое пазьней? Яна адчула, што сон змагае яе, і пачала мроіць, як прахаджаецца за руку з Дайнай, вельмі сур’ёзна пытаючыся:
— Дайна, скажы мне шчыра: ці каштавала ты калі кажана?
І тут раптам: трэсь! трэсь! Яна хлёпнулася на кучу гальля й сухога лісьця. Падзеньне скончылася.
Алеся не пабілася ані, таму адразу ўскочыла і глянула ўгору, але там было цёмна. Перад ёй паўстаў доўгі калідор. І Белы Трус яшчэ не зусім прапаў з вачэй, мільгануўшы ў яго канцы. Ні хвілі на роздум! Алеся памкнула, як вецер. Яна пасьпела пачуць, што, забягаючы за рог, Трус сказаў:
— Ай, вушкі мае! Ай, вусікі! Як я пазьнюся!
Калі Алеся завярнула за рог, здавалася, Трус блізка. Але раптам ён зьнік. А яна апынулася ў доўгім нізкім памяшканьні,

асьветленым радочкам лямпаў, што зьвісалі з столі.
Абапал стаялі дзьверы — і ўсе замкнёныя. Алеся паспрабавала іх адчыніць і не змагла. Тады яна спынілася ў маркоце пасярэдзіне, ня ведаючы, як ёй наагул адсюль выйсьці.
І тут ёй на вочы трапіўся маленькі трохногі столік з таўшчэзнага шкла. На ім нічога не было, акрамя тоненькага залатога ключыка. Алесі прыйшло ў галаву, што ён павінен падыходзіць да адных зь дзьвярэй. Аднак — на жаль! — ці то замковыя шчыліны былі занадта вялікія, ці то ключ быў такі маленькі, але ён нічагутка не хацеў адмыкаць. Урэшце, абыходзячы ўсе дзьверы па другім разе, яна наблізілася да кароценькае фіраначкі, якое ня згледзела раней. Там хаваліся дзьверцы цаляў на пятнаццаць увышкі. Алеся паспрабавала ўставіць у замок маленькі залаты ключ — і, на вялікую радасьць, ён падышоў!
Алеся адамкнула дзьверцы і ўбачыла, што вядуць яны ў маленечкі калідорчык, ня большы за пацучыную нару. Яна ўкленчыла і ўгледзела на другім канцы калідорчыка сад Заўвага — такі прыгожы, роўнага якому яна дагэтуль ня бачыла. Як ёй адразу захацелася прэч з гэтага цёмнага памяшканьня ды пахадзіць сярод тых клюмбаў з зыркімі кветкамі, між тых прахалодных фантанаў! Аднак яна не магла прасунуць нават галаву ў прахон. “Калі б мая галава і *прайшла* ў дзьверы, — падумала няшчасная Алеся, — там зь яе было б вельмі мала карысьці без плячэй. О, як бы мне хацелася скласьціся па-тэлескопнаму! Думаю, у мяне выйшла б, калі б толькі я ведала, з чаго трэба пачынаць”. Бачыце, зь ёй ужо адбылося гэтулькі дзівосаў, што нават пачало здавацца, быццам вельмі мала чаго ў сьвеце зусім не бывае.
Чакаць каля маленькіх дзьвярэй не было сэнсу, таму яна вярнулася да стала, у цьмянай надзеі знайсьці на ім яшчэ адзін ключ альбо, прынамсі, інструкцыю па складаньні людзей па-тэлескопнаму. Але гэтым разам яна знайшла там маленькую бутэлечку (“Якой дагэтуль тут пэўна не было”, — сказала сабе Алеся), да шыйкі якой быў прыкручаны папяровы цэтлік з ладнымі друкаванымі літарамі “ВЫПІ МЯНЕ”.
Ведама, лёгка сказаць “выпі мяне”! Але маленькая мудрая Алеся не зьбіралася гэтага рабіць адразу.
— Не, наперад я гляну, ці не напісана там дзе *“Атрута”*! — сказала яна.

Бо яна чытала некалькі мілых апавяданьнечкаў пра дзяцей, Заўвага якія згарэлі ў агні альбо якіх зжэрлі драпежнікі, дый пра іншыя непрыемнасьці, якія адбыліся адно таму, што дзеці *не хацелі* помніць простыя правілы, якім іх навучылі сябры. Прыкладам, да чырвані нагрэтая качарга можа вас апячы, калі вы будзеце трымаць яе задоўга. Альбо калі вы *вельмі* глыбока парэжаце сабе палец нажом, дык звычайна зьяўляецца кроў. І Алеся ніколі не забывалася, што, калі выпіць зашмат з бутэлечкі з надпісам “Атрута”, гэта амаль заўсёды будзе каштаваць вам жыцьця, раней ці пазьней.
Так ці інакш, на гэтай бутэлечцы не было надпісу “Атрута”, і Алеся наважылася паспытаць, што ў ёй, і смак зьмесьціва выявіўся вельмі прыемным. На смак гэта было як мяшанка Заўвага вішнёвага пірага, бялковага крэму, ананаса, печанага індыка, ляндрынак і падсмажанага на масьле хлеба. Алеся сама не заўважыла, як выпіла.

* * * **Заўвага**

— Што за дзіўнае адчуваньне! — сказала Алеся. — Здаецца, я складаюся, нібы тэлескоп!
А так і было: цяперака яна мела толькі дзесяць цаляў росту. Яе тварык зазьзяў радасьцю ад думкі, што цяпер яна можа ўвайсьці праз маленькія дзьверцы ў той прыгожы сад. Аднак перадусім яна счакала, каб паглядзець, ці ня будзе яна меншаць далей, нават крыху нэрвуючыся з гэтай прычыны.
— Бо гэта ж можа скончыцца тым, вы разумееце, што я зусім зьнікну, растану, як сьвечка! Цікава, да чаго я стала б тады падобная?
Яна паспрабавала ўявіць сабе, як выглядае агеньчык сьвечкі пасьля таго, як яе задзьмулі. Заўвага Але ня ўспомніла, каб калі што такое бачыла.
Празь які час, упэўніўшыся, што нічога больш не адбываецца, яна надумала пайсьці ў сад. Бедная Алеся! Падышоўшы да дзьверцаў, яна ўспомніла, што забылася на залаты ключык, а калі вярнулася да стала, каб узяць яго, убачыла, што ня можа да яго дацягнуцца. Алеся добра бачыла яго праз шкло. Яна зрабіла ўсё, што можна, каб ускараскацца на адну з ножак стала, але ножка была занадта коўзкая. Зьняможыўшыся ад марных высілкаў, бедненькая малюпатка села й заплакала.
— Годзе, няма сэнсу гэтак плакаць! — загадала сабе Алеся. —

Раю табе, каб ты перастала зараз жа!
Звычайна яна давала сабе вельмі добрыя парады, хоць даволі рэдка іх слухалася. А калі-нікалі дык і шчыкала сябе так жорстка, што сьлёзы зьяўляліся ўваччу. Яна помніла, як раз спрабавала накруціць самой сабе вуха за тое, што змахлявала падчас гульні ў кракет, сама ж супраць сябе. (Гэтая прыдума вельмі любіла ўдаваць зь сябе адразу дзьвюх асоб.) Заўвага
“Аднак цяпер не да таго, — падумала бедная Алеся, — каб удаваць зь сябе дзьвюх розных асоб! Які ў гэтым сэнс, калі ад мяне засталося так мала, што ці назьбіраецца й на адну сапраўдную асобу!”
Тут яе пагляд запыніўся на маленькай шкляной скрыначцы, што валялася пад сталом. Алеся адчыніла яе, а ўсярэдзіне ляжаў малюсенькі піражок, на якім крэмам было напісана “ЗЬЕЖ МЯНЕ”.
— Добра, я яго зьем, — сказала Алеся, — і калі ад гэтага пабольшаю — тады змагу дастаць ключык, а калі паменшаю — тады пралезу пад дзьвярыма. Так ці гэтак я патраплю ў сад. Будзь што будзе!
Яна крыху ўкусіла і аж запішчала ад нецярпеньня, трымаючы руку на макаўцы, каб адчуць, у які бок яна будзе рухацца.
— Вырасту ці паменшаю? Вырасту ці паменшаю?
Як жа яна зьдзівілася, калі рост застаўся той самы. Хоць, пэўна ж, яно так і бывае, калі нехта зьесьць кавалачак пірага. Аднак Алеся гэтак звыкла да дзівосных здарэньняў, што, калі рэчы йшлі сваім ходам, гэта яе нават засмучала.
Гэтак яна ўзялася за працу і вельмі борзда дакончыла пірог.

Разьдзел другі
Копанка, поўная сьлёз

— Ой, усё дзівосіцца і дзівосіцца! Заўвага — закрычала Алеся. Яна гэтак зьдзівілася, што на хвілю пераблытала ўсе словы на сьвеце.
— Цяпер я раскладаюся, нібы найвялікшы ў сьвеце тэлескоп! Бывайце, ногі!
(Калі яна зірнула на свае ногі — іх было амаль не відаць, гэтак яны аддаліліся.)
— Бедныя мае ножачкі! Хто ж цяпер будзе вас абуваць,

нацягваць на вас панчошкі, мае любыя? Пэўна, што я не змагу гэта рабіць! Я буду вельмі далёка, каб мець сабе клопат аб вас. Вы мусіце самі даваць сабе рады, калі зможаце...
“Аднак трэба быць дабрэйшай зь імі, — падумала Алеся, — а то яны, можа, не захочуць ісьці туды, куды я скажу! Трэба падумаць... Добра, штогод на Каляды буду слаць ім новую пару чаравічак.”
І яна ўзялася плянаваць, як будзе гэта рабіць: “Чаравічкі павінны прыходзіць па пошце. Але як гэта сьмешна — слаць падарункі ўласным нагам! І як, пэўна, дзіўна будуць глядзецца адрасы!”

Спадарыні Алесінай Правай Назе [Заўвага]
На дзяружцы,
каля Каміну
(зь любасьцю ад Алесі).
— Божухна! Якую лухту я вярзу!
У тую ж хвіліну яе галава ўперлася ў столь. Алеся перарасла ўжо за пяць футаў — таму яна схапіла залаты ключык ды як мага панеслася да дзьверцаў у сад.
Нябожанька Алеся! Найбольшае, што яна магла зрабіць, — гэта легчы на падлогу бачком і зазірнуць адным вокам у сад. Патрапіць туды цяпер — зусім не было магчымасьці. Яна села й зноўку заплакала.
— І табе ня сорамна за свае паводзіны! — сказала Алеся. — Такая вялікая дзяўчынка (цяпер яна мела поўнае права так казаць) — і ўсё яшчэ плача, як маленькая! Кінь зараз жа, ці чуеш!
Аднак яна плакала й плакала, пакуль вакол яе не ўтварылася ладная копанка, паўнюткая сьлёз, — цалі з чатыры ўглыбкі, — заняўшы каля паловы залі.
Неўзабаве Алеся пачула блізкі тупат маленькіх ножак і зараз жа выцерла вочы, каб пабачыць, што там робіцца. А гэта вяртаўся Белы Трус, шыкоўна апрануты, з парай зграбных пальчатак у адной руцэ і вялізарным веерам у другой. Ён пратупаў міма ў страшнай сьпешцы, мармычучы сабе пад нос:
— О, Княгіня, Княгіня! О! Няўжо яна не разьюшыцца за тое, што я змусіў яе гэтак доўга чакаць?
Алеся была ў такім адчаі, што гатовая была папрасіць дапамогі ў каго заўгодна. Таму, калі Трус прабягаў побач зь ёю, яна

ціхім, нерашучым голасам сказала:
— Выбачайце, калі ласка, спадару...
Трус падхапіўся, згубіў белыя пальчаткі, веер і даў такой лататы, што ўмомант прапаў у цемры.
Алеся падняла веер з пальчаткамі і, паколькі ў залі было задушна, пачала абмахвацца, увесь час прыгаворваючы:
— А Божачкі! Што за дзіўныя рэчы адбываюцца сёньня! Учора ж, здаецца, усё йшло, як заўсёды! Можа, з мною што ўночы здарылася і я моцна перамянілася? Дайце падумаць: *ці была я* той самай, калі прачнулася сёньня ўранку? Заўвага Я добра помню, што адчувала сябе крыху інакш. Але калі я не была той самай, тады насоўваецца пытаньне: “Хто я ўрэшце?” Ага! *Во дзе* ўся штука!
І яна пачала перабіраць у памяці дзяцей свайго веку, якіх ведала, каб упэўніцца, ці не ператварылася яна раптам у каго.
— Зразумела, што я не Адэлька, — зазначыла Алеся, — у яе такія кудзеркі, а мае валасы зусім не завіваюцца. І пэўна, што я ня Бася, бо ведаю ўсякую ўсячыну, а яна — амаль нічагусенькі! Апрача таго *яна* — гэта яна, а *я* — гэта я. Божа мой, Божа!.. Як усё складана! Трэба спраўдзіць, ці ведаю я тое, што раней ведала. Пагледзімо: чатыры на пяць — дванаццаць, чатыры на шэсьць — трынаццаць, а чатыры на сем... О Божухна! Гэтак я ніколі не дайду да дваццаці! Заўвага Вяроўка яе бяры, гэтую табліцу множаньня! Паспрабуем геаграфію. Лёндан — гэта сталіца Парыжу, а Парыж — гэта сталіца Рыму, а Рым... О не! *Усё* зусім ня так, я ўпэўненая! Дальбог, я ператварылася ў Басю! Паспрабую прачытаць што на памяць: “Не сядзіцца ў...”
Яна скрыжавала рукі перад сабой, быццам адказвала заданьне, і пачала паўтараць вершык, аднак голас яе гучаў нязвыкла, хрыпата, а словы выходзілі ня так, як звычайна:

Не сядзіцца ў жыце Заўвага
Слоніку малому
Кліча яго грэчка,
Цягнуць качкі з дому.

— Мамачка, шкарлупка, —
Просіць ён так хціва, —
Можа б, ты нас грэчку
Патаптаць пусьціла.

— Я пэўная, што вершык выйшаў нейкі няправільны! — сказала няшчасная Алеся, і з кожным новым радком яе вочы напаўняліся сьлязьмі. — Цяпер ясна, я чыстая Бася. А жыць мне прыйдзецца, як і ёй, у гаротнай хацінцы, і цацак у мяне ня будзе. Да таго ж, трэба будзе без канца вучыць і вучыць заданьні! Не! Калі я Бася, дык застаюся тут! І ня трэба засоўваць сюды галаву і ўпрошваць мяне: “Выходзь, золатца наша!” Я толькі гляну на іх і скажу: “А хто я, га? Скажэце мне, хто я такая!” І калі гэта мне спадабаецца, я выйду. А калі не — застануся тут, унізе, пакуль ня стану кім іншым.
— О Божухна! Людцы мае! — Алеся залілася сьлязьмі. — Я праўда хачу, каб хто-небудзь *паспрабаваў бы* ўсунуць сюды галаву! Я *так* стамілася быць адна!
Яна сказала гэта, глянула на свае рукі і вельмі зьдзівілася, калі заўважыла, што надзела адну з трусовых пальчатак.
— Як гэта я патрапіла? — падумала Алеся. — Няўжо я зноў паменшала!
Яна ўзьнялася і падышла да століка, каб памерацца зь ім. Выходзіла, што цяпер яна каля двух футаў росту і ўсё меншае ды меншае. Неўзабаве яна здагадалася: прычынай служыў веер, які яна трымала ў руках, а потым спрытна адкінула прэч. І вельмі ў пару, інакш скараціласа б дазваньня. Заўвага
— Каб яшчэ трохі — дык і ўсё. *Капцы!* — сказала Алеся, моцна напалоханая раптоўнай пераменай, але шчасьлівая, што ўратавалася. — А цяпер — у сад!
І яна ўгрунь панеслася да дзьверцаў. Але дзе там! Дзьверцы, як і даўней, заставаліся пад замком, а залаты ключык ляжаў сабе ціха на шкляным століку.
— Ну, гэта проста невядома што! — падумала беднае дзіцё. — Яшчэ ніколі я не была такою шмакадзяўкаю. Далібог! Горш і не прыдумаеш. Што праўда, то праўда!
Толькі яна гэта мовіла — нага пасьлізнулася, і — боўць! — Алеся па вушы апынулася ў салёнай вадзе. Першай думкаю было, што яна боўтнулася ў мора. Заўвага
— У такім разе мне давядзецца вяртацца дамоў чыгункай, — зазначыла яна сабе.
Раз у жыцьці Алеся ўжо была *на моры* і цьвёрда ведала, што на моры абавязкова павінны быць купальныя кабінкі, Заўвага дзеці, якія граюцца ў пяску, за імі — радочак курортных дамкоў, а далей — чыгуначная станцыя. Але неўзабаве яна даўмелася,

што лучыла ў копанку сьлёз, якія сама ж і выплакала, калі была дылдай.
— Я ж табе казала, каб ты ня плакала, як румза! — прыкрыкнула Алеся, барахтаючыся ў копанцы і спрабуючы прыбіцца да берагу. — От за тое самае цяпер і буду пакараная патапленьнем ва ўласных сьлязах! Во дзе сапраўды *плаксівае становішча*!
У той момант яна пачула непадалёк нейкі плёскат і падплыла бліжэй, каб даведацца, што там такое. Спачатку ёй падалося, што гэта які морж альбо гіпапатам, але потым успомніла, якая яна цяпер малюсенькая. І тады высьветлілася, што гэта плюхаецца простая мыш, якая гэтаксама ўвалілася ў ямку з вадой.
“Ці не пагутарыць мне з гэтай мышшу? — падумала Алеся. — Тут унізе ўсё гэтак дзіўна, можа, яна й умее гаварыць. Зрэшты, паспрабаваць не зашкодзіць.” І яна пачала:
— Мышухна! Ці ня ведаеце Вы, як мне вылезьці з гэтага вадаёму? Я вельмі стамілася тут плаваць, Мышухна!
Алеся думала, што акурат так трэба гаварыць з мышамі. Яна ніколі дагэтуль ня гутарыла зь імі, але запомніла табліцу скланеньня, якую бачыла ў падручніку гісторыі мовы, што належаў ейнаму брату:

Назоўны: *мыш*
Родны: *мышы*
Творны: *мышшу*
Клічны: *мышухна!* Заўвага
Мыша зірнула на яе даволі падазрона і нібыта падміргнула, але нічога не сказала.
— Можа, яна ня ведае па-простаму, — падумала Алеся. — Гэта, бадай, мыш-французанка, што прыбыла з войскам Вільгельма Заваёўніка.
Нягледзячы на ўсю сваю абазнанасьць у гісторыі, Алеся, трэба прызнацца, да канца не ўяўляла, *калі* што адбылося.
І яна пачала зноўку:
— Où est ma chatte? Заўвага — бо менавіта гэтая фраза стаяла першай у яе падручніку французскай мовы.
Мыша нечакана аж падскочыла ў вадзе і, здавалася, уся затрымцела ад жаху.
— Ой, выбачайце, калі ласка! — усклікнула Алеся, баючыся,

што пакрыўдзіла жывёлінку. — Я зусім забылася, што вы ня любіце катоў.
— Не люблю катоў! — перадражніла Мыша віскліва. — А ты любіла б каты, каб была мышшу?
— Можа, і не, — разважліва адказала Алеся, — але ня варта дзеля гэтага так злаваць. Я б хацела пазнаёміць Вас з нашай коткай Дайнай. Думаю, Вам бы адразу пачалі падабацца каты. Яна такая мілая і спакойная, — працягвала Алеся, гутарачы найбольш сама з сабою і разьняволена плаваючы па копанцы. — Яна сядзіць сабе пры каміне і вядзе салодкую курну, намывае гасьцей. Яна такая мяккая і свойская! І так добра палюе на мыш... Ой, прабачце, калі ласка! — зноў усклікнула Алеся.
Але цяперака Мыша ашчэрылася і нашэршылася. Алеся выразна адчула, што значыць *азьвярэць*, калі гэтае слова карэктна ўжываць у дачыненьні да мышы.
— Ня будзем пра яе гаварыць, калі Вам ня хочацца!
— Мне ня хочацца? — закрычала Мыша, якую ўсю аж трасло, ад вушэй да кончыка хвосьціка. — Быццам *я* магла такое гаварыць! У нашай сям'і заўжды *ненавідзелі* катоў. Гэтых гідкіх, нізкіх, вульгарных істотаў! Не хачу нават слухаць пра іх і чуць іх імя!
— Я праўда больш ня буду! — сказала Алеся, вельмі сьпяшаючыся зьмяніць тэму гаворкі. — А вось Вы... Вы любіце, прыкладам... сабакі?
Мыша маўчала, таму Алеся з запалам працягвала:
— Каля нашага дому жыве такі ладны сабачка... Каб Вы толькі бачылі! Маленькі тэр'ер з бліскучымі вочкамі! Ведаеце, такі кудлаты, рыжы! Вы кідаеце кіёчак ці яшчэ што, і ён зараз вам прыносіць. А яшчэ ён сядае і просіць у вас есьці. І ўсякія штукі ўмее... Нават паловы ня ўспомніш! Ён жыве ў аднаго фэрмэра, ведаеце... А той ім не нахваліцца, кажа, што ён каштуе цэлыя сто фунтаў! І быццам ён усіх пацукоў і... Божа мой, Божа! — закрычала Алеся ў роспачы. — Здаецца, я зноў яе пакрыўдзіла! А Мыша ўцякала, з усяе сілы перабіраючы лапкамі ў вадзе, так, што хвалі пайшлі.
Тады Алеся пяшчотненька гукнула ўсьлед:
— Мышуля, любенькая! Вельмі прашу Вас, вярнецеся! Мы ня будзем успамінаць ні пра катоў, ні пра сабак, раз яны Вам так не даспадобы!

Мыша пачула, разьвярнулася і павольна паплыла назад. Яе пыска чыста зьбялела. (“Ад расчуленасьці”, — падумала Алеся.) Ціхім дрыготкім голасам Мыша прамовіла:
— Рушма да берагу, а там я раскажу табе маю гісторыю. Ты зразумееш, чаму я гэтак ненавіджу каты і сабакі.
Быў самы час выпраўляцца ў дарогу, бо ў копанку нападала столькі розных птушак і зьвяркоў, што там стала ўжо не прапіхнуцца. Там былі Гогаль, Дода, Папугай, Арлянё Заўвага і яшчэ колькі дзіўных істот. Алеся ўзяла рэй, і кампанія рушыла да берагу.

Разьдзел трэці
Перадвыбарная гонка й гісторыя з сумным канцом

Кампанія, што згрудзілася пры беразе, выглядала вельмі несамавіта: пер’е ў птушак завэзгалася, на зьвярах пазьліпалася поўсьць. З усіх капала, цякло. Усе таўкліся і калаціліся ад холаду.
Першым пытаньнем, ведама, было, каб дзе як абсохнуць. Пачалі радзіцца. І ўжо за колькі хвілін Алеся галёкала са сваімі суседзямі так, як быццам яна ведала іх усё жыцьцё. Яна нават ўступіла ў працяглую спрэчку з Папугайчыкам, які ўрэшце насупіўся і прамовіў:
— Я за цябе старэйшы і мне лепш ведаць!
Алеся не пагаджалася, бо ня ведала, колькі Папугайчыку гадоў. А раз ён рашуча адмаўляўся называць свае гады — няма чаго і спрачацца.
Нарэшце Мыша, якую хіба ўсе тут паважалі, заклікала:
— Сядзьце і паслухайце сюды! Я магу лёгка і проста вас высушыць!
Усе адразу ж абселі Мышу. Алеся ня зводзіла зь яе вачэй, бо ведала: калі толькі не абсохнуць зараз жа пасьля таго, як намокнеш, — абавязкова моцна расхварэешся.
— Кахі-кахі! — паважна адкашлялася Мыша. — Вы гатовыя? Я раскажу вам самую асушальную гісторыю з усіх мне вядомых. Цсссс, будзьце ласкавыя! “Вільгельм Заваёўнік, чыё чало блаславіў пантыфік, Заўвага неўзабаве падпарадкаваў сабе англасаксаў, якім бракавала дастойных правадыроў і якія

спрадвеку звыкліся раўнадушна ўспрымаць узурпацыю ўлады і захопы чужых уладаньняў. Эдвін, эрл Мэрсіі, і Моркар, эрл Нартумбрыі...”
— Брррррр! — застукаў зубамі Папугайчык.
— Выбачайце, што Вы сказалі? — строга, але падкрэсьлена ветліва запыталася Мыша. — Вы нешта сказалі?
— Я? Ды я і дзюбы не разяваў! — запратэставаў Папугайчык.
— А мне здалося, Вы нешта сказалі, — паўтарыла Мыша. — Дык я працягваю: “Эдвін, эрл Мэрсіі, і Моркар, эрл Нартумбрыі, прысягнулі яму, і нават Стыганд, славуты сваёй любоўю да мілае бацькаўшчыны арцыбіскуп Кентэрбэрыйскі, знайшоў гэта годным...”
— Знайшоў *што*? — спытаўся Гогаль.
— “Знайшоў *гэта*...” — адказала Мыша, моцна раззлаваўшыся.
— Вы павінны ведаць, што значыць “гэта”. Заўвага
— Я якраз-такі выдатна ведаю, што значыць “гэта”! Калі *я* што знаходжу, — сказаў Гогаль, — дык яно звычайна альбо жабка, альбо чарвяк. А што арцыбіскуп знайшоў?
Мыша пусьціла яго пытаньне між вушамі і не бязь сьпешкі працягвала:
— “...знайшоў гэта годным; разам з Эдгарам Атэлінгам ён выступіў насустрач Вільгельму і прапанаваў яму карону Англіі. Вільгельм напачатку праяўляў стрыманасьць, але нахабства яго нарманаў...” Як Вам цяпер, любачка мая? — працягвала яна, павярнуўшыся да Алесі. — Сохнецца?
— Мокнецца! — сумна адказала Алеся. — Ваша гісторыя мяне зусім ня сушыць.
— У такім разе, — прыўзьняўшыся, урачыста абвясьціла Птушка Дода, — я выстаўляю прапанову пастанавіць адкласьці паседжаньне дзеля неадкладнага прыняцьця больш эфэктыўных захадаў.
— Гаварэце па-нашаму! — зрабіла заўвагу Арлянё. — Я не разумею і паловы гэтых доўгіх слоў. Зрэшты, ня думаю, што Вы іх і сама разумееце!
І Арлянё ўнюрыла галаву ў плечы, каб схаваць усьмешку.
А некаторыя з птушак адкрыта засьмяяліся.
— Я зьбіралася сказаць, — пакрыўджана заявіла Птушка Дода, — што найлепшы спосаб высушыцца — перадвыбарная гонка. Заўвага
— А што такое перадвыбарная гонка? — спыталася Алеся.

Ня тое каб ёй рупіла ведаць гэта, але Птушка Дода зрабіла такую паўзу, быццам *нехта* нешта мусіць дадаць. А дадаваць ніхто не зьбіраўся.
— Ну што ж, — сказала Птушка Дода, — найлепш зразумець — гэта ўзяць удзел у гонцы!
(Можа, і вам закарцела ўзяць удзел? Тады я раскажу, як гэта рабіла Птушка Дода.)
Спачатку яна намалявала бегавую трасу — нешта накшталт кола.
— Дакладная форма неабавязковая! — махнула яна куртатым крылцам.
Тады разьмясьціла ўсю грамаду па крузе. Ніхто не камандаваў: “Раз, два, тры — бяжы!” Усе пачыналі калі хацелі. І спыняліся калі хацелі. Цяжка было зразумець, калі гонка скончылася. Аднак за паўгадзіны ўсе досыць-такі абсохлі. Птушка Дода раптам крыкнула:
— Гонка скончаная!
І ўсе скупіліся вакол яе, задыханыя, пытаючыся:
— Ну дык хто перамог?
Каб адказаць на гэтае пытаньне, Птушка Дода глыбока задумалася, прыклаўшы адзін палец да лоба (пастава, у якой зазвычай малююць Шэксьпіра). Астатнія тым часам чакалі ў поўнай цішыні. Нарэшце Птушка Дода вымавіла:
— Перамаглі *ўсе*, і *кожны* мусіць атрымаць прыз.
— А хто будзе раздаваць? — запыталіся ўсе амаль хорам.
— *Яна!* Хто ж яшчэ? — адказала Птушка Дода, паказваючы на Алесю пальцам.
І ўся кампанія абступіла яе, бязладна крычучы:
— Прызы давай! Давай прызы!
Алеся ня мела ніякага ўяўленьня, што рабіць. З роспачы яна засунула руку ў кішэнь і выцягнула адтуль бляшанку цукатаў (на шчасьце, салёная вада ў скрынку не папала) і раздала іх. Кожнаму дасталося акурат па ляндрынцы.
— Але ж яна й сама павінна атрымаць прыз, — заўважыла Мыша.
— Ведама, — адразу пацьвердзіла Птушка Дода. — Што яшчэ маецца ў цябе ў кішэні? — зьвярнулася яна да Алесі.
— Толькі напарстак, — разгубілася Алеся.
— Перадай яго мне, — загадала Птушка Дода.
Усе зноўку абступілі Алесю, тым часам Птушка Дода ўрачыста

падала напарстак і мовіла:
— Мы маем гонар прасіць Вас ласкава прыняць гэты элегантны напарстак. Заўвага
Як толькі яна скончыла сваю кароткую прамову, кампанія запляскала ў далоні і закрычала “ўра!”.
Алесі гэты рытуал падаўся даволі бязглуздым, але ўсе выглядалі гэтак сур’ёзна, што яна не наважылася засьмяяцца. Дзяўчынка ня ведала, як падзякаваць, і проста ўзяла напарстак, пакланіўшыся як мага ўрачысьцей.
Далей пачалося паяданьне цукерак. Гэта, дарэчы, выклікала гоман і гармідар. Вялікія птушкі скардзіліся, што не пасьпелі рассмакавацца, а маленькія папярхнуліся, і ім давялося стукаць у плечы. Нарэшце тлум скончыўся, усе расьселіся ў кола ды пачалі ўпрошваць Мышу расказаць яшчэ што.
— Вы абяцалі расказаць сваю гісторыю. Помніце? — нагадала Алеся. — І чаму вы так ненавідзіце К. і С., — дадала яна шэптам, баючыся, каб Мыша зноў не пакрыўдзілася.
— Мая песьня вельмі доўгая й сумная, як мой хвост! — уздыхнула Мыша, паварочваючыся да Алесі.
— Так, гэта будзе *доўгая песьня*, — пагадзілася Алеся, пазіраючы на Мышын хвост. — Але чаму сумная, як хвост?..
І, пакуль Мыша расказвала, дзяўчынка ўсё думала пра гэты хвост, і ўвесь Мышын аповед у яе ў галаве выстройваўся вось так:



```
                і прысяжных,
                     Я ня стану
                      цярпець. — Я
                      судзьдзя і
                     прысяжны, —
                  Кажа хлус
             гэты важны,—
       І цябе
  сваёй
   лапай
     Выра-
         кую
             на
                сьмерць.
```

— Ты мяне ня слухаеш! — строгім піскам заўважыла Алесі Мыша. — Пра што ты толькі думаеш?

— Даруйце! — пачціва адказала Алеся. — Вы расказалі якраз да пятага згібу, так?

— Ніякіх згібаў м-мая гісторыя ня м-мае! — запінаючыся ад злосьці, прапішчала Мыша.

— Як гэта нямая, калі я чула Вашы словы! — усклікнула Алеся, якую заўсёды абурала няпраўда. — Калі Вы дазволіце, я нават магу прыгадаць Вашы апошнія словы.

— Табе і так, відаць, зашмат усяго дазвалялася! — віскнула Мыша і рашуча рушыла ўпрочкі. — Ты зьневажаеш мяне сваімі бязглуздымі выказваньнямі!

— Я ня гэта мела на ўвазе! — пачала апраўдвацца бедная Алеся. — Вас так лёгка пакрыўдзіць!

Мыша толькі буркнула нешта ў адказ.

— Калі ласка, вярнецеся й раскажэце Вашую гісторыю да канца! — закрычала наўздагон Алеся.

Астатнія далучыліся да яе, просячы хорам:

— Так, зрабеце ласку!

Але Мыша толькі раззлавана пакруціла галавой і прысьпешыла крок.

— Як шкада, што яна ня хоча застацца! — уздыхнуў Папугайчык, як толькі Мыша прапала з вачэй.

А старая Крабіха скарыстала нагоду, каб павучыць сваю дачку:

— Вось, даражэнькая! Глядзі і запамінай: трэба заўжды *трымаць сябе ў руках!*

— А яшчэ важней *трымаць язык за зубамі*! — не змаўчала ёй маладая Крабоўна. — Ваша вечнае каньканьне і *вустрыцу выведзе зь сябе*!
— Каб зараз сюды нашую Дайну, во было б добра! — уздыхнула Алеся, не зьвяртаючыся ні да кога ў прыватнасьці.
— *Яна* б умомант яе прывалакла назад!
— А хто такая гэтая Дайна, ці можна даведацца? — пацікавіўся Папугайчык.
Алеся падбадзёрылася, бо заўсёды ахвотна гаварыла пра сваю сяброўку:
— Гэта нашая котка! Яна так ловіць мышы, вы не ўяўляеце! А каб вы бачылі, як яна птушак падпільноўвае! Ды што там, любую птушку яна зьядае адным заседам!
Гэтыя словы моцна ўзрушылі слухачоў. Некаторыя з птушак далі лататы. Старая Сарока пачала сьпешна зьбіраць манаткі, прыгаворваючы:
— Мне трэба як мага хутчэй дахаты! Начное паветра шкодзіць майму горлу!
А Канарэйка дрогкім голасам гукнула дзеткам:
— Хутчэй, мае любыя! Пара спаткі!
Пад усялякімі прычынамі яны ціхенька пазьнікалі хто куды, і Алеся засталася адна.
“Ня варта было ўспамінаць пра Дайну! — скрушна зазначыла Алеся. — Здаецца, ня надта яе тут любяць! Але ж лепшай коткі ў сьвеце няма! Ах, Дайна мая, любачка! Ці пабачу я цябе калі?”
Тут гаротная Алеся зноў пачала плакаць, бо адчула сябе вельмі самотнай. Ды неўзабаве яна пачула, як недзе зноў затупалі маленькія лапкі, і стала ўглядацца ў навакольле, спадзеючыся зноў убачыць пакрыўджаную Мышу, якая мо ўсё ж вырашыла вярнуцца, каб даказаць сваю гісторыю.

Разьдзел чацьверты

Трус запускае Піліпку

Але гэта быў Белы Трус, што памалу целяпаўся назад, хапатліва азіраючыся, быццам бы што згубіў. Алеся пачула, як ён мармыча сабе пад нос:
— Княгіня! Княгіня! О мае дарагія вусікі! О мая скурка! Яна сьсячэ мне галаву, як раз плюнуць! Не магу ўцяміць, дзе я іх пасеяў?
Алеся адразу здагадалася, што ён шукае веер і пару белых

пальчатак. І з добрага сэрца таксама пачала прыглядацца, дзе ж яны маглі падзецца. Але марна, іх нідзе не было. Усё так перамянілася з таго часу, як яна плавала ў копанцы: вялізная заля з шкляным столікам і маленькімі дзьверцамі як на той сьвет правалілася.

Неўзабаве Трус заўважыў Алесю, занятую шуканьнем, і злосна гукнуў:

— Гэй, Мар'яна! А ты што тут *робіш*? Зараз жа ляці дамоў і прынясі пару пальчатак ды веер! І каб хуценька мне!

Алеся так напалохалася, што адразу кінулася туды, куды паказаў Трус, нават не паспрабаваўшы растлумачыць яму ягоную памылку.

"Ён пераблытаў мяне з сваёй пакаёўкай, — думала Алеся летучы. — Во, пэўна, зьдзівіцца, калі даведаецца, хто я такая! Але лепей прынесьці яму той веер і пальчаткі. Зразумела, калі я іх знайду!"

І толькі яна падумала гэта, як апынулася каля хацінкі, на дзьвярах якой зьзяла медзяная шыльда з выбітым на ёй імем "Б. ТРУС". Алеся ўвайшла бяз гуку і рушыла ўгору па лесьвіцы. Яна вельмі баялася спаткацца з сапраўднай Мар'янай, якая выкіне яе з дому раней, чым яна зможа выканаць даручэньне Труса. "Хоць увогуле дзіўна, — сказала сабе Алеся, — быць на пабягушках у нейкага труса! Калі справы так пойдуць далей, дык наступнаю мяне, напэўна, будзе пасылаць па справах ужо Дайна!"

І яна жыва ўявіла сабе карціну: "Спадарыня Алеся! Хадзеце зараз жа сюды і падрыхтуйцеся ісьці на вуліцу!" — "Зараз! Іду, няня! Але я мушу павартаваць гэтую мышыную норку, пакуль ня вернецца Дайна. Трэба дагледзець, каб не ўцякло мышанё". "Толькі каб жа Дайну не пагналі, — працягвала разважаць Алеся, — калі яна гэтак раскамандуецца людзьмі!"

Тым часам Алеся апынулася ў маленькім зграбным пакойчыку. Ля акна стаяла трумо, а на ім, як яна й спадзявалася, ляжалі веер і дзьве ці тры пары белых пальчатак. Алеся ўзяла веер, пару пальчатак і ўжо зьбіралася ісьці, калі ёй на вочы трапілася маленькая бутэлечка, што стаяла каля люстэрка. Гэтым разам на ёй не было цэтліка з напісам "ВЫПІ МЯНЕ", аднак Алеся адкаркавала бутэлечку і прыклала яе да вуснаў.

"Ужо цяпер дык я ведаю, што *нештачкі* цікавае здарыцца, — сказала яна сабе, — як і заўсёды, калі я штосьці тутака зьядаю

ці выпіваю. Я толькі гляну, як дзеіць гэтая бутэлечка. Бог дасьць, ад гэтага пітва я зноў падрасту. А то такая бяда ад маёй драбноты!”
І яна сапраўды вырасла, прычым нашмат хутчэй, чым чакала. Не пасьпела яна выпіць і паловы, як адчула, што яе галава ўперлася ў столь. Яна мусіла ўгнуць плечы, каб не скруціць сабе шыі. Алеся хуценька паставіла бутэлечку на месца і сказала:
— Вой-вой-вой, до! Спадзяюся, я больш не павялічуся. Я й так ужо не прайду ў дзьверы. І навошта я глынула так шмат, дурнічка!
Дарма! Было запозна шкадаваць! Яна ўсё расла ды расла і ўжо мусіла стаць на каленкі, а праз хвіліну і таго месца забракла. Яна паспрабавала легчы, адным локцем упёршыся ў дзьверы, а другі паклаўшы сабе пад галаву. І ўсё адно Алеся расла. Апошняе, што яна магла зрабіць, — гэта высунуць адну руку ў акно, а нагу ў камін, Заўвага толькі й сказаўшы сабе: “Усё, далей ужо няма куды. Заўвага І *што* зь мяне будзе?”
На шчасьце, дзеяньне чароўнай бутэлечкі спынілася — Алеся перастала расьці. Усё адно яе становішча было ніякаватым: ніякай магчымасьці выкараскацца з пакою не прадбачылася. Дзіва што яна зажурылася.
“Няма лепш, як дома! — думала бедная Алеся. — Там не бывае, каб хто большаў ці меншаў! Каб камандавалі ўсялякія мышы, трусы... І собіла мне лезьці ў тую нару! Але ж... Але... Яно такое дзіўнае, гэтае тутэйшае жыцьцё! Цікава, што гэта *магло* адбыцца з мной! Калі я проста чытала казкі — дык уявіць сабе не магла, каб гэтакія штукі дзе здараліся! А тут, на табе, сама патрапіла ў адну! Пра мяне б кніжку напісаць, далібог! Калі вырасту, я таксама напішу кніжку... Толькі я ўжо, здаецца, і без таго вырасла!” — і дадала сумным голасам:
— Прынамсі, *тут* расьці ўжо няма куды.
“У такім разе, — падумала Алеся, — мне заўсёды будзе столькі гадоў, як цяпер? Гэта было б нядрэнна! Я ніколі не пастарэю. Зь іншага боку, тады мне давядзецца ўвесь век хадзіць у школу! О, толькі ня *гэта*!”
— Ну ты і дурненькая, Алеся! — адказала яна сама сабе. — Якая школа, якая вучоба? Тут для *цябе* няма месца, дык дзе ж яно будзе для падручнікаў!
Так яна гаманіла, удаючы то адзін бок, то другі. І выходзіла

ніштаватая сабе гутарка. Аж тут пачуўся на дварэ нечы крык.
— Мар'яна! Гэй, Марка! — крычаў голас. — Давай сюды пальчаткі! Зараз жа!
Потым зь лесьвіцы даляцеў тупат маленькіх ножак. Алеся здагадалася: гэта Трус прыбег яе шукаць. І затрымцела так, што страпянулася ўся хата. Алеся забылася, наколькі яна цяпер большая за Труса — і таму ёй не выпадае баяцца.
А Трус падышоў да дзьвярэй і паспрабаваў іх адчыніць, але дзьверы адчыняліся ўсярэдзіну, а локаць Алесі шчыльна падпіраў іх. Алеся пачула, як Трус, ня даўшы рады, сказаў сабе:
— Прыйдзецца абабегчы вакол і залезьці праз акно.
"Так ты і залез!" — падумала Алеся і, счакаўшы, пакуль Трус загрукае пад карнізам, з усяе сілы махнула тою рукой, што высоўвалася ў акно, спрабуючы захапіць Труса ў жменю. Яна нічога не ўхапіла, але пачула танюсенькі віск, удар, а потым звон шкла. Відаць, Трус уваліўся ў цяпліцу з гуркамі ці яшчэ куды.
І зараз жа пачуўся яго раззлаваны крык:
— Пэт! Пэт! Дзе ты?
А потым прагучаў голас, якога Алеся яшчэ ня чула:
— Ды тутака я, значыцца! Грушы абкопваю, вашамосьць!
— Грушы абкопвае, а няўжо ж! — заенчыў разьюшаны Трус. — Сюды давай! Памажы мне вылезьці!
Зноў зазьвінела пабітае шкло.
— А цяпер скажы мне, Пэт, што гэта там тырчыць з акна?
— Чыяся ручка, значыцца, вашамосьць!
Ён так і вымаўляў: "чыяся".
— Якая ручка, ёлуп! Дзе ты бачыў "ручку" такіх памераў? Яна тырчыць на ўсё акно!
— Гэта так, вашамосьць! Ды ўсё ж тамака чыяся ручка.
— Добра! Аднак ёй няма чаго там рабіць. Ідзі прыбяры яе адтуль!
Потым настала доўгая цішыня, і толькі раз-пораз даносіліся шэпты:
— Дальбог! Значыцца, не па-мойму гэта, вашамосьць! Авохці мне... Не па-мойму!
— Рабі, як я табе кажу, галган!
Алеся яшчэ раз хапянула пальцамі ў паветры. Цяпер пачуліся *два* танюсенькія віскі і зноў — пабітае шкло.
"Колькі ж там тых цяпліцаў на гуркі! — падумала Алеся. —

Цікава, што яны будуць рабіць далей! Калі выцягваць мяне з акна, дык я ня супраць. Каб толькі ім гэта *ўдалося*! Так збрыдла сядзець!”
На нейкі час усё заціхла, пасьля зарыпелі калёсы. Процьма галасоў зьлівалася ў адзін гоман. Алеся адрозьнівала словы:
— Дзе яшчэ адны драбіны?
— Дзе-дзе! Мне сказалі прынесьці толькі адны. У Піліпкі павінны быць другія.
— Піліпка, хлопча! Давай іх сюды!
— Сюды! Стаў іх на вугал.
— Не! Спачатку зьвяжы іх! А то й да паловы не дастануць!
— Дастануць! Не лапачыся!
— Сюды, Піліпка! Бярыся за вяроўку!
— Ці вытрымае страха?
— Пільнуйся! Там слаба трымаецца, можна ўваліцца!
— Падаюць! Беражыся!
Раптам моцна грукнула.
— Гэй, хто гэта зрабіў?
— Відаць, Піліпка!
— А хто ў комін палезе?
— Не-е, *я* не палезу! Давай *ты* лезь!
— *Лезьці?* Ну не!
— Піліпка палезе!
— А, Піліпка, ты! Гаспадар кажа, ты павінен лезьці ў комін!
“Ах, во як! Значыць, Піліпка і ў комін павінен лезьці? — сказала сабе Алеся. — Яны, здаецца, усё звалілі на беднага Піліпку! Я б нізавошта не захацела аказацца на яго месцы. Комін, праўда, вузенькі, але я *думаю*, што брыкнуцца змагу!”
Яна засунула нагу як мага далей у комін і празь які час пачула скробат маленькага зьвярка (здагадацца, што гэта менавіта за зьвярок, яна не магла), які скробся і шамацеў акурат над ёю.
— Гэта Піліпка! — сказала яна, рэзка дрыгнула нагой і здумала пачакаць, што ж будзе далей.
Перш разьнёсься ўсіхны крык:
— Піліпка ляціць!
Потым — самотны голас Труса:
— Лавеце яго! Гэй, там, каля плоту!
Потым — цішыня, і зноў разнабой галасоў:
— Прытрымайце яму галаву!
— Гарэлкі сюды!

— Памалу! Задушыцца...
— Ну як, браточак!?
— Дык што там было? Раскажы!
Нарэшце пачуўся танюсенькі, кволы і пісклявы галасок (“Піліпкаў”, — здагадалася Алеся):
— Ну, як вам сказаць... Дзякуй, больш ня трэба. Мне ўжо лепш... Толькі ў галаве нешта блытаецца... Амаль нічога ня помню... Падкінула мяне... як ляльку на спружыне. І чую — лячу, што тая ракета!
— Але! Да ракеты ты быў вельмі падобны, браточку! — пацьвердзілі галасы.
— Трэба паліць хату! — данёсься раптам голас Труса.
Алеся гукнула штомоцы:
— Толькі паспрабуйце, я Дайну на вас спушчу!
Імгненна настала мёртвая цішыня. Алеся падумала: “Цікава, што яны зараз прыдумаюць! Калі б у іх было хоць трохі мазгоў, яны б ужо разабралі страху”. Праз пару хвілін рух пачаўся зноў. Алеся ўчула, як Трус сказаў:
— Пакуль досыць і аднаго вазка.
“Вазка *чаго*?” — падумала Алеся.
Але сумневы перарваў град дробных каменьчыкаў, што, як чмялі, пасыпаліся ў акно. А некаторыя нават паранілі яе. “Я ім дам!” — падумала яна і гукнула:
— Толькі паспрабуйце яшчэ раз кінуць!
Гэта зноў выклікала мёртвую цішыню на дварэ.
Алеся зьдзіўлена заўважыла, што на падлозе каменьчыкі ператвараюцца ў маленькія піражкі. І шыкоўная думка прышла ёй у галаву: “Калі я зьем піражок — адразу будзе нейкая зьмена ў памерах. Зрабіць мяне яшчэ большаю наўрад ці можна. Думаю, ён мяне толькі паменшыць”.
Так яна зьела піражок і была страшэнна задаволеная, калі ўбачыла, што ўмомант пачала скарачацца. А як толькі паменшала, каб выйсьці празь дзьверы, — сіганула з хаты і натрапіла на натоўп дробных зьвяркоў ды птушак, што таўкліся на падворку. Ахвярны Піліпка Заўвага — ці то трытон, ці то яшчарка — ляжаў у цэнтры, на руках у дзьвюх марскіх сьвінак, якія адпойвалі яго з бутэлькі. Усе, зараз разгледзеўшыся, кінуліся на Алесю. Але яна бяз духу так пусьцілася прэч, што неўзабаве апынулася ў бясьпецы сярод густога лесу.
— Першай справай, — сказала Алеся, разгледзеўшыся ў

гушчары, — трэба вярнуць свае памеры. Другая рэч — знайсьці дарогу ў той чароўны сад. Думаю, гэта найлепшы плян.
Плян запраўды падаваўся выдатным: простым і ясным. Адна бяда, яна ня мела найменшага ўяўленьня, як яго ажыцьцявіць.
І пакуль Алеся хапатліва разглядалася ў гушчары, кароткі пранізьлівы брэх над самаю галавою прымусіў яе зірнуць угору. Агромністы шчанюк узіраўся вялізнымі круглымі вачыма і асьцярожна выцягваў лапу, спрабуючы да яе дакрануцца.
— Беднае сабачанё! — пяшчотна сказала Алеся і паспрабавала падклікаць яго сьвістам.
Але дзе там! Алеся баялася, што шчанюк галодны і — сьвішчы не сьвішчы! — можа проста зьесьці яе.
Алеся, мала ўсьведамляючы, што робіць, падняла трэсачку і сунула яе шчаняці. А той з радасным віскам падскочыў угору адразу на ўсіх чатырох лапах і кінуўся да трэскі, як быццам вельмі хацеў ёю завалодаць. Тады Алеся матлянулася за куст чартапалоху, каб шчанюк яе не растаптаў. І, калі яна апынулася па той бок куста, шчанюк зноў кінуўся да трэскі, закідваючы ногі за вушы, каб хутчэй яе ўхапіць. Алеся, для якой гэтыя хованкі былі як забаўкі з канём, рызыкавала патрапіць пад шчанюковыя лапы. Яна зноў схавалася за куст. Шчанюк яшчэ некалькі разоў з хрыплым брэхам памыкаўся да трэскі: то крыху ўперад, то далёка назад! І, урэшце, сеў, яхаючы, высалапіўшы язык і прыплюшчыўшы вочы.
Выдаўся-такі шанец уцячы ад шчаняці! Алеся наважылася і пабегла, аж пакуль не стамілася і спынілася набрацца духу, а брэх не сьціхаў удалечыні.
— І ўсё-ткі, які мілы шчанючок! — сказала Алеся, прыхіліўшыся да сьцябла курасьлепу і абмахваючыся яго лістом. — Навучыць бы яго ўсялякім штукам! Калі б... калі б... я толькі мела патрэбны для гэтага рост! О людцы! Я ледзь не забылася, што павінна зноў вырасьці! Трэба падумаць, як гэта робіцца? Здаецца, я павінна што-небудзь зьесьці ці выпіць. Пытаньне — што!?
Пытаньне “што” сапраўды заставалася нявырашаным. Алеся агледзела навакольныя кветкі і травінкі, але ня ўбачыла нічога такога, што варта было б зьесьці альбо выпіць. Паблізу рос вялізны грыб, памерам, бадай што, з Алесю. Яна агледзела яго зьнізу, збоку і ззаду. А чаму б ня глянуць таксама, што там наверсе?

Алеся ўзьнялася на дыбачкі, зазірнула за край грыбовай шапачкі і вочы ў вочы спаткалася зь вялізным блакітным вусенем. Ён сядзеў на самай плешцы ды курыў кальян, склаўшы рукі і не зважаючы ні на Алесю, ані на што ў сьвеце.

Разьдзел пяты

Вусенева парада

Вусень і Алеся пэўны час моўчкі ўглядаліся адно на аднаго. Нарэшце, Вусень выцягнуў з рота кальян і зьвярнуўся да Алесі мройлівым, сонным голасам:

— А *ты* хто такая?

Такі пачатак мала натхняў на гутарку. Таму й Алеся адказала ня надта сьмялява:

— Я... я... спадару, цяпер і ня ведаю... Але, прынамсі, ведаю, кім я *была*, калі прачнулася сёньня наранку. З таго часу я, адчуваю, некалькі разоў адмянілася.

— Што ты маеш на ўвазе? — стрымана спытаўся Вусень. — Патлумач сваю думку.

— Я... спадару, на жаль, ня ўпэўненая, што гэтая думка і праўда *мая*, — сказала Алеся, — сама, бачыце, ня ведаю, хто я. Заўвага

— Нічога я ня бачу, — адказаў Вусень.

— Баюся, я не змагу гэта патлумачыць лепей, — пачціва працягвала Алеся, — бо й сама не магу нічагутка зразумець. Мяняцца ў памерах некалькі разоў на дзень — гэта моцна зьбівае з панталыку.

— Зусім не, — сказаў Вусень.

— Ну што ж, можа, Вы да гэтага яшчэ не дасьпелі, — прамовіла Алеся, — але калі Вы ператворыцеся ў кокан — а некалі ператворыцеся пэўна, Вы ж ведаеце! — а тады ў матыля... Думаю, Вам будзе ад гэтага ніякавата, ці не?

— Зусім не, — сказаў Вусень.

— Добра, можа, *Вы* ўсё адчуваеце інакш, — сказала Алеся, — толькі я ведаю, што *мне* ад гэтага было б крыху ніякавата.

— Табе? — кінуў Вусень фанабэрыста. — А хто *ты* такая?

Гэта вяртала іх да стану на пачатак гутаркі. Алеся адчула лёгкае раздражненьне ад *занадта* ж ляканічных Вусеневых заўваг, таму прыняла велічную позу і дэкляравала:

— Я мяркую, што перш *Вы* мусіце сказаць мне, кім Вы ёсьць.

— Навошта? — зьдзівіўся Вусень.

Гэта было яшчэ адно складанае пытаньне. І раз Алесі не прыйшло ў галаву добрага адказу, а Вусень, здавалася, быў *зусім* не ў гуморы, яна павярнулася і пайшла прэч.
— Вярніся! — гукнуў яе Вусень. — Я мушу сказаць табе нешта вельмі важнае!
Гэта гучала шматабяцальна. Алеся вярнулася.
— Трэба быць ураўнаважанай, — сказаў Вусень.
— І гэта ўсё? — спытала Алеся, спрабуючы ўтаймаваць сваю злосьць.
— Не, — адказаў Вусень.
Алеся падумала: можна й пачакаць, балазе ёй няма чаго асабліва рабіць, а раптам Вусень скажа нешта вартае. Некалькі хвілін той пыхкаў кальянам у поўным маўчаньні. Урэшце, ён разьняў складзеныя на жываце рукі, выняў з рота кальян і пачаў:
— Дык ты думаеш, што перамянілася, так?
— Баюся, што так, спадару, — сказала Алеся. — Я не магу ўспомніць таго, што заўжды дагэтуль помніла. Апроча таго, не праходзіць і дзесяці хвілін, як я мяняюся ў росьце!
— Успомніць *чаго*? — удакладніў Вусень.
— Прыкладам, я спрабавала чытаць вершык *“Не сядзіцца ў хаце...”*, але выйшла зусім ня тое! — засмучана адказала Алеся.
— Прачытай тады *“Бацьку Ўільяма”*, — парадзіў Вусень.
Алеся склала на грудзёх рукі і пачала:

— Бацька Ўільям, [Заўвага] *ты вельмі глыбокі стары, —*
так сказаў маладзён. — Дык навошта
цэлы дзень ты нагамі стаіш дагары,
адкажы мне, якім гэта коштам?

— У сваёй маладосьці, — стары адказаў, —
я на думкі ня траціў ні глузда
і цудоўную здольнасьць стаяць я прыдбаў,
бо заўжды ў галаве маёй пуста.

— Ты стары чалавек, я пра гэта казаў,
да таго ж ты — уеўшыся, сыты,
але тут ля дзьвярэй сальта мне паказаў —
і адкуль у цябе столькі спрыту?

— Як я быў малады, — сівізною затрос
мудры бацька, — я быў вельмі порсткі,
націрацца купіў мазі дзіўнае воз
я за шылінг. Ці даць табе трошкі?

— Ты стары, — кажа сын, — апроч тлушчу, усе
мусяць стравы давацца нялёгка,
ды з касцямі і дзюбай зьядаеш гусей
ты за раз, не зьмігнуўшы і вокам.

— З тваёй маткай, быў час, — той яму адказаў, —
я судзіцца ня страчваў нагоды
і ў прамовах я сківіцам сілу прыдбаў —
тая сіла са мной назаўсёды.

— Ты стары чалавек, — зноўку хлопец сказаў, —
і твой зрок прытупіўся дарэшты,
ды на носе ты здольны трымаць ментуза —
адкуль спрытнасьці столькі бярэш ты?

— Я ўжо тройчы табе, сыне мой, даў адказ, —
мовіў той. — Ці ня будзе на сёньня?
Не магу гэтак шмат гаварыць я за раз —
прэч адсюль, а то скіну са сходняў!

— Зусім ня так, — сказаў Вусень.

— Вы хацелі сказаць — не *зусім* так, — няўпэўнена ўдакладніла Алеся, — некаторыя словы ня тыя.

— Усё ня тое, ад пачатку й да канца, — настойваў Вусень.

Некалькі хвілін стаяла ціша. Першым загаварыў Вусень.

— А якога памеру ты б хацела быць? — спытаўся ён.

— Ах, я неперабо́рлівая, — пасьпяшалася адказаць Алеся. — Проста, ведаеце, я б хацела мяняцца ня так часта.

— *Ня ведаю*, — прамармытаў Вусень.

Алеся нічога не адказала; яшчэ ніколі ў жыцьці яна так не заблытвалася ў супярэчнасьцях і цяпер адчувала, што ёй памалу здраджвае ейная ўраўнаважанасьць.

— А цяпер ты задаволеная? — спытаўся Вусень.

— Ну, шчыра кажучы, спадару, з Вашага дазволу, я б хацела *крышачку* пабольшаць, — сказала Алеся. — Тры цалі — гэта мізэрны рост для жывой істоты.

— Гэта цудоўны рост! — раззлаваўся Вусень і пад тое ўзьняўся ледзь не на дыбкі. (Ён дакладна меў тры цалі росту.)
— Але я да яго не прывыкла! — запратэставала бедная Алеся. А сама падумала: “Каб жа гэтыя стварэньні яшчэ не былі такія крыўдлівыя!”
— Прывыкнеш патроху! — сказаў Вусень, засунуў кальян у рот і зацягнуўся.
Алеся цярпліва чакала, пакуль Вусень не надумаецца зноў падаць голас. Праз пару хвілін Вусень выняў з роту кальян, пазяхнуў раз-другі і перасмыкнуўся. Потым зьлез з грыба, пасунуўся ў траву і прапаў, пасьпеўшы на разьвітаньне дакінуць:
— Адзін бок зробіць цябе большай, другі — меншай.
“Адзін бок *чаго*? Другі бок *чаго*?” — задумалася Алеся.
— Грыба, натуральна, — сказаў Вусень, быццам Алеся ўголас яго пыталася, і зараз зьнік з вачэй.
Недзе з хвілю Алеся задуменна ўзіралася на грыб, спрабуючы сьцяміць, дзе які бок. Грыб быў круглюсенькі, таму гэтае заданьне было складаным. Але яна абхапіла рукамі шапку і адламала з кожнага краю па кавалку.
— А цяпер — дзе што? — спыталася яна і ўкусіла ад кавалку ў правай руцэ, каб паспытаць яго дзеяньня.
У той жа момант Алеся стукнулася барадою аб носік уласнай ступы!
Ад раптоўнай перамены яна страшэнна спалохалася. Але ўсьведамляла: часу траціць нельга. І Алеся пасьпяшалася ўгрызьціся ў іншы кавалак, хоць барада яе ўжо так шчыльна ўперлася ў ногі, што не давала нават губы разьняць. Урэшце яна патрапіла адкусіць ад скрыліка, які трымала ў левай руцэ.

* * *

— Глянь ты, мая галава ўрэшце вольная! — усклікнула Алеся з захапленьнем, якое тут жа ператварылася ў агаломшанасьць, калі яна згледзела, што плячэй і блізка няма. Усё, што яна бачыла, глянуўшы ўніз, — агромністай даўжыні шыя, што ўздымалася як самотная сьцяблінка над зялёным морам лістоты.
— Што тут за *зеляніна*? — зьдзівілася Алеся. — І дзе падзеліся мае *плечы*? А вы, мае бедныя ручкі! Чаму ж я вас болей ня бачу?

Гаворачы, яна рухала рукамі, але гэта нічога не давала, апрача слабога шолаху сярод далёкай зялёнай лістоты.
Ня даўшы рады ўзьняць рукі да галавы, яна паспрабавала нахіліць галаву *да іх* і была ўсьцешаная тым, што яе шыя лёгка варочаецца на ўсе бакі, як зьмяя. Выхіліўшы галаву элегантным зыгзагам, Алеся мелася зазірнуць пад зеляніну, якая была ня чым іншым — Алеся ўжо скеміла! — як лістотай дрэў. І тут рэзкі сьвіст змусіў яе адхіснуцца. Вялізная галуба кінулася ёй у твар і замалаціла з усяе моцы крыламі.
— Гадаўка! — верашчала Галуба.
— Ніякая я *ня* гадаўка! — абурылася Алеся. — Пакіньце мяне ў спакоі!
— А я кажу — гадаўка! — паўтарыла Галуба, але ўжо памяркоўней, і, румзаючы, дадала: — Я ўжо спрабавала і тое, і гэта, але хіба дасі ім рады!
— Ня цямлю, пра што вы гаворыце, — сказала Алеся.
— Я спрабавала рабіць пад каранямі дрэў, на беразе рэчкі, у кустох, — працягвала Галуба, не зважаючы на яе, — але гэтае гадаўё! Рады няма!
Тут Алеся ўжо канчаткова перастала нешта разумець. Але падумала, што варта памаўчаць, пакуль Галуба ня скончыць наракаць.
— Класьці ды выседжваць яйкі і так ня проста! — казала Галуба. — А тут яшчэ пільнуй іх ад гадаў дзень і ноч! Ды што там! За апошнія тры тыдні я нават вока ня сплюшчыла!
— Выбачайце, я надзвычай шкадую, што патурбавала вас, — уставіла Алеся, якая пачала разумець, у чым тут рэч.
— І варта мне толькі знайсьці найбольшае дрэва ў лесе, — працягвала скардзіцца Галуба, пераходзячы неўзабаве на енк, — і варта мне толькі паспадзявацца, што тут я нарэшце для іх недасяжная, як на табе! — яны, кручаныя, зь неба лезуць! Ах ты, зьмяя!
— Ніякая я *не зьмяя*, будзьце пэўныя! — сказала Алеся. — Я... Я...
— Так я табе і паверыла! У такім разе што ты за жывёла? — спыталася Галуба. — Я разумею, ты шукаеш адчапное!
— Я... я... маленькая дзяўчынка! — сказала Алеся ня вельмі ўпэўнена, успомніўшы, колькі яна мянялася за цэлы дзень.
— Ага, так я табе й паверыла! — з глыбокаю пагардаю адказала Галуба. — Нагледзелася я на маленькіх дзяўчатак, але *ніводнай*

сярод іх не траплялася з такою шыяй! Не, не! Ты чыстая гадаўка, няма чаго адмаўляццца. Зараз ты скажаш мне, быццам ніколі не каштавала яек!
— Я *ела* яйкі, — запратэставала Алеся, якая была вельмі шчырым дзіцем, — але ж дзяўчынкі, як і гадзіны, таксама ядуць яйкі, каб Вы ведалі.
— Я табе ня веру, — сказала Галуба. — Зрэшты, раз дзяўчынкі ядуць яйкі, значыць, і яны такія самыя гадзіны. Заўвага От і ўсё, што я магу сказаць.
Гэтая думка падалася Алесі настолькі новай, што яна змоўкла на пару хвілінаў, а Галуба тым часам дадала:
— Ты *яйкі* шукаеш! Я ведаю гэта, і можаш мне тут не апраўдвацца. А якая мне тады розьніца, дзяўчынка ты ці зьмяюка?
— Для *мяне* гэта вялікая розьніца, — перапыніла яе Алеся, — і я не шукаю яек, як бачыце. А каб і шукала, дык ня *вашыя*. Я ня ем сырых яек!
— Тады прэч адсюль! — змрочна крыкнула Галуба, зноў сядаючы на сваё гняздо.
Алесі было цяжка прабірацца між дрэваў, шыя раз-пораз чаплялася за гальлё, і ёй абычас даводзілася спыняцца і разблытвацца. Неўзабаве яна ўспомніла, што ўсё яшчэ трымае кавалкі грыба, і вельмі абачліва ўзялася імі частаваццца, кусаючы памалюсеньку спачатку ад аднаго, потым ад другога, то большаючы, то меншаючы, пакуль ня здолела, урэшце, вярнуць свае звыклыя памеры.
Алеся, якая даўно не была *свайго* росту, спачатку пачулася ніякавата, але за колькі хвілінаў прызвычаілася ўжо і зноў загаварыла сама з сабою.
— Ага, вось я й выканала палову свайго пляну! Якія дзіўныя ўсё ж гэтыя адмены! Я ніколі не магу быць пэўная, чым стану ў наступную хвіліну! Што ж, цяпер я вярнулася да свайго нармальнага росту. Далей варта патрапіць у той цудоўны сад. Цікава, і як жа гэта *зрабіць*?
Толькі яна гэта мовіла, як апынулася на палянцы, дзе пасярэдзіне стаяла хатка ўвышкі з чатыры футы. “Хто б там ні жыў, — падумала Алеся, — з *такім* ростам туды лепей ня сунуцца. Яны ж, убачыўшы мяне, павар’яцеюць ад жаху!” Яна зноў, па каліве, пачала кусаць ад кавалачка з правай рукі, ня важачыся падысьці, пакуль не паменшала да дзевяці цаляў.

Разьдзел шосты

Перац і парасё

Яна яшчэ пару хвілін стаяла разглядала хатку, ня ведаючы, што рабіць, калі зь лесу раптам выбег лёкай. (Алеся па ліўрэі пазнала, што гэта лёкай, на твар жа ён быў чысты карась.) Заўвага Лёкай гучна забарабаніў у дзьверы. Дзьверы адчыніў яшчэ адзін лёкай у ліўрэі, круглавідны, лупаты — чыстая рапуха. Алеся зьвярнула ўвагу, што ў абодвух на галовах узвышаюцца напудраныя парыкі з доўгімі завітымі буклямі. Ёй адразу стала цікава, што ўсё гэта значыць, і яна высунулася зь лесу, бліжэй да хаткі, каб паслухаць.

Лёкай-Карась пачаў з таго, што выцягнуў з-пад пахі велізарны ліст, ці не зь яго ростам, і ўручыў Лёкаю-Рапусе, сказаўшы ўрачыста:

— Для Княгіні. Ад Каралевы. Запросіны на кракет.

Лёкай-Рапуха паўтарыў тым самым тонам, толькі перамяніўшы крыху парадак слоў:

— Ад Каралевы. Для Княгіні. Запросіны на кракет.

Тады яны пакланіліся адзін аднаму так, што іх напудраныя кудзеркі ледзьве не пераблыталіся.

Алесю гэта так пацешыла, што яна адступіла назад у лес, баючыся выдаць сябе сьмехам. А калі яна выглянула зноў, Лёкай-Карась ужо зьнік, а другі сядзеў на ганку, дурнавата ўтаропіўшыся ў неба.

Алеся баязьліва падышла да дзьвярэй і пастукала.

— Тваё стуканьне ня мае ніякага сэнсу, Заўвага — заўважыў Лёкай, — зь дзьвюх прычынаў: па-першае, я, як і ты, стаю з гэтага боку дзьвярэй, а па-другое, усярэдзіне такі вэрхал, што ніхто цябе не пачуе.

І праўда, зь сярэдзіны *далятаў* страшэнны гоман. Цяжка было зразумець, што там робіцца: там безупынку скавытала, чхала і штохвіліны даносіўся такі громазд, быццам нехта граміў талеркі.

— Будзьце ласкавы, — сказала Алеся, — падкажэце, як мне ўвайсьці?

— Тваё стуканьне, магчыма, мела б сэнс, — разважаў Лёкай, ня слухаючы Алесі, — калі б гэтыя дзьверы былі паміж намі. Прыкладам, калі б ты была ўсярэдзіне, ты магла б пастукаць, а я мог бы цябе выпусьціць, разумееш?

Гаворачы, ён штораз зіркаў у неба. Алесі гэта падалося надта няветлым. “Хоць, можа, ён інакш ня можа, — сама сабе падумала Алеся. — Вочы ў яго сядзяць на *самюсенькай* макаўцы. Але ўсё адно, на пытаньні жа ён мог бы адказваць.”
— Прабачце, як я магу трапіць у дом? — паўтарыла яна як мага гучней.
— Магчыма, я прасяджу тут... — заўважыў Лёкай, — да заўтра...
У гэты момант дзьверы расчыніліся — і вялізная талерка паляцела Лёкаю проста ў галаву. Але, на шчасьце, зьлёгку чапіўшы яго па носе, яна разьбілася ўшчэнт аб дрэва ў яго за плячыма.
— ...а мо’ й да пазаўтра, — працягваў Лёкай, нібы нічога ня здарылася, нават вухам не павёўшы. (Хоць дзе ў Рапухі тыя вухі?)
— Як я магу трапіць у дом? — яшчэ раз запыталася Алеся ўжо зусім гучна.
— А ці *варта наагул* туды трапляць? — сказаў Лёкай. — Во дзе пытаньне!
Так яно так, толькі Алесі не падабалася, калі зь ёю гаварылі ў падобным тоне.
— Проста жах, — прамармытала яна сабе пад нос, — як уся гэтая жыўнасьць любіць пярэчыць. Ашалець можна!
Лёкай, мабыць, падумаў, што прыйшоў час паўтарыць сваю ўлюбёную думку зь некаторымі варыяцыямі.
— Я буду тут сядзець і сядзець, — сказаў ён, — дзень пры дні, увесь час.
— А *мне* што рабіць? — спыталася Алеся.
— Што сабе хочаш, — адказаў Лёкай і засьвістаў.
— Зь ім кашы ня зварыш! — махнула рукою Алеся. — Нейкі ідыёт!
Яна адчыніла дзьверы і ўвайшла. За дзьвярыма аказалася вялікая кухня, паўнюткая чаду. Пасярэдзіне сядзела на трыножцы Княгіня Заўвага і гушкала немаўля; кухарка, схіліўшыся над агнём, памешвала ў велічэзнай каструлі нешта накшталт супу.
— У гэтым супе зашмат перцу! — зазначыла Алеся, ледзь трываючы, каб ня чхнуць.
Прынамсі ў *паветры* перцу было шмат. Нават Княгіня раз у раз чхала; а дзіця дык і чхала, і верашчала проста безь перадыху.

Ня чхалі тут толькі двое: кухарка і агромністы кот, які ляжаў на каберчыку пры печы і лыбіўся аж да вушэй.
— Скажэце, калі ласка, — асьцярожна пачала Алеся, бо не была ўпэўненая, ці ветла загаворваць з старэйшымі першай, — чаму ваш кот гэтак пасьміхаецца?
— Гэта Чэшырскі Кот, Заўвага — сказала Княгіня, — вось чаму. Сьвіньня!
Апошняе слова яна так выкрыкнула, што Алеся ледзь не падскочыла. Але тут жа зразумела, што гэта сказана не на яе адрас, а да дзіцяці, і, набраўшыся адвагі, працягвала:
— Я ня ведала, што Чэшырскія Каты заўжды ўсьміхаюцца. Шчыра кажучы, я наагул ня чула, каб каты *ўмелі* ўсьміхацца.
— Усе каты ўмеюць усьміхацца, — сказала Княгіня, — і большая палова зь іх усьміхаецца.
— Я ня ведаю ніводнага, які б усьміхаўся, — настойвала Алеся як мага больш ветла, задаволеная тым, што завязалася гутарка.
— Ды што ты наагул ведаеш?! — заявіла Княгіня. — Нічагутка!
Алесі зусім не спадабаўся тон гэтае заўвагі, і яна падумала, што варта было б разгаварыцца пра што іншае. Пакуль яна спрабавала адшукаць якую-небудзь лепшую тэму, кухарка зьняла з агню рондаль і пачала шпурляць усім, што было пад рукою. У Княгіню і малога паляцелі качэргі, чапёлы, шчыпцы, шуфлікі, потым — патэльні, талеркі і сподкі. Княгіня не зьвяртала аніякай увагі, нават калі яны ў яе траплялі. Што да немаўляці, дык яно й без таго так крычала, што немагчыма было сказаць, ці гэта кухарка яго зачапіла, ці яно крычыць проста так.
— Прашу Вас, *падумайце*, што Вы робіце! — узрушана закрычала Алеся, падскокваючы на месцы. — Ой, проста ў *чароўны* носік! — жахнулася яна, калі вялізная патэльня пранеслася ля самага твару немаўляці; яшчэ трохі, і застацца яму бяз носу.
— Калі б кожны сачыў за сваім носам і ня соваў яго ў чужыя справы, — прабурчала Княгіня, — зямля круцілася б куды хутчэй.
— Што не дало б аніякай карысьці, — дакінула Алеся, радая прадэманстраваць сёе-тое з сваіх ведаў. — Толькі ўявеце сабе, як збаламуціліся б дзень і ноч! Зямлі ж патрэбныя дваццаць чатыры гадзіны, каб абляцець вакол сваю... сваю... вось.
— Што да восяў, — сказала Княгіня, — то добра было б адсячы

некаму галаву тут вось!
Алеся занепакоена зірнула на кухарку, ці не ўспрыняла тая гэты дрэнны жарт як загад. Але тая засяроджана мяшала суп і, здавалася, нічога ня чула, так што Алеся працягвала далей:
— Дваццаць чатыры гадзіны, *здаецца*... Ці толькі дванаццаць?
— Адчапіся ты *ад мяне*! — усклікнула Княгіня. — Чаго я цярпець не магу, дык гэта лічбаў.
І тут яна зноў узялася за немаўля, сьпяваючы нешта накшталт калыханкі і груба гушкаючы яго пры кожным радку:

— Будзь вельмі жорсткай зь немаўлём, [Заўвага]
лупі яго: няхай
заўсёды памятае ён
твой запавет: “Ня чхай!”
П р ы п е ў
(У якім далучаліся кухарка й немаўля):
— Уа! Уа! Уа!

Калі пачаўся другі куплет, Княгіня падкідала малога ўжо гэтак высока ўгору, што ад верашчаньня малечы Алеся не дачувала словаў:

— Ён чхае, каб зь цябе пакпіць.
Лупі яго, як козу:
ён перцу можа перажыць
якую хочаш дозу.

П р ы п е ў:
Уа! Уа! Уа!

— На! Можаш пакалыхаць, калі хочаш! — сказала Княгіня Алесі, перакідаючы малое ёй. — А я мушу рыхтавацца да гульні ў кракет з Каралевай, — і рушыла прэч.
Кухарка яшчэ шпурнула ёй наўздагон патэльню, але міма.
Алеся ледзьве пасьпела падхапіць дзіцё: малеча мела даволі-такі дзіўныя формы і ўвесь час выпроставала ручкі й ножкі ў розныя бакі. “Нібы ў якой марское зоркі”, — падумала Алеся. Беднае немаўлятка сапло, як паравая машына, складалася напалам і выгіналася назад. Адным словам, першыя хвіліны

Алеся ледзьве-ледзьве трымала яго на руках.
Урэшце, яна знайшла спосаб, як яго закалыхаць: яна ўкруціла яго ў вузельчык, а потым цьвёрда трымала за правае вуха і левую нагу, каб не раскруціўся. Гэтак яны і выйшлі на двор.
“Калі я не забяру дзіця з сабой, — падумала Алеся, — яны затаўкуць яго ня сёньня, дык заўтра. Пакінуць яго ў такіх умовах было б злачынствам!” Заўвага
Апошнія словы яна прамовіла ўголас, і малеча зарохкала ў адказ (чханьне спынілася).
— Ня рохкай, — зрабіла яму заўвагу Алеся, — гэта не найлепшая манера.
А тое зноў: рох-рох! Алеся раздражнёна зазірнула яму ў твар. І, далібог, у малога *так* задзіраўся нос, што больш нагадваў лыч, дый вочы, як для дзіцяці, былі замалыя. Адным словам, ягоны выгляд Алесі зусім не спадабаўся.
“Можа, яно такое зарумзанае”, — падумала яна і зазірнула дзіцяці ў вочы, ці няма там сьлёзак.
Не, сьлёзак не было.
— Калі ты тут зьбіраешся ператварыцца ў парасё, даражэнькае, — сказала Алеся сур’ёзна, — дык я з табой ходацца не зьбіраюся. Май на ўвазе!
Беднае дзіцятка зноў зарумзала (ці зарохкала — хто яго ведае!), а потым крыху сьціхла.
Алеся ўжо пачала разважаць: “Цікава, што я буду рабіць з гэтым стварэньнем, калі прынясу яго дадому?” Заўвага
Тут яно зарохкала так гучна, што Алеся спалохана зазірнула яму ў тварык. Сумневу не заставалася. Гэта было чыстае парасё. Далей цягаць яго на руках было бязглузда. Алеся адпусьціла парасятка і адчула вялікую палёгку, Заўвага пабачыўшы, як задаволена тое пачасала ў лес.
“Зь яго магло б выйсьці страшэнна брыдкае дзіцё, — зазначыла сабе Алеся, — а вось як для парасяці — дык і надта ладнае”.
Яна пачала перабіраць у памяці ўсіх ведамых ёй дзяцей, зь якіх маглі б удацца добрыя кабанчыкі, і толькі была падумала: “Каб ведаў хто спосаб, як іх перамяняць”, — як скаланулася, бо на суку за пару крокаў ад Алесі раптам зьявіўся Чэшырскі Кот. Ён пазіраў і ўсьміхаўся.
Выглядаў ён зычліва, хоць кіпці ў яго былі некароткія і зубоў — поўны рот. Алеся вырашыла, што ставіцца да яго трэба паважліва.

— Чэшырскі Кіціська! — нясьмела пачала Алеся, бо зусім ня мела пэўнасьці, ці ўпадабае ён такі зварот, але ўсьмешка ягоная толькі пашырылася.
“Ага! Яму гэта падабаецца”, — зазначыла Алеся і працягвала:
— Ці не падкажаце Вы, кудою адсюль ісьці?
— Гэта залежыць ад таго, куды ты хочаш патрапіць, — адказаў Кот.
— Ды мне, бадай што, бяз розьніцы, — разважыла Алеся.
— Тады ўсё роўна кудою, — сказаў Кот.
— ...калі я толькі *куды* патраплю, — патлумачыла Алеся.
— Куды-небудзь пэўна што патрапіш, Заўвага — запэўніў яе Кот, — калі толькі будзеш ісьці досыць доўга.
Алеся адчула, што адмовіць яму ў рацыі цяжка, таму паспрабавала задаць яшчэ адно пытаньне:
— А якія людзі там жывуць?
— У *тым* баку, — сказаў Кот, паказваючы некуды праваю лапаю, — жыве Шапавал; а ў *тым,* — ён узьняў левую, — жыве Марцовы Заяц. Можаш наведаць каго хочаш — абодва вар’яты. Заўвага
— Чаго гэта мне хадзіць да вар’ятаў? — запярэчыла Алеся.
— А што ты зробіш! — прамармытаў Кот. — Мы ўсе тут вар’яты. І ты. І я.
— Адкуль Вы ведаеце, што я вар’ятка? — спыталася Алеся.
— А хто ты яшчэ? — зьдзівіўся Кот. — Іначай ты б сюды ня трапіла.
Алесю такое тлумачэньне ня дужа пераконвала, і ўсё ж яна працягвала:
— А скуль Вы ведаеце, што Вы вар’ят?
— Пачнём з сабакі — ён не вар’ят. Ты згодная, што сабака ў сваім розуме? Заўвага
— Думаю, што так, — адказала Алеся.
— А цяпер глядзі, — працягваў Кот, — сабака, як ведама, гырчыць, калі злуе, і махае хвастом, калі задаволены. А я гырчу, калі задаволены, і махаю хвастом, калі злую. Выходзіць, я вар’ят.
— *Па-мойму*, Вы мурчыцё, а не гырчыцё, — удакладніла Алеся.
— Называй гэта як хочаш, якая розьніца, — прамурчаў Кот. — Ты пойдзеш сёньня на кракет да Каралевы?
— Мне б вельмі хацелася, — сказала Алеся, — але мяне туды яшчэ не запрасілі.

— Убачымся там, — дадаў Кот і растаў у паветры.
Алеся ня надта зьдзівілася, бо патроху ўжо прызвычайвалася да ўсялякіх дзівосаў. Яна яшчэ глядзела туды, дзе нядаўна быў Кот, калі ён зноў раптам зьявіўся.
— Дарэчы, што сталася зь дзіцем? — пацікавіўся Кот. — Ледзь не забыўся ў цябе спытацца.
— Яно ператварылася ў парася, — спакойна адказала Алеся, як быццам так і трэба было, каб Кот аб'явіўся гэтак жа раптоўна, як растаў у паветры.
— Я так і думаў, — сказаў Кот і зноў зьнік.
Алеся счакала крыху, ці ня вернецца ён, а калі Кот не зьявіўся — рушыла ў той бок, дзе, як ёй сказана было, жыў Марцовы Заяц.
"Шапавалаў я ў сваім жыцьці ўжо бачыла, — мовіла сабе Алеся. — Марцовы Заяц — куды цікавейшы тып. І, раз цяпер травень, можа, Заяц ня будзе конікі выкідаць. Прынамсі, мо ён ужо не настолькі вар'ят, якім быў у сакавіку?"
І толькі яна ўзьняла галаву, як зноў убачыла Ката на суку.
— Ты сказала "ў парася" ці "ў карася"? — удакладніў Кот.
— У парася! — паўтарыла Алеся. — І, прашу Вас, ня трэба так раптоўна зьнікаць і зьяўляцца, а то мне млосна робіцца!
— Добра, — сказаў Кот і цяпер ужо павольна раставаў у паветры, пачынаючы з канца хваста, пакуль не засталася адна ўсьмешка. Ката ўжо не было, а яна ўсё яшчэ лунала ў паветры.
"Авохці! Катоў без усьмешак я нагледзелася, — падумала Алеся, — але каб усьмешку без ката!.. Заўвага Гэта проста нешта неверагоднае!"
Яна ішла, ішла, пакуль не набрыла на дом Марцовага Зайца. Што гэта быў акурат ягоны дом, няцяжка было здагадацца — усе коміны нагадвалі заечыя вушы, а страху пакрываў заечы ворс. Хата была такая вялікая, што Алеся наважылася падысьці, толькі калі адкусіла ад грыба ў левай руцэ і вырасла футы на два. Ды ўсё адно ішла яна ня надта сьмялява: "А раптам ён пачне выраблять свае штукі! Мо варта было ісьці да Шапавала?"

Разьдзел сёмы

Гарбата ў вар'ятаў

Пад дрэвам перад домам стаяў засланы стол, за сталом пілі гарбату Марцовы Заяц і Шапавал. Між імі спала Соня, Заўвага і

яны абапіралі на яе локці, нібы на падушку, і гаманілі церазь яе галаву. “Бедны зьвярок! — падумала Алеся, — Зрэшты, раз яна сьпіць, наўрад ці ёй гэта замінае”.
Хоць стол быў доўгі, усе трое цясьніліся на рагу адно пры адным.
— Месца няма! Месца няма! — закрычалі яны, як толькі ўбачылі Алесю.
— Тут *колькі хочаш* месца! — абурылася Алеся і ўселася ў вялікім фатэлі зь іншага канца стала.
— Частуйся віном! Заўвага — закамандаваў Марцовы Заяц.
Алеся абгледзела стол, але нічога, апрача гарбаты, там не заўважыла.
— Нешта я ня бачу ніякага віна, — зазначыла яна.
— А яго й няма, — адказаў Марцовы Заяц.
— У такім разе, ня надта ветла з вашага боку запрашаць мяне ім пачаставацца, — разгнявілася Алеся.
— А з твайго боку — ня надта ветла сядаць за стол без запрашэньня, Заўвага — заўважыў у сваю чаргу Марцовы Заяц.
— Я ня ведала, што стол толькі *для вас*, — сказала Алеся. — Ён сэрвіраваны на большую колькасьць людзей.
— Табе трэба пастрыгчыся! — раптам заявіў Шапавал.
Ён ужо каторы час пазіраў на Алесю зь вялікай цікавасьцю.
— А Вам трэба навучыцца не рабіць малазнаёмым людзям заўваг асабістага характару, — не бяз строгасьці парыравала Алеся. — Гэта няветла.
Шапавал, відаць, не чакаў такога пачуць, бо сумеўся і перавёў размову на іншую тэму:
— Чым крумкач падобны да грыфэльнае дошкі? Заўвага
“А-а! Вось і пабавімся! — падумала Алеся. — Загадкі я люблю!”
— Думаю, што мне па сілах гэта адгадаць, — дадала яна ўголас.
— Ты маеш на ўвазе, што разьлічваеш знайсьці слушны адказ на гэтую загадку? Заўвага — спытаўся Марцовы Заяц.
— Менавіта, — пацьвердзіла Алеся.
— Тады і кажы тое, што маеш на ўвазе, — дадаў Марцовы Заяц.
— А я так і кажу, — адрэзала Алеся. — Прынамсі... прынамсі, я маю на ўвазе тое, што кажу... Гэта ж тое самае...
— Ай-я! Тое самае! — запярэчыў Шапавал. — Ты яшчэ скажы, нібыта “я бачу тое, што ем” і “я ем тое, што бачу” — гэта адно і тое самае!

— Гэтак ты магла б сьцьвярджаць, — дадаў Марцовы Заяц, — што “я люблю ўсё, што маю” і “я маю ўсё, што люблю” — гэта адно і тое самае!
— Гэтак ты магла б сьцьвярджаць, — дадала Соня, якая гаварыла нібы праз сон, — што “я дыхаю, калі сплю” і “я сплю, калі дыхаю” — гэта адно і тое самае!
— Вось так і *ты*, — падвёў рысу Шапавал.
Тут гутарка перарвалася, і ўся кампанія нейкі час сядзела моўчкі. Тым часам Алеся спрабавала ўспомніць усё, што толькі ведала пра крумкачоў і грыфэльныя дошкі. Выходзіла небагата.
Шапавал загаварыў першым:
— Які ў нас сёньня дзень? — спытаўся ён, зьвяртаючыся да Алесі.
Потым дастаў з кішэні гадзіньнік і напружана ўглядаўся ў яго, час ад часу заклапочана страсаючы і падносячы да вуха.
Алеся трошкі падумала й адказала:
— Сёньня — чацьвертага.
— На два дні позьніцца! — уздыхнуў Шапавал. — Я ж табе казаў, што нельга мазаць гадзіньнік маслам! — дадаў ён, злосна пазіраючы на Марцовага Зайца.
— Дык жа гэта ж было масла *вышэйшага гатунку*! — рахмана апраўдваўся Заяц.
— Ну і што? Усё адно туды маглі трапіць крошкі! — прабурчаў Шапавал. — Ня трэ’ было лазіць у мэханізм нажом, якім хлеб кроім.
Марцовы Заяц узяў гадзіньнік і скрушна зірнуў на яго, потым апусьціў у кубак з чаем, выняў і зноў зірнуў. Аднак ня змог прыдумаць нічога лепшага за сваю ранейшую фразу:
— Дык жа гэта ж было масла *вышэйшага гатунку*! Ты ж сам бачыў!
Алеся зь цікавасьцю казерылася на яго.
— Які вясёлы гадзіньнік! Заўвага — заўважыла яна. — Паказвае дзень месяца, але не паказвае, каторая гадзіна!
— А навошта? — прамармытаў Шапавал. — Няўжо *твой* гадзіньнік паказвае год?
— Ведама ж, не! — борзда адказала Алеся. — Бо год доўга застаецца той самы.
— Дык і *мой* таксама, — сказаў Шапавал.
Алеся была проста зьбітая з тропу. Яна ня бачыла ў заўвазе Шапавала ніякага сэнсу, хоць усе словы быццам бы былі

правільныя. Заўвага
— Я вас не зусім зразумела, — перапытала яна як мага ветлівей.
— Соня зноў сьпіць, — сказаў Шапавал і пляснуў ёй на нос гарачай гарбаты.
Соня раздражнёна пакруціла галавой і мармытнула, не расплюшчваючы вачэй:
— Ведама, ведама, гэта я й хацела сказаць.
— Ну дык што, ты ўжо адгадала загадку? — спытаўся Шапавал, зьвяртаючыся да Алесі.
— Не, здаюся, — абвесьціла Алеся. — Які адказ?
— Нават не ўяўляю, — сказаў Шапавал.
— Я таксама, — дакінуў Марцовы Заяц.
Алеся стомлена ўздыхнула:
— Я думаю, што можна бавіць час нашмат цікавей, чым марнаваць яго на загадкі без адгадак.
— Каб ты ведала пра час гэтулькі, як я, Заўвага — сказаў Шапавал, — ты б не гаварыла пра *яго* марнаваньне. Час — гэта *Яна*. Гэта наша Доля.
— Незразумела, што вы хочаце гэтым сказаць, — спыталася Алеся.
— Дзе ж табе будзе зразумела! — сказаў Шапавал, пагардліва матляючы галавой. — Падазраю, што ты нават ніколі не гаварыла зь Ёю!
— Можа, і не, — уніклівa адказала Алеся. — Але я ведаю, што, калі развучваеш музычную п’есу, трэба адбіваць *долю*.
— А! Дык во дзе прычына! — сказаў Шапавал. — Доля ня церпіць біцьця. Затое калі ты зь Ёю сябруеш, Яна робіць з тваім гадзіньнікам усё, што ты хочаш. Уяві, скажам, што цяпер дзявятая раніцы і павінны пачацца заняткі ў школе. Досыць табе шапнуць: “А Долечка ты ж мая!”, як стрэлкі гадзіньніка ўмомант праходзяць патрэбную табе долю! Палова на другую — пара палуднаваць!
(“Хацеў бы я, каб надышоў час полудня”, — шапнуў сабе Заяц.)
— Так, гэта было б здорава, — задуменна сказала Алеся. — Але ў такім разе я не пасьпела б адчуць голад. Заўвага
— Спачатку, можа, і не, — сказаў Шапавал. — Але ты магла б і пачакаць.
— Дык вось як, значыцца, *вы* бавіце час, — здагадалася Алеся.
Аднак Шапавал паныла пакруціў галавой.

— Дзе там! — адказаў ён. — Мы з Доляю пасварыліся яшчэ летась у сакавіку — якраз перад тым, як *ён*, ну, ты зразумела... (і паказаў лыжачкай на Марцовага Зайца) звар'яцеў. Гэта было на славутым канцэрце, што давала тады Каралева Чырвань, дзе я мусіў пяяць:

Котка, котачка, крычы Заўвага
Немым крыкам уначы.
Ці ведаеш ты гэтую песеньку?
— Нешта падобнае я чула, — сказала Алеся.
— Яна мае працяг, ты ж ведаеш, — расказваў Шапавал. — Вось ён:

Абуджаючы ўвесь сьвет,
Як шалёны курасьлеп.
Котка, котачка...
Тут Соня зварухнулася і запяяла ў сьне:
— Котка, котка, котка, котка... — і цягнула б так бясконца, калі б яе не ўшчыкнулі.
— ...Не пасьпеў я дацягнуць першы куплет, — працягваў Шапавал, — як Каралева зараўла: "Ён цягне ката за хвост, скуралуп! Сьцяць яму галаву!"
— Якое зьверства! — усклікнула Алеся.
— А самае галоўнае, што Доля пакрыўдзілася, — жаласьліва працягваў Шапавал. — Цяпер Яна дзеля мяне ня тое што стрэлкай — пальцам не зварухне! І цяпер абычас у нас пятая гадзіна.
Тут Алеся скеміла:
— Дык вось чаму ў вас так стол накрыты! — усклікнула яна.
— А як жа ж! — уздыхнуў Шапавал. — У нас увесь час — час піць чай, таму й няма часу на мыцьцё посуду.
— Во чаму ў вас столькі посуду на стале! — здаўмелася Алеся.
— Ты правільна зразумела, — кіўнуў Шапавал. — Калі адзін прыбор робіцца брудны, мы перасоўваемся далей.
— А што вы робіце, калі вяртаецеся ў пачатак? Заўвага — наважылася запытацца Алеся.
— Ці не зьмяніць нам тэму? — умяшаўся, пазяхнуўшы, Марцовы Заяц. — Я ўжо стаміўся ад гэтых размоваў. Хай маладая спадарычна раскажа нам якую гісторыю.
— Баюся, што я ніводнай ня ведаю, — сказала Алеся, зьнянацку

засыпетая прапановай.
— Тады Соня раскажа! — закрычалі разам Шапавал і Марцовы Заяц. — Уставай, Соня! — І яны ўшчыкнулі яе з двух бакоў.
Соня паволі расплюшчыла павекі.
— Я ня сплю, сябры мае, — сказала яна гугнява і квола, — я чула кожнае ваша слова.
— Раскажы нам якую-небудзь гісторыю! — загадаў Марцовы Заяц.
— Так, калі ласка! — папрасіла Алеся.
— І не марудзь, — дадаў Шапавал, — іначай ты зноў засьнеш раней, чым скончыш.
— Жылі-былі тры сястрычкі, — борзда пачала Соня, — і звaліся яны Леська, Алька і Цылька, а жылі яны на дне ручая... Заўвага
— А што ж яны там елі і пілі? Чым яны жывіліся? — спыталася Алеся, якую заўжды цікавілі пытаньні ежы й піцьця.
Соня задумалася на пару хвілінаў і адказала:
— Яны жывіліся жывіцай.
— Але ведаеце, гэта было б цяжка ажыцьцявіць, — ласкава запярэчыла Алеся. — Ім бы ўвесь час балеў жывот.
— Так і было, — пагадзілася Соня. — Ім *вельмі* балелі жываты.
Алеся паспрабавала ўявіць гэтакі незвычайны лад жыцьця, аднак такі экстраардынарны спосаб харчаваньня быў для яе непрагляднай таямніцай, і яна зноў запыталася:
— А чаму яны жылі на дне ручая?
— Выпі яшчэ гарбаты, — строга прапанаваў ёй Марцовы Заяц.
— Я пакуль нічога не піла, — пакрыўдзілася Алеся,— таму не магу выпіць *яшчэ*.
— Ты хочаш сказаць, што ня можаш *ня выпіць* яшчэ гарбаты, — перабіў яе Шапавал. — Нельга ж выпіць *яшчэ нічога*.
— А *Вас* ніхто не пытаўся, — кінула яму Алеся.
— І хто гэта, цікава, цяпер робіць малазнаёмым людзям заўвагі асабістага характару? — пераможна запытаўся Шапавал.
Алеся не знайшлася, што яму на гэта адказаць. Таму яна наліла сабе крыху чаю й намазала маслам лусту хлеба, а потым зьвярнулася да Соні й паўтарыла сваё пытаньне:
— Дык чаму яны жылі на дне ручая?
Соні падумала яшчэ пару хвілін і нарэшце адказала:
— Бо гэта быў жывічны ручай.
— Няма такіх ручаёў! — Алеся ўжо пачала абурацца, аднак Шапавал і Марцовы Заяц зашыкалі на яе, а Соня раздражнёна

адзначыла:
— Калі ты ня ўмееш паводзіць сябе ў калектыве, тады даказвай гісторыю сама.
— Не, будзьце ласкавая, працягвайце! — паспрабавала замірыцца Алеся. — Абяцаю больш Вас не перапыняць. Можа, і сапраўды недзе ёсьць *адзін* такі ручай. Заўвага
— Адзін, яна кажа. Не, вы толькі падумайце — адзін! — усё яшчэ бушавала Соня.
Аднак яна пагадзілася працягваць.
— І вось, гэтыя тры сястрычкі вучыліся чэрпаць поўнымі чарпакамі, чэрпаць поўнымі чарпакамі...
— А *што* чэрпаць? — спыталася Алеся, забыўшыся на сваё абяцаньне.
— Жывіцу, — адказала Соня, ня думаючы ні хвіліны.
— Мне патрэбны чысты кубак, — абвесьціў Шапавал. — Перасядзьма на адно месца далей.
З гэтымі словамі ён узьняўся й перасеў, Соня пасунулася на яго месца, Марцовы Заяц апынуўся на месцы Соні, а Алеся без асаблівага жаданьня перасела на месца Марцовага Зайца. Шапавал быў адзіны, каму перасадка дала нейкую выгаду. Што да Алесі, дык яна прагадала, бо Марцовы Заяц толькі што перакуліў гладыш з малаком.
Алесі не хацелася зноў крыўдзіць Соню, і яна запыталася вельмі асьцярожна:
— Я ўсё ж не зразумела, адкуль жа яны чэрпалі жывіцу?
— Калі можна чэрпаць ваду з воднага ручая, — умяшаўся Шапавал, — дык, думаю, можна чэрпаць і жывіцу з жывічнага. Але якая дурніца!
— Дык жа яны жылі *ўсярэдзіне* ручая, — настойвала Алеся, робячы выгляд, што ня чула апошніх словаў.
— Ну, вядома ж, яны жылі ўсярэдзіне! — заявіла Соня.
Гэты адказ настолькі заблытаў бедную Алесю, што некаторы час яна слухала Соніна апавяданьне моўчкі.
— Дык, значыцца, вучыліся яны чэрпаць, вучыліся, — расказвала далей Соня, пазяхаючы й паціраючы вочы, бо сон ізноў даймаў яе, — і вычэрпвалі яны ўсякую ўсячыну... усё, што пачынаецца на М... Заўвага
— Чаму на М? — зьдзівілася Алеся.
— А чаму не? — адшыў яе Заяц.
Алеся прыкусіла язычок.

Соню тым часам зусім змарыў сон, і яе вочы заплюшчыліся. Але Шапавал яе ўшчыкнуў, яна тоненька піскнула, падхапілася і працягвала далей:
— ...што пачынаецца на М, напрыклад, *машыны, месяц, мэмуары, матэматыку, мноства*... Вось часам, калі рэчаў шмат, ты кажаш, што іх “мноства”. Але пры гэтым ці бачыла ты калі, як гэтае мноства вычэрпваюць?
— Гэта Вы ў мяне пытаецеся? — зьбянтэжылася Алеся. — Можа быць... але я ня пэўная...
— Раз ня пэўная, дык і не выступай, — зноў перабіў яе Шапавал.
Гэта было ўжо занадта! Алеся не магла сьцярпець такой грубасьці: яна сьціснула губкі, устала і ганарліва пайшла ўпрочкі. Яна спадзявалася, што яе перапросяць, паклічуць назад, і таму пару разоў нават азірнулася цішком. Нічога падобнага: Соня адразу заснула, а двое астатніх нават не глядзелі ёй усьлед. Калі Алеся аглянулася апошні раз, дык пабачыла, што яны заняліся засоўваньнем Соні ў імбрычак.
— Не, *сюды* я болей ні нагой! — сказала сабе Алеся, апынуўшыся на лясной сьцежцы. — Гэта самая ідыёцкая кампанія, якую я сустракала ў сваім жыцьці!
І тут у адным з дрэваў яна пабачыла дзьверцы, што адчыняліся ўсярэдзіну ствала.
“Да чаго цікава! — захапілася яна. — Сёньня ўсё цікава! Мусіць, варта і тут пабываць!”
Яна ўвайшла і зноў апынулася ў той самай доўгай залі каля шклянога століка.
— Ага, цяпер я ўжо ведаю, што рабіць! — сказала яна сабе. Перш-наперш яна ўзяла ключык і адамкнула дзьверцы ў сад. Потым узялася за грыб, кавалак якога прыхавала ў кішэні, і адшчыпвала ад яго патрошку, пакуль ня зьменшылася да фута росту. Тады яна прайшла калідорчыкам і апынулася нарэшце ў прыгожым садочку сярод яркіх кветнікаў ды халадкіх фантанаў.

Разьдзел восьмы

Кракет з Каралевай

Пры ўваходзе ў сад цьвіў вялізны куст белых ружаў. Але тры садоўнікі, абступіўшы яго, старанна перамалёўвалі кветкі ў чырвоны колер. Алесі гэта падалося нечым неверагодным, і

толькі яна падышла бліжэй, каб зразумець, ці можна давяраць сваім вачам, як пачула такую размову:
— Асьцярожней ты, Пятка! Годзе ўжо мяне фарбай пэцкаць!
— А што я зраблю, — буркнуў Пятка. — Гэта Сёмка мяне пад локаць штурхнуў.
Сёмка кінуў на яго злосны позірк і сказаў:
— Ага, малайцом, Пятка! Усю віну вярні на іншых!
— Чыя б карова мычала! — не здаваўся Пятка. — Яшчэ сам чуў учора ад Каралевы, што па тваёй галаве сякера плача.
— За што? — спытаўся першы.
— Ня сунь *носа* ў чужое проса, Двойка! — цыкнуў на яго Сёмка.
— Цябе гэта не датычыць.
— Гэта ўсіх датычыць! — крычаў Пятка. — І я яму скажу, за што. За тое, што прынёс кухару цыбуліны туліпанаў замест цыбулінаў цыбулі!
Сёмка шпурнуў пэндзаль на зямлю:
— Чуў я ўсякую лухту, але каб такое! — завёўся ён і раптам пабачыў побач Алесю.
Сёмка адразу ж сумеўся й сьціх, астатнія таксама заўважылі яе, і ўсе трое нізка пакланіліся.
— Выбачайце, будзьце ласкавы патлумачыць, — папыталася Алеся сарамяжліва, — навошта вы перамалёўваеце ружы?
Пятка й Сёмка пераглянуліся і зьвярнулі свае погляды на Двойку. Той ціхутка адказаў:
— Шчыра кажучы, спадарычна, выйшла такая штука: тут меліся пасадзіць чырвоныя ружы, а мы далі маху, утыркнулі белыя. Дык калі б Каралева гэта заўважыла, паляцелі б нашы галовы. Вось мы, спадарычна, і намагаемся, каб да яе зьяўленьня...
І тут Пятка, які палахліва разглядаўся па садзе, закрычаў:
— Каралева! Каралева!
І ўся тройка ніцма ўпала на зямлю. Пачуўся тупат, і Алеся пачала выглядаць Каралеву, бо вельмі хацела яе пабачыць. Першымі крочылі дзесяць жаўнераў, узброеных дзідамі. Яны былі такія самыя кантаватыя і пляскатыя, як і садоўнікі, а з рагоў у іх тырчалі ручкі ды ножкі. Сьледам выступалі парамі дзесяць прыдворных, усе ў крыжыках жалудоў. За імі высыпалі дзесяць каралянятаў, яны таксама скакалі вясёлымі парамі, усьцяж абсыпаныя сэрцайкамі ў выглядзе чырвонае масьці. Потым чынілі ход госьці, пераважна Каралі й Каралевы, і сярод іх Алеся пазнала Белага Труса; ён нешта некаму хапатліва і

нэрвова даводзіў, усьміхаючыся пры кожным слове. Алесі ён не заўважыў. Далей ішоў Валет Чырвань, несучы на падушцы з барвовага аксаміту карону Караля. А замыкалі ўрачыстае шэсьце КАРОЛЬ І КАРАЛЕВА ЧЫРВАНЬ.
Алеся трохі засумнявалася, ці не распасьцерціся і ёй ніцма, як тыя садоўнікі, але нешта яна не магла прыпомніць, каб дзе чула пра такія правілы паводзінаў падчас шэсьцяў, і падумала: “Якая ж тады ад шэсьця карысьць, калі ўсе будуць ляжаць ніцма і нічога ня бачыць?” І яна засталася стаяць, чакаючы, што будзе.
Калі шэсьце наблізілася да Алесі, усе спыніліся і ўзерыліся ў яе, а Каралева сурова запыталася ў Валета Чырвань:
— Хто такая?
Аднак той у адказ толькі пакланіўся і вінавата ўсьміхнуўся.
— Дурань! — кінула Каралева, нецярпліва крутнуўшы галавой, і зьвярнулася да Алесі. — Як тваё імя, дзяўчынка?
— Мяне завуць Алеся, з ласкі Вашай Вялікасьці, — адказала Алеся вельмі ветла. Аднак сама сабе падумала: “Яшчэ стану я баяцца ўсякіх картачных дамаў!”
— А *гэта* хто такія? — спыталася Каралева, паказваючы на трох садоўнікаў, што ляжалі покатам пад ружавым кустом. (Як вы ўжо здагадаліся, яны ляжалі тварам долу, а рысунак у іх на плячох быў такі самы, як і ва ўсіх картаў, таму Каралева не магла пазнаць, садоўнікі гэта, жаўнеры ці прыдворныя, ці яе дзеці.)
— А *я* адкуль знаю? — у тон Каралеве адказала Алеся, сама зьдзіўляючыся сваёй сьмеласьці. — *Што* яны мне?..
Каралева пачырванела ад злосьці. Заўвага Можа, з хвіліну яна ўзіралася на Алесю, як дзікі зьвер, і нарэшце заверашчала:
— Сьцяць ёй галаву! Сьцяць...
— Яшчэ чаго! — сказала Алеся моцна і цьвёрда. Каралева сьціхла.
Кароль узяў сваю жоначку пад руку і нясьмела мовіў:
— Дарагая, яна ж яшчэ дзіця!
Каралева злосна адвярнулася ад мужа і загадала Валету:
— Перавярнуць іх!
Валет асьцярожненька выканаў загад, перавярнуўшы садоўнікаў наском бота.
— Устаць! — зараўла Каралева, і тры садоўнікі ўмомант падхапіліся і пачалі кланяцца Каралю, Каралеве, іх дзецям і

ўсім астатнім.
— Досыць! — закрычала Каралева. — Мне ўжо галава кружыцца ад вашых паклонаў.
Потым павярнулася да ружавага куста і спыталася:
— *Што* вы тут рабілі?
— З Вашага дазволу, Вашая Вялікасьць, — паслужліва сказаў Двойка, апусьціўшыся на адно калена, — мы спрабавалі...
— *Я* ўжо бачу! — мовіла Каралева, якая тым часам пільна разглядала ружы. — Сьцяць ім галовы!
Шэсьце рушыла далей, толькі тры жаўнеры засталіся, каб пакараць сьмерцю няшчасных садоўнікаў. Тыя кінуліся да Алесі, шукаючы паратунку.
— Ня бойцеся, вам нічога ня зробяць! — сказала Алеся і схавала іх у вялізны вазон, што стаяў побач.
Тры жаўнеры пахадзілі-пахадзілі вакол, усё абшукалі і патупалі даганяць астатніх.
— Вы сьцялі ім галовы? — крыкнула салдатам Каралева.
— Ім капцы, Ваша Вялікасьць! — гаркнулі жаўнеры.
— Выдатна! — сказала Каралева. — Ты гуляеш у кракет?
Жаўнеры гэтым разам маўчалі, пазіраючы на Алесю, відаць, пытаньне задавалася ёй.
— Але! — гукнула Алеся.
— Дык хадзі сюды! — прараўла Каралева.
Алеся далучылася да шэсьця, дзівячыся: што ж зараз будзе?
— Сёньня... сёньня цудоўнае надвор'е! — вымавіў нечы слабы галасочак.
Яна азірнулася: побач трухаў Белы Трус, настойліва заглядаючы ёй у вочы.
— Найцудоўнейшае! — пагадзілася Алеся. — А дзе Княгіня?
— Ш-ш! — перарваў яе Трус.
Пад тое ён трывожна азірнуўся, потым прыўзьняўся на дыбачкі і прашаптаў Алесі на вушка:
— Яна засуджаная на сьмерць.
— За што? — спыталася Алеся.
— Вы, здаецца, сказалі "Як шкада!"? — спытаўся Трус.
— Не, я гэтага не казала. Ня думаю, што гэта той выпадак, калі трэба шкадаваць. Я спыталася: "За што?"
— Яна накруціла Каралеву за вушы... — пачаў Трус.
Алеся не ўтрымалася ад сьмеху.
— Ой, цішэй! — спалохана зашаптаў Трус. — Каралева пачуе!

Рэч у тым, што Княгіня моцна спазьнілася, і Каралева сказала...
— Усе па сваіх месцах! — зараўла Каралева грамавым голасам.
І ўсе пачалі мітусіцца туды-сюды, спатыкаючыся адзін аб аднаго. За пару хвілін гульцы разьмеркаваліся, і гульня пачалася.
Алеся ў жыцьці ня бачыла такой дзіўнай кракетнай пляцоўкі: усюды адны гурбы ды разоры, замест кракетных куляў — жывыя вожыкі, бітамі служылі жывыя флямінга, Заўвага а жаўнеры мусілі сагнуцца напалам і, стоячы на зямлі рукамі й нагамі, удаваць зь сябе брамкі.
Галоўная цяжкасьць, зь якой Алеся спатыкнулася на самым пачатку, палягала ва ўтаймаваньні флямінга. Каб хоць неяк выкруціцца, яна запхнула сабе тулава флямінга пад паху нагамі ўніз. Але, як толькі Алеся выпрастала да належнага стану птушыную шыю, каб лупцануць па вожыку флямінгавай галавой, птушка выгнулася і так занепакоена зазірнула Алесі ў вочы, што дзяўчынка не магла не засьмяяцца. Тады яна ўзяла флямінга галавой уніз, але не пасьпела ўдарыць, як вожык ужо перавярнуўся і падаўся па сваіх справах. Апрача таго, на шляху яе вожыкаў, як на злосьць, шораз траплялiся яміны, а жаўнеры абычас уставалі і пераходзілі на іншае месца пляцоўкі. Алеся неўзабаве прыйшла да высновы, што тутэйшы кракет — насамрэч вельмі складаная гульня.
Усе гулялі без чаргі і раз-пораз сварыліся ды біліся за вожыкаў. Каралева ж проста ашалела і лётала па пляцоўцы з крыкам:
— Сьцяць яму галаву! Сьцяць ёй галаву!
Алеся пачувалася ніякавата. Праўда, яна сама з Каралевай яшчэ не пасварылася, аднак разумела, што сутычка можа адбыцца ў кожную хвіліну. “Што будзе тады са мною? — падумала яна. — Тут страшна любяць сьцінаць людзям галовы. Дзіўна, што тут увогуле яшчэ засталося нешта жывое!”
Алеся стала разглядацца, шукаючы магчымасьці ціхенька зьнікнуць, калі раптам угледзела дзівосную паветраную зьяву. Тая спачатку зьбіла яе з панталыку, але пасьля хвілінных назіраньняў Алеся ўпэўнілася, што гэта лунае ўсьмешка. “Чэшырскі Кот! — сказала яна сабе. — Цяпер будзе хоць да каго слова закінуць”.
— Як твае посьпехі ў кракеце? — спытаўся Кот, як толькі ў паветры зьявілася настолькі вялікая частка ягонага рота, каб ён стаў здольны штосьці вымавіць.

Алеся пачакала, пакуль пакажуцца вочы, і тады хітнула галавой. “Які сэнс яму нешта казаць, — падумала яна, — пакуль не відаць ані вуха”. Праз хвіліну зьявілася ўся галава. Алеся паставіла свайго флямінга на зямлю і пачала расказваць пра гульню, вельмі радая, што сустрэла суразмоўцу. А Кот, пэўна, вырашыў, што цяпер яго досыць, і ўжо болей ня рос.
— Па-мойму, яны ўсе гуляюць бяз правілаў, — пачала Алеся скардзіцца, — яны так б’юцца і крычаць, што нічагутка не чуваць. Можа, у іх наагул правілаў няма. А калі яны й ёсьць, іх ніхто не пільнуецца. Вы не ўяўляеце сабе, як лёгка заблытацца, калі ўсё навокал варушыцца. Вунь, прыкладам, брамка, празь якую я павінна прайсьці, шпацыруе на другім канцы поля.
Я мусіла ўдарыць па вожыку Каралевы, але ён уцёк, калі ўбачыў, што я набліжаюся!
— А як табе Каралева? — ціхенька спытаўся Кот.
— Зусім не падабаецца, — сказала Алеся. — Яна так...
Раптам яна заўважыла, што Каралева стаіць у яе за сьпінай і прыслухоўваецца.
— ...моцна гуляе, — не разгубілася Алеся, — што проста хоць ты адразу здавайся.
Каралева ўсьміхнулася і рушыла далей.
— З кім ты гаворыш? — спытаўся Кароль, падыходзячы да Алесі і зь цікаўнасьцю паглядаючы на каціную галаву.
— Гэта мой сябар, Чэшырскі Кот, — сказала Алеся. — Дазвольце, я вас пазнаёмлю.
— Ня дужа прыемнае аблічча, — заўважыў Кароль, — але ўсё адно ён можа пацалаваць мне руку, калі мае ахвоту.
— Дзякуй, абыдуся, — сказаў Кот.
— Што за дзёрзкасьць! — абурыўся Кароль. — І ня трэба на мяне *гэтак* глядзець!
З гэтымі словамі ён схаваўся за Алесю.
— У Ката таксама можа быць свой погляд на караля, [Заўвага] — сказала Алеся. — Я пра гэта чытала ў нейкай кнізе, ня помню толькі дзе.
— Яго трэба адтуль прыбраць, — цьвёрда сказаў Кароль і клікнуў Каралеву, якая праходзіла побач. — Мая даражэнькая! Я жадаю, каб Вы загадалі прыняць гэтага ката!
У Каралевы быў толькі адзін спосаб разьвязаньня ўсіх праблемаў, як вялікіх, так і малых.
— Сьсячэце яму галаву! — заявіла яна, нават не зірнуўшы ў той

бок.
— Я асабіста паклічу ката, — нецярпліва сказаў Кароль і засьпяшаўся.
Пачуўшы здалёк разьюшаны роў Каралевы, Алеся падумала, што ёй таксама трэба вярнуцца й паглядзець, што там з гульнёй. Яна ўжо чула, як тая прысудзіла трох гульцоў, што абмінулі сваю чаргу, да “пакараньня горлам”. І Алесі зусім не спадабалася такая замятня, калі не разабраць, за кім чыя чарга. Яна пайшла шукаць свайго вожыка. Знайшла: той біўся зь іншым. Гэта падалося Алесі цудоўнай акалічнасьцю, каб абодвух загнаць у брамку. Але куды там! Яе флямінга даўно ўцёк на іншы край саду і безь вялікіх посьпехаў спрабаваў узьляцець на дрэва.
Калі яна злавіла флямінга і вярнулася, вожыкі ўжо кончылі біцца і некуды запрапасьціліся — хай яны згараць. “Ні бяды, — падумала Алеся, — усё адно брамкі таксама ўцяклі”. Яна ўзяла флямінга пад паху, каб той зноў ня ўцёк, і вярнулася да свайго сябра-Ката.
Але вакол таго, на яе зьдзіўленьне, назьбіраўся ладны натоўп. Кат, Кароль і Каралева гаварылі ўсе трое адначасова, а астатнія захоўвалі цішыню і мелі вельмі заклапочаны выгляд.
Калі зьявілася Алеся, усе трое папрасілі яе вырашыць спрэчку. Але паколькі ўсе яны гаварылі адначасова, ёй было вельмі цяжка зразумець, што менавіта мае на ўвазе кожны зь іх.
Довад ката палягаў у тым, што немагчыма сьсячы галаву, калі няма цела, ад якога яна павінна быць аддзеленая, што ён ніколі ня чуў аб нечым падобным раней і *першым* у гісторыі на такое не наважыцца.
Довад Караля палягаў у тым, што ўсё, што мае галаву, можа быць яе пазбаўленае, і няма чаго лухты вярзьці.
Довад Каралевы палягаў у тым, што калі з гэтым Катом зараз жа не разьбяруцца, дык пастрачваюць галовы ўсе *пагалоўна*! (Акурат гэтая заўвага надала грамадзе такі несамавіты выгляд.)
Алеся нічога не магла прыдумаць, як толькі сказаць:
— Кот належыць Княгіні, і лепш у *яе* спытацца, што зь ім рабіць.
— Яна арыштаваная, — сказала Каралева кату. — Прывесьці яе сюды!
Кат паляцеў з хуткасьцю стралы. А галава Ката зараз пачала

зьнікаць. Калі ж кат прывёў Княгіню — Кот выпарыўся дазваньня. Кароль з катам замітусіліся, шукаючы Ката, а астатнія вярнуліся да гульні.

Разьдзел дзявяты

Гісторыя недачарапахі

— Вы не ўяўляеце сабе, якая я радая зноў Вас бачыць, сэрцайка маё, сяброўчка мая, зорка ясная! — сказала Княгіня, ласкава ўзяўшы Алесю пад локаць.

Алеся ўсьцешылася, што ў Княгіні такі зычлівы настрой, і падумала: можа, тады, пры першай сустрэчы на кухні, тая ад перцу была такой дзікай? “Калі *я* стану Княгіняй, — падумала Алеся (праўда, безь вялікага спадзеву), — у мяне на кухні ня будзе перцу зусім. Суп смачны й безь яго... Можа, гэта ад перцу людзі адзін аднаго пераць...” Гэтая думка ёй спадабалася, і яна яе разьвіла: “Ад воцату — адзін аднаго цапаюць, ад гарбаты — гарбацяцца, ад кашы — кашлацеюць, ад солі — салавеюць. А вось ад цукерак і ўсякага такога салодкага дзеткі робяцца — ну проста залатымі. От каб людзі *пра гэта* даведаліся і вялі рацыянальнае харчаваньне...”

Яна амаль забылася аб прысутнасьці Княгіні і таму крыху спалохалася, пачуўшы над самым вухам:

— Ты думаеш пра нешта, каханенькая, і забылася, што трэба падтрымліваць гутарку. А ў чым тут мараль, ня ўспомню... Мо’ згадаю празь нейкі час...

— Можа, ні ў чым, — наважылася Алеся.

— Ай-яй-яй, дзіця-дзіця! — сказала Княгіня. — Ва ўсім ёсьць нейкая мараль... Заўвага Калі толькі ўмееш яе знайсьці!

І з гэтымі словамі яна прытулілася да Алесі.

Алесі ня вельмі падабалася імкненьне Княгіні трымацца як мага бліжэй. Найперш таму, што Княгіня была *аж такая* брыдкая, а другое — росту яна была такоўскага, што сваім вострым падбародзьдзем упіралася Алесі ў плячо. Аднак Алесі не хацелася быць няветлаю, і яна, як магла, цярпела на плячы Княгініну галаву.

— Гульня, здаецца, памалу разрухалася, — сказала яна, каб неяк падтрымаць размову.

— Так, — пагадзілася Княгіня. — І тут мараль: “Каханьне — пачуцьцё, што ў рух прыводзіць зоры...” Заўвага

— А нехта, помню, казаў, — прашаптала Алеся, — што

нябесныя целы круцяцца, бо кожны сочыць за сваім носам і ня совае яго ў чужыя справы!
— А няўжо ж! Гэта ж азначае ў прынцыпе тое самае, — сказала Княгіня і ўпілася барадою ў Алесіна плячо. — І тут мараль: дбай пра сэнс, а словы самі падбаюць пра сябе.
“Да чаго ж некаторым людзям падабаецца ўсюды шукаць мараль!” — падумалася Алесі.
— Ты, пэўна, думаеш, чаму я не абдыму цябе? — счакаўшы, запыталася Княгіня. — Рэч у тым, што я сумняюся ў нораве твайго флямінга. Але, можа, паспрабаваць?
— Ён сапраўды можа скубануць! — папярэдзіла Алеся, якая зусім не хацела *стаць абнятай*.
— Праўду кажаш! — заківала Княгіня. — Флямінга скубуцца ня горш за гарчыцу. І тут ізноў мараль: падобнае прыцягваецца да падобнага. Заўвага
— Адно што гарчыца не падобная да флямінга, Заўвага — зазначыла Алеся. — Гарчыца ж ня птушка!
— Ты, як заўсёды, праўду кажаш! — зноў заківала Княгіня. — Як ты добра ва ўсім разьбіраешся!
— Па-мойму, гарчыца — гэта мінэрал, — працягвала разважаць Алеся.
— А як жа ж, іменна мінэрал, — заківала Княгіня, гатовая пагадзіцца з усім, што казала Алеся. — У гары непадалёк адсюль ёсьць вялікае радовішча мінэральнае гарчыцы. І тут мараль: хай ты *згары* — такое жыцьцё.
— Успомніла! — усклікнула Алеся, не зьвярнуўшы ўвагі на апошнюю выснову. — Гарчыца — гэта фрукт! Яна не зусім падобная да простае садавіны, але ўсё-ткі.
— Твая праўда! Гарчыца — фрукт, і такі фрукт, што ого-го! — сказала Княгіня. — І тут мараль: заўжды будзь самім сабою. Альбо, калі перадаць гэтую самую думку прасьцей, ніколі не імкніся Заўвага здацца іншым, каб іншым не здалося, што тое, які ты быў альбо мусіў быў быць, было іншым, чым тое, які ты быў, іначай іншым здалося б, што ты быў іншы.
— Я лепш зразумела б, — сказала Алеся вельмі ветла, — калі б запісала Вашыя словы. А то мне цяжкавата ўлавіць іх сэнс.
— Гэта яшчэ што ў параўнаньні з тым, што я магла б выдаць, калі б яшчэ крыху падумала, — задаволена адказала Княгіня.
— Прашу Вас, не абцяжвайце сябе яшчэ больш простай перадачай думкі, — узмалілася Алеся.

— Пра якую цяжкасьць вы гаворыце! — замахала рукою Княгіня. — Усё, што я вам дагэтуль сказала, — гэта мой вам падарунак.
“Нішто сабе падаруначак! — падумала Алеся. — Як добра, што людзі ня дораць адзін аднаму на дзень народзінаў такіх падарункаў!” Аднак паўтарыць гэта ўголас яна не насьмелілася.
— Ты зноў задумалася? — пацікавілася Княгіня, упіваючыся ў Алесіна плячо востраю барадою.
— Я маю права думаць столькі, колькі захачу, — адказала Алеся даволі рэзка, бо Княгіня ўжо пачынала ёй надакучваць.
— Ты маеш такое ж права думаць, — заявіла Княгіня, — як сьвіньні лётаць, і тут ма-а...
Але, на вялікае зьдзіўленьне Алесі, голас Княгіні перарваўся на пачатку яе ўлюбёнага слоўца “мараль”, а руку, якою яна трымалася за Алесін локаць, раптам узялі дрыжыкі. Алеся падняла вочы і ўбачыла, што перад імі, склаўшы рукі на грудзях і нахмурыўшы бровы, як хмара, стаіць Каралева.
— Якая цудоўная пагода, Вашая Вялікасьць! — сказала Княгіня ціхім, слабым голасам.
— Дык вось, з ласкі сваёй усялітасьцівай, папярэджваю, — закрычала Каралева і тупнула нагою, — альбо ты, альбо твая галава — адно з двух — павінны паляцець прэч. Зараз жа! Не, ні разу! Альбо цябе, альбо тваёй галавы тутака быць не павінна праз паўсэкунды! Выбірай!
Княгіня выбрала й зараз жа зьнікла.
— Працягваем гульню! — скамандавала Алесі Каралева.
Алеся была занадта напалоханая, каб прамовіць хоць слова, і ціхутка пайшла сьледам да кракетнай пляцоўкі. Госьці, карыстаючыся з адсутнасьці гаспадыні, прыляглі адпачыць у цяньку. Але ўбачыўшы яе, умомант кінуліся на пляцоўку. Каралева тут жа абвясьціла, што той, хто забавіцца зь вяртаньнем у гульню, неўзабаве пазбавіцца жыцьця.
Усю гульню Каралева няспынна сварылася з гульцамі і крычала:
— Сьцяць яму галаву! Сьцяць ёй галаву!
Асуджаных салдаты бралі пад варту. Ясная рэч, дзеля гэтага яны мусілі пакідаць поле, і за якія паўгадзіны на полі не засталося ніводнай брамкі, а ўсе гульцы, апрача Караля, Каралевы й Алесі, былі арыштаваныя ды чакалі сьмерці.

Тады Каралева спынілася, задыханая, і сказала Алесі:
— Ты ўжо бачыла Недачарапаху?
— Не, — адказала Алеся. — Я нават ня ведаю, што гэта такое.
— Гэта тое, з чаго робіцца Недачарапахавы Суп, Заўвага — патлумачыла Каралева.
— Ніколі ня бачыла, нават ня чула, — паўтарыла Алеся.
— То хадзем — пабачыш, — прапанавала Каралева, — і пачуеш яе гісторыю.
Толькі яны адышліся, Алеся пачула, як Кароль ціхенька паведаміў усёй арыштанцкай партыі:
— Вам усім дарована.
“Ну во, гэта ўжо лепей!” — сказала сабе Алеся, бо яе вельмі маркоціла гэткая колькасьць сьмяротных прысудаў.
Неўзабаве яны пабачылі Грыфона, Заўвага што драмаў на сонцы. (Калі вы ня ведаеце, як выглядае Грыфон, зірнеце на малюнак.)
— Уставай, гультаіна, — сказала Каралева, — і завядзі гэтую юную лэдзі да Недачарапахі! Хай тая раскажа ёй сваю гісторыю. А я мушу вярнуцца і прасачыць за адсячэньнем парачкі гарачых галоваў.
І пайшла, пакінуўшы Алесю з Грыфонам. Нельга сказаць, што Алеся прыйшла ў захапленьне ад выгляду гэтай істоты, але гэта, прынамсі, было бясьпечней, чым кампанія гняўлівай Каралевы. Алеся засталася.
Грыфон узьняўся, сеў і прадзёр вочы. Потым паўзіраўся Каралеве ўсьлед, пакуль тая ня зьнікла, а тады зарагатаў.
— Во дзе сьмехатура! — сказаў Грыфон ці то сабе, ці то Алесі.
— *Дзе* сьмехатура? — спыталася тая.
— *Вунь дзе* пайшла! — сказаў Грыфон. — Гэта ўсё адна сьмехатура. Яны ж ніколі нікога не караюць. Хадзем!
“І кожны табе камандуе!.. “Хадзем”!.. — сама сабе думала Алеся, сунучыся памалу за Грыфонам. — Мне яшчэ ніколі ў жыцьці столькі не загадвалі, як тут!”
Не прайшлі яны і трохі, як здалёк пабачылі Недачарапаху, што ў скрушнай самоце сядзела на скалістым беразе. А калі падышлі бліжэй, Алеся пачула, што тая ўздыхае так горка, што сэрца проста само разрывалася ад спачуваньня ёй. Алесі стала вельмі-вельмі шкада Недачарапахі.
— Што ў яе за бяда? — спыталася яна ў Грыфона.
І ён адказаў амаль тымі самымі словамі, якімі гаварыў пра каралеву:

— Гэта ўсё сьмехатура. Якая бяда ў яе! Сьмех адзін! Хадзем!
Яны падышлі да Недачарапахі, якая зірнула на іх вялікімі вачыма, поўнымі сьлёз, але нічога не сказала.
— Гэтая во спадарычна, — сказаў Грыфон, — хоча паслухаць тваю гісторыю. Далібог!
— Добра, раскажу, — азвалася Недачарапаха глыбокім, глухім голасам. — Сядайцеся — і ні слова, пакуль я ня скончу.
Сеўшы, яны з добрую хвіліну маўчалі.
“Не разумею, каля ж яна зьбіраецца *скончыць*, калі яна дагэтуль не пачала”, — падумала Алеся, але цярпліва чакала.
— Некалі, — глыбока ўздыхнуўшы, сказала нарэшце Недачарапаха, — я была сапраўднаю Чарапахай.
Пасьля гэтых словаў ізноў запанавала доўгая цішыня, перарываная рэдкімі Грыфонавымі ўскрыкамі (накшталт “Хгкррг!”) і няспынным румзаньнем Недачарапахі. Алеся ўжо зьбіралася ўзьняцца й сказаць: “Дзякуй вам, спадарыня, за вашую цікавую гісторыю”, — але ніяк не магла паверыць, што працягу ня будзе, таму й сядзела ціхенька.
— Калі мы былі маленькія, — супакоіўшыся, загаварыла нарэшце Недачарапаха, хоць раз-пораз яшчэ шморгала носам, — мы хадзілі ў морскую школу. Настаўнікам быў адзін стары Чарапах, міжсобку мы называлі яго Гадам...
— Чаму ж вы называлі яго Гадам, калі ён быў Чарапахам? — пацікавілася Алеся.
— Мы называлі яго Гадам, бо мы былі ягоныя гадаванцы, — незадаволена патлумачыла Недачарапаха. — Але ж ты тупая, трэба сказаць!
— Сорамна задаваць такія прымітыўныя пытаньні, — дадаў Грыфон.
І жывёліны моўчкі так утаропіліся на бедную Алесю, што ёй захацелася скрозьдонна праваліцца. Нарэшце Грыфон сказаў Недачарапасе:
— Давай далей, матухна! Не сядзець жа нам тут цэлы дзень!
І тая зноў загаварыла:
— Так, мы хадзілі ў морскую школу, хоць ты, можа, мне й ня верыш...
— Я не казала, што ня веру Вам! — перабіла Алеся.
— Ты мне ня верыш, — бубнела Недаарапаха.
— Змоўкні! — цыкнуў Грыфон, перш чым Алеся здолела што адказаць.

Недачарапаха працягвала.
— У нас была найлепшая адукацыя — гэта праўда, бо мы хадзілі ў школу кожны Божы дзень...
— Я таксама хадзіла ў школу кожны дзень, — сказала Алеся. — Няма тут чым ужо так ганарыцца!
— А ў вас былі дадатковыя дысцыпліны? — раздражнёна запыталася Недачарапаха.
— А то не! — абурылася Алеся. — Французская мова й музыка.
— І мыцьцё? — спыталася Недачарапаха.
— Не, мыцьця не было! — буркнула Алеся.
— А-а! Значыць, вашая школа была ня вельмі добрай, — з палёгкай у голасе сказала Недачарапаха. — А вось у *нашай* школе, акрамя ўсяго астатняга, выкладаліся французская мова, музыка *і мыцьцё* *Заўвага* — як дадатковы прадмет.
— Толькі ці было яно вам патрэбнае? — усумнілася Алеся. — Вы ж пражывалі на дне мора.
— Я яму так і не навучылася, — уздыхнула Недачарапаха. — Я наведвала толькі абавязковыя прадметы.
— А што за яны? — пацікавілася Алеся.
— Ну, найперш, вядома, нас вучылі Чысаць і Пітаць, — адказала Недачарапаха. — Пасьля пайшлі розныя галіны арытмэтыкі: Скаканьне, Абніманьне, Ножаньне і Зьзяленьне.
— Ніколі ня чула ні пра якае “Ножаньне”, — прызналася Алеся.
— Што гэта?
— “Ніколі ня чула ні пра якае “Ножаньне”! — з робленым зьдзіўленьнем перадражніў яе Грыфон, ускінуўшы ўгору абедзьве лапы. — Спадзяюся, ты хоць ведаеш, як нож дзеліць адзін бохан хлеба на мноства скібаў?
— Ведаю, — няўпэўнена сказала Алеся. — Гэта значыць... разразаць... на кавалкі…
— У такім разе, — пераможна абвесьціў Грыфон, — калі ты не разумееш, што такое “Ножаньне”, ты поўная дурніца.
Алесі ад такога адказу расхацелася задаваць далейшыя пытаньні на гэтую тэму, таму яна зноў павярнулася да Недачарапахі:
— А што яшчэ Вы вывучалі?
— Яшчэ ў нас была Гістэрыя, — адказала Недачарапаха, падлічваючы навукі на сваіх плаўнікох. — Гістэрыя старажытная й сучасная, зь Біяграфіяй, потым Вымярэнчае Мастацтва — яго выкладаў стары мянтуз, які прыходзіў да нас

раз на тыдзень і вучыў нас Вымяраньню, Замарочваньню і Завязваньню Марскім Казлом.
— А гэта як? — зьдзівілася Алеся.
— Ну, сама я табе гэтага не пакажу, — сказала Недачарапаха.
— У мяне, старое, суставы ўжо ня тыя. А Грыфон гэтага ў школе не праходзіў, здаецца.
— Ня меў калі, — пагадзіўся Грыфон. — Я паглыблена вывучаў старажытныя моры. Выкладаў іх адзін стары жук, ох і жук!
— Я да яго не хадзіла, не, не хадзіла, — з уздыхам падхапіла Недачарапаха. — Як там іх — Грэшнае мора, Чаркоўнасланянскае, Лапціна, Старадаўняя Грацыя...
— Жук так і казаў, так і казаў! — пацьвердзіў Грыфон, уздыхаючы ў сваю чаргу.
І абедзьве істоты настальгічна абхапілі плаўнікамі галовы.
— І колькі гадзінаў у дзень у вас доўжыліся заняткі? — спыталася Алеся, каб адвесьці суразмоўцаў ад сумных думак.
— Першы дзень дзесяць гадзінаў, другі дзевяць... і гэтак далей.
— Што за дзіўны расклад! — усклікнула Алеся.
— Таму ён і называецца раскладам, — заўважыў Грыфон, — што дзень пры дні ён раскладваецца, раскладваецца — і ўрэшце не застаецца нічога.
Гэтая думка была для Алесі новай, і яна крыху падумала над ёю, перш чым зноў падала голас:
— Тады, мусіць, адзінаццаты дзень у вас быў выхадны?
— А няўжо ж! Выхадны, — пагадзілася Недачарапаха.
— А што вы рабілі на дванаццаты дзень? — пацікавілася Алеся, якую такі пэдагагічны падыход інтрыгаваў усё больш.
— До’ ўжо пра школу! Заўвага — абарваў Грыфон. — Раскажы ёй што-кольвек пра гульні...

Разьдзел дзясяты

Кадрыля з амарамі

Недачарапаха глыбока ўздыхнула і змахнула сьлязу плаўніком. Яна зірнула на Алесю, намагаючыся нешта прамовіць, аднак яшчэ хвілю-другую яе душылі сьлёзы.
— Відаць, ёй у горле костка засела, — сказаў Грыфон і пачаў трэсьці сваю сяброўку ды малаціць ёй у плечы.
Нарэшце, да Недачарапахі вярнуўся голас, і, заліваючыся сьлязьмі, яна пачала:
— Наўрад ці табе даводзілася доўгі час жыць на дне мора...

— Не даводзілася, — пагадзілася Алеся.
— ...і сустракацца з амарам...
Алеся ўжо адкрыла рот, каб сказаць: “Амара я аднойчы каштавала”, — аднак у час паправілася:
— Не, ніколі...
— ...так што ты, відаць, ня можаш сабе ўявіць, якая гэта чароўная штука — кадрыля з амарамі!
— Праўда, не магу, — сказала Алеся. — А што гэта за танец?
— Як табе апісаць... — задумаўся Грыфон, — спачатку становяцца ўздоўж берага радочкам...
— Ты блытаеш, дружа! У два рады! — усклікнула Недачарапаха. — Чайкі, чарапахі, пстругі і гэтак далей. Тады, папярэдне расчысьціўшы ў моры пляцоўку ад мэдуз...
— На гэта звычайна *ідзе* немалы час, — усунуўся Грыфон.
— ...вы робіце два крокі наперад — авансэ!..
— Ва ўсіх дам кавалеры — амары! — закрычаў Грыфон.
— Ведама, амары! — пацьвердзіла Недачарапаха. — Два крокі наперад пад ручку з амарам...
— ...Зьмена амараў і два крокі назад у ранейшую пазыцыю, — не супакойваўся Грыфон.
— Потым, — працягвала ў сваім спакойным тоне Недачарапаха, — вы шпурляеце ама...
— Амараў! — крыкнуў Грыфон, падскочыўшы.
— ...як мага далей у мора...
— Плывяце за імі! — выгукнуў Грыфон.
— Робіце ў моры сальта-мартале! — завішчала Недачарапаха, куляючыся вакол Алесі.
— Зноў мяняецеся амарамі! — зароў Грыфон, зрываючы голас.
— Вяртаецеся на сушу — і гэта канец першай фігуры, — прахрыпела Недачарапаха нечакана аслаблым голасам.
Абедзьве істоты, якія толькі што апантана скакалі, як вар’яты, заціхлі, смутна пазіраючы на Алесю.
— Напэўна, гэта вельмі прыгожы танец, — асьцярожна сказала Алеся.
— Хочаш паглядзець яго на практыцы? — спыталася Недачарапаха.
— Натуральна, хачу! — зь ветлівасьці пагадзілася Алеся.
— Хадзем, пакажам ёй першую фігуру! — прапанавала Недачарапаха Грыфону. — Мы можам пусьціцца ў скокі й без амараў. Якая розьніца! Толькі хто будзе сьпяваць?

— Лепей *ты* сьпявай, — прапанаваў Грыфон. — Я забыўся словы.
І яны закружыліся вакол Алесі, раз-пораз наступаючы Алесі на ногі і махаючы лапамі ў такт мэлёдыі, якую павольна і жаласьліва сьпявала Недачарапаха:
— Пасьпяшаймася, — гарбуша кажа морскаму каньку, [Заўвага]
— Хвост аддушыць мне нязграба, я так болей не магу.
Паглядзі, як чарапахі ды амары рвуцца ў бой!
На пяску яны чакаюць — ці пусьціўся б ты са мной?
Ці пусьціўся б? Ці скакаў бы? Ці скакаў бы ты са мной?
Ці пусьціўся б? Ці скакаў бы? Ці скакаў бы ты са мной?

Ты, напэўна, не ўяўляеш, які гэта будзе кляс,
Калі, быццам тых амараў, зашпурнуць у мора нас!
Ды канёк сказаў: “У мора?” — і спадлоба паглядзеў.
“Не, — сказаў ён, — шчыры дзякуй”, танцаваць жа не схацеў.
Не схацеў: ня мог, баяўся танцаваць, дый не хацеў.
Не схацеў: ня мог, баяўся, дый танцулек не хацеў.

— Ну і што з таго, што ў мора? — зноўку тая сябруку.
— Ня што іншае, як бераг у яго на тым баку.
Не пасьпееш азірнуцца — нас там выкіне прыбой.
Каб мяне кахаў заўзята — дык пусьціўся б ты са мной.
Ці пусьціўся б? Ці скакаў бы? Ці скакаў бы ты са мной?
Ці пусьціўся б? Ці скакаў бы? Ці скакаў бы ты са мной?
— Дзякуй! Дзякуй! Гэта вельмі цікавы танец, асабліва калі на яго глядзіш, — сказала Алеся, у душы страшэнна радая, што яны ўрэшце кінулі свае гоцалкі. — І песенька пра гарбушу такая пацешная! Мне спадабалася.
— А што да гарбушаў, — ажывілася Недачарапаха, — яны... Ты бачыла гарбушаў, спадзяюся?
— Так, — сказала Алеся, — я іх часта бачу на абе... — і тут жа асяклася.
— Ня ведаю, дзе гэта — на Абе, — заўважыла Недачарапаха, — але калі ты бачышся зь імі так часта, дык, пэўна, ведаеш, як яны выглядаюць?
— Але, няўжо ж, — задуменна адказала Алеся. — Яны звычайна без галоваў і ўсе ўкачаныя ў муку.
— Наконт мукі ты памыляешся, — запярэчыла Недачарапаха.
— Усю муку змыла б марская вада. А галовы яны *й праўда*

згубілі, бо...
Тут Недачарапаха нечакана пазяхнула і прымружыла вочы.
— Раскажы ёй аб прычыне гэтага і ўсім такім... — зьвярнулася яна да Грыфона.
— Згубілі таму, — падхапіў Грыфон, — што пайшлі яны, *прыкладам*, з амарамі на кадрылю. Ну, амары іх і захапляюць, каб шпурнуць у мора. А раз яны захапляюцца, значыць, і губляюць галаву, а пасьля не пасьпяваюць знайсьці яе. Вось і ўсё.
— Дзякуй, — сказала Алеся, — гэта вельмі цікава. Я ня ведала так шмат падрабязнасьцяў пра гарбушу.
— Я б расказаў табе яшчэ больш, каб ты хацела, — дадаў Грыфон. — Ты ведаеш, напрыклад, чаму яны завуцца гарбушамі?
— Ніколі пра гэта ня думала, — сказала Алеся. — А чаму?
— Таму што яны *харчуюцца гарбатай*, — урачыста заявіў Грыфон.
Алеся зусім зьбілася з тропу.
— Харчуюцца гарбатай? Хіба можна пражыць на гарбаце? — не разумела Аліса.
— А *ты*, прыкладам, чым харчуешся? — спытаўся Грыфон.
Алеся згадала, што даўно ня ела нічога, акрамя сырога грыба, і крыху задумалася, перш чым адказаць.
— Супамі, кашамі, а таксама цукеркамі...
— А на дне мора ўсе харчуюцца гарбатай або кавай, — тонам, якім адкрываюць вялікі сакрэт, паведаміў ёй Грыфон, — цяпер будзеш ведаць!
— А з чым… п'юць марскую гарбату? — спыталася Алеся, так, нібы яна паверыла Грыфону.
— З марскімі язычкамі й пірагамі з марской капустай. А то як жа ж! — нецярпліва адказаў Грыфон. — Але, слухай, такія элемэнтарныя рэчы кожная крэветка ведае!
— Калі б я была гарбушай, — сказала Алеся, якая ўсё яшчэ знаходзілася пад уражаньнем песенькі, — я б сказала таму каньку: "Ідзі адсюль, даражэнькі! Якой трасцы ты нам патрэбны!"
— Ды што ты такое кажаш! — абурылася Недачарапаха. — Ніводная разумная рыбіна свайго канька не адрачэцца.
— Чаму ж? — моцна зьдзівілася Алеся.
— Ды таму, — працягвала Недачарапаха, — што ў любой

рыбіны, якая паважае сябе, павінен быць свой *любімы канёк*!
— Што вы маеце на ўвазе? — усё яшчэ не разумела Алеся.
— Нічога я ня маю ні на вазе, ні ў вазе, і хопіць пра гэта! — пакрыўджана адказала Недачарапаха.
А Грыфон дадаў:
— Лепей ты раскажы нам што-небудзь з *сваіх* прыгодаў.
— Я б магла расказаць вам пра свае прыгоды, пачынаючы зь сёньняшняй раніцы, — няўпэўнена сказала Алеся, — бо пачынаць ад учора — няма сэнсу. Тады я была іншым чалавекам.
— Растлумач, што ты хочаш гэтым сказаць, — запатрабавала Недачарапаха.
— Не, не! Спачатку прыгоды, — нецярпліва ўсклікнуў Грыфон.
— Тлумачэньні займаюць страшэнна шмат часу.
І Алеся пачала апавядаць ад таго моманту, як яна ўпершыню ўбачыла Белага Труса. Праўда, напачатку, калі абедзьве істоты, разявіўшы пашчы і вытарашчыўшы вочы, абселі яе зусім блізка, яна крыху перапалохалася. Але патроху набралася адвагі. Аўдыторыя слухала яе ў поўнай цішыні, пакуль Алеся не дайшла да таго месца, як яна чытала Вусеню “Бацьку Ўільяма”, а словы выходзілі зусім ня тыя. Тут Недачарапаха глыбока ўздыхнула і заўважыла:
— Вельмі цікавая гісторыя!
— Цікавая! Самая цікавая па ўзроўні цікавасьці! — адзначыў Грыфон.
— Усе словы шыварат-навыварат, — задуменна прамовіла Недачарапаха. — Каб яна цяпер што пачытала — я б ахвотна паслухала. Скажы ёй, хай яна пачытае.
І зірнула на Грыфона, быццам той мае на Алесю які ўплыў.
— Устань і прачытай нам “Зорку Вэнэру”, — загадаў Алесі Грыфон.
“Вось, раскамандаваліся! Нібы ў школе на занятках! — падумала Алеся. — Можа, яны мне яшчэ й адзнакі зьбіраюцца выставіць?”
Тым ня менш, яна ўстала і пачала чытаць, але галава яе яшчэ была моцна задураная кадрыляю з амарамі, і Алеся мала ўсьведамляла, што кажа. Словы сапраўды выходзілі вельмі дзіўныя:

Зорка Хімэра ўзышла пад вадою, [Заўвага]

Сьмешныя сваркі з сабой прынясла:
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Хімэра ўзышла.

З гэтай пары я пачаў заікацца
І ад цябе паратунку шукаў:
Ціхім вар'яцтвам увесь скаланацца
З гэтай пары я пачаў.
— Зусім ня тое, чаму мяне вучылі ў дзяцінстве, — зазначыў Грыфон.
— А я дык увогуле ўпершыню чую такую бязглузьдзіцу, — сказала Недачарапаха.
Алеся прамаўчала. Яна села на зямлю і ў адчаі закрыла тварык рукамі. Няўжо ўжо *ніколі* ня вернецца нармальнае жыццё?
— Хацела б я, каб мне гэты верш растлумачылі, — папрасіла Недачарапаха.
— Яна ня ўмее тлумачыць, — хутчэй перабіў сяброўку Грыфон.
— Чытай наступны верш!
— Хай патлумачыць хоць, чаму ён "пачаў заікацца", — настойвала Недачарапаха. — І што за "сьмешныя сваркі"? Незразумела!
— Гэта як у гарбушы з каньком, — спрабавала нешта патлумачыць Алеся, але сама страшэнна заблыталася і прагнула зьмяніць тэму.
— Давай наступны вершык, — зноў закамандаваў Грыфон. — Ён пачынаецца "Я ішоў каля саду".
Алеся не магла не паслухацца, хоць была ўпэўненая, што ўсё зноў выйдзе зусім ня так, і дрыготкім голасам пачала:

Я ішоў каля саду і ўгледзеў няўзнак,
Як Пугач і Пантэра дзялілі праснак:
І скарынку, і мякіш Пантэра ўзяла,
Пугачу ж засталося прыбраць са стала.

У кішэню Пугач паклаў срэбны прыбор,
А Пантэра галоднаю выйшла на двор,
І таму на дэсэрт, праснака апрача,
Яна зьела даверлівага...
— Што за карысьць ад такога чытаньня, — перапыніла яе Недачарапаха, — калі ты нічога пасьля не тлумачыш? Гэты

верш яшчэ больш туманны, чым першы! Я ў жыцьці ня чула такой нісянеціцы!
— Так, лепей табе вершыкаў не чытаць, — сказаў Грыфон, і Алеся ў душы запляскала ў ладкі.
— Дык што, паспрабуем другую фігуру кадрылі з амарамі без амараў? — працягваў Грыфон. — Ці ты хочаш, каб Недачарапаха запела яшчэ адну песьню?
— Песьню, песьню, зрабеце ласку, засьпявайце песьню! — выбрала Алеся з такім энтузіязмам, што Грыфон нават пакрыўдзіўся:
— Гм! Пра густы не спрачаюцца! Засьпявай ёй “Чарапахавы Суп”, матухна?
Недачарапаха глыбока ўздыхнула і, хліпаючы ад плачу, запела:

Мой родны суп, як ты мне мілы, [Заўвага]
Забыць цябе ня маю сілы!
Ня раз, як воўк лясны, галодны,
Цябе я ўвесь зьядаў халодны,
А ўжо калі ты быў гарачы —
Тады я скаланаўся ў плачы,
Мой ро-о-о-одны су-у-у-уп
З найлепшых круп!

Мой родны суп, мая вячэра,
Табой я вечны ненажэра.
Як дурань зь пісанаю торбай,
Ляцеў я, каб цябе пасёрбаць,
Ад хваляў сіняга Дунаю,
Дзе я душою спачываю,
Мой ро-о-о-о-одны су-у-у-уп
З найлепШЫХ КРУП!
— Зноў прыпеў! — закрычаў Грыфон.
І толькі Недачарапаха пачала паўтараць прыпеў, як здалёку данёсься крык:
— Устаць, суд ідзе!
— Хадзем! — клікнуў Грыфон і, хапіўшы Алесю за руку, засьпяшаўся, не чакаючы канца песенькі.
— Які суд? — цікавілася задыханая Алеся.
Але Грыфон толькі падганяў:
— Хутчэй!

І бяз духу нёсься далей. А ззаду ўсё слабей і слабей вецер даносіў жалобны сьпеў:

Мой ро-о-о-одны су-у-у-уп
З найлепшых круп!

Разьдзел адзінаццаты

Хто пакраў пячэнцы?

Кароль і Каралева Чырвань ужо сядзелі на троне. Вакол сабралася процьма розных птушак, зьвяроў і калода картаў у поўным складзе. Перад тронам у атачэньні варты стаяў Валет, закаваны ў кайданы. Пры Каралю туляўся Белы Трус з трубой у адной руцэ і пэргамінным сувоем у другой. А на самай сярэдзіне каралеўскага судовага двара стаяў стол зь вялізным талерцам пячэнцаў. Яны выглядалі так ласа, што ў Алесі адразу сьлінкі пацяклі. “От каб гэты суд скончыўся хутчэй ды раздалі пачастунак!” — падумала Алеся.

Але падобна, што дачакаць канца шанцаў не было. І яна пачала разглядацца навакол, каб хоць чымсьці заняць час.

Алеся яшчэ ніколі не была на судзе, але чытала аб працэсах у кніжках і надта цешылася з таго, што ведае, як што на судзе называецца. “Вунь той — судзьдзя, — сказала яна сабе, — бо ў яго вялізны парык”. Судзьдзём, між іншым, быў сам Кароль. Ён пачапіў карону сабе на парык (калі хочаце даведацца, як гэта выглядала, зірніце на малюнак) і таму выгляд меў несамавіты і недарэчны. “А гэта — лава прысяжных, — падумала Алеся. — А вунь тыя дванаццаць істот (іх іначай як “істотамі” і не назавеш, бо частка зь іх былі зьвяры, а частка — птушкі) пэўна што і ёсьць прысяжныя”.

Апошняе слова яна паўтарыла з гонарам двойчы ці тройчы, і ганарылася яна небеспадстаўна, бо вельмі мала дзяўчынак у яе гады ведаюць, што яно значыць. Зрэшты, сказаць “судовыя засядацелі” таксама не было б памылкаю.

Усе дванаццаць прысяжных нешта заўзята пісалі на грыфэльных дошчачках.

— Што яны робяць? — шапнула Алеся Грыфону. — Ім жа яшчэ няма чаго занатоўваць, суд не пачаўся...

— Яны запісваюць свае імёны, — зашаптаў ў адказ Грыфон, — баяцца, што забудуцца на іх да канца суду.

— Але ж дурні! — абурана выгукнула Алеся, аднак тут жа

замаўчала, бо Белы Трус закрычаў:
— Цішыня ў судзе!
А Кароль начапіў акуляры і строга абвёў позіркам прысутных, каб устанавіць, хто парушыў парадак.
Алеся бачыла — бо кожнаму з прысяжных магла зазірнуць цераз плячо, — як яны занатоўваюць “Але ж дурні!”, і нават угледзела, што адзін зь іх ня ведаў, пішацца “але ж” ці “але ш”, і падгледзеў у суседа. “Во, панапісваюць такія!” — падумала Алеся.
На бяду, у аднаго з прысяжных невыносна рыпеў грыфэль. Алеся нядоўга гэта цярпела, абышла лаву прысяжных і цопнула грыфэль так спрытненька, што бедны прысяжны (а гэта быў той самы трытон Піліпка) ня мог даўмецца, куды дзеўся ягоны інструмэнт. Марна ён глядзеў на лаве і пад лаваю — нічога не знайшоў. Урэшце ён вырашыў пісаць проста пальцам і так да самага канца паседжаньня і вадзіў пальцам па дошцы. Ведама, карысьці з такой пісаніны было ні на грош, бо палец не пакідае на таблічцы сьлядоў.
— Вяшчуне, зачытайце абвінаваўчае заключэньне! — загадаў Кароль.
Тут Белы Трус тройчы пратрубіў у трубу, разгарнуў пэргамінны сувой і прачытаў:

Раз Дама Сэрцаў сьпякла пячэнцаў, *Заўвага*
Іншых ня маючы спраў:
Валет жа Сэрцаў, ласун пячэнцаў,
Тыя пячэнцы пакраў.
— Прашу прысяжных абвясьціць свой вэрдыкт, — зьвярнуўся Кароль да прысяжных.
— Яшчэ рана, яшчэ рана! — хапатліва перапыніў яго Трус. — У нас яшчэ гара працы!
— Калі так, паклічце першага сьведку, — пажадаў Кароль.
Белы Трус зноў тройчы затрубіў у трубу і абвясьціў:
— Першы сьведка!
Першым сьведкам быў Шапавал. Ён увайшоў з кубкам гарбаты ў адной руцэ і недаедзеным лусьцікам у другой.
— Прашу прабачэньня, Вашая Вялікасьць, — пачаў ён, — што я гэта ўзяў з сабою. Я акурат піў гарбату, калі па мяне прышлі, дык не пасьпеў дапіць.
— Вам трэба было дапіць сваю гарбату, перш чым зьяўляцца ў

суд, — прабраў яго Кароль. — Калі ж вы, дарэчы, пачалі, што не пасьпелі скончыць?
Шапавал зірнуў на Марцовага Зайца, які таксама прыцёгся ў суд пад ручку з Соняй.
— Чатырнаццатага сакавіка, *здаецца*, — адказаў ён.
— Пятнаццатага, — удакладніў Марцовы Заяц.
— Шаснаццатага, — запярэчыла Соня.
— Запішэце гэта збалянсавана, — сказаў Кароль прысяжным, і тыя паслужліва занатавалі ўсе тры даты сабе на дошчачкі, потым склалі іх, а вынік перавялі ў грашовае вымярэньне.
— Здыміце свой капялюш, — зьвярнуўся Кароль да Шапавала.
— Гэта ня мой, — адказаў Шапавал.
— Вы прыйшлі ў суд у *крадзеным*?! — усклікнуў Кароль, Заўвага зьвяртаючыся да прысяжных, якія неадкладна ўпісалі гэты факт у пратакол.
— Я іх не нашу, я іх прадаю, — сказаў Шапавал і дадаў у якасьці тлумачэньня: — Ніводзін зь іх мне не належыць. Я шапавал.
Тут Каралева начапіла акуляры і так вытарашчылася на Шапавала, што той зьбялеў і замітусіўся.
— Паказаньні давайце, — сказаў Кароль, — і не нэрвуйцеся, а то я адпраўлю вас на шыбеніцу.
Здаецца, такі наказ сьведку зусім не натхніў. Ён пераступаў з нагі на нагу, заклапочана паглядаў на Каралеву і, сумеўшыся, замест лусьціка адкусіў ладны кавалак кубка.
У гэты момант Алеся занепакоілася, адчуўшы нешта дзіўнае, і спаквaля зразумела, што яна зноў расьце. Спачатку яна падумала ўстаць і пакінуць двор суду, але потым вырашыла, што лепей заставацца на сваім месцы, пакуль яго хапае.
— Перастаньце на мяне налягаць, — незадаволена буркнула Соня, што сядзела побач. — Я ўжо ледзь дыхаю!
— Не магу перастаць, — вінавата сказала Алеся, — я расту.
— Якое Вы маеце права расьці ў грамадзкім месцы! — абурылася Соня.
— Не гаварэце глуму, — ужо цьвярдзей заявіла Алеся. — І Вы ж расьцяце.
— Так, але *я* расту ў разумных межах, — запярэчыла Соня, — а *ты* буяніш.
Яна ўстала і дэманстратыўна перайшла на супрацьлеглы канец двара.

Каралева тым часам пільна ўзіралася ў Шапавала, і толькі Соня нагледзела сабе месца, як адзін з судовых выканаўцаў атрымаў найвысачэйшы загад:
— Прынясі мне сьпіс тых, хто сьпяваў на апошнім канцэрце! Заўвага
Тут Шапавал так затросься, што ў яго з ног пазьляталі чаравікі.
— Сьведка, не хвалюйцеся, а давайце паказаньні, — раздражнёна паўтарыў Кароль, — а то я пакараю вас сьмерцю, можаце не хвалявацца.
— Я чалавек просты, Вашая Вялікасьць, — загаварыў Шапавал з трымценьнем у голасе, — і не пасьпеў дапіць гарбаты... недзе з тыдзень таму... да таго ж лусьцікі пайшлі танюсенькія... а вы ж ведаеце, што я гарбаты аматар...
— Гарбаты хто? — перапытаўся Кароль.
— Я *не гарбаты*, — паправіўся Шапавал.
— Я сам бачу, што вы не гарбаты! — ускінуўся Кароль. — Сьведка, вы што, мяне за дурня маеце? Не цягніце рызіну, паказаньні давайце!
— Я чалавек просты, — не здаваўся Шапавал, — і пасьля гэтага ўсё гарбата і гарбата... а Марцовы Заяц і скажы...
— Не было такога! — спрытна перабіў Марцовы Заяц.
— Было! — настойваў Шапавал.
— Адмаўляю! — запярэчыў Марцовы Заяц.
— Ён гэта адмаўляе, — паўтарыў Кароль. — Прысяжныя, не запісвайце гэтага.
— Значыць, у такім разе, гэта сказала Соня, — працягваў Шапавал, занепакоена азіраючыся на Соню, ці хоць тая не адмовіцца, але тая нічога не адмаўляла, бо спала як пшаніцу прадаўшы.
— Потым, — сьведчыў далей Шапавал, — я намазаў яшчэ адзін бутэрброд...
— Дык што ж Соня сказала? — спытаўся нехта з прысяжных.
— Гэтага я ня помню, — сказаў Шапавал.
— *Або* вы гэта ўспомніце, сьведка, — заўважыў Кароль, — *або* вы будзеце пакараны сьмерцю.
У небаракі Шапавала і кубак, і лусьцік пакаціліся з рук, і ён бухнуўся на адно калена, заенчыўшы:
— Вашая Вялікасьць, я чалавек просты…
— Я бачу, што не *вялікі*… не вялікі сьведка з вас, — пакпіў Кароль.

Адна з марскіх сьвінак зааплядавала, але судовыя чыны тут жа заклікалі яе да парадку. (Паколькі ня ўсе разумеюць выразу “заклікаць некага да парадку”, Заўвага я зараз патлумачу, як яны гэта рабілі. У іх быў вялізны палатняны мех, як для бульбы, з завязачкамі зьверху. Яны запіхнулі туды марскую сьвінку галавою ўніз, кінулі мех на зямлю і селі на яго.)
“Цяпер я хоць буду ведаць, як гэта робіцца, — падумала Алеся. — А то ў газэтах часта пішуць: “Асобныя з прысутных ўзьнялі воплескі, аднак былі адразу ж закліканыя да парадку судовымі чынамі”, — і я раней ніколі не разумела, што гэта значыць”.
— Калі гэта ўсё, што вам ведама, — сказаў тым часам Кароль, — можаце сесьці.
— Дзякуй, я лепей тут пастаю. За што мяне садзіць у турму?
— Тады валіце, раз вы Ша-па-вал!
Шапавал і паваліўся на падлогу. Тут яшчэ адна марская сьвінка запляскала ў ладкі і такама была закліканая да парадку.
“Марскіх сьвінак больш не засталося! — падумала Алеся. — Бязь іх суд пойдзе значна хутчэй!..”
— Зрэшты, лепей я пайду дап’ю сваю гарбату, — сказаў Шапавал, спалохана пазіраючы ўгару на Каралеву, якая праглядала сьпіс сьпевакоў.
— Валіце-валіце, — дазволіў Кароль, і Шапавал вываліўся вон, нават не пасьпеўшы насунуць чаравікі.
— ...На ўсялякі выпадак заадно сьсячэце яму галаву, — распарадзілася Каралева ўдагонку.
Аднак Шапавал прапаў з вачэй раней, чым кат падышоў да дзьвярэй.
— Паклічце наступнага сьведку! — загадаў Кароль.
Наступнаю сьведкаю была кухарка Княгіні. Яна прывалакла з сабой перачніцу. Таму пра асобу наступнага ўдзельніка судовага працэсу Алеся здагадалася яшчэ да таго, як кухарка ўвайшла, па тым, што людзі каля брамы пачалі ўсе як адзін чхаць.
— Давайце паказаньні, — загадаў Кароль.
— Трасцы! — вылаялася кухарка.
Кароль нецярпліва зірнуў на Белага Труса, і той сказаў ціхім голасам:
— Вашая Вялікасьць, гэтаму сьведку трэба ўчыніць допыт з прыдзіркамі.
— Што ж, з прыдзіркамі дык з прыдзіркамі, — без асаблівага

энтузіязму пагадзіўся Кароль.
Ён нахмурыўся так, што пад бровамі стала амаль не відаць вачэй, і страшным глухім голасам запытаўся:
— З чаго робяцца пячэнцы?
— Зь перцу пераважна, — адказала кухарка.
— З ж-ж-жывіцы, — данёсься сонны голас з лаваў публікі.
— Выкіньце адсюль гэтую Соню! — завішчэла Каралева. — Стнеце ёй галаву! Хапайце яе! Выдварце яе! Зашчыкайце яе! Адрэжце ёй хвост!
Некалькі хвілін у судзе стаяла замятня, бо ўсе лавілі Соню, каб заклікаць да парадку і яе, а калі зноў паселі, то кухаркі ўжо і сьлед прастыў.
— Такой бяды! — з палёгкаю ўздыхнуў Кароль. — Клічце наступнага сьведку.
І дадаў ужо цішэй, зьвяртаючыся да Каралевы:
— Я цябе вельмі прашу, дарагая, наступнага сьведку дапытвай з прыдзіркамі *ты*. У мяне ад прыдзірак ужо бровы баляць!
Алеся пазірала, як Белы Трус бегае вачыма па сьпісе, і гадала: каго ж выклічуць наступным. “Няшмат доказаў яны пакуль назьбіралі”, — думалася ёй.
Уявеце сабе яе зьдзіўленьне, калі Белы Трус на ўвесь свой вісклівы голас выгукнуў імя наступнага сьведкі:
— Алеся!

Разьдзел дванаццаты

Алесіна сьведчаньне

— Тут! — азвалася Алеся, ад нечаканасьці забыўшыся, наколькі яна вырасла за апошнія колькі хвілін, так што, падскочыўшы, зачапіла падолкам спадніцы лаву прысяжных ды вывернула гэтую жыўнасьць на галовы публікі. Пападаўшы, засядацелі так і засталіся ляжаць на падлозе, хто раскірначыўшыся, хто распластаўшыся. Яны нагадвалі Алесі залатых рыбак з акварыюму, які яна перакуліла выпадкам тыдзень таму.
— Ах, *прашу* прабачэньня! — жахнулася Алеся і кінулася зьбіраць іх як мага хутчэй.
Залатыя рыбкі стаялі ў яе перад вачыма, і ёй здавалася, што, калі зараз жа не падняць іх усіх і не вярнуць за лаву прысяжных, яны перамруць.
— Суд ня можа ісьці, — сурова сказаў Кароль, — пакуль усе прысяжныя ня зоймуць свае законныя месцы. — *Усе*, —

паўтарыў ён з націскам, строга ўзіраючыся на Алесю.
Тая зірнула на лаву і ўбачыла, што сьпехам утыркнула Піліпку дагары нагамі. Нябога адно мэлянхалічна матляў угары хвастом, ня могучы варухнуць тулавам. Алеся вомірг схапіла яго і перавярнула як трэба. “Зрэшты, вялікай розьніцы няма, — падумалася ёй, — ці ён так сядзіць, ці гэтак — суду ад яго *адзін* толк”.
І толькі прысяжныя паачуньвалі крыху ды вярнулі свае грыфэлі з дошчачкамі, як усе зь вялікай адказнасьцю ўзяліся апісваць здарэньне. Усе, апрача Піліпкі, — той ужо канчаткова перастаў што-небудзь разумець і толькі сядзеў, разявіўшыся ды ўтаропіўшыся ў столь.
— Што сьведку ведама аб гэтай справе? — спытаўся Кароль Алесю.
— Нічога, — адказала яна.
— *Зусім* нічога? — настойваў Кароль.
— Зусім нічога, — сказала Алеся.
— Гэта вельмі важна, — падкрэсьліў Кароль, зьвярнуўшыся да прысяжных.
Тыя ўзяліся запісваць сабе на дошчачкі, але тут умяшаўся Белы Трус:
— Вашая Вялікасьць, несумненна, хацеў сказаць, што гэта *ня*важна, — сказаў ён вельмі пачціва, аднак увесь час варушачы бровамі і нешта паказваючы Каралю на мігі.
— Зразумела, я хацеў сказаць *ня*важна, — хапатліва выправіўся Кароль, а сам працягваў мармытаць сабе пад нос: — Важна — няважна... няважна — важна… — як быццам узважваў, якое слова лепей гучыць.
Адныя прысяжныя занатавалі сабе “важна”, другія “няважна”. Алеся ўсё гэта бачыла, бо стаяла так блізка, што магла зазірнуць у іх запісы. “Ды тут усё няважна”, — падумала яна.
У гэтую хвіліну Кароль пасьпешна запісаў нешта ў сваёй памятнай кнізе і абвесьціў:
— Цішыня ў залі! — і зачытаў уголас: — Закон нумар сорак два: *Кожны, хто вышэйшы за мілю, мусіць пакінуць суд.*
Усе паглядзелі на Алесю.
— Я *ніжэйшая* за мілю, — запярэчыла тая.
— Вышэйшая, — сказаў Кароль.
— Яна і дзьве мілі будзе! — умяшалася Каралева.
— Хай сабе так, усё адно не пайду, — сказала Алеся. — Да таго

ж, гэта незаконны закон: вы яго толькі што прыдумалі.
— Гэта найдаўнейшы закон у кнізе, — настойваў Кароль.
— Тады ён быў бы законам нумар адзін, — заўважыла Алеся.
Кароль зьбялеў і ўмомант загарнуў памятную кнігу.
— Прашу прысяжных абвясьціць свой вэрдыкт, — зьвярнуўся ён да суду сьцішэлым, няпэўным голасам.
— У справе зьявіліся новыя доказы, з ласкі Вашае Вялікасьці, — сказаў Белы Трус, аж ніжучыся на месцы ад нецярплячкі. — Толькі што была знойдзеная вось гэтая папера.
— Што ў ёй? — спыталася Каралева.
— Я яшчэ яе не разгортваў, — сказаў Белы Трус, — але здаецца, гэта ліст, адрасаваны падсудным некаму.
— Раз ёсьць ліст, — адзначыў Кароль, — значыць, ён адрасаваны некаму. Калі толькі ён не напісаны падсудным да нікога, што здараецца нячаста.
— А каму ён адрасаваны? — спытаўся адзін з прысяжных.
— Адрасат не пазначаны, — адказаў Белы Трус. — Дакладней, там нічога не напісана *звонку*.
З гэтымі словамі ён разгарнуў паперу й дадаў:
— Гэта, як высьвятляецца, ня ліст, а вершы.
— Напісаныя почыркам падсуднага? — запытаўся яшчэ адзін прысяжны.
— Не, — сказаў Белы Трус. — Як ні дзіўна.
(Прысяжныя ўтаропіліся ў столь ад разгубленасьці.)
— Значыць, ён падрабіў нечы почырк! — сказаў Кароль.
(Прысяжныя заўсьміхаліся.)
— Вашая Вялікасьць, зьлітуйцеся, — сказаў Валет, — я не пісаў гэтага ліста, і яны ня могуць давесьці адваротнага, бо ён не падпісаны.
— Ах, ты яго яшчэ й не падпісаў! — працягваў Кароль. — Гэта толькі абцяжарвае тваю віну. Калі б ты ня меў наўме круцельства, дык бы абавязкова падпісаўся пад сваім пісьмом, як і кожны сумленны чалавек, які піша ліст.
Гэтыя словы выклікалі воплескі прысутных, бо ўпершыню Кароль выказаў сапраўды разумную думку.
— Гэта *даказвае* ягоную віну, — заявіла Каралева. — Пара сьця...
— Нічога не даказвае! — крыкнула Алеся. — Вы ж ня ведаеце нават, што ў тых вершах!
— Дык зачытайце іх! — загадаў Кароль.

Белы Трус начапіў свае акуляры.
— Скуль мне пачаць, Вашая Вялікасьць? — спытаўся ён.
— Пачні з пачатку, — грозна сказаў Кароль, — і чытай, пакуль ня дойдзеш да канца, а там можаш спыніцца.
Пакуль Белы Трус чытаў верш, у судзе стаяла мёртвая цішыня:

Ты зь ёю быў, сказалі мне, [Заўвага]
І ўзгадваў нас пры ім:
Яна ж сказала пра мяне:
Ты не плывец зусім.

Ён ім сказаў, што я там быў
(Бо ведама ўсё нам):
Каб скарыстала яна ўплыў,
Дзе ты ўжо быў бы сам?

Я даў адзін ёй, два яму,
Ты даў нам тры ўсяго;
Усё вярнулася таму,
Хто меў іх да таго.

Калі б былі яна ці я
Замешаныя ў тым,
Вельмі патрэбная твая
Была б падтрымка ім.

Я меў уражаньне тады,
Як выбрык яе ўзяў,
Што перашкодай значнай ты
Між імі й намі стаў.

Дык не кажы яму, што так
Цудоўна зь імі ёй,
Гэта сакрэтны будзе пакт
Паміж табой і мной.
— Гэта найважнейшае сьведчаньне з усіх, якія мы дагэтуль чулі, — сказаў Кароль, паціраючы рукі. — Так што прашу прысяжных абве...
— Калі хоць адзін зь іх растлумачыць мне сэнс гэтага верша, — перабіла Алеся (за апошнія хвіліны яна так падрасла, што зусім

не баялася перарываць Караля), — я буду яму вельмі абавязаная. Ды тут жа ні каліва глузду няма!
Прысяжныя занатавалі: “Ды тут жа ні каліва глузду няма!” — але ніхто зь іх не наважыўся патлумачыць зьмест пачутага.
— Калі ў ім няма глузду, — сказаў Кароль, — гэта вызваляе нас ад абавязку яго шукаць. І ўсё-ткі я ня ўпэўнены, — працягваў ён, разгарнуўшы паперу ў сябе на калене й пазіраючы ў яе адным вокам. — Мне здаецца, я бачу ў іх нейкі сэнс... *Ты не плывец зусім...* — вы ж ня ўмееце плаваць, абвінавачваны? — спытаўся ён, зьвяртаючыся да Валета.
Валет сумна пакруціў галавой.
— Хіба я падобны да чалавека, які ўмее плаваць? — сказаў ён. (Да чалавека ён зусім ня быў падобны, бо зроблены быў з кардону, як і ўсе карты.)
— Выдатна! Ага... — сказаў Кароль і пачаў бубнець сабе пад нос тыя самыя вершы: *“ведама ўсё нам”* — гэта прысяжныя, зразумела; *“каб скарыстала яна ўплыў”* — гэта, відаць, Каралева; *“дзе ты ўжо быў бы сам?”* — сапраўды, дзе?! — *“я даў адзін ёй, два яму”* — ага, дык вось што ён зрабіў зь пячэнцамі! Ясьненька!..
— Аднак там ёсьць працяг: *“Усё вярнулася таму, хто меў іх да таго”*, — сказала Алеся.
— І што, гэта ня праўда, па-твойму? — сказаў пераможна Кароль, паказваючы на місу зь пячэнцамі. — *Гэта* ўжо ясьней яснага! Потым зноў: *“Як выбрык яе ўзяў”*. У цябе ж, наколькі я ведаю, ніколі не бывае выбрыкаў, дарагая? — спытаўся ён у Каралевы.
— Ніколі! — гнеўна сказала Каралева і шпурнула ў Піліпку чарніліцай.
(Няшчасны Піліпка, які быў перастаў пісаць пальцам з прычыны марнасьці гэтага занятку, цяпер зноў ліхаманкава кінуўся занатоўваць, вэдзгаючы пальцам чарніла, што сьцякала ў яго па твары.)
— Значыць, слова “выбрык” няслушна выбранае, — сказаў Кароль, ганарліва азіраючы суд.
Але ў двары паседжаньняў стаяла мёртвая цішыня.
— Гэта была гульня слоў, — дадаў Кароль раздражнёна, і ўсе дружна засьмяяліся. — Прашу прысяжных абвясьціць свой вэрдыкт, — прамовіў Кароль мо ўжо які дваццаты раз за дзень.
— Не, не! — сказала Каралева. — Спачатку прысуд — вэрдыкт

потым.
— Што за бязглузьдзіца! — голасна запярэчыла Алеся. — Што вы ўвогуле такое верзяце!
— Маўчаць! — пачырванеўшы, зараўла Каралева.
— Ня буду маўчаць! — адказала ёй Алеся.
— Сьцяць ёй галаву! — штомоцы зараўла Каралева, але ніхто не зварухнуўся.
— Ды каму *вы* патрэбныя? — сказала Алеся (яна ўжо выросла да сваіх звыклых памераў). — Вы ж усяго толькі калода картаў! Тут уся калода ўзьнялася ў паветра й наляцела на яе. Алеся ўскрыкнула, напалову спалоханая, напалову раззлаваная, і, адбіваючыся, замахала рукамі. І раптам убачыла, што ляжыць на беразе, паклаўшы галаву на калені сястры, якая асьцярожна прымае ёй з тварыка сухое лісьце, што нападала з дрэў.
— Алеся, любачка, прачынайся! — сказала сястра. — Доўга ж ты спала, трэба сказаць!
— О, я прысьніла такі цікавы сон! — замуркала Алеся. І яна расказала сястры ўсё, што толькі запомніла з сваіх дзіўных Прыгодаў, якія вы толькі што чулі.
А калі яна скончыла, сястра пацалавала яе й сказала:
— Гэта напраўду цікавы сон, любая мая. А зараз ляці піць гарбату — ты ўжо позьнішся.
Алеся ўскочыла і паляцела дадому стрымгалоў, думаючы па дарозе, які ж чароўны сон яна прысьніла.

А сястра засталася сядзець там, дзе яе пакінула Алеся. Падпёршы рукою галаву, яна назірала, як заходзіць сонца, думала пра маленькую Алесю, яе дзівосныя Прыгоды, аж пакуль таксама не пачала летуцець... І вось што яна пабачыла. Перш яна ўбачыла маленькую Алесю: пяшчотныя ручкі зноў абнялі ёй калені, жвавыя бліскучыя вачаняты глядзелі на яе. Яна чула ўсе адценьні Алесінага голасу і бачыла крыху нязграбны, раптоўны рух галоўкі, якім тая адкідала непаслухмяныя валасы, што *заўсёды* лезьлі ёй у вочы. І пакуль сястра мроіла, быццам слухае яе, усё навокал ажыло і напоўнілася дзіўнымі істотамі з Алесінага сну.
Доўгая трава зашамрэла ў яе пад нагамі, калі побач прабег Белы Трус; спалоханая Мыша заплюхалася ў найбліжэйшым ставе. Яна чула, як зьвіняць кубкі гарбаты, зь якіх безупынку

п’юць Марцовы Заяц і ягоныя сябры, чула віскліві голас Каралевы, што загадваў пакараць сьмерцю яе няшчасных гасьцей... Зноў парсюк чхаў на каленях у Княгіні, тым часам як талеркі й сподкі разьляталіся вакол, і зноў даносіўся Грыфонаў сьмех, рыпеньне Піліпкавага грыфэлю; стогны марскіх сьвінак, закліканых да парадку, мяшаліся з далёкім плачем гаротнай Недачарапахі.
Тады Алесіна сястра заплюшчыла вочы і амаль паверыла, што яна патрапіла ў Дзівосную Краіну, хоць ведала, што варта іх расплюшчыць — усё навокал ператворыцца ў панылую штодзённасьць: трава будзе шумець толькі ад ветру, вада будзе хвалявацца ад гайданьня чароту, звон кубкаў з гарбатаю стане бразгатам балаболак на авечках, што пасуцца воддаль, Каралевін віск акажацца пастуховым крыкам, а чханьне дзіцяці, Грыфонаў сьмех і рэшта нязвыклых гукаў зробяцца цьмяным водгульлем рабочых гукаў, што даносяцца з фэрмы; далёкае ж сьвістаньне імбрычка падменіць сабою цяжкія ўздыхі Недачарапахі.
Нарэшце яна ўявіла сабе, як яе маленькая сястрычка вырасьце некалі і стане дарослай жанчынай, але ў яе ўсё роўна застанецца простае і чулае сэрца маленькай дзяўчынкі. І гэтая жанчына сама зьбірацьме каля сябе маленькіх дзетак, а іхныя вочы будуць весялець і сьвяціцца ад мноства дзіўных казак, якія яна ім раскажа. І можа, яна нават раскажа свой сон пра Дзівосную Краіну, якую прысьніла шмат гадоў таму. І будзе разам зь імі смуткаваць немудрагелістым дзіцячым смуткам, радавацца іх немудрагелістаю дзіцячаю радасьцю, успамінаючы сваё маленства і шчасьлівыя летнія дні.

Канец
Пераклаў з ангельскай Максім Шчур.
Заўвагі Юрася Пацюпы

Заўвагі

Крыніцаю культурна-гістарычных зьвестак пры ўкладаньні заўвагаў паслужылі камэнтары Марціна Гарднэра ды Н. М. Дзямуравай з расейскага выданьня (Кэррол Л. Приключения

Алисы в стране чудес. Сквозь зеркало и что там увидела Алиса, или Алиса в зазеркалье. Москва. “Наука”, 1978.) і Джэймса Р. Кінкейда з амэрыканскага выданьня (Carroll’s L. Alice’s Adventures in Wonderland. A Harvest/HBJ Book. 1991.). Паасобныя філязофскія думкі ўзятыя зь “Лёгікі сэнсу” Жыля Дэлёза (Делёз Ж. Логика смысла. Москва, Издательский центр “Академия”, 1995.).

Разьдзел першы.

“Пагодным ранкам залатым…” — У вершы апісваецца запраўдная падзея 1862 году, калі Люіс Керал, яго сябар Робінсан Дакварт і сёстры Лідэл, “першая” — Ларына Шарлота, “другая” — Аліса Плэзнс і “трэцяя” — Эдыт, выправіліся на прагулянку па Тэмзе. Наагул, першыя старонкі казкі ўзьнікалі спантанна, без усялякага пляну. Назад

Не ўцярпеўшы ад цікаўнасьці, яна кінулася за ім… — Панятак *цікаўнасьць* вельмі важны для Керала, гарачага прыхільніка антыдыдактызму ў дзіцячай літаратуры — у тыя часы цікаўнасьць лічылася супраціўнасьцю набожнасьці і маральнасьці. Назад

…Алеся не хацела ўпускаць той слоік… — Пры вольным падзеньні, як ведама, слоік нельга было ўпусьціць. У “Сыльві і Бруна” Керал апісвае працэс піцьця гарбаты пры вольным падзеньні, пярэчачы тым самым Айнштайну. Назад

Што праўда, то праўда! — Гэты ўстойлівы выраз — узор чорнага кералаўскага гумару. Назад

…я падаю скрозь зямлю! — Развагі пра тое, што будзе, калі ўпасьці ў тунэль, які йдзе праз цэнтар зямлі, у часы Керала былі досыць пашыраныя. Назад

Дайна — гэта котка. — Так запраўды звалі котку сясьцёр Лідэл. Назад

Ці ядуць каты кажаноў? — П. Элікзэндэр бачыць тут зьвязак зь лягічным пазытывізмам, што адпрэчваў “бессэнсоўныя” пытаньні, якія нельга эмпірычна спраўдзіць (гл. таксама разьдзел VII “Гарбата ў вар’ятаў”). Кінкейд зьвяртае ўвагу на тое, што ў дзівоснай краіне няма сыстэмнага падзелу на драпежных і свойскіх істот. Назад

Яна ўкленчыла і ўгледзела на другім канцы калідорчыка сад… — Ведама, што Керал працаваў у бібліятэцы ў пакойчыку з

вокнамі на сад, дзе сёстры Лідэл гулялі ў крыкет. Назад
Бо яна чытала некалькі мілых апавяданьнечкаў пра дзяцей... — Ніжэй гратэскава пералічаюцца жахі тагачаснае дзіцячае маралістычнае літаратуры. Назад
На смак гэта было як мяшанка... — Тут іранічна “перамешваюцца” ўсе смакі, якія маглі падабацца Алісе. Насамрэч жа перад намі нерэальны, чыста вэрбальны, фантастычны канструкт, якія любіў скарыстоўваць Керал. Назад
* * * — Знак “зорачкі” Керал непасьлядоўна тарнуе для абазначэньня раптоўных пераўтварэньняў Алесі. Назад
...агеньчык сьвечкі пасьля таго, як яе задзьмулі. — Яшчэ адзін узор фантастыкі. Да падобнага роду аб’ектаў можна аднесьці і ўсьмешку Чэшырскага Ката (разьдзелы VI, VIII). Падобныя парадоксы так ці інакш ёсьць крытыкаю вэрбалізму філязофскіх рэалістаў, як плятонаўскага, так і арыстотэлеўскага гатунку. Ф. Бэкан у гэтай сувязі некалі пісаў: “Плятон падначаліў сьвет думкам, а Арыстотэль падначаліў гэтыя думкі словам”. Назад
...любіла ўдаваць зь сябе адразу дзьвюх асоб. — Тэма двайніка, папулярная ў рамантыкаў, вельмі часта, на розныя лады, гучыць у Керала. Назад

Разьдзел другі.

...усё дзівосіцца і дзівосіцца! — Абыходжаньне Керала з моваю вельмі далёкае ад акадэмічнае правільнасьці. Парушэньні ў мове служаць для яго як спосабам разьвіцьця сюжэту, так і прадукаваньнем новых сэнсаў. Назад
Спадарыні Алесінай Правай Назе... — У ангельскім фальклёры падобны матыў адчужэньня даволі пашыраны. Назад
...ці была я той самай, калі прачнулася сёньня ўранку? — М. Гіт трактуе пераўтварэньні Алесі як крызысы тоеснасьці, якім “мог бы пазайздросьціць усякі экзыстэнцыяліст”. Назад
Гэтак я ніколі не дайду да дваццаці! — Ёсьць розныя тлумачэньні гэтага выказу. М. Гарднэр заўважае: “Ангельская табліца множаньня традыцыйна сканчаецца на 12, калі ж мы працягнем гэтую абсурдную прагрэсію —
4x5 = 12
4x6 = 13
4x7 = 14 і г.д., —
то давядзецца спыніцца на

4x12 = 19.
Да 20 забракне адзінкі”.
Паводле А. Л. Тэйлара, тут у першым прыкладзе выкарыстоўваецца васемнаццатковая сыстэма зьлічэньня, у другім — дваццаціадзінковая і г.д., кожны раз аснова павялічваецца на тры. Але 4 на 13 такім спосабам будзе раўняцца ўжо ня 20, а 1. Назад
“Не сядзіцца ў жыце…” — У ангельскім арыгінале аб’ектам пародыі служыць малавядомы сёньня верш багаслова і паэта Айзэка Ўотса (1674—1748) “Супраць Дзяньгубства і Свавольства” (1715). Назад
…скараціласа б дазваньня. — Пытаньне, ці можна скараціцца “да званьня”, нагадвае апорыі Зэнона Элейскага: *Ахілес і чарапаха, Дыхатамія, Страла.* А таксама адсылае нас да спрэчкі Бэрклі зь Ньютанам. Бэрклі ўважаў супярэчнасьцю сьцьверджаньне бясконца малых часьціц. Граніцаю ўсякага дзяленьня, паводле Бэрклі, мусіць быць парог успрыманьня. У фізычным сэнсе граніцаю скарачэньня мусіць стаць квант. А фразэалёгія беларускае мовы, як бачым, падказвае: маўляў, апошняе, што застаецца ад рэчы, гэта яе “імя”, “знак”, “званьне”. Назад
…Яна боўтнулася ў мора. — Мора сьлёз У. Эмпсан тлумачыць як праакіян, а *гонку* як тэорыю натуральнага адбору паводле Дарвіна. Назад
…на моры абавязкова павінны быць купальныя кабінкі… — Закрытыя кабінкі на колцах, якія служылі для купаньня, — тыповая адзнака пурытанізму віктарыянскае эпохі. Назад
Мыш — мышы — мышшу — мышухна. — У арыгінале камічны прыклад запазычаны з “Камічнае лацінскае граматыкі” (1840) П. Лі. Назад
Où est ma chatte? — Дзе мая котка? *(франц.)* Падручнік французскае мовы (1804), адкуль бярэцца гэты выраз, моцна паўплываў на казку Керала. Пэўна, што Белы Трус як увасабленьне баязьлівасьці і падстаркаватасьці, антыпод Алесі, быў таксама навеяны гэтым падручнікам. Назад
Там былі Гогаль, Дода, Папугай, Арлянё… — Прыватны жарт. Тут адпаведна маюцца на ўвазе: Робінсан Дакварт, сам Люіс Керал (Чарлз Лютвідж Доджсан), Ларына і Эдыт. *Дода*, вядомая яшчэ пад назвай дронт звычайны, — птушка з атраду дронтавых, велічынёю з гусь, жыла на Маскарэнскіх выспах, дзе

не было драпежнікаў, страціла здольнасьць лётаць. Вынішчаная ў XVII ст. паляваньнем і завезенымі туды свойскімі сьвіньнямі. У ангельскай энцыкляпэдыі артыкул *Доджсан* ішоў акурат наступным за *Дода*, а сам Керал, калі заікаўся, вымаўляў сваё імя падобна да гэтага найменьня. Назад

Разьдзел трэці.

“Вільгельм Заваёўнік, чыё чало блаславіў пантыфік…” — Цытата з падручніка гісторыі 1862 году Гевіленда Чэмпэла. Назад

Вы павінны ведаць, што значыць “гэта”. — Для Керала вельмі характэрная іронія над абстракцыямі кшталту “знайшоў гэта годным”. Аднак сэнс іроніі куды глыбейшы: рэч у тым, што “гэта” (у Дэлёза “прывіднае “гэта”) без кантэксту запраўды нічога не абазначае. Невыпадкова Ленін у “Філязофскіх сшытках” назваў “гэта” найабстрактнейшым словам. І ўсё ж яго заўвага занадта пасьпешлівая. У прагматычных кантэкстах “гэта”, нібы палец Кратыла, паказвае на самыя канкрэтныя рэчы (гл. ніжэй: *жабка, чарвяк*). Яно, як і ўсе займеньнікі, ідэальнае слова, бо без прагматычнае сытуацыі ўсе словы, у той ці іншай ступені, “абстрактныя”, г.зн. замкнёныя самі на сябе, а не на рэчаіснасьць. Прафанацыя абстракцыяў праз гранічную канкрэтыку — тыповы прыклад наміналістычнага “экстрэмізму”, які сягае традыцыяў кінікаў. У беларускай літаратуры падобны прыём можна сустрэць у К. Марашэўскага, дзе чорт ужывае польскі лягічны тэрмін *wniosek* — “рашэньне, зьмеркаваньне”, а мужык чуе “падвёнзкі”, “дзявочыя зьвёнзкі”, далей чорт ужывае слова “выплывае” ў сэнсе лягічнае высновы, а мужык кажа “кроў з носу плывець”. Урэшце, усе абстрактныя чортавы развагі мужык “фундуе” канкрэтнымі рэчамі: *хрэн, часнык, рэдзька, цыбуля* і г.д. Назад

…перадвыбарная гонка — У арыгінале ўжываецца *Caucus-race.* Цьмянае слова *caucus* прышло з амэрыканскае палітычнае тэрміналёгіі і ў ангельскім кантэксьце стала абазначаць іранічнае, нават рэзка нэгатыўнае, найменьне групы палітычных праціўнікаў. У Керала яно служыць сымбалем палітычнага тлуму. Мітусьня бегаў, “кіданьне ад сказу да сказу” паводле Дэлёза ёсьць альтэрнатываю статычнаму “сухому апавяданьню”. Назад

Мы маем гонар прасіць Вас ласкава прыняць… напарстак. — Тут

можна згледзець пародыю на рыцарскую этыку, калі сэньёр, прымаючы пад сваю зьверхнасьць васала, забіраў ягоную маёмасьць і адразу ж ласкава яе вяртаў. Назад

Разьдзел чацьверты.

…высунуць адну руку ў акно, а нагу ў камін… — З 1935 году, пачынаючы ад У. Эмпсана, гэты эпізод надта любяць зьясьняць фрайдысты. Назад

…далей ужо няма куды. — У прыватных лістох Керала, як і ў Набокава ў “Лаліце”, вельмі часта выказваецца жальба — маўляў, дзеці (дзяўчынкі) занадта хутка растуць. Дарэчы, тое, што Набокаў пераклаў “Алесю” на расейскую мову, — зусім не выпадковы факт. Назад

Ахвярны Піліпка… — У арыгінале даецца “народная” форма імя *маленькі Біл*, што абазначае адначасна і “маленькі рахунак”, г.зн. ахвярнага казла, “крайняга”. Назад

Разьдзел пяты.

…Сама, бачыце, ня ведаю, хто я. — П. Гіт бачыць тут зьвязак з уяўленьнямі Лока аб цэласьці асобы як адзінстве памяці. Назад

“Бацька Ўільям” — пародыя на павучальны верш Робэрта Саўты (1774—1843) “Радасьці старога, і як ён іх набыў”. Назад

…раз дзяўчынкі ядуць яйкі, значыць, і яны такія самыя гадзіны. — Гэты дыялёг — узор “пабытовае лёгікі”. П. Гіт бачыць тут насьмешку над сафізмамі. Назад

Разьдзел шосты.

…на твар жа ён быў чысты карась. — Лёкай-Карась, паводле апісаньняў, вельмі нагадваў сабою фурмана Лідэлаў. Назад

Тваё стуканьне ня мае ніякага сэнсу… — У гэтым эпізодзе Керал прапануе супярэчлівую камунікацыйную сытуацыю збыткоўнасьці або недастатковасьці паведамленьня, у залежнасьці ад таго, каму яно адрасаванае: тым, хто вонкі, ці тым, хто ўсярэдзіне хаткі. Найдакладнейшае паведамленьне наагул траціць сэнс, калі ў зьвязцы *адрасант — код — адрасат* выпадае апошняя часьціна. Далейшая гутарка Алесі зь лёкаем таксама мае “сэміятычны” характар. Назад

…Княгіня… — На малюнках Джона Тэніэла, першага ілюстратара Керала, Княгіню малявалі з партрэту XVI ст. Квінтэна Масэйна “Пачварная Герцагіня”, правобразам якой

паслужыла Маргарыта Маўльташ (“рот кашальком”), што жыла ў XIV ст. Назад

…Чэшырскі Кот. — Існаваў выраз “усьміхаецца, як чэшырскі кот”, паходжаньне якога незразумелае. Паводле аднае вэрсіі, адзін з старажытных родаў графства Чэшыр меў на гербе льва; адсюль і пайшла традыцыя маляваць усьмешлівых ільвоў, падобных да катоў, над дзьвярамі корчмаў. Іншая вэрсія кажа, што форму ўсьмешлівых катоў мелі чэшырскія сыры. Псыхааналітык Ф. Грынэйкер дасьціпна заўважае: “Гэта вельмі ў стылі Керала: кот з сыру можа зьесьці пацука, які сырам паласаваўся”. Назад

Будзь вельмі жорсткай зь немаўлём… — Пародыя на забыты верш, які прыпісваўся то Дж. У. Лэнгфарду, то Д. Бэйтсу. Назад

Пакінуць яго ў такіх умовах было б злачынствам! — Маральная дылема, ці можа быць бязьдзеяньне злачынствам, сягае яшчэ гісторыі зь Пілатам. Назад

…што я буду рабіць з гэтым стварэньнем, калі прынясу яго дадому? — Гэты эпізод можна трактаваць як страх дзяўчыны перад грамадзкаю маралью. Назад

Алеся адпусьціла парасятка і адчула вялікую палёгку… — Дэлёз адзначае, што Керал не любіў хлопчыкаў, таму зусім невыпадкова дзіцё мужчынскага полу ператвараецца ў парасё. Назад

Куды-небудзь пэўна што патрапіш… — Гутарка Алесі і Ката асацыюецца з ірляндзкаю прымаўкаю пра дзьве брудныя дарогі: “Якую ні выбераш — захочаш пайсьці па іншай”. Джон Кемэні бачыць у гутарцы альтэрнатыву паміж навукаю і этыкаю: навука ня можа даць параду, *куды* ісьці, але таму, хто ўжо зрабіў выбар, яна можа падказаць, *як* ісьці найлепш. Назад

…абодва вар’яты. — У ангельскай мове існавалі ўстойлівыя выразы: “шалёны як шапавал”, “шалёны як марцовы заяц”. Рэч у тым, што шапавалы, ужываючы ртуць пры вырабе капелюшоў, сапраўды “прафэсійна” труціліся, што прыводзіла да сутаргаў, парушэньняў маўленьня, галюцынацыяў і г.д. А зайцы, як ведама, у сакавіку паводзяцца вельмі актыўна і дзіўна для вонкавага назіральніка. Назад

Пачнём з сабакі — ён не вар’ят. Ты згодная, што сабака ў сваім розуме? — Імітуецца манера сакратаўскага дыялёгу, калі праціўнік падводзіцца да пэўнага няўхільнага лягічнага рашэньня. Назад

Катоў без усьмешак я нагледзелася… але каб усьмешку без ката!.. — Гэты прыклад вэрбальнае фантастыкі Гарднэр называе “някепскім апісаньнем чыстае матэматыкі”. У сапраўднасьці перад намі сынэкдаха, прыватны выпадак мэтанімііі. Падобную фігуру скарыстаў некалі Анаксымандар, калі ў якасьці архэ прапанаваў не мэтафару (вада Фалеса), а сынэкдаху *апэйрон* — “неабсяжнае”. Назад

Разьдзел сёмы.

…за сталом пілі гарбату Марцовы Заяц і Шапавал. Між імі спала Соня… — Кажуць, што Тэніэл маляваў Шапавала з Т. Картэра, гандляра мэбляю, ведамага сваімі дзівацкімі вынаходкамі. Прыкладам, ён вынайшаў “ложак-будзільнік”, які ў патрэбны час сам скідваў соннага. *Соня* — грызун, больш падобны да вавёркі, чымся да мышы, які на зіму ўпадае ў засонак. Назад

Частуйся віном! — Прапанова частавацца тым, чаго няма, — жарт з рэпэртуару кініка Дыягена Сынопскага. Назад

А з твайго боку ня надта ветла… — Лёгіка паводле прынцыпу “сам дурань” асабліва пікантна гучыць з вуснаў “лягічнага пазытывіста” Марцовага Зайца. Назад

Чым крумкач падобны да грыфэльнае дошкі? — Гэтая загадка, як пазьней прызнаваўся Керал, сапраўды ня мела адгадкі, але спарадзіла іх нямала. Можна сказаць, што ў ёй, у самой яе незавершанасьці, закладзены фундамэнтальны прынцып мэтафары: няма ніводнае пары адвольна ўзятых аб’ектаў, якія нельга было б параўнаць, пытаньне толькі ў тым, які бок узяць за падставу параўнаньня. Назад

…разьлічваеш знайсьці слушны адказ на гэтую загадку? — Тут скептыцызм Марцовага Зайца ў нечым папярэднічае постпазытывізму К. Попэра, які даводзіў, быццам няма раз і назаўсёды слушных тэорыяў. Тое, што гэты скепсыс узьнікае з нагоды мэтафары, падказвае нам: усе навуковыя тэорыі — ня што іншае, як разгорнутыя мэтафары. Назад

Які вясёлы гадзіньнік! — У “Сыльвіі і Бруна”, адкручваючы назад стрэлкі гадзіньніка, можна вяртацца ў мінуўшчыну. Наагул, Керал любіў жарты з часам. Ён казаў: гадзіньнік, які стаіць, лепшы за той, які спазьняецца на хвіліну, бо першы паказвае правільны час двойчы на суткі, а другі — толькі раз

на два гады. Назад
Алеся ня бачыла ў заўвазе Шапавала ніякага сэнсу, хоць усе словы быццам бы былі правільныя. — Яшчэ адзін адсыл да лягічнага пазытывізму, які падзяляў выказваньні на слушныя, аблудныя і бессэнсоўныя. Назад
Каб ты ведала пра час гэтулькі, як я… — П. Гіт асацыюе з гэтым выказваньнем цьверджаньне Аўгустына, маўляў, пакуль пра час не пытаюцца, мы ведаем, што гэта такое, але як толькі паспрабуем адказаць — пападаем у тупік. Тут можна згледзець іронію на адрас мэтафізыкі, якая спрабуе то тлумачыць, то адмаўляць час. Успамінаецца таксама анэкдот пра філёзафа, што чытаў лекцыю пра ілюзорнасьць часу, а потым глянуў на гадзіньнік і паведаміў: “Я пазьнюся”. Назад
…У такім разе я не пасьпела б адчуць голад. — У. Шыблз заўважае, што Алеся міжволі разьмяжоўвае астранамічны і біялягічны час. Назад
“Котка, котачка, крычы…” — Пародыя на верш Джэйн Тэйлар “Зорка”. Назад
А што вы робіце, калі вяртаецеся ў пачатак? — Каб не адказваць на гэтае пытаньне, Марцовы Заяц прапаноўвае зьмяніць тэму, што можна тлумачыць як страх перад благою бясконцасьцю. (Бясконцасьці, дарэчы, баяліся старажытныя грэкі.) Парадоксы Керала вельмі часта заводзяць сюжэт ў ірацыянальны тупік, і кожны раз нехта з “валявых” герояў (Чэшырскі Кот, Грыфон) прапаноўвае зьмяніць тэму. Такі прыём можна назваць прыватным выпадкам *deus ex machina* (Бога з машыны) — грэкі яго ўжывалі тады, калі падзеі трагедыі не маглі атрымаць арганічнае разьвязкі. Назад
Жылі-былі тры сястрычкі… Леська, Алька і Цылька… — Прыватны жарт. Маюцца на ўвазе сёстры Лідэл. Назад
…недзе ёсьць адзін *такі ручай.* — Алесіна імкненьне да кампрамісу, згода прызнаць “адзінкавае” выключэньне, якое не пацьвярджае папярэдняе тэорыі, згодна з прынцыпам фальсыфікацыянізму К. Попэра дарэшты разбурае, “фальсыфікуе” гэтую тэорыю. Тут можна ўгледзець прыхаваную іронію, недавер да індукцыйнага вырашэньня, гарантыі ад абвяржэньня якога немагчыма даць. Назад
…што пачынаецца на М… — Фантасмагарычны, адвольны набор аб’ектаў, сярод якіх ёсьць і абстракцыі. Ідэя “намаляваць мноства” — адзін з прыкладаў кералаўскае вэрбальнае

фантастыкі. Падобная ірацыянальная рэіфікацыя сустракаецца ў Э. По ў “Заняпадзе дому Ашэраў”: “Калі ўдавалася калі-кольвек нейкаму чалавеку выразіць фарбамі на палатне чыстую ідэю, чалавек гэты быў Родэрык Ашэр”. Назад

Разьдзел восьмы.

Каралева пачырванела ад злосьці. — Керал імкнуўся паказаць каралеву ўвасабленьнем сьляпой, нястрыманай эмоцыі. Назад

...Бітамі служылі жывыя флямінга... — Стварэньне новых гульняў і перарабляньне старых — адно з захапленьняў Керала. Гульні ў казках Керала, як заўважае Дэлёз, ня маюць правілаў, пераможцаў і адказнасьці, што робіць іх “ідэальнымі гульнямі”. Назад

У Ката таксама можа быць свай погляд на караля. — Гэтая ангельская прымаўка азначае, што пэўныя рэчы чарналюду нельга забараніць. Назад

Разьдзел дзявяты.

Ва ўсім ёсьць нейкая мараль... — Можна заўважыць, што самыя прывабныя героі Керала часьцей за ўсё наміналісты. Княгіня да такіх не адносіцца, таму яна, як крайняя філязофская рэалістка, эсэнцыялістка, у кожнай рэчы шукае існасьць, мараль, “дбае пра сэнс”. Але імкненьне знайсьці глыбіню рэчаў, слушна заўважае Дэлёз, абяртаецца шматмоўнасьцю, рэгрэсам у бясконцасьць: “Мараль кожнага сказу складаецца зь іншага сказу, які абазначае сэнс першага”. А “калі Алеся маўчыць, княгіня бяззбройная”. Дарэчы, патрабаваньне маралі ад кожнага мастацкага тэксту было характэрна для клясыцыстаў і сацрэалістаў. Назад

Каханьне — пачуцьцё, што ў рух прыводзіць зоры... — Цытата з “Боскае камэдыі” Дантэ. Назад

...падобнае прыцягваецца да падобнага. — “Падобнае падобным” пазнаецца, лічыў Эмпэдокль. Назад

...гарчыца не падобная да флямінга. — Гл. увагу да сёмага разьдзелу пра “загадку” Шапавала. Назад

...ніколі не імкніся... — Доўгае, няўцямнае выказваньне, якое ў якасьці “прасьцейшага” прапануе Княгіня, характэрна для яе рэалізму. Падобныя выразы, зь якіх зьдзекуецца Попэр, на кожным кроку сустракаюцца ў Гегеля. Кажуць, быццам аднойчы

Кант зьвярнуўся да Гегеля з просьбай, каб той выклаў сваю філязофію карацей, папулярней і па-французку, на што Гегель пакрыўджана адказаў: “Маю філязофію нельга выкласьці ні карацей, ні папулярней, ні па-французку”. Назад

Гэта тое, з чаго робіцца Недачарапахавы Суп… — Недачарапаха (Mock-Turtle) паходзіць ад Mock-Turtle soup — супу, які толькі па назьве зьвязаны зь зялёнаю марскою чарапахай, а насамрэч варыцца зь цяляціны. Таму Недачарапаху з часоў Тэніэла і малююць з прыкметамі каровы. Назад

Неўзабаве яны пабачылі Грыфона… — Грыфон — мітычная істота з галавой і целам ільва і крыламі арла. У Сярэднявеччы ён сымбалізаваў злучэньне Бога і чалавека ў Хрысту, у Дантавым “Чысцы” грыфон цягне калясьніцу — Царкву. Назад

…выкладаліся французская мова, музыка і мыцьцё… — Гэтакі пералік быў пазначаны на ангельскіх рахунках за наведваньне школы, дзе плата за школьныя заняткі стаяла ў адным шэрагу з платаю за паслугі пральні. Назад

До’ ўжо пра школу! — Чарговае ўжываньне прыёму deus ex machina. Назад

Разьдзел дзясяты.

Пасьпяшаймася, — гарбуша кажа сябруку-каньку… — Пародыя на першы радок верша Мэры Гаўіт “Павук і муха”, які сваім парадкам быў пародыяй на даўнейшую песеньку. Параўнайма зьвярыныя гратэскі беларускіх аўтараў: “Камара з дуба цяжкі ўпадак” Дамініка Рудніцкага і “Мушка-Зелянушка і Камарык-Насаты тварык” Максіма Багдановіча. Назад

Зорка Хімэра ўзышла пад вадою… — У арыгінале пародыя на верш Айзэка Ўотса “Гультай”. Назад

Мой родны суп, як ты мне мілы… — У арыгінале пародыя на песеньку Джэймса М. Сэйлза “Зорка вячэрняя”. Назад

Разьдзел адзінаццаты.

Раз Дама Сэрцаў сьпякла пячэнцаў… — Першая страфа народнае песенькі. У беларускім перакладзе ўжытая папулярная некалі сылябічная страфа 10+7. Назад

…у крадзеным?! — усклікнуў Кароль… — Яшчэ адзін узор псэўдааргумэнтацыі. Назад

Прынясі мне сьпіс тых, хто сьпяваў на апошнім канцэрце! — Гл. разьдзел сёмы. Назад

Паколькі ня ўсе разумеюць выразу “заклікаць некага да парадку”... — Парадыйная рэіфікацыя яшчэ аднае абстракцыі ў духу кінікаў. Параўнайма ў Дэлёза: “Сафісты і кінікі ўжо зрабілі гумар філязофскаю зброяй супраць сакратычнае іроніі”. Назад

Разьдзел дванаццаты.

Ты зь ёю быў, сказалі мне... — Перапрацаваны варыянт вершаніснянеціцы Керала, які складаецца з суцэльных займеньнікаў. Назад

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Ноч перад Новым годам
Чароўны край
Агітатар
Саммі
Агацін тата

Міхась Машара

Ноч перад Новым годам

Сярэбрачыся зіяньнем дрыжачых зорак,
Ноч марозная ціха плыве.

Марозная ноч. Яскрава-чырвоны пурпур зары на захадзе даўным-даўно пагас, утапіўся ў густой імгле, што прадвесьніцай вялікага марозу залегла зь вечара цёмна-шэрым вянком на краі кругазору. Цёмна-сіняя глыбіня начнога неба

густа-густа засеяна малымі і вялікімі зоркамі, якія, углядаючыся ў малочную бель заснуўшых палёў, пераліваюцца і дрыжаць многахваробным зьзяньнем…
У паветры ціха-ціха… Так выразна чуваць далёкае тужлівае завываньне галодных ваўкоў, заядла-трывожную пераклічку вясковых сабак і пісклівы скрып саней спозьненага падарожніка. Праўда, часам узварушыць гэтую цішыню раскацістым глухім рэхам магутны трэск — гэта ўладар сьцюдзёнага царства, сівы Дзед Мароз, мацуе сваім вандроўным кіем крыштальна-сталёвыя масты рэк і азёр, а мо паліць з гармат “віваты” на спатканьне Новага году.
Але пакінем краскі зімы… і паглядзім лепш, як спатыкаюць яго людзі.
Вось на высокім беразе Дзісенкі далёка ад вялікіх гарадоў і дарог, захаваўшыся між лагчын і нязьлічаных узгоркаў, пад белым зімовым покрывам, здалёк — быццам статак белых авечак, бязладна рассыпаліся вясковыя хаткі. Зімовыя завеі ў сваім буйным разгульлі, навяваючы вялізныя гурбы каля платоў і сьцен, глыбака засыпалі іх сьнегам. Між гэтых хатак, уючыся з гурбы на гурбу, разьляглася вузкая вясковая вулка, да якой ад кожнай хаткі, як галінкі да дрэва, цягнуцца вытаптаныя ў сьнезе сьцежкі. Хаткі невялікія, некаторыя пахіліліся крыху на бок, быццам ад цяжару сьнегу, наваленага на саламяныя стрэхі. Адны — блізка ля самай вулкі, другія з сваімі хляўцамі, паветкамі і сьвіронкамі адбегліся значна далей у бок і там сядзяць, засыпаныя да стрэхаў сьнегам. Там-сям стаяць, як вартаўнікі, старыя вербы, раскінуўшы шырака сваё гальлё, прыбранае сьнежна-пушыстымі карункамі. Дзе-нідзе ля хаткі глыбака ў сьнезе стаіць маленькі садок з густым кустом вішняку…
Ясная навагодняя ноч ціха атуліла сьцюдзёным скрылом гэту вёсачку і як бы сама прытулілася да яе, падслухоўваючы жыцьцё гэтых пахілых хатак, што блішчаць на сьнежнай белі агнямі маленькіх замураваных марозам акон, быццам водблескамі далёкіх зьзяючых зор ці сьветлякамі ў траве вясновай парой.
А жыцьцё як бы замерла, як бы прытаілася тут у навагоднім чаканьні. Не відаць ніякага руху, не чуваць ніякага гулу вячэрняй працы. Зь ніводнае хаткі не нясецца звычайнае ў гэту пару вурчэньне калаўротаў сабраных на попрадкі пральняў, ані

цяпаньня тапара, ані пісклівага голасу пілы нешта майструючага гаспадара.

Часам скрыпнуць недзе дзьверы — і ў марознай цішы далёка нясецца, вылецеўшы адтуль, адгалосак адарванай гутаркі. Кожны селянін сёньня загадзя стараўся закончыць усю працу, бо ж вечарам Багатая куцьця. Гэта ж адно з гадавых урачыстых сьвяткоў, як Радаўніца, Дзяды і другія сьвяткі, урачыстая павага якіх уяўляецца ў тым, што, па законе адвечнага звычаю, кожны селянін стараецца зрабіць як найбагацейшую вячэру, дазваляючы сабе ня часта спатыканыя здабыткі ў яго жыцьці: смачна паесьці.
З гэтых сьвяточных звычаяў асабліва выдзяляецца роскашай навагодная куцьця — недарма ж яна завецца Багатай куцьцёй. Але мы адышлі ад мэты. Нам трэ жывыя абразкі жыцьця і настрою, у якім спатыкаюць жыхары гэтай вёскі Новы год.
Вось перад намі недалёка ад вулкі адна зь лепшых хатак гэтай вёскі ветліва блішчыць аганькамі акон, як бы запрашаючы да сябе змучанага падарожніка, абяцаючы гасьцінны прыём, цяпло і супакой.
Дык зойдзем… Хата досыць абшырная. Правы куток ад парога амаль увесь займае вялізная пабеленая вапнай печ. Супроць яе ў другім кутку, пад абразамі, пакрытымі белым, як сьнег, ручніком, стаіць маляваны чырвонай хварбай стол. Над ім вісіць лямпа. Ад стала ўздоўж вылепленых белай сьвежай паперай сьцен цягнуцца чыста вышараваныя лаўкі. Па вымытай падлозе ўсюды раскінуты дробна пасечаныя яловыя лапкі, ад якіх у цёплым паветры хаткі прыемна пахне смалой.
У двух другіх кутках стаяць засланыя ўзорнымі дыванамі ложкі. На адным зь іх ляжыць гаспадар, яшчэ не стары, поўны сіл мужчына.
Ён нядаўна прыехаў зь лесу, дзе вазіў на сплаў бярвеньне. Сёньня, завёўшы апошні воз, доўга ждаў платы за папярэднюю працу і дзеля гэтага спазьніўся. Прыехаўшы да дому, гаспадар крыху перакусіў і лёг спачыць.
Гаспадыня штось яшчэ прыбірае, штось варыць каля печы. А на печы ў белай палатнянай кашулі, зьвесіўшы зграбна апранутыя ў ліповыя лапці зь белымі новымі анучамі ногі на пяколак, сядзіць лысы зь сівой невялікай бародкай стары дзед — бацька гаспадара. Каля яго — унукі. Меншага свайго пестунка,

Юрачку — хлапца гадкоў трох, дзед трымае на каленях. Воддаль, на каптуры, падабраўшы пад сябе лапкі, мурлыкаючы сваю ціхую манатонную песьню, сядзіць любімец дзетак — чорны таўсты кот.
Дзеткам вельмі нудна чакаць на гэтую “багатую куцьцю”, для якой маці прышыкавала столькі прысмакаў. Каб хутчэй скаратаць час, яны засыпаюць рознымі пытаньнямі дзеда.

— Дзядулька, а пашто кладуць на Багатую куцьцю на стол пад абрус сена? — пытаецца бальшак Янук.
Яму мінула ўжо восем гадоў, ён ужо ходзіць у вясковую школу — з чаго вельмі горды і паважна задае свае цікавыя пытаньні дзеду.
— Га?.. Што казаў?.. — пытаецца замест адказу дзед.
Ён крыху глухаваты. Янук панаўляе пытаньне.
— Сена… Сена… А гэта для таго, што Хрыстос нарадзіўся на сене.
— А дзядулька казаў, што на калядную куцьцю кладуць дзеля гэтага сена, а сёньня багатая, — дапытваецца Янук.
— Гэта ўсё роўна. Сена заўсёды на куцьцю кладуць дзеля гэтага, бо такі звычай здаўна, — тлумачыцца дзед.
Янук не зусім задаволены, хоча пытацца далей, але яго перабівае Галінка, меншая сястра Янука.
Цікавую гутарку дзетак перарывае маці, клічучы ўсіх за стол. Хуценька прыбеглі радыя дзеці, зьлез зь печы дзед, устаў бацька. На’т кот саскочыў з каптура, трэцца каля дзяцей, раз-пораз кладзе лапкі на стол, высоўвае свой ружовы нос і з захапленьнем нюхае смачны пах прысмакаў.
Чаго ж, чаго там на стале ні было! І мяса, і каўбасы, і аладкі, і салодкая куцьця… Са смакам елі і старыя, і малыя; мурлыкаючы ад здавальненьня, зьядаў і кот тое, што яму дзеці кідалі пад стол.
Але ж было ўжо даволі позна, усім хацелася спаць, а маленькі Юрачка на’т заснуў на руках у мамы. Толькі Янка, прытуліўшыся да бацькі, шаптаў яму аб сваіх жаданьнях і надзеях на тыя радасьці, якія павінен яму прынесьці Новы год. Але ж і яго вочкі былі шторазу больш сонныя, і ён ахвотна паслухаў мамы, якая, паслаўшы пасьцель, клікала дзетак спаць.
У хуткім часе ў хаце было зусім цёмна і ціха. Толькі праз вокны заглядалі ясныя зіхоткія зоркі… Глядзелі яны на тварыкі

дзетак, якія ўсьміхаліся ў сьне і летуцелі аб тым, што ім прынясе Новы год.
На канцы тае ж самае вёскі, згорбіўшыся ад старасьці, прысела пасярод гурганоў сьнегу малюсенькая хатка старэнькай жабрачкі. Ціха ў хатцы і сумна ў гэтую марозную навагоднюю ноч. Не гарыць у печцы, не відаць ніякага перадсьвяточнага руху, а дробныя замерзшыя шыбкі слаба мігцяць ад дрыжачага сьвету лучыны. У хатцы сьцюдзёна і панура… У куточку на ўслоне сядзіць, скорчыўшыся, маленькая, мо сямі-васьмі гадовая дзяўчынка — унучка старой жабрачкі. Яе парваная сукенка не закрывае худзенькіх ножак, а дрыжачыя ручкі моцна-моцна прыціскаюць да грудзей дзіравую хустку. Яе бабулька яшчэ не вярнулася з жэбраў. Дзяўчынка адна ў гэтых голых сумных сьценах засыпанай сьнегам хаткі. Ёй страшна… Страшна ад гэтых жудасных, лунаючых па сьценах ценяў змроку… Страшна ад погляду дзюрак-вачэй лысага сьвятога на абразе. Апошнюю лусту хлеба яна даўно зьела і цяпер на вячэру чакае бабульку. Сёньня Багатая куцьця, людзі добра дораць. Бабулька павінна прынесьці шмат хлеба, а пэўна, назьбірае і закрасы. Але вось нешта спазьнілася, не ідзе. Дзяўчынка час ад часу ўстае з услону і паглядае праз маленькую прахуханую ў зьмерзлай шыбцы дзюрачку. Мо, часам, ідзе бабулька? Але нічагусенькі не відаць, апрача белага сьнегу і маленькай латкі цёмна-сіняга неба, засеянага густа дрыжачымі зоркамі. Пасьля падыходзіць да дзьвярэй і, прылажыўшы вушка, слухае, ці не скрыпяць знаёмыя шагі… Не чуваць нічагусенькі. Толькі недзе ў кутку ці пад печкай скрабе мыш. “Чаму не ідзе бабулька? — думала дзяўчынка. — Пэўна прыстала, а мо заначавала дзе, спазьніўшыся! Не, не, не заначуе. Яна ведае, што чакае яе галодная ўнучка”, — дзяўчынка зноў ідзе да акна, ізноў доўга ўглядаецца ў сьнежную бель. У хатцы цямнее: дагарае лучынка. Дзяўчынка скідае дымячы агарак на зямлю, у чорную жалезіну сьветача затыкае другую лучынку і доўга грэе худыя скрэпшыя ручкі над зырка ўспыхнуўшым аганьком.
У хатцы сьцюдзёна… Замерзшая дзяўчынка бярэ з палка парваную дзяружку і лезе на не зусім яшчэ астыгшую печ, лажыцца, скорчыўшыся, і, каб хутчэй нагрэцца, нацягвае дзяругу на галаву.
Прыемнае цяпло памалу пачало абнімаць худзенькае цела

дзяўчынкі, і яна крыху павесялела. Тут ёй зусім ня страшна, а каб чаго пад'есьці, то было б зусім добра. "Ці ж гэта мне першыня быць галоднай! — думае яна. — Хутка прыйдзе бабулька, вось тады смачна пад'ем!" З гэтай думкай яна і засынае.

…У хаце стала зусім цёмна. Лучына дагарэла і згасла, толькі ў сьветачы блішчэў яшчэ незатухшы чырвоны вугаль агарка, які ў цемры выглядаў, як вогненае вока нейкай пачвары. Час ад часу па хатцы зь піскам прабягалі мышы ды зь печы неслася роўнае дыханьне дзяўчынкі.

Сьпіць дзяўчынка, і сьніцца ёй, што нарэшце прыйшла бабулька, а яна, жыва саскочыўшы зь печы, пачала памагаць бабульцы зьнімаць вялізныя, туга нечым напакаваныя торбы. Рада дзяўчынка: зьнік недзе страх адзіноцтва, дый хатка неяк дзіўна перамянілася: па сьценах ня поўзаюць даўгія цёмныя цені, на стале ясна гарыць лямпа.

Бабулька выкладае на стол шмат розных рэчаў: тут ёсьць і хлеб, і масла, і саланіна, і каўбасы, а торба ўсё яшчэ не пустая. З другой торбы бабулька вымае новую сукенку і чаравікі і дае ўсё гэта ёй. Пасьля дастае з запазухі шнурок чырвоных пацерак і, вешаючы іх на шыйку анямеўшай з радасьці ўнучкі, цалуе яе шчочкі сваімі зморшчанымі вуснамі, на якіх сьвеціцца ціхая ўсьмешка. Дзяўчынка аглядае прыгожыя падарункі і хуценька пачынае апранацца.

А тым часам бабулька ўжо разьвяла агонь на прыпечку, і па ўсёй хатцы расходзіцца прыемны пах і піск скварак. Не пасьпела дзяўчынка апрануцца, як на стале ўжо зьявілася сена, белы абрус, а на ім — хлеб, куцьця і поўная патэльня каўбас і скварак.

Садзяцца за стол; бабулька падкладае ўнучцы самыя смачныя кусочкі і пры тым міла ўсьміхаецца.

У гэты самы час, як дзяўчынка ўва сьне так радасна спаткала Новы год, па дарозе з далёкай вёскі ідзе дамоў старая жабрачка — бабулька нашай дзяўчынкі. Скрып, скрып — граюць марозную песьню дробныя частыя шагі па бліскучай выгладжанай санямі дарозе.

Бабулька прыстала і, як на грэх, спазьнілася, а да хаткі яшчэ не малы кавалак, вярсты дзьве будзе.

"Трэ было раней зьбірацца ў дарогу", — думае бабулька. Але ж

не заўсёды бывае “Багатая куцьця”, не заўсёды людзі так багата дораць. Трэ было з гэтага скарыстаць. Сёньня яна сабрала больш, чым за цэлы папярэдні тыдзень. Будзе з чым спаткаць Новы год, будзе чым пацешыць унучку. Толькі вось каб хутчэй дайсьці да вёскі…

Час ад часу бабулька затрымліваецца і, пазіраючы на бліскучыя зоркі, слухае, ці не скрыпяць ззаду сані якога-небудзь спазьніўца-падарожнага?.. Цішыня… Нічагусенькі не чуваць… Толькі моцна-моцна б’ецца сэрца, ды часам здалёк даляціць тужлівая нота галоднай ваўчынай песьні.

Ізноў ідзе далей бабулька, ізноў скрыпіць сьнег пад нагамі, а змучанае старое цела просіць адпачынку: ломяць плечы ад цяжкіх торбаў, як абцугі, мерзлыя хадакі ціснуць змучаныя ногі. У галаве мільгаюць адрыўкі думак: заўтра Новы год, што ён прынясе, што ён прынясе? Чым абдорыць?.. Гэтае пытаньне ўзьнікла вось так, мімаволі, бо запраўды яна нічога не чакае ад яго, даўно страціла надзею на паляпшэньне сваёй долі. Чаго ж ёй можна жадаць ад Новага году? Хіба аднаго: дачакацца зноў другога. Бо ж, паміма ўсяго, ёй ня хочацца яшчэ паміраць. Сама сьмерць яе не пужае, але пужае лёс, які спаткае яе маленькую ўнучку, калі яна астанецца адна. Вось, пражыць яшчэ хоць бы пару гадкоў, падняць яе на ногі, каб сама магла як-небудзь здабыць сабе кусок хлеба.

А над усімі гэтымі думкамі стаіць адно жаданьне: дайсьці хутчэй дамоў і сагрэць на печы старое, перамерзшае цела.

З гэтай думкай бабулька пачала спускацца ў глыбокі яр, які лёг цераз дарогу, а там за ім на гары пачнецца вясковае поле — скуль рукой падаць да вёскі. Нават аганькі можна будзе пабачыць. Бабулька апошнімі сіламі ўзьбіраецца на гару. Яна зноў на роўнай дарозе, ды яшчэ на сваёй, на вясковай. Вось яна нат выразна адрозьнівае слабое мірганьне аконца сваёй хаткі, дзе яе чакае малая ўнучка і цёплая печ.

Але чаму сэрца так моцна б’ецца, так цяжка дыхаць? Гэта гара вычарпала яе апошнія сілы… Ногі зусім ня хочуць ісьці далей. Адпачыць, адпачыць — просяцца змучаныя плечы; адпачыць, адпачыць — ные ўсё зьняможанае цела. А тут, як на спакусу, побач самой дарогі стаіць мяжовы капец з старым пахілым крыжом.

“Вось, толькі на адну хвілінку, — думае бабулька, сядаючы, — толькі перавяду дух, толькі хай заспакоіцца крыху сэрца, хай

набяруцца сілы змораныя ногі… Да хаткі ўжо недалёка… Дайду… А тым часам хто над'едзе…" — цешыць сябе надзеяй. А зоры, ясныя зоры ўсьцяж дрыжаць… Усё серабрыцца іх іскрыстым зьзяньнем малочная белізна сьнегу. Бабулька нат не агледзелася, як яе зьнямога перайшла ў дрымоту, і яна заснула. Адзіны міг — і ўсё перамянілася. Зьніклі дрыжачыя зоры, прапаў недзе белы сьнег. Яна нават ня чуе, што мароз ледзяніць у жылах кроў… Яна бачыць сябе не старой жабрачкай, а маленькай дзяўчынкай, поўнай радасьці і здароўя зь вясёлым чырвоным, як краска маку, тварыкам; бегае па полі, па лугох, паміж зялёных кустоў, а сонца, агністае сонца цалуе яе снапамі сваіх залатых касуль. З вышыні ліюцца на зямлю зычныя трэлі жаўрука…
Падыходзіць поўнач… Мароз усё мацнее. Старая жабрачка моцна сьпіць. Ёй, мусіць, цяпер зусім цёпла, бо яна ўжо ня туліцца ў сваю дзіравую вопратку. Уся яе фігура пахілілася крыху назад, а на заплюснутых вачох зіхацяць зорным блескам дзьве застыўшыя вялікія сьлязінкі.
Мо яна так глыбока задумалася?.. Не, яна сьпіць… Сьпіць моцна, апошнім сном…
(Заранка. Кніжка 1—2, 1928)

Мама

Чароўны край

Сыночку маленькі, ты ручку мне дай,
Увяду ця' ў чароўны, у нязьведаны Край,
Вузенькай мяжою мы пойдзем ўдваіх;
Так мякка, на'т крокаў ня ўчуем сваіх,
Так мякка, прыгожа, пахуча… ах рай!
Сыночку маленькі, ты ручку мне дай…

Глянь, жыта красуе — расуе кругом,

Русалкі-казыткі хаваюцца ў ём.
А зайчык, прысеўшы ля самай мяжы,
На жабу міргае: “Дзе я — не кажы”.

На лузе зялёным пан бусел стаіць,
Над ім ўецца кніга і кліча: піць-піць!
Шнур гусак на сонцы бліснуў, закрычаў,
Спусьціўся і ў лозах-чаротах прапаў.

На возера ў чыстай-празрыстай вадзе
Лілея свае карагоды вядзе…
Камарыкі роем “лявоніху” скачуць…
Ля берага вербы хістаюцца, плачуць…
Чаго яны плачуць? Ты сэрцам згадай…
Сыночку маленькі, ты ручку мне дай.
(Заранка, 1928, №4)

М.Таўбэ

Агітатар малюнак

Міколка Жук з малых гадоў выказваў агітатарскія здольнасьці. Яшчэ калі ў нас палякі былі, Міколка ўмеў лоўка крыкнуць: “Далоў палякаў”, або: “Хутка чырвоныя прыйдуць”. Высуне язык якому-небудзь златапагоньніку, і пакуль той, як ашпараны гэтай сьмеласьцю, ачухаецца, Міколка зьнікаў… А цяпер Міколка лічыць сябе ўжо й вялікім агітатарам. Нядаўна на зборы атраду правадыр сказаў:
— Трэба працаваць у сям’і. Трэба праводзіць агітацыю.
Гэтыя словы доўга абмяркоўваў Міколка і цьвёрда парашыў праводзіць агітацыю ў сваёй сям’і.
Агітацыя пачалася ўвечары, калі бацькі селі вячэраць.

Міколка тады пачаў:
— Таварышы, тата і мама! Вы яшчэ цёмныя элемэнты. Вы яшчэ верыце ў бога, якога ніколі не было… Вы не чытаеце газэт і г.д.
Агітаваў Міколка доўга, але агітацыя добра ня скончылася. Міколку здорава адлупцаваў за гэта бацька.
Усю ноч Міколка думаў: “Чаму гэта агітацыя так дрэнна скончылася?” У школе да яго падышоў таварыш, таксама піянэр, Ядавіцкі Міколка, і першым чынам запытаўся:
— Як агітацыя?
— І не гавары. Ня толькі адлупцавалі, а яшчэ ў атрад не дазволілі больш хадзіць… Цёмныя элемэнты, што казаць!..
На другім сходзе першым чынам зьвярнуўся Міколка да правадыра:
— Як гэта так?! Мы агітуем, а нас лупцуюць.
— Не зразумелі вы мяне. Тут трэба падыходзіць лоўка… Гаварыць бацьком, што вы робіце ў атрадзе, чытаць кнігі і г.д.
Доўга гаварыў правадыр. І доўга яго слухалі піянэры.
У Міколкі цяпер ёсьць дасягненьні ў працы ў сям’і. Яго бацька выпісвае газэты, чытае іх. Матка вучыцца ў Міколкі пісаць і цікавіцца працай у жаночым аддзеле… Дасягненьні маленькія, але для Міколкі яны вялікія. Калі нікога ў хаце няма, то Міколка пагражае кулаком у куток, дзе вісяць абразы, і гаворыць:
— Пачакайце трошкі, скора й вас ня будзе!
Агітатарам Міколка гэтак і застаўся, толькі ён цяпер агітатар з падыходам.

(Беларускі піонэр, 1926, №2)

В.П.

Саммі

1.

Саммі часта прыраўніваў свайго Саіба да бульдога. Атрымоўвалася вельмі ўдалае падабенства. У Саіба былі вялікія шчокі, маленькія круглыя вочкі — у бульдога таксама. Саіб быў злосны, як сабака, а бульдог… як бульдог. Калі Саіб быў злосны, ён біў Саммі стэкам, а бульдог кусаў… за голыя пяткі. Розьніца невялікая: ад стэка баліць сьпіна, ад зубоў бульдога — пяткі.

Зразумела, Саіб падобны да свайго бульдога. У гэтым у Саммі не было ніякага сумненьня. У Саіба заўсёды балеў жывот. Ён зьвярнуўся да дактароў, і дактары сказалі яму рабіць ванны і масаж. Саіб вялікі, вельмі вялікі абжора. За абедам Саіб зьядае цэлага фазана, выпівае вялізарную бутэльку элю.

Кожную раніцу Саммі даводзілася рабіць Саібу масаж. Гэта для Саммі было вельмі цяжка. У гэты час Саммі пацеў і моцна дыхаў. І нічога дзіўнага! — у Саіба быў вялікі валасаты жывот. Бедны Саммі! Ён пацеў, ён задыхаўся, а Саіб, падобны да бульдога, фыркаў, як бульдог.

2.

Бедны, бедны Саммі. Як цяжка жыць маленькім індусам пад блакітным небам сваёй і ў той жа час чужой Бацькаўшчыны! Раніцу, дзень і ноч Саммі за працай. Куды трэба зьбегаць — Саммі, трэба падаць Саібу эль — Саммі, трэба прыбраць памяшканьне — Саммі.

Саммі зь пер'якамі з райскай птушкі адганяе ад Саіба і яго жонкі камароў, і за ўсё гэта Саммі б'юць стэкамі. Саммі кусае бульдог. Саммі патрэбна было скаліць зубы, сьмяяцца, бо Саіб не любіў, калі Саммі сумаваў.

Калі Саіб канчаў свае справы ў габінэце — ён ішоў і клаўся на дыван, які стаяў пад навесам. Да яго прыходзіла жонка. Саіб з сваёй жонкай пілі віно, а ля іх стаяў бедны Саммі. Ён матаў над імі пер'ямі райскай птушкі. Саіб злаваў на нешта і біў Саммі стэкам па твары.

3.

Пасьля цяжкай дзённай працы Саммі ішоў, разьбітым і панурым, адпачываць у свой маленькі пакойчык. І вось тут ён многа думаў аб тым, чаму так бязьлітасна зьдзекуецца над ім

яго Саіб, чаму ён, гэткі маленькі, павінен зносіць усе крыўды цяжкага падняволенага жыцьця. Ён думаў, і разам з думкамі паўставалі сьветлыя, заклікаючыя да лепшага, мары. І гэтыя мары падказвалі яму, што недзе далёка ад блакітных нябёсаў яго айчыны ёсьць шчасьлівая і вольная краіна, дзе людзі жывуць аднымі імкненьнямі, аднымі пачуцьцямі, радасьцямі, адным жыцьцём. Так праходзілі ночы Саммі, але сёньня было іначай. У двары Саіба здарыўся нейкі перапалох, нехта прабег, скінулася з гучным звонам драбіна. Саіб усхапіўся. Бульдога не было. Ён кінуўся да Саммі, пачаў зваць яго, а Саммі сьніўся ў гэты час вельмі прыемны сон. Ён сьніў, што бег ад Саіба, а яго заклікала да сябе шчасьлівая краіна. Але ён губляў сілы, і Саіб бег за ім усё бліжэй і бліжэй. Раптам Саммі адчуў моцны пякучы боль на сваім твары. Ён усхапіўся, расплюшчыў вочы. Усе мары, усе прыгожыя і радасныя малюнкі, навеяныя сном, адляцелі ў нябыт. Перад ім стаяў злосны Саіб і пагражаў забіць Саммі за тое, што ён ня слухаецца свайго гаспадара. Саммі пачаў адгаворвацца, але адказам на гэта быў удар стэкам па твары. Саммі не стрымаўся і пракляў Саіба. У гэты час у хату прыбег бульдог. Гэта ён нарабіў гвалту на двары. Саіб зацкаваў бульдога на Саммі, і бульдог вострымі зубамі ўпіўся ў жывое цела хлапца. Саммі задыхаўся ад болю і ад злосьці. Саіб, лаючы ўвесь сьвет, выйшаў, а Саммі, разьбіты і скусаны, забыўся ў нейкім салодкім забыцьці помсты.

4.

Залаціўся ўсход. Сонца пунсовымі праменьнямі аблівала люстраныя вокны памяшканьня Саіба. Сам Саіб яшчэ ляжаў на ложку, соладка пацягваўся і пазяхаў. Сьпяшацца яму ня трэба было. Яго Саммі быў ціхі і заўсёды слухаўся Саіба, яго яшчэ можна было многа-многа разоў біць стэкам. Але Саіб памыляўся. Саммі зусім не хацеў яго слухацца. І ён слухаўся толькі затым, каб паказаць, што ён гэткі ціхі і пакорны. Яму надаелі балючыя ўдары стэку, вострыя зубы бульдога. Ціхай прыемнай усьмешкай яго заклікалі да сябе Джунглі. І ён усьміхаўся ім празь люстраныя вокны, як быццам хочучы сказаць:

— Я прыйду да вас, хутка прыйду!

І ён думаў, што трэба забіць Саіба, а тады — ідзі куды толькі

хочаш!
Раптам Саіб крыкнуў:
— Саммі!
— Эх, праклятаму Саібу трэба рабіць масаж! Ну, дык хай жа ён ведае, хто такі Саммі! Даволі ён сьмяяўся зь мяне, даволі біў мяне сваім стэкам!
Саммі рабіў Саібу масаж, а Саіб, падобны да бульдога, фыркаў і біў Саммі кулакамі. Саммі больш стрымаць гэтага ня мог… Усьміхнуўся на сонцы востры нож, і тлустае цела Саіба распласталася на ложку.
Не было больш стэка, не было зубоў бульдога, а быў шырокі прастор палёў.
(Беларускі піонэр, 1926)

Астапенка і Таўбін

Агацін тата

Быў у Агаты
П’яніца-тата.
Дома не начуе —
Ходзіць у піўную.
А на заводзе
Толькі працы шкодзіць.
Пасьля ночы п’янай
Не ўстае ён рана.
Гудок гудзіць,
А тата сьпіць.
Крычыць Агата:
“Уставай, тата!..”
А тата ў дванаццаць
Выходзіць на працу
Зь цяжкой
Галавой.

Шумяць варштаты,
Працуюць таты:
І Янкаў тата,
І Ганчын тата,
Міхалкаў тата,
Ігналькаў тата —
Усе ля варштатаў.
Агацін тата,
Як прыйдзе дахаты,
Пазяхае, размаўляе,
Вочы жмурыць,
Люльку курыць…
“Галава баліць!..”
А варштат стаіць.

…Вывесілі тату
На чорную дошку —
“Працаваць ля варштату —
Ня спаць на ложку!”
Падышла Агата
Ўвечары да таты.
Тата сёньня зрана
Быў зусім ня п’яны.
Сядзіць спахмурнелы
Вечар цэлы.
Кажа Агата:
“Слухай, тата,
Ты цяпер, выходзіць,
Лодыр на заводзе?!.
Ці ты будзеш так
І далей лайдак?…”

Нахіліўся тата
Прад малой Агатай,
Хаваючы вочы.
Павячэраў моўчкі.
Заўтра ўстаў ён рана
І, зусім ня п’яны,
Працаваў старанна

Ля свайго варштату.
Кінуў ён піўную
І цяпер працуе
Без прагулу тата.
(Беларускі піонэр, 1926, №10)

Часопіс "Беларускі піонэр" выдаваўся ад 1924 году.
У 1929—1941 гадах — "Іскры Ільіча",
ад 1945 году выдаецца пад назваю "Бярозка".

Падрыхтавала Наталля Анофранка.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Дзёньнік Севярына Квяткоўскага
Вытрымкі з запісаў у дзёньніку вучня СШ № 74 г. Менску Квяткоўскага Севярына (1980–1987 гг.)

Опоздал на урок математики.
Опоздал на десять минут!
Поведение на перемене неуд.
(Чтение) Не следил!
Развлекался после звонка.
Ужасно вёл себя до начала занятий.
Своевременно не на месте!
(Русск.яз.) Не сдал!
Дрался с девочкой.

Пришел без учебников!
Пришел на урок французского без словаря!
Нет дневника наблюдений!
Не выучил стих-е!
Нет примеров из д/з!
Неправильно выполнил домашнее задание!
Не выучил басню!
Выучить стих-е обязательно!
Нет ни одного дом. задания!
Плохо ведёт себя на уроке! Постоянно что-то жует на уроках.
Тов. родители! Ваш сын постоянно не готов к уроку. Нет нотной тетради.
Тов. родители, Ваш сын очень плохо ведёт себя на уроке.
Безобразно вёл себя на сборе отряда.
Пришел на физкультуру без формы.
Отлично работал.
Плохо работал на субботнике.
Опоздал на зарядку!
Товарищи родители! Подпишите, пожалуйста, дневник сына!
Поведение за неделю неуд. Прошу прийти родителям в школу.
Поведение во время самоподготовки неуд.
Не выполнил распоряжение кл. руководителя.
Много разговаривает!
Выучить глаголы!
Заполняй дневник регулярно!
Поведение на перемене неудовлетворительное.
На уроках поведение тоже неудовлетв. Северин не хочет отвечать за свои поступки.
Поведение на зарядке неуд.
Дом. раб. нет.

Дом. задание не выпол.
Дом. задание не всё.
Северин с группой не обедает, ходит во время обеда возле столов и мешает другим.
Не учит слова!
Почему не подаёшь дневник учителям на оценку?
Объявляется благодарность за участие в конкурсе “Защита профессии”.

Самовольно ушел с субботника.
Объявляется выговор за отсутствие на районном мероприятии.
Нет словаря!
Нетактичное отношение к дежурству по этажу.
Пришел без формы.
Работа на субботнике — “3”.
Сдать письменные работы по бел.яз. и лит.
Товарищи родители! Где словарь вашего сына?!
Безобразно ведёт себя на уроке!
Безобразно ведёт словарь!
Опоздал на урок.
Прошу привести в порядок прическу сына!
Играет в азартные игры в школе.
Дежурство по школе — “3”.
Систематически опаздывает в школу.
Политинформация. Не готов!
Объявляется благодарность за подготовку к конкурсу инсценирован. песни.
Опоздал в школу!
Объявляется благодарность за участие в соревнованиях!
Пришел без словаря!
Объявляется благодарность за участие в районных мероприятиях.
Опоздал на дежурство!
Не выполняет требований учителя.
В 19.00 состоится родительское собрание! (Экстренное).
Объявляется благодарность за участие в кроссе!
Ведение дневника — “2”.
Не умеет вести себя на зарядке!
Вызывающе вел себя на уроке ИЗО. На замечание учителя ответил: “Мне всё равно, я в кедах”.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 2 (22) – 2002**
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
[image] [image] [image] [

* * *

Жанчына ў цягніку
Сказала суседцы па купэ:
“Я тагда так мучылась, так страдала,
І я прасіла аб адном —
Штоб яму адплацілась цем жа,
І вот ціпер яво скруціла.
ТАК ШТО БОГ ЕСЬЦЬ”.

* * *

У фэтышысцкім клюбе ў Вашынгтоне
Жыла дзіўная марская істота,
Падобная да похвы і да кветкі
З тонкімі мясістымі пялёсткамі.
Яны ледзь калыхаліся ў вадзе
Вакол вузкай аксамітнай шчыліны.
Тая павольна адчынялася й сьціскалася
З толькі ёй вядомых прычынаў.
У іншым акварыюме плавалі акулкі
Памерам з добрага акуня,
Таксама цікавае відовішча,
Але да яе ім было далёка.
Я прыйшоў сьвяткаваць Новы год, сядзеў ды пацягваў піва.
Прыемная публіка ў скуры з мэталам, музыка “Ministry”
ды “Nine Inch Nails”.
Цётка вяла на ланцугу мужыка ў бліскучым чорным ашыйніку.
Нейкі дзядзька прывязаў да слупа дзяўчыну з аголенай сьпелай
дупай,
Пасьцёгваў па задніцы пугай, кароткай, зь мяккай скуры,
Крыху падобнай да той, зь якой у дзяцінстве я пасьвіў козаў.
“Хочаш яе лупцануць?” — спытаўся ў мяне мужык.
“Не, дзякуй”.
Я залез на маленькую сцэну каля слупа
Паназіраць за тварам прывязанай дзяўчыны.
Яна стагнала, як іншыя стогнуць ад ласкаў,
І вялікія смочкі напяліся, быццам іх нехта надзьмуў
(Замест станіка мела нейкія бліскаўкі),
Дакрануўся да смочкаў — цьвёрдыя, як мае быць.

— Сьцісьні мацней.
Я паслухаўся.
— Хочаш мяне пабіць?
— Ты гэтага хочаш?
— Так.
Я падышоў да мужыка.
Гэтым разам ён быў не такі ўжо ахвочы, сказаў пачакаць,
Потым ўсё ж такі даў мне пугу.
Я біў па дупе пару хвілінаў і лашчыў дзяўчыне міжножжа.
Мне падабалася; ёй, здаецца, ня менеў.
Потым я аддаў пугу і пайшоў далей піць сваё піва.
Хутка прабіла дванаццаць, і ўсім налілі па шампанскім.
А празь нейкі час, абыходзячы клюб,
Я заўважыў за шклом тую істоту,
Падобную да похвы і да кветкі
З ружовымі празрыстымі пялёсткамі,
Якія ледзь калыхаліся ў вадзе
Вакол вузкай глыбокай шчыліны.
Я стаяў там больш за гадзіну,
Гледзячы на першы цуд новага году.

* * *

А пятай раніцы я ехаў распальваць бітумную печку,
Адзіны пасажыр у першым аўтобусе.
Аўтобус спыніўся непадалёк ад дыспэтчарскай.
— Эй, братан, — паклікаў мяне кіроўца, моцна выдыхнуў.
— Ат міня сільна пахне?
— Ну, ёсьць малёк.
Ён дастаў нейкі балёнчык і папшыкаў сабе ў рот.
— А ціперь?
— Нармальна.
Мы пад’ехалі да дыспэтчарскай.
Вадзіла пайшоў запаўняць нейкі аркуш,
Вярнуўся празь некалькі хвілінаў,
І мы пакацілі насустрач новаму працоўнаму дню.

* * *

Міша марыў працаваць у ФСБ, у нейкім аналітычным аддзеле,
Але пакуль што мы разам мылі посуд і чысьцілі амэрыканскія
прыбіральні.
Яшчэ ён любіў Дастаеўскага і водку, але ня вельмі добра яе
трымаў —
Здароўе было слабое, таму ў ФСБ яму сказалі, што шанцаў
мала
Для студэнта-юрыста зь Ніжняга Ноўгараду.
Міша быў закаханы ў Дашу зь Піцеру,
Высокую, дзябёлую, цыцкастую дзяўчыну,
З рабаціністым харошым тварам і доўгімі сьветлымі валасамі.
Даша Мішы не кахала, Дастаеўскага не любіла, але з агідай
казала пра амэрыканцаў:
“Ніякай культуры, як прыемна адчуваць тут сябе эўрапейцам,
Нават якім-кольвечы зачуханым палякам”.
На што я ёй казаў, што ў палякаў культуры болей, чым у Расеі.
“Чаму вы ня хочаце далучыцца да нас?” — пытала яна мяне.
(Ішоў 94-ы год, хутка абралі Луку).
Дашу крыўдзіла, калі я тлумачыў усім, што я не расеец.
Мішу таксама крыўдзіла, але ён нічога не казаў.
Можа, трэніраваў вытрымку для ФСБ, а можа, зь сяброўскіх
пачуцьцяў.
А на выходныя Даша паехала ў госьці да вялікага тлустага
амэрыканца
На некалькі дзён, пакуль мы зь Мішам і Грэгам з Трынідаду
езьдзілі ў Нью-Ёрк,
Ад Мішавага запрашэньня яна адмовілася.
Потым яна скардзілася мне, што амэрыканец сквапны,
і трахацца ня ўмее,
І з самага пачатку быў ёй агідны.
Мне было дзіўна,
Бо, хоць Міша ня меў шмат грошай, я думаю, для Дашы ён
патраціўся б больш,
А хто лепей трахаўся, мне цяжка судзіць.
Не разумею расейскага патрыятызму,
Хоць Міша і Даша былі мне сымпатычныя.

* * *

Джону застаўся дванаццаты бой,

Каб атрымаць другую палоску на жоўты пояс,
Каб падняцца яшчэ на прыступку,
Пратрымацца яшчэ дзьве хвіліны.
Джон быў тоўсты дзябёлы азіят,
Можа, кітаец, а мо яшчэ хто.
Супраць яго выйшаў самы моцны баец клюбу.
Такое, напэўна, правіла іспыту кёкусін-каратэ.
Дакладна ня ведаю — я быў навічок, у той дзень меў
толькі два баі,
Але мне хапіла.
Сэмпай Юра з карычневым поясам быў вышэйшы за Джона
на галаву,
Важыў, пэўна, не нашмат болей, толькі тлушчу ня меў,
Але галоўнае, нагамі біўся, бы конь:
Сам бачыў, як ён калоў тоўстыя дошкі,
Якія трымалі на ўзроўні ягонай галавы,
І калі ён біў нагой мне ў “лапу”, прыціснутую да жывата,
Дыхаць было цяжкавата.
Юра хутка заваліў Джона нагой у печань,
Джон курчыўся на татамі нашмат даўжэй за пяць сэкундаў
(Значыць, прайграў бой і ня здаў іспыту),
Але сэнсэй гучна сказаў:
“Давай, Джон, падымайся, кумітэ”.
І празь нейкую хвіліну Джон падняўся.
“Падтрымайма Джона”, — сказаў сэнсэй,
І мы запляскалі ў далоні, і сёй-той крыкнуў: “Давай, Джоне!”
Ня ведаю, ці было тое падтрымкай.
Далей Юра гуляўся, як кошка з мышкай:
Два разы валіў Джона “вяртушкамі” нагой у галаву
(Але відаць было, што біў у чвэрць сілы).
Джон абодва разы падымаўся праз пару дзясяткаў сэкундаў,
І ўрэшце сэнсэй спыніў бой.
Мы зноўку запляскалі, крычалі: “Малайчына, Джон!”
Ня ведаю, ці прыдбаў ён другую лычку на жоўты пояс,
Спадзяюся, што так.

* * *

91-ы год быў на Каўказе ня самы лепшы,
Але, здаецца, і не найгоршы.

Мы прыехалі ўтраіх на вакзал у Мінводах,
Чакалі чацьвертую двое сутак,
Пазнаёміліся з турыстамі з расейскай глыбінкі,
Якія вярталіся дадому.
“Мы на перевал-то вышлі, — распавядалі яны,
А там-то люді з автоматамі.
Оні говорят: туда не ходіте!
Мы і не пошлі”.
Нарэшце мы ня вытрымалі, паехалі ў горы.
Наша чацьвертая прыехала з Крывога Рогу праз пару гадзінаў,
У Мінводах пераблытала аўтобусы, паехала замест Карачаеўску
ў Чаркеск,
Дагнала нас праз два дні на маршруце,
Вясёлая, баявітая хахлушка,
Я быў дужа рады,
Тым болей што іншая дзяўчына ў нашай групе
Была амаль поўная супрацьлегласьць —
Млявая, рамантычная і ня дужа цяглівая,
Даводзілася забіраць у яе частку рэчаў
І падцягваць на больш-менш цяжкіх пад’ёмах.
Дзе б нам ні сустрэліся людзі, нас віталі гасьцінна:
“А, бэларусы, харошіе людзі!”
Толькі паўсюль казалі:
“Туда нэ хады, там плахіе люды.
Будут вас стрэлят, фотаапарат забырат”.
Фотаапарата мы ня мелі.
Можа, таму, калі мы прыходзілі туды, куды нам хадзіць ня
раілі,
Нас зноўку віталі гасьцінна,
І зноўку папярэджвалі наконт злобных суседзяў.
Аднойчы мы залезьлі на няправільны перавал
Вышэйшай катэгорыі, чым нам было трэба.
Спускацца наперад было небясьпечна,
Вырашылі крыху вярнуцца й заначаваць пад перавалам,
Ужо цямнела.
“Рібята, я хацела бы прачітаць сьціх”, —
Сказала нашая рамантычная дзяўчына,
Мы моўчкі пагледзелі на яе,
Яна пачала прамаўляць верш Еўтушэнкі,
Някепскі, але як для мяне, дык ён гучаў там, нібы жаба ў мёдзе,

У каўкаскім сутоньні, сярод сьнегу і камянёў.
Мы моўчкі даслухалі, рушылі ўніз
І хуткім часам паставілі намёт
На маленькай камяністай пляцовачцы.
Кажуць, што ўначы побач усё цокалі дзікія козы,
Сам ня чуў, спалося занадта добра.
А празь некалькі дзён нашая рамантычная дзяўчына
Знайшла на стаянцы некім пакінутую вайсковую біклажку
І падаравала мне, сказала, што я ёй дужа дапамагаў.
Так што, калі стары Еўтушэнка прыехаў у наш унівэрсытэт
У Паўночнай Караліне напрыканцы дзевяностых,
Я схадзіў на сустрэчу зь ім бяз злых успамінаў.

* * *

Сьляпыя ўлезьлі ў аўтобус, трымаліся за рукі —
Жанчына й мужчына гадоў па 45.
Наперадзе йшлі два сабакі-павадыры
Вялікія й прыгожыя — руды ды чорны,
Абодва з разумнымі яснымі вачыма.
Твары сьляпых былі агідныя й дурныя.
Невідушчыя вочы, бы шэрыя яйкі,
І целы, як мяхі зь пяском.
І толькі рукі гэтых людзей
Былі на дзіва прыгожыя:
Жаночая рука ў абдымку з мужчынскай
Трымалі больш цяплыні, чым увесь наш аўтобус,
Што мчаў невядома куды.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса

Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Юрась Пацюпа*

---

* *Частка з гэтых вершаў напісаная пад уплывам працы над "Рытмалагічным трактатам", дзе робіцца спроба зрэабілітаваць сылябіну. У "Зьніклай чыгунцы" ўжытая мадыфікацыя каламыйнавага вершу, якая сустракаецца ў Я. Купалы, К. Каганца ды Ц. Гартнага і якую не прачыталі адэкватна нашыя вершазнаўцы. А "Твае валасы" напісаныя пяцідольнікам першым, што раней існаваў толькі тэарэтычна* (**Аўт.**)

Пастараль

Я будаваў над рэчкай дом
з сухіх пясчынак,
а ты з аблокаў за акном
кашулі шыла.

Аднойчы дзеці у вадзе
разьбілі месяц,
асклепкі ў ветру ў барадзе
зазьзялі весела.

Прыходзіць ноч у кажусе

з травы зялёнай
і кажа: — Вецер разьнясе
ваш дом з праклёнам.

— У нас на небе пчолы ёсьць
і з ромам соты,
гасьцінца, — кажам, — ветру дасьць
апостал Пётра.

Мы пелі зь ветрам з таго дня,
на хвалях спалі,
і падплывалі рыбы з дна —
нас казыталі.

І мы сьмяяліся у сьне,
як бэз, пахучым,
у сьне, дзе вершы ёсьць усе —
бяры што хочаш.
2. 08. 2001 г.

Зьніклая чыгунка
думка
Азёры—Горадня—Парэчча

Гасьне дзень, зьбіўся цень
у траве заспанай.
Па вадзе ноч ідзе,
сьцелючы туманы.

Там сьляпыя слупы
ў возеры чарнеюць,
на слупох мох залёг,
рэйкі не бялеюць.

Далей тор, што прастор
расьсякае гулка.
Сьпіць барак, гэта знак —
быў вакзал з чыгункай.

Уначы птах крычыць,
глянь! — нібы сьвітае.
Без атос уразнос
цягнік пралятае.

Вось цягнік борзда зьнік,
не пакінуў дыму.
Даўшы сьвіст, машыніст
дзьвярамі ня грымнуў.

Плыў з акон гоман-звон,
быццам бы з магілы,
тлум паноў, бляск абноў,
сьмех паненак мілы.

Тмте-б-тмте сеў паэт,
сам Іван Піліпаў —
тых пуцін важны чын,
ды мундзір нязвыклы...

Тутака цягніка —
як і не бывала.
Толькі жвір, нібы ў вір
дарога запала.

Духата: тах-тах-тах! —
нясецца з-за гаю.
Процьмай воч глядзіць ноч
і ціха ўздыхае.
4. 06. 2002 г.

Твае валасы

Там, па-за цёмна-бэзавымі раўнінамі,
мора тваіх рассыпаных валасоў,
ноч аклікае крыкамі лебядзінымі
сны мае, растрывожавае ізноў.

Сьняцца мне зацалованыя, каханыя,
дух мой яны займаюць, нібы віры,
з кветкамі пераплеценыя, ўздыханьнямі
ціхімі перапоўненыя: бяры!

Золата найцямнейшае і цякучае,
сьпелае, вельмі цяжкае, як іртуць,
кроплі яго пад месяцам сінім мучаюць
смагаю, толькі ў губы мне не цякуць.
23. 07. 2002 г.

* * *

У жонкі павінна быць многа імёнаў,
таемных, як імя Бога, прамоўленых уначы,
найменьняў для пальцаў, грудзей і ўлоньня,
каб летнім дажджом па целе яе цячы.

Няхай, як дрэва майскай лістотай,
што ўвесну сьмяецца і шалясьціць,
ад маіх пацалункаў, аддаваных употай,
яна не стамляецца штоночы цьвісьці.

Няхай пад рукамі ўспыхваюць зоры
ў рассыпаных па падушцы яе валасох,
а цемра густая, як добрае мора,
кранае пальцы доўгіх дзявочых ног.
3. 11. 2001 г.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса

Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Вольга Гапеева

***

па-ведамленьне
аб не-існаваньні
прыйшло
не-чакана
было лішне
выцягваць боты
ды йсьці на су-стрэчу
кожную голку
з маіх пазногцяў
павыцягвалі ўчора
зрабілася сумнай
ды бессэнсоўнай
вячэрняя кава
лужыны
мокрыя могілкі кропель-ападкаў
штодзённа
тут папаўняюцца
новымі жыхарамі

птушка
з адрэзанай лапкай
і вокам кіклёпа
сядзіць на падваконьні
ды чысьціць пёркі
жанчыны
змываюць штучнасьць
і ў сваіх ложках
чакаюць таго
чаго не адчуюць напэўна й заўтра
сьвяточны пірог
застанецца на дзень наступны
а я ўсё адно
пайду басанож
па тваім роце

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Сяргей Жадан

Гісторыя культуры пачатку стагодзьдзя
Ты шчэ сёньня адпішаш, датыкаючыся цёплых літар,
перабіраючы іх у цямрэчы, блытаючы галосныя й зычныя,
як друкарка ў старой варшаўскай канторы.
Цяжкія соты пісьма
ўжо цямнеюць тым золатам, зь якога сочыцца мова.
Ты пішы, адно не спыняйся,
прадрукоўвай пустот белiню, пратоптвай нямы чарнасьлед.
Ніхто ня вернецца з доўгіх начных блуканьняў,
і забытыя ўсімі смаўжы будуць гінуць у мокрай траве.

У белых сьнягах, бы ў сурвэтках, ляжыць Цэнтральная Эўропа.
Я верыў заўсёды лянівай цыганскай плястычнасьці,
бо ня кожнаму выпадае такі зацяганы шэлег.
Калі б ты паглядзела ў іх пашпарты,
што заносяць гарчыцаю ды шафранам,
калі б ты пачула іх разьбітыя акардэоны,
што патыхаюць скураю ды арабскімі спэцыямі, —
яны кажуць, што, калі ты ідзеш — куды б ты ні ехала, —

ты адно аддаляешся й ніколі ня будзеш бліжэй, чым ты ёсьць;
калі моўкнуць сьпевы старых грамафонаў,
зь іх выцякае змазка,
нібы тамат з прабітых бляшанак
з-пад супу.

Не за тымі дзьвярамі, не ў гарадох, прапаленых сонцам,
разрываецца кожнага ранку спрацаванае сэрца эпохі.
Час насамрэч мінае, але ж ён мінае так блізка, што ты,
прыглядзеўшыся, распазнаеш сьцяжэласьць яго валокнаў,
паўтараючы шэптам пачутыя ад яго сказы,
быццам хочаш, каб потым, калісьці, пазнаўшы твой голас,
можна было сказаць:
так паўставала эпоха,
так яна разварочвалася — цяжка, як бамбавоз,
пакідаючы згаслыя сонцы й перагружаныя камутатары,
разганяючы з плаўняў дзікія качкі,
што, разьлятаючыся, перакрываюць
грузчыкаў,
Бога,
баржы.

Выбіраючы курс навучаньня, між іншымі рэчамі
ты даведацца мусіла б —
на самой справе культура пачатку стагодзьдзя
ўжо адціснута венамі на тваёй маруднай руцэ,
укарэнена ў згінах тваіх тугіх валасоў,
абы-як перахопленых на вятры,
разьвеяных над пальцамі,
як струмені цёплай вады над рукамыйнікам,
як гліняныя каляровыя пацеркі над попельніцамі і кубкамі,
як асеньняе доўгае неба
над кукурузным полем.

Прадажныя паэты 60-х
Прадажныя паэты 60-х мусілі б цешыцца,
што ўсё скончылася так удала:
бо столькі было небясьпек,
а бач ты — выжылі, вярнулі крэдыты,

хіба што будуць смылець баявыя раны
падчас цыклёнаў,
нібы падчас месячніцы.

Прадажныя паэты 60-х возяць з сабою
вялікія валізы з жоўтае штучнае скуры;
спыняючыся ў гатэлях,
яны прытрымліваюць слухаўку плячом, нібы скрыпку,
а на іхных валізах стракацяць наклейкі рэклямы.
Віетконг, дзяўчынка, гэта й ёсьць нашае калектыўнае
падсьвядомае.
Што табе да мяне? — лёгка выкінеш скамечаную візытоўку.
Адною візай у пашпарце болей,
адною меней.

Некалі на засьнежаным аэрадроме
некаму зь іх прыгадаюцца ўсе іх лекцыі,
бэрлінскае радыё і масты цераз Віслу.
“Добра, — падумае ён, — добра,
гэта былі неблагія часы — нашыя прадажныя 60-я,
дарма што пасьля ў галаве
суцэльная пэдэрастыя і сацыял-дэмакратыя.
Нас вяла за сабою любоў,
любоў вырывала нам глянды,
як вырываюць слухаўкі з вулічных тэлефонаў.
Паэзія пішацца горлам,
ды гэтае горла безнадзейна застуджана”.

Паводле ўсіх законаў літаратуры,
паводле кожнай умовы ў падпісаных імі кантрактах,
яны напраўду змагаліся за свабоду,
а свабода, як ведама, вымагае,
каб за яе час ад часу змагаліся
ў акопах, лясох
і на бачынах незалежнай прэсы.

Гаворачы тут пра паэзію,
згадайма ўсіх тых, хто застаўся
на бруку і пляжах старых-добрых 60-х,
усіх, хто ня здолеў прайсьці да канца курсу рэабілітацыі

й над кім і цяпер праплываюць аблокі,
сваёю структурай падобныя да амэрыканскіх вэрлібраў;
згадайма ўсіх іх, бо тое, што вы называеце часам,
здаецца звычайнай разьніцай,
дзе выпускаюць кішкі — проста таму,
што гэта павінны рабіць менавіта тут;
і выжываюць па гэтым
хіба што прадажныя паэты
зь лёгкімі — разарванымі
ад любові.

Сэрба-харвацкая
Юная сэрбка пераходзіць вуліцу,
праходзіць
паўз асеньні базар з паразьвешаным сям-там таварам,
заўважае, што гэтай восеньню золата шмат у гародніне
і хусьцінах —
вунь яго колькі ў цёплай цыбулі;
шмат сьвятла ў рэстаранах,
дзе на сьценах вісяць
партрэты цэсара.

Цяпло гэтай восені, яно кранаецца і цябе,
і гэтая юная жанчына нешта шукае ў сваім заплечніку,
выкладае на стол то слухаўку, то аловак;
будзе табе зіма,
будуць табе і сьненьні,
але неба цяжэе штовосені
й хітры д'ябал
хапае сабе грэшнікаў,
як грубыя фінікі
з каляровых упаковак.

Корсткія славянскія сынтагмы;
яна апавядае, як купляла канвэрты ў тытунёвай крамцы,
як зайшла ў падземку
і галубы, зьлятаючы, біліся аб яе, нібы аб дождж;
калі верыць яе словам, ніхто не заўважае, як заходзіць сонца,
заўважаюць толькі, што ейныя скулы

трохі цямнеюць.

Паспрабуй цяпер растлумач ёй,
што гэтыя восеньскія гадзіньнікі,
калі іх не сабраць у час,
проста перасьпяваюць і пырскаюць
на адзежу й далоні сокам,
на які потым зьлятаюцца восы
й прабіваюць джаламі тваю скуру —
ажно да самога сэрца.

Прыбіральніцы калідораў
Павольна шкрабуць падлогу, як палубу,
старыя прыбіральніцы калідораў;
ты чуеш іхныя галасы на сходах —
яны баязьліва праходзяць паўзь сьцены,
доўгімі крукамі вылоўліваюць з вады
вадзяных пацукоў і горкія сьненьні.

Пакоі вакол перапоўненыя сутоньнем,
як крэйсэры вугалем;
прыбіральніцы калідораў
вышкрабаюць луску вострымі нажамі,
заганяюць цыганскія голкі ў ранішняе сонца;
канчаецца восень — і неба
такое цёмнае, быццам бы нехта паскідваў да купы
адцятыя курыныя галовы
і чорныя ружы.

Адмыўшы ўсю кроў,
яны зьбіраюцца на вакзалах, п'юць падагрэтае віно
й гавораць пра тое,
што рыба блукае ў Дунаі
й ня можа выйсьці на плыткаводзьдзе
без начных ліхтароў
з караблёў,
без галасоў зь берагу,
без тунэляў і лазаў
у яе чортавым лёдзе.

Польскі рок
Засынаючы, яна прыгадала раку —
недзе ў лагчынах сну, дзе яна забывалася ягоны твар,
халоднае рэчышча сьвяцілася зь сярэдзіны бронзай,
хоць плынь засыпала сьнегам;
пасьля выпаўзалі з туману старыя пасьляваенныя лякаматывы
й выходзілі рабочыя ў сініх джынсавых камбінэзонах.

Мы апынуліся па розныя бакі зімы,
і дыктарскі голас, злоўлены ў выпадковай таксоўцы,
яшчэ нагадае табе
васьмідзясятыя гады й радыё,
напоўненае польскім рокам;
рок-н-рол, які слухалі мэханікі ў чыгуначным дэпо,
рок-н-рол, які пералятаў цераз Карпаты,
праточваючыся праз паветра недзе на Раве-Рускай;
наш край не настолькі вялікі, каб у ім разьмінуцца,
наша паветра не такое бясконцае,
каб слухаць розную музыку.

Я думаю, што, калі б існавала прамая сувязь з Богам,
яна б адбывалася менавіта з дапамогаю
гэтых цёплых брунатных канвэртаў
з кружэлкамі польскага року,
з тонкімі драпінамі ад божых пазногцяў
на чорных палёх;
ты можаш пабачыць яго вінілавую скуру,
ты можаш адчуць яго клубнічную кроў,
змываючы пыл і
праціраючы дарожкі
губкаю з воцатам.

Спалоханыя ветрам птушкі,
супакоіўшыся, займаюць свае месцы
ў прамежках паміж ударамі яе сэрца,
ня ведаючы, што яна бачыць у сваім сьне,
пра каго яна забывае сярод сухога рэчышча;

вось яе жыцьцёвы груз — радзімкі на скуры і
праязныя білеты ў кішэнях курткі;

вось зіма перакоціцца з сопкі на сопку
і прыйдзе гарачая пара,
калі зь зямлі павырастае столькі розных рэчаў,
ажно паветра змушана будзе прыўзьняцца крыху вышэй,
каб не чапляць гэтых доўгіх высокіх сьцяблін,
што растуць ніадкуль і цягнуцца ў нікуды
якраз пад яе акном.

Пераклаў з украінскай Андрэй Хадановіч

Юры Андруховіч
Жадан

Сяргей Жадан паходзіць з найусходнейшай, якая толькі ёсьць, Украіны. Жыхары тых ускраін, дагэтуль карыстаючыся нявызначанасьцю ды яўнай праблематычнасьцю дзяржаўнай мяжы, у значнай сваёй частцы займаюцца чымсьці накшталт кантрабанды. Робячы зацяжныя рэйды ў глыбіні Эўразіі, яны не заўсёды ўсьведамляюць сябе вандроўнікамі ў чужой краіне: ляндшафты, мова й спосабы выжываньня нічым не адрозьніваюцца ад іхных. Толькі існаваньне мытняў і патайных дарог прымушае памятаць пра новую геапалітычную рэальнасьць. Загадкавага ў гэтым нічога няма. Загадкавым ёсьць зьяўленьне сярод іх Жадана.
Адкуль ён, чорт яго бяры, узяўся, гэты літаратурны гаўрош, герой пралетарскага маньерызму, дзіця індустрыяльных падзямельляў ды постсавецкага пастпанку?
Адкуль прыходзяць паэты, асабліва ў нашай брутальнай краіне, дзе бездань паміж імі ды астатнім народам робіцца проста-такі экзыстэнцыйнаю? Адкуль бярэцца гэтая патрэба — гаварыць ненармальнымі вершамі там, дзе ўжо ніхто ня чуе нават звычайнай мовы?
Я магу дапусьціць толькі адно: нехта, магчыма, зь неба ткнуў

пярстом кудысьці ў напрамку раённага цэнтру Старабельск і сказаў: “Ты, малец!” А далей усё адбывалася нібы й самапасам — харкаўскае сілавое поле, энэргетыка мёртвых паэтаў, блюзьнерства, каханьне, алькаголь, шуканьне дакладнае рыфмы. І — паэзія, гэтая прыгожая жэстыкуляцыя, гэтае жорсткае мужчынскае маўленьне без аніводнага смаркача — вершы роспачы, што самі ёсьць радасьцю, вершы безнадзейнасьці, што самі ёсьць надзеяй.
Пераклад з украінскай

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

2 шы дзеткі
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Франк Сысін

(Не)чаканыя ўкраінцы

Andrew Wilson. The Ukrainians: Unexpected Nation. *— Yale University Press: New Haven — London, 2000.*

ФРАНК СЫСІН — дырэктар Цэнтру даследаваньня гісторыі Украіны імя Пятра Яцыка пры Канадзкім інстытуце ўкраінскіх досьледаў Альберцкага ўніверсітэту (Эдмантан).

1

Вывучэнне гісторыі шмат якіх еўрапейскіх нацый сутыкаецца з адной праблемай: дзяржавы былі нетрывалыя, адміністрацыйныя межы мяняліся, народы перамешваліся. Ва Ўсходняй Еўропе цягам апошніх двух стагоддзяў людзі выказвалі лаяльнасць не столькі да дзяржавы, колькі да народу/нацыі, што часта прыводзіла да змены межаў, перападзелу насельніцтва і фармавання нацыянальнай дзяржавы як дамінантнага палітычнага ўтварэння. Прыкладам гэтаму — Украіна. Праўда, можна спрачацца, у якой ступені яна нацыянальная дзяржава.

Эндру Ўілсан у новай кнізе “Ўкраінцы: нечаканая нацыя” вырашыў засяродзіцца на гісторыі ўкраінцаў, а не тэрыторыі Ўкраіны ці ўкраінскіх і неўкраінскіх дзяржаваў ды палітычных утварэнняў, да якіх яна належала. Аднак ягоны падыход істотна адрозніваецца ад традыцыйных гісторый XIX і пачатку

XX стагоддзяў, якія намагаліся паказаць непарыўнасць развіцця ўкраінскага народу і ўкраінскай тоеснасці. Уілсан ставіць за мэту прасачыць перарывістасць гісторыі, акрэсліць нявыкарыстаныя магчымасці і дэканструяваць нацыянальную міфалогію. Ён даследуе тоеснасці, якім не ўдалося развіцца, пазычыўшы гэтую практыку ў сучаснага напрамку, што атрымаў назву альтэрнатыўнай гісторыі (contrafactual history). Уілсан сцвярджае: нявыкарыстаныя магчымасці мелі столькі ж шанцаў рэалізавацца, што і развіццё ўкраінскай тоеснасці. Ён даводзіць важнасць імперскіх (Польска-Літоўская дзяржава, Расійская імперыя, Савецкі Саюз) і панславісцкіх праектаў ды тоеснасцяў. Уілсан упэўнены, што так можна і нават трэба даследаваць любую нацыянальную гісторыю. Гэтая манаграфія — спроба растлумачыць свету (які, на аўтараву думку, лічыць Украіну “нечаканай нацыяй”), хто такія ўкраінцы.
На першы погляд здаецца, што аўтар гэтай кнігі стаіць на пазіцыях вучоных-мадэрністаў. Тыя ўпэўненыя, што нацыі пачалі ўзнікаць толькі ў канцы XVIII стагоддзя, і не згодныя з нацыянальнымі гісторыкамі XIX — пачатку XX стагоддзяў, для якіх мадэрністы знайшлі пагардлівую назву “прымардыялісты” (апошнім часам сярод іх апаненты вылучылі яшчэ “перэніялістаў” — тых, хто верыць у гістарычную значнасць этнічнай тоеснасці, што развіваецца ў нацыю). Класічныя нацыянальныя гісторыкі лічылі, што нацыі фармуюцца павольна і вызначальную ролю тут адыгрываюць народныя масы. Перш за ўсё сялянства, бо эліта ва Ўсходняй Еўропе часта асімілявалася моўна і культурна. Нацыянальныя гісторыкі добра ўсведамлялі сваю прыналежнасць да “нацыянальных праектаў”, але разглядалі гэтыя праекты як захаванне, аднаўленне ці завяршэнне сучасных і мінулых працэсаў. Яны прызнавалі, што ў даўнія часы нацыянальны фактар не адыгрываў істотнай ролі, аднак ім не прыходзіла ў галаву, што нацыя і нацыянальнасць узніклі толькі пасля Вялікай французскай або індустрыяльнай рэвалюцыі.

Тым часам мадэрністы бачаць у нацыянальна арыентаваных, часта нацыяналістычных гістарычных працах праецыраванне сучаснай нацыі ў мінулае, а таксама няздольнасць разгледзець яе ўзнікненне і развіццё ў кантэксце палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай мадэрнізацыі. У той час як савецкія марксісцкія

гісторыкі звязвалі развіццё катэгорыяў нацыянальнага з эканамічнымі сістэмамі і класамі, многія заходнія мадэрністы пасля нацыяналістычнага ўсплёску ў Еўропе ў першай палове XX стагоддзя пачалі лічыць пошукі нацыяў раней за эпоху нацыяналізму і амерыканскую ды французскую рэвалюцыі анахранізмам. Мадэрністы ўсё больш засяроджваліся на працэсах стварэння нацыяў элітамі, гэта значыць на "нацыянальных праектах". Але яны ўсё яшчэ разглядалі нацыі як рэальныя з'явы, што паўставалі ў спецыфічных гістарычных умовах Новага часу, калі вызначальнымі былі інтарэсы дзяржавы і сацыяльных групаў.

У апошнія дваццаць гадоў на класічных мадэрністаў усё больш ціснуць навукоўцы, якія ставяць пад сумненне само існаванне нацыі як гістарычна трывалай супольнасці і замест гэтага засяроджваюцца на ўяўленні або адкрыцці нацыяў у Новы час (Гобсбаўм, Андэрсан). Хоць большасць гэтых працаў пісалася пад уплывам марксізму, яны дапамаглі адасобіць даследаванне ўяўленай нацыі ад вывучэння сацыяльных і палітычных працэсаў мадэрнізацыі, што былі вызначальнымі для класічных мадэрністаў.

2

У цэлым Уілсан — мадэрніст, хоць у ягонай працы палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя ўмовы ўтварэння нацыі — ужо не самае галоўнае. Затое на першым плане — дэканструяванне нацыянальных міфаў і праекты стварэння тоеснасці. Гэта ўносіць у ягоную працу элементы прымардыялізму, паколькі адкідае мадэрнісцкія абмежаванні нацыі перыядам, калі ўзнікаюць пэўныя ўмовы для іх фармаваньня. Адначасова гэта адкрывае шлях да постмадэрнісцкага разбурэння канцэпцыяў лінейнага і непарыўнага гістарычнага развіцця, аддаючы перавагу фрагментарнаму паказу мінулага як скарбонкі, адкуль сучаснасць пазычае матэрыял для міфатворчасці. Магчыма, перанос увагі даследавання з нацыі ці нацыяналізму і канцэпцыі тлумачыць, чаму Уілсан абыякавы да палітыкі паняццяў і не дае азначэнняў нацыі і народу. Увогуле, ён заблытваюць пытанне, тлумачачы назву "Нечаканая вясна" здзіўленнем Захаду перад з'яўленнем незалежнай Украінскай дзяржавы. Выглядае, што Уілсан прыхільнік англасаксонскай традыцыі, у якой "нацыя" і "дзяржава" — сінонімы. У Англіі ж

Ukrainian Nationalism in the 1990s: A Minority Faith. ***Cambridge,*** 1997. Пераклад на ***расійскую*** мову ***"Украинский***

ў наступным абзацы ён ужывае слова “нацыя” ў значэнні “народ”, а потым заяўляе, што нацыя — гэта культурная мадэль, і мэта аўтара — паказаць розныя канцэпцыі ўяўлення Ўкраіны. І тут ён не кажа пра ўкраінцаў. Не акрэсліўшы, што робіць супольнасць нацыяй ці народам, Уілсан не дае нам магчымасці ацаніць наступнае яго сцверджанне: “Магчыма, украінцы на нашых вачах робяцца нацыяй”, або: у 1917 годзе “база для ўтварэння новай украінскай нацыі была занадта малая”, тады “ўкраінскага народу яшчэ не было”. Большая дакладнасць палегчыла б ацэнку розных поглядаў і праектаў, якія прапануе Ўілсан. Ён не хоча даваць азначэнняў, як і ў папярэдняй кніжцы пра ўкраінскі нацыяналізм *.
Уілсан сцвярджае, што Ўкраіна, здабыўшы ў 1991 годзе незалежнасць, была нечаканай нацыяй, у прыватнасці, з-за сваёй культурнай, рэгіянальнай, рэлігійнай і моўнай неаднароднасці. Не думаю, што ў 1990—91 гадах гэтую праблему шмат каментавалі, паколькі ў той час за межамі Ўкраіны мала хто верыў, што Ўкраіна можа дасягнуць незалежнасці. Дыскусія пра тое, ці выстаіць Украіна, пачалася ўжо пасля здабыцця незалежнасці. Вядома, Уілсанавы паважныя папярэднікі ў Лонданскім інстытуце славянскіх і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў, Сетан-Уотсаны, не раз звярталі ўвагу на ўкраінскі народ яшчэ з самага пачатку XX стагоддзя. З бібліяграфіі і каментароў відаць, што ў англамоўнага чытача было нямала літаратуры пра ўкраінцаў і іхні нацыянальны рух. Але калі пад канец 70-х Мілан Кундэра перасцерагаў, што на вачах ягонага пакалення непрыметна знікае 40-мільённая еўрапейская нацыя, ён меў на ўвазе не толькі працэсы ў самой Украіне, але і зніжэнне зацікаўленасці ўкраінцамі ў другой палове XX стагоддзя ў параўнанні з першай. Таму ў пэўным сэнсе ўкраінцы ўсё ж былі ў 1991 годзе нечаканай нацыяй.

Нягледзячы на ўсе свае тэарэтычныя і аналітычныя хібы, Уілсанава кніга ўражвае сваім размахам: яна ахоплівае ад тэорыі этнагенезу да стасункаў Украіны з МВФ. У кнізе вытрымліваецца храналагічны прынцып (хіба што Кіеўская Русь разглядаецца перад дыскусіяй пра тэорыі паходжання ўкраінцаў ад старажытных народаў). Першыя сем частак (прыблізна палова кніжкі) прысвечаныя ўкраінскай гісторыі аж

па сённяшні дзень, з восьмага па дванаццаты раздзелы гаворка ідзе пра стварэнне незалежнай украінскай дзяржавы. Вельмі арыгінальны трынаццаты раздзел “Уяўляючы Ўкраіну: да тэорыі ўкраінскай геапалітыкі” расказвае пра розныя канцэпцыі Ўкраіны. Завяршаецца кніга высновамі пад назвай “Чаму Ўкраіна?”. Уілсан цікава супастаўляе матэрыял, цытуе безліч працаў (прычым добра арыентуецца ва ўкраінскай гістарыяграфіі апошняга дзесяцігоддзя), багата ілюструе сваю кніжку выявамі архітэктурных помнікаў, рэпрадукцыямі мастацкіх твораў, карыкатурамі, мапамі.

Нягледзячы на храналагічнасць выкладу, аўтар выкарыстоўвае пры разглядзе кожнага перыяду не толькі тагачасныя, але і пазнейшыя матэрыялы. Хоць кніга не прасочвае эвалюцыі палітычнага, грамадскага і культурнага жыцця за даўжэйшы час, яе перавага — у глыбокім аналізе праблематыкі асобных перыядаў. Шмат увагі аддадзена актуальнай праблеме расійска-ўкраінскіх узаемаадносінаў, хоць можна папікнуць аўтара тым, што, праектуючы іх сучаснае значэнне ў мінулае, ён перабольшвае іхнюю ролю на шкоду польска-ўкраінскім сувязям.

Уілсан пачынае кнігу з таго, што супастаўляе розныя версіі “старажытнай Русі”, за якую змагаюцца сучасныя ўкраінцы і расійцы, прыводзіць супярэчлівыя тэорыі еднасці і адрознасці земляў і насельніцтва Русі і, нарэшце, прыходзіць да высновы, што “пачынаць трэба з сумленнай ацэнкі супольнага мінулага ўкраінцаў і расійцаў”. Хоць і незразумела, як вызначыць “сумленнасць” усяго, што напісалі папярэднікі аўтара і ён сам, і ці дастаткова ва Ўілсана спецыяльных ведаў, каб рабіць аўтарытэтныя заключэнні. Сам ён больш схіляецца да думкі пра адзінства Кіеўскай Русі, якая належала абодвум народам да таго, як яны зрабіліся сучаснымі нацыямі. Ён сцвярджае, напрыклад, што “тры сучасныя ўсходнеславянскія мовы пачалі фармавацца як асобныя цэласнасці ў XIII—XIV стагоддзях, г.зн. калі Русь ужо была палітычна падзеленая”. Уілсан абапіраецца на працы Аляксандра Ісачэнкі, цытуе Гарацыя Ланта пра мову на Русі ў XI стагоддзі, але ніводнага разу не згадвае такога аўтарытэтнага навукоўца, як Юры Шавялёў, які лічыў, што протаўкраінскія дыялекты паходзяць ад агульнаславянскай мовы, а стараўкраінская пачала развівацца ў сярэдзіне XI стагоддзя. Калі перад аўтарамі падручнікаў паўстае праблема,

як абагульніць даследаванні ў галінах і перыядах, у якіх яны не спецыялізуюцца, яны звычайна намагаюцца абмежавацца мінімалісцкімі сцверджаннямі. Ад такой палемічнай працы, як Уілсанава, можна было б, прынамсі, чакаць, што яна азнаёміць чытача з асноўнымі канцэпцыямі, якія маюць вагу ў навуковым свеце. Але аўтар, прыводзячы думку пра тое, што ўкраінская і расійская мовы рана адгалінаваліся адна ад адной, замест таго каб цытаваць поруч з Ісачэнкам Шавялёва, спасылаецца на Івана Юшчука, “віднага дзеяча таварыства “Просвіта”. Праблема аўтарытэтаў і навуковага значэння прыведзеных поглядаў робіцца яшчэ больш прыкметнай у наступным раздзеле, дзе гаворыцца пра розныя тэорыі паходжання ўкраінцаў ад старажытных народаў (адзін з падраздзелаў мае яскравую назву “Ўкраінец Атыла”), а таксама пра паганства. Тут агляд канцэпцыяў публіцыстаў і містыкаў (Алеся Бердніка, Лява Сіленкі, Юр’я Каныгіна і г.д.), чые працы Ўілсан лічыць “цалкам неспасціжнымі”, пераплятаецца з поглядамі сур’ёзных вучоных — Міхаіла Грушэўскага, Вікенція Хвойкі, Вадзіма Шчарбакіўскага: і адны, і другія, на думку аўтара, імкнуліся абгрунтаваць непраўдападобную старажытнасць каранёў украінцаў. Спасылаючыся на газетныя артыкулы ўперамежку з навуковымі манаграфіямі, аўтар не спяшаецца дапамагчы чытачу разабрацца, што ёсць што, і паказаць, наколькі сур’ёзныя і папулярныя ідэі, згаданыя ў ягонай працы. Вядомая рэч, шмат якія з гэтых ідэй існуюць і маюць уплыў у пэўных колах, але перамешванне твораў містыкаў з акадэмічнымі даследаваннямі, пастаянныя спасылкі на “многіх украінскіх вучоных” і падобнае істотна змяншаюць каштоўнасць гэтага раздзелу.

3

Падзяліўшы Кіеўскую Русь паміж двума народамі і насмяяўшыся з тэорыяў старажытнага паходжання ўкраінцаў, Уілсан звяртаецца да XIV—XVII стагоддзяў. Ягоныя спробы інтэрпрэтацыі міфаў і культурных канцэптаў шмат у чым піянерскія, асабліва для неспецыялізаванай працы. Менавіта тут Уілсан міжволі праяўляе сябе як прымардыяліст ці перэніяліст. У трэцім раздзеле “Ні рыба ні мяса: паміж Польшчай і Расіяй” Уілсан расказвае пра літоўскі і польскі перыяды, асаблівую ўвагу звяртаючы на царкоўныя справы.

Выкарыстоўваючы найноўшую літаратуру пра гэтую эпоху, у прыватнасці працы Ігара Шаўчэнкі, Дэвіда Фрыка і Пятра Саса, ён закранае праблему ўзнікнення “рускага народу” як сацыяльнага, культурнага і палітычнага прадукту эпохі. Ён таксама разважае над загадкай таго, чаму характар гэтага прадукту аказаўся ўкраінскім, тады як беларуска-ўкраінская супольнасць так і не развілася ў сучасную нацыю.
Аўтар адыходзіць ад пераказу поглядаў пазнейшых гісторыкаў і публіцыстаў, які пераважаў у першых двух раздзелах, намагаючыся высветліць канцэпцыі нацыі таго перыяду. Гэта даволі цяжкая задача для неспецыяліста, і Ўілсан часта пускаецца ў неабгрунтаваныя абагульненні і нават робіць фактычныя памылкі. Аўтары больш традыцыйных падручнікаў намагаюцца абысці гэтую пастку, абмяжоўваючыся агульнапрынятымі поглядамі і асцярожнымі сцверджаннямі пра перыяды, у якіх яны не спецыялісты. Уілсан часам робіць гэтак жа, напрыклад, калі паўтарае пашыранае клішэ gente Ruthenus, natione Polonus. Ён перакладае гэта як “рускага роду, польскай нацыі”, хоць і ўказвае, што гэты выраз ахоплівае розныя значэнні словаў “нацыя” і “род”. Насамрэч значэнні *gens* і *natio* ў Рэчы Паспалітай XVI і XVII стагоддзяў былі амаль тоесныя. Гэтае ўжыванае ў XIX стагоддзі клішэ, якое падпарадкоўвала рускае паходжанне прыналежнасці да польскай палітычнай нацыі, у ранні Новы час не выкарыстоўвалася (хоць два падобныя выразы сустракаюцца ў Станіслава Арахоўскага). Марна спадзявацца, што Ўілсан усведамляе ўсю складанасць гэтага пытання. Але можна было б чакаць, што ён, пахваліўшы манаграфію Пятра Саса, возьме з яе больш і пакажа важнасць укаранення ўва Ўкраіне сучаснай тэрміналогіі, у першую чаргу паняцця “народ”. Гэта дазволіла б прасачыць, як народ, у дадзеным выпадку рускі, уяўлялі ўва Ўкраіне; што азначала з’яўленне гэтага паняцця для ўкраінскай палітычнай культуры ды тоеснасці пад канец XVI стагоддзя; як паўплывала запазычанае з Украіны паняцце “народ” на развіццё расійскай тоеснасці ў Масковіі канца XVII стагоддзя; і нарэшце, як усё гэта натхняла нацыянальны рух XIX стагоддзя. Відавочна, паўстае пытанне, ці сапраўды свет уяўленых нацыяў з’явіўся да Новага часу і як яго з’яўленне суадносіцца з пазнейшымі вобразамі нацый. Такі аналіз таксама дапамог бы праясніць фундаментальнае пытанне, якое закранае Ўілсан, адносячы

беларуска-ўкраінскую супольнасць да рускага народу.

Але такая задача, напэўна, знаходзіцца за межамі кампетэнцыі неспецыяліста. Таму сутыкаемся са сцверджаннем: “У той час паўднёвую Русь пачалі называць “Рутэнія”, маючы на ўвазе культурную супольнасць, блізкую і адначасна адрозную ад праваслаўнай Масковіі, аднак гэта была не адзіная нава”. Што тут зразумее англамоўны чытач, які не ведае, што “Рутэнія” — гэта проста лацінская форма слова “Русь”? Насамрэч пастаяннае ўжыванне назваў, вытворных ад Русі, уключаючы назоўнікі “русіч” і “русін”, было вызначальным фактарам звязанасці Ўкраіны са Старажытнай Руссю. У XVI і XVII стагоддзях Масковію ў Польска-Літоўскай Рэчы Паспалітай часта не называлі Руссю, а яе жыхароў — русінамі. Аўтару не хапае спецыяльных ведаў — гэта выяўляецца і тады, калі ён сцвярджае, што новаўвядзенні Пятра Магілы “ўключалі ў сябе ўласцівую Рэфармацыі практыку далучэння свецкіх людзей да царкоўнага жыцця” (на справе свецкія асобы ўдзельнічалі ў царкоўным жыцці ва Ўкраіне сама меней з XVI стагоддзя, а Магіла процістаяў гэтаму) і што “Польшча аслабела пасля няўдалай спробы скарыстаць “смуту” ў Масковіі” (тады як гаворка ідзе пра 20-я і 30-я гады XVII стагоддзя). Уілсан таксама піша, што Рыгор Каніскі, меркаваны аўтар “Гісторыі Русаў”, “ананімнай гісторыі, якая натхняла нацыянальны рух XIX стагоддзя”, быў беларускім архіепіскапам і гэта нібыта сведчыць пра трываласць беларуска-ўкраінскай супольнасці. Ніхто ўжо не лічыць аўтарам “Гісторыі” Каніскага, але нават калі б гэта быў ягоны твор, дык паходзіў Каніскі з Украіны: ён нарадзіўся ў Нежыне і нейкі час быў рэктарам Кіева-Магілянскай акадэміі.

4

Наступны раздзел Уілсан прысвячае гісторыі казацтва да канца XVII стагоддзя, фармаванню ў гэты час культуры і тоеснасці. Ён лічыць, што менавіта ў XVII стагоддзі закладаліся асновы сучаснай украінскай тоеснасці, паколькі старажытныя карані ўкраінцаў, пра якія гаварылася ў другім раздзеле, занадта няпэўныя, а ў перыяд Кіеўскай Русі іхняя тоеснасць не магла сфармавацца, бо гэта супольная з Расіяй спадчына. Уілсан таксама развівае думку пра тое, што менавіта ў гэты перыяд

адбылася культурная еўрапеізацыя Украіны, і тэзіс расійскіх гісторыкаў і Пятра Талочкі, якія лічаць гэты перыяд парою адыходу ад традыцыяў Русі. Матэрыялам, выкладзеным у гэтым раздзеле, аўтар валодае лепш, хоць іншым разам і робіць памылковыя абагульненні (“Зрэшты, казакаў аб’ядноўвала перш за ўсё праваслаўная вера”) ды перабольшвае ўласныя аргументы (сцвярджае, што вельмі мала казакаў было з Львоўшчыны і што пераважная большасць казакаў былі простага паходжання, не заўважыўшы заходнеўкраінскіх каранёў Сагайдачнага ці ролі магнатаў, такіх, як Дзмітро Байда Вішнявецкі). Уілсан таксама памыляецца, кажучы, што Панцеляймон Куліш, Уладзімір Антановіч і Вячаслаў Лыпінскі “крытыкавалі казацтва за няздольнасць стварыць сапраўдную дзяржаўнасць”. Цікава ўбачыць побач трох гісторыкаў з такімі рознымі поглядамі на казацтва, але калі Уілсан мае рацыю што да Куліша ў перыяд ягонага казакафобства, дык гэта аніяк не датычыць Антановіча і Лыпінскага. Народнік Антановіч не расцэньваў няздольнасць пабудаваць дзяржаву як нешта негатыўнае, а дзяржаўнік Лыпінскі лічыў, што ў часы Хмяльніцкага казакі дзяржаўнасць здабылі.
Разгляд XVII стагоддзя Уілсан завяршае сцверджаннем, што ў той час узнікла асобная мясцовая культура, але “зберагчы яе — гэта была ўжо зусім іншая рэч”. Гэтую ўстаноўку ён развівае ў наступным раздзеле “Украіна, Расія і Расійская імперыя” (“Ukraine, Russia and Rossija”). Тут гаворыцца пра стварэнне Расійскай імперыі і асіміляцыю мовы і тоеснасці расійскай эліты. Ён звяртае ўвагу на тое, што сучасныя нацыянальныя гістарыёграфы часта ігнаруюць трываласць і жыццяздольнасць розных імперскіх лаяльнасцяў і тоеснасцяў. У папярэдніх двух раздзелах аўтар паказаў украінскія карані гэтага працэсу, аналізуючы погляды ўкраінскіх думаннікаў XVII стагоддзя, якія даводзілі супольнае паходжанне ўкраінцаў ды расійцаў і выступалі за шчыльнейшыя сувязі з Масковіяй. У гэтым раздзеле паказана, як суадносіцца з фармаваннем украінскага нацыянальнага руху плынь за адзінства ўкраінцаў і расійцаў, якая ўзнікла ў XIX стагоддзі. Уілсан удала выкарыстоўвае біпалярнасць Гогаля і Шаўчэнкі, каб праілюстраваць розныя варыянты тоеснасці ўкраінцаў (або маларосаў) у XIX стагоддзі. Тут, як і ва ўсёй ягонай кнізе, уражваюць прыклады з літаратуры і мастацтва. Асабліва дарэчна ён згадвае драму

Лесі Ўкраінкі “Баярыня”, тлумачачы, чаму ва ўкраінскім нацыянальным руху перад першай сусветнай вайной з’явілася проціпастаўленне Ўкраіны і ўкраінскай культуры Расіі і расійскай культуры.

Уілсан пачынае з патэнцыйна плённага параўнання Ўкраіны і Шатландыі XVIII стагоддзя, даводзячы, што, нягледзячы на пэўнае падабенства, іхняя роля і функцыя ў большай дзяржаве (Расійскай імперыі і Злучаным Каралеўстве) значна адрозніваліся. Ён часткова тлумачыць гэтую адрознасць тым, што ў XVIII стагоддзі Англія і Шатландыя ўжо былі асобнымі нацыямі. Праўда, калі яны такімі зрабіліся, Уілсан не піша, адыходзячы тут ад перакананых мадэрністаў. Уілсан мяркуе, што існаванне дзвюх асобных нацыяў абумовіла неабходнасць стварэння супольнай брытанскай тоеснасці, але ў выпадку Расіі і Ўкраіны гэтага не адбылося, бо на той час яны яшчэ не былі нацыямі. І менавіта гэта выклікала змешванне і размыванне невыразных тоеснасцяў украінцаў і расійцаў. Больш дэталёвы параўнальны аналіз падабенстваў, у першую чаргу супастаўленне брытанскай і “ўсерасійскай” ды ангельскай тоеснасцяў, а таксама пагарджання з боку ангельцаў і расійцаў (велікаросаў) адрозненнямі паміж імперскай і ўласнай тоеснасцю, быў бы ў гэтым раздзеле вельмі карысны. Магчыма, гэта дазволіла б іначай зірнуць на тое, як канцэпцыі “рускага народу” і казацкай Гетманшчыны ператварыліся ў XVIII стагоддзі ў маларасійскую палітычную, сацыяльную і культурную мадэль, з якой задоўга да рамантызму XIX стагоддзя выкрышталізавалася ўкраінская нацыянальная тоеснасць.

Уілсанавай працы ўвогуле не стае аналізу вызначальнай ролі XVIII стагоддзя ў развіцці культуры ды тоеснасці Ўкраіны, няхай і пад назвай Маларосіі. Марна шукаць у ёй гетмана Піліпа Орліка і ягоную канстытуцыю, што адыграла такую важную ролю ў палітычным жыцці сучаснай Украіны. Хоць Уілсан і згадвае пра тое, што дзеячы нацыянальнага руху XIX стагоддзя маглі знайсці ў летапісах XVIII стагоддзя нямала звестак пра эпоху казацтва, ён не адзначае, што ў гэтых тэкстах была адлюстравана найперш тагачасная палітычная культура і тоеснасць.

Няўважлівасцю да XVIII стагоддзя можна растлумачыць і тое, што ва Ўілсанавай “Бібліяграфіі”, рэкамендаванай для

заходняга чытача, няма адной з найважнейшых англамоўных манаграфіяў па ўкраінскай гісторыі — кнігі Зянона Когута “Расійскі цэнтралізм і ўкраінская аўтаномія: Ліквідацыя Гетманшчыны. 1760—1830”. Не раскрыўшы складанага працэсу ўдзелу ўкраінцаў у стварэнні імперскай тоеснасці і культуры паралельна з развіццём украінскай, немагчыма зразумець усю дынаміку міфаў і тоеснасцяў на пачатку XIX стагоддзя (я сказаў бы, што, пачынаючы з XVII стагоддзя, украінцы няспынна ўводзяць у расійскі дыскурс паняцце народу/нацыі). Калі б Уілсан яго раскрыў, гэта дало б магчымасць увесці ў кантэкст такія працы, як “Гісторыя Русаў”, якую ён мімаходзь згадвае як “протанацыяналістычную”. Можна было б таксама не мяшаць у адну кучу Качубея, Безбародзькі, Кастамарава і Гогаля як “маларосаў”, проціпастаўляючы іх Шаўчэнку, які, на думку Ўілсана, стварыў альтэрнатыўны, г.зн. усеўкраінскі, сусвет (аўтар кніжкі не толькі памылкова паставіў побач “маларасійства” Кастамарава і Гогаля, але таксама не ўбачыў таго ўплыву, які зрабіла на Шаўчэнку “маларасійства” XVIII стагоддзя).

Даследчык яўна няўважлівы да Польшчы і польскіх уплываў, якія заставаліся вырашальным фактарам фармавання тоеснасці ўкраінцаў у царскай імперыі цягам XIX стагоддзя. Ён не раз згадвае Ўладзіміра Антановіча, але чытач так і не даведаецца пра польскае паходжанне гэтага выдатнага гісторыка і актыўнага дзеяча ўкраінскага руху, як і пра шчыльныя інтэлектуальныя сувязі Антановіча з “хлапаманамі” — рухам польскай шляхты ва Ўкраіне, а менавіта яны сфармавалі ягоны народніцкі светапогляд. Уілсан абрывае абмеркаванне польскіх уплываў у Наддняпроўскай Украіне занадта рана — нават для даследавання, якое робіць акцэнт на ўзаемасувязях украінскай і расійскай тоеснасцяў.

5

Праўда, палякі з’яўляюцца ў раздзеле пра ўкраінскія землі ў імперыі Габсбургаў. Засяродзіўшыся пераважна на аўстрыйскай Галіччыне (хоць ёсць таксама падраздзелы пра Букавіну, Закарпацце ды ўкраінскую дыяспару), Уілсан даследуе працэс, у якім ён бачыць працэс стварэння міфічнай структуры галіцкага ўкраінафільства. Ён мяркуе, што галіцкія русіны былі своеасаблівай tabula rasa, на якой можна было фармаваць

розныя тоеснасці і для якой яшчэ трэ было ўсталёўваць сувязі з украінцамі на Ўсходзе. Як русафільскую, так і русінскую тоеснасці Ўілсан лічыць аднолькава магчымымі альтэрнатывамі, але невысока ацэньвае тагачасную перспектыву інкарпарацыі русінаў у польскі нацыянальны праект. Пры канцы аўтар сцвярджае, што ў Галіччыне сфармаваўся радыкальны погляд на ўкраінскую нацыянальную тоеснасць, які ставіць расійцаў і ўкраінцаў па розныя бакі цывілізацыйнага падзелу. Уілсан прыпісвае Грушэўскаму вядучую ролю ў стварэнні новай “галіцкай ідэалогіі”, характарызуючы яе як “новае адкрыццё міфу Русі і выключэнне з гэтага міфу Расіі”. Асаблівую ўвагу ён звяртае на перайменаванне Русі ў “Русь-Украіну”, указвае на новы галіцкі “акцыдэнталізм”, які падкрэсліваў геапалітычную, культурную і расавую адрознасць украінцаў ад расійцаў. Гэтаму галіцкаму бачанню выключнасці Ўкраіны Ўілсан надае вялікае значэнне, але гэта, як і большасць ягоных сцверджанняў, занадта смелы і сумнеўны вывад.

Уілсан пераацэньвае новае адкрыццё Грушэўскім міфу Русі, які, на думку аўтара, ва Ўкраіне практычна знік яшчэ ў XVIII стагоддзі. Уілсан зазначае, што Грушэўскі абапіраўся на працы Антановіча і Кастамарава. Сапраўды, менавіта Антановіч у 1885 годзе парадзіў Аляксандру Барвінскаму выкарыстаць назву “Ўкраіна-Русь” у ягонай гістарычнай серыі. Аднак “міф” Русі стаў часткай украінскай традыцыі яшчэ на пачатку XIX стагоддзя ў “Гісторыі Русаў” і перш за ўсё ў працах Міхаіла Максімовіча. Уілсан нават не згадвае пра ягоную дыскусію 1850-х гадоў з Міхаілам Пагодзіным, які сцвярджаў, што ўсё насельніцтва Кіеўскай зямлі пасля мангольскай навалы перасялілася на поўнач, а на яго месца пазней прыйшлі продкі ўкраінцаў. Але ж гэтая дыскусія зрабіла барацьбу за спадчыну Русі цэнтральным пунктам ва ўкраінска-расійскай палеміцы. Пішучы пра Грушэўскага як пра галоўнага стваральніка новай “галіцкай ідэалогіі”, аўтар нідзе выразна не згадвае, што той прыехаў у Львоў з Наддняпроўскай Украіны, — а сярэдні заходні чытач напэўна не ведае пра нягаліцкае паходжанне і духоўнае станаўленне Грушэўскага. Гэта толькі адзін з момантаў Уілсанавага прымяншэння ролі Ўсходняй Украіны ў развіцці таго, што ён называе “галіцкай” ідэалогіяй. Чытач дазнаецца, скажам, што дыскусію пра расавае адрозненне

расійцаў і ўкраінцаў распачаў антраполаг Хведар Воўк, які “нарадзіўся ў Палтаве, але большасць даследаванняў праводзіў у Галіччыне”. Гэта праўда, што Воўк у 1904—1906 гадах зладзіў важныя экспедыцыі ў Галіччыне. Але гэты выхадзец з Палтаўшчыны і выпускнік Кіеўскага і Адэскага ўніверсітэтаў правёў нямала палявых даследаванняў і на Наддняпроўшчыне. Гнаны царскім рэжымам, Воўк уцёк за мяжу і пазней абараніў дысертацыю ў Парыжы. Пасля рэвалюцыі 1905 году вярнуўся ў Расійскую імперыю як хавальнік Этнаграфічнага музею імя імператара Аляксандра III і выкладчык факультэту антрапалогіі Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэту. Відавочна, што жыццёвы вопыт, здабыты ў Расійскай імперыі, значна больш паўплываў на фармаванне поглядаў Воўка, чым непрацяглае знаходжанне ў Галіччыне.
Тэндэнцыя да спрашчэння рэгіянальнага складу стваральнікаў украінскай нацыянальнай ідэалогіі XX стагоддзя праглядаецца таксама ў аповедзе пра ўкраінскую дыяспару. Уілсан толькі мімаходзь згадвае міжваенную дыяспару з “Вялікай Украіны” ў Празе, Варшаве, Парыжы, Берліне і іншых еўрапейскіх цэнтрах, якая адыграла такую важную ролю ва ўкраінскім палітычным, культурным і інтэлектуальным жыцці. Але нават у гэтых нешматлікіх згадках ёсць фактычныя памылкі: напрыклад, месцам пражывання Лыпінскага і Скарападскага названая Прага. Постаць Сымона Пятлюры ледзь згадваецца (у адрозненне ад Грушэўскага і Скарападскага) у аглядзе незалежных украінскіх дзяржаваў, а пра забойства Пятлюры на эміграцыі ў Парыжы, што зрабіла яго постаць легендарнаю, а яго самога — мучанікам, не згадваецца ўвогуле. Да паўночнаамерыканскай дыяспары, піша Ўілсан, пасля другой сусветнай вайны далучылася “новая хваля эмігрантаў, але зноў толькі з Заходняй Украіны”. Заходнікаў сапраўды было больш (асабліва пасля таго, як многіх усходнікаў, што хацелі застацца на Захадзе, саюзнікі прымусова выдалі Савецкаму Саюзу), але тое, што нямала новых эмігрантаў у ЗША і Канадзе паходзілі з Усходняй Украіны, адразу ж істотна адбілася на паўночнаамерыканскай дыяспары. Яна вырашыла актыўней змагацца з савецкай дэзінфармацыяй, бо цяпер сюды прыбыло шмат сведкаў галадамору 1932—33 гадоў. Украінскае інтэлектуальнае жыццё ажыўлялі такія вучоныя-ўсходнікі, як Юры Шавялёў, Ігар Шаўчэнка, Аляксандр Аглоблін і многія

іншыя. Вялікае значэнне мела таксама стварэнне Ўкраінскай свабоднай акадэміі навук. Мітрапаліт Мсціслаў Скрыпнік, колішні афіцэр арміі УНР, і мітрапаліт Іларыён (Іван Агіенка), колішні міністр ураду УНР, узмацнялі ўкраінскае праваслаўе ў Паўночнай Амерыцы; Уілсан расказвае пра іх у раздзеле, прысвечаным царкоўнаму жыццю Ўкраіны, але, здаецца, не звязвае іх са сваімі ж поглядамі на пасляваенную эміграцыю.

6

У сёмым раздзеле “ХХ стагоддзе: ад сялян да ўкраінцаў” Уілсан даследуе разнастайныя палітычныя рухі і ідэалогіі (часам называючы іх праектамі), што фармавалі Ўкраіну апошняга стагоддзя. Ён аспрэчвае погляды такога аўтарытэтнага даследчыка сучаснай Украіны, як Яраслаў Грыцак, які сцвярджае, што яно завяршыла фармаванне ўкраінскай нацыі. Уілсан указвае на розныя тоеснасці ды розныя варыянты яе будучага развіцця, якія робяць гэтае завяршэнне праблематычным. Асабліва каштоўны ягоны аналіз украінскага мадэрнізму 20-х гадоў як жыццядайнага перыяду ва ўкраінскай культуры. Аўтар пераканаўча паказвае, як у Савецкім Саюзе пасля ўкраінізацыі ўкраінская тоеснасць была заменена на лаяльную да СССР: у пэўнай ступені яна вярнулася да падпарадкавання расійскай тоеснасці і да ўз’яднання з ёй пад дахам славянафільства. У гэтай частцы кнігі Уілсан акрэслівае феномен, які пасля назаве “іншай Украінай”, што не прыняла мадэлі ўкраінскай нацыянал-дэмакратыі, але і не стала цалкам расійскай. Уілсан выдатна праводзіць межы паміж украінскай, савецкай, расійскай і славянскай тоеснасцямі ў савецкай Украіне ў сталінскія і паслясталінскія часы. Дзіўна, што аўтар не надае дастаткова ўвагі галадамору, рэпрэсіям і другой сусветнай вайне, якія знішчылі безліч людзей і культурных каштоўнасцяў ва Ўкраіне. Мала згадваецца і пра тое, як у другой сусветнай вайне паядналіся савецкі і славянскі міфы. Вяртаючыся да заходнеўкраінскай ідэалогіі і яе дачынення да Ўсходняй Украіны, Уілсан зноў церпіць няўдачу. У падраздзеле “Рафінаваны этнанацыяналізм” ён піша пра “радыкальную этнанацыяналістычную альтэрнатыву” ў міжваеннай Заходняй Украіне. Уілсан падкрэслівае панаванне антырасійскіх настрояў нягледзячы на тое, што “галоўным захопнікам” рэгіёну была Польшча. Даследуючы развіццё гэтай ідэалогіі,

Уілсан сцвярджае, што для “вядучага ідэолага новай тоеснасці Дзмітра Данцова (1883—1973) Польшча была прыгнятальнікам Украіны, а Расія была яе — як і ўсёй Еўропы — экзістэнцыйнай антытэзай”. Ён таксама згадвае пра ролю Яўгена Маланюка (называючы гады ягонага жыцця 1897—1939, хоць Маланюк пражыў у Злучаных Штатах да 1968 году). Абодвух Уілсан называе “заходнеўкраінскімі пісьменнікамі” і ніводнага разу не згадвае, што Данцоў, хоць у міжваенны перыяд жыў у Львове, нарадзіўся ў Мелітопалі і да 1908 года жыў у Расійскай імперыі, а потым эміграваў праз зняволенні і пераслед. У 1917 годзе ён вярнуўся і ўзначаліў прэс-бюро ва ўрадзе гетмана Скарападскага. Маланюк нарадзіўся на Херсоншчыне, быў афіцэрам арміі УНР і неўзабаве эміграваў, але, наколькі мне вядома, ніколі не жыў у Заходняй Украіне, а міжваенны час правёў пераважна ў заходняй Чэхаславаччыне і Варшаве. Празмерная ўвага Данцова і Маланюка да Расіі і расійска-ўкраінскіх стасункаў тлумачыцца якраз тым, што яны былі ўсходнікі, а не заходнікі. Перамога ідэяў усходніх украінцаў засведчыла сілу панукраінскага духу, хоць многія аўтары тлумачылі яе пранікненнем радыкалізму, тыповага для інтэлігенцыі Расійскай імперыі, у постаўстрыйскую Галіччыну. Іван Лысяк-Рудніцкі ў працы “Грамадска-палітычны светапогляд Уладзіміра Віннічэнкі” параўноўваў Віннічэнку і Данцова — сыноў паўднёваўкраінскіх стэпаў, якія мелі многія характэрныя рысы светапогляду расійскай інтэлігенцыі (ідэалагічны экстрэмізм, радыкальнасць рашэнняў, рэвалюцыйнае і таталітарнае мысленне), аднак развілі іх у розных палітычных напрамках — левым і правым. З Лысяком-Рудніцкім можна згаджацца, а можна не, але трэба адзначыць усходнеўкраінскі ўплыў на фармаванне ўкраінскага антырасійскага інтэгральнага нацыяналізму XX стагоддзя, каб пазбегнуць спрошчанага анахранічнага падзелу Украіны на “нацыяналістычны Захад” і “прарасійскі Усход”.

7

Няхай другую палову кніжкі, у якой апісваецца здабыццё незалежнасці і функцыянаванне ў новай украінскай дзяржаве палітычных, рэлігійных і эканамічных інстытутаў, ацэньваюць спецыялісты па гісторыі сучаснай Украіны. На маю думку, гэтая частка цалкам удалая (толькі ў раздзеле пра рэлігію

аўтар адчувае сябе няўпэўнена) і карысная для тых, хто хоча пазнаёміцца з сітуацыяй ва Ўкраіне. Спынюся на двух раздзелах, на мой погляд, самых арыгінальных.
У раздзеле “Ўяўляючы ўкраінцаў: адна Ўкраіна ці некалькі?” Ўілсан выяўляе розныя тоеснасці насельніцтва Ўкраіны, часта расплывістыя і мяшаныя. Чытачы, знаёмыя з ягонай папярэдняй кніжкай, заўважаць, што аўтар па-майстэрску аналізуе тоеснасць тых, хто не далучыўся да ўкраінскай нацыянальнай традыцыі, і ўжо беспадстаўна не аддзяляе іх ад украінскага нацыянальнага лагеру. Ягоны тэзіс, што вялікае значэнне для ўкраінскай тоеснасці мае савецкая спадчына, у святле апошняга дзесяцігоддзя выглядае пераканаўча. Аднак аўтар часта выказвае здагадкі там, дзе патрэбныя абгрунтаваныя аргументы, як, напрыклад, у падраздзеле “Посткаланіяльная Ўкраіна?”, дзе сцверджанне “Ўкраіна ніколі не была класічнай калоніяй” падмацавана толькі словамі гісторыка Ўладзіміра Грынёва.
Раздзел “Уяўляючы Украіну: да тэорыі ўкраінскай геапалітыкі” прадстаўляе розныя канцэпцыі Ўкраіны і яе месца ў разнастайных уяўных геапалітычных блоках — Еўропе, Цэнтральнай Еўропе, Еўраатлантычным свеце і Еўразіі. Тут разглядаюцца не толькі сучасныя геапалітычныя і цывілізацыйныя канцэпцыі (Сэмюэла Гантынгтана і Збігнева Бжазіньскага), але і шматлікія тэорыі першай паловы XX стагоддзя. З украінскіх нацыянальных канцэпцыяў Уілсан звяртаецца да прац Сцяпана Рудніцкага пачатку стагоддзя і Юр’я Ліпы часоў другой сусветнай вайны. Асабліва каштоўныя выкладзеныя тут погляды сучаснай Расіі на Ўкраіну, у прыватнасці ўключэнне Ўкраіны ў еўразійскую прастору (пазіцыя Генадзя Зюганава). У адрозненне ад папярэдняй кніжкі, Уілсан вельмі добра паказвае, што многім расійцам цяжка пагадзіцца з існаваннем украінскай нацыі, нават калі яны згаджаюцца з існаваннем украінскай дзяржавы, і гэта датычыць нават людзей з памяркоўнымі поглядамі, не кажучы ўжо пра тыя палітычныя колы, якія адмаўляюцца прызнаць за Ўкраінай законнае месца на геапалітычнай арэне.
Як і ў іншых раздзелах, аўтар грэбуе польскай традыцыяй, гэтым разам польскай думкай у Новым свеце. Так, Оскар Галецкі выказаўся за ўключэнне Ўкраіны ў “Цэнтральна-Ўсходнюю Еўропу” ў сваіх працах “Межы заходняй цывілізацыі:

гісторыя Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы” (1952) і “Гісторыя Еўропы: межы і падзелы” (1950), што выйшлі ў перыяд заснавання саветалогіі, славістыкі і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў у ЗША пасля другой сусветнай вайны. Відавочна, гэтаму паспрыялі ўкраінскія карані навукоўца і тое, што ён даследаваў гісторыю ўкраінскіх земляў XVI — пачатку XVII стагоддзяў. Таксама цяжка ўявіць аналіз вобразаў Украіны і сітуацыі ў рэгіёне без Ежы Гедройца і часопісу “Культура”.

8

Уілсан прачытаў шмат, але не глыбока. Ён сабраў велізарны матэрыял, аднак не праверыў яго дакладнасці. Аўтар піша з захапленнем, але, магчыма, з-за фрагментарнасці структуры кнігі, вывады і аргументы ў розных раздзелах не заўсёды стасуюцца паміж сабой.

Гэта відаць у характарыстыцы адной з галоўных адзнак украінскай нацыі — назваў “Украіна” і “ўкраінцы”. Бясспрэчна, тое, што Ўкраіна не мела сталай уласнай назвы, адмоўна адбілася на нацыянальным развіцці, а новыя назвы шораз ставілі пад сумненне непарыўнасць украінскай гісторыі. Сістэматычныя і традыцыйныя храналагічныя даследаванні па гісторыі ўкраінцаў нязменна закранаюць гэтую праблему, як, напрыклад, Грушэўскі ў першым раздзеле першага тома “Гісторыі Ўкраіны-Русі”. Аднак Уілсан, разглядаючы змену саманазвы галічан з русінаў на ўкраінцаў каля 1900 году, піша: “Гэтая тэрміналагічная змена арыентавалася на прэцэдэнты XVII стагоддзя і ўпершыню была ажыццёўлена ў Харкаве на пачатку XIX стагоддзя, яшчэ да таго, як яе папулярызаваў Шаўчэнка”. У заўвазе да гэтага выказвання гаворыцца, што “слова “Ўкраіна” сустракаецца ў летапісах з XII стагоддзя, але шырока ўжываецца толькі з канца XIX”. Я не ведаю ніводнага выпадка ўжывання слова “ўкраінцы” як нацыянальнай назвы ў XVII стагодззі, няма гэтага слова і ў творах Шаўчэнкі. Затое паняцце “Ўкраіна” ў XVII стагоддзі вельмі пашырылася, калі яно пачало азначаць не “пагранічныя землі”, а адну з назваў казацкіх земляў і Гетманшчыны, што ўтварылася пасля паўстання Хмяльніцкага.

Не зусім дакладны аўтар і ў выкладзе гістарычных міфаў. У якасці доказу аднаўлення сувязяў русінаў з Кіеўскай Руссю ў XVII стагоддзі Ўілсан прыводзіць цытаты накшталт: “З таго

пакалення войска, што… за Ўладзімірам, святым манархам рускім, ваявалі Грэцыю, Македонію, Ілірык". Кожны, хто ведае гэты перыяд украінскай гісторыі, пазнае фрагменты "Пратэстацыі" мітрапаліта Ёва Барэцкага 1621 году. Гэты фрагмент вельмі вядомы, паколькі Грушэўскі выкарыстаў урывак з яго як эпіграф да першага тома гісторыі ўкраінскага казацтва. Аднак у ім гаворыцца не пра русінаў, а пра казакаў, удакладняе прафесар Ігар Шаўчэнка, у якога Ўілсан бярэ гэтыя звесткі. Уілсан ведае пра гэта, што відаць з цытаты ў наступным раздзеле (с. 23). Сапраўды, калі ва Ўкраіне канца XVI — пачатку XVII стагоддзя вырасла цікавасць да гісторыі, сувязь са Старажытнай Руссю здавалася відавочнай: яна была ўвасоблена і ў польскай гістарыяграфіі, якая стымулявала тую цікавасць, і ў саміх руінах Кіева. Гэтай сувязі ніхто не ставіў пад сумненне аж да сярэдзіны XIX стагоддзя, калі Пагодзін паспрабаваў даказаць адваротнае. У той жа час, сувязь казацтва са Старажытнай Руссю — гэта свядомы "нацыянальны праект" украінскага духавенства XVII стагоддзя. Каб дэканструяваць нацыянальныя міфы, трэба іх выкладаць правільна.
Часам Уілсанавы высновы сумнеўныя. Ён сцвярджае, што ў польска-ўкраінскай вайне 1918—19 гадоў Польшча здабыла "лёгкую перамогу". "Лёгкая" яна была ці "цяжкая" — залежыць ад таго, з якога боку на яе глядзець. Але Ўілсан, вядома ж, не піша, што пра гэта думаюць палякі, — а іхняя маладая дзяржава страціла 10 тысяч байцоў (украінцаў загінула 15 тысяч). Цяжкасці ў барацьбе з арміяй, набранай толькі з трох з паловай мільёнаў заходніх украінцаў, былі вялікім ударам для польскай дзяржавы і грамадства, і менавіта таму палякі так жорстка ставіліся да ўкраінцаў, калі войскі Ўкраінскай Галіцкай арміі былі выцеснены за Оўруч. З іншага боку, падзеі ўкраінска-польскай вайны ўзмацнілі самаўпэўненасць і нездаволенасць заходніх украінцаў, таму новай польскай дзяржаве было вельмі цяжка дабіцца іхняе пакоры, не кажучы пра лаяльнасць. Лагеры інтэрнаваных падчас і пасля вайны, а таксама іншыя акты гвалту паглыбілі прорву паміж палякамі і ўкраінцамі. Ва ўводзінах Уілсан тлумачыць, чаму ён звяртаецца пераважна да расійска-ўкраінскай, а не да польска-ўкраінскай тэматыкі. Аднак наўрад ці гэта апраўдвае няўвагу да адной з найважнейшых падзеяў як для ўтварэння ўкраінскай нацыі ў XX стагоддзі, так і для ўкраінскай ды польскай нацыянальных

міфалогій. Тым больш што гэтая падзея вельмі істотная для развіцця “заходнеўкраінскага радыкальнага этнанацыяналізму”, якому Ўілсан надае такое значэнне.

9

Такім чынам, што дае Ўілсанава кніга для даследавання ўкраінцаў як нацыі ці народу, што новага яна ўносіць у гістарычныя дыскусіі ва Ўкраіне і як яна паўплывае на ўспрыманне Ўкраіны заходнімі вучонымі? Для ўласна нацыялогіі кніга не мае вялікай каштоўнасці дзеля браку інтэлектуальнай выразнасці ў вызначэнні прадмета даследавання. Аўтар не дае азначэння нацыі, таму незразумела, паводле якіх крытэраў ён сцвярджае існаванне ўкраінскай нацыі. Нежаданне бачыць гістарычнае развіццё элементаў народу/нацыі і правільна выкарыстоўваць прааналізаваны матэрыял надалей таксама змяншае каштоўнасць кнігі, якая прэтэндуе на даследаванне эвалюцыі ўкраінскага народу (напрыклад, як моўнай супольнасці або групы, якая адрозніваецца ад суседзяў) і/або нацыі. Таму чытач нават не зразумее, што ўкраінцы то набліжаліся да развітой нацыянальнай супольнасці (як у сярэдзіне XVII стагоддзя або ў 1920-х гадах), то аддаляліся. Нягледзячы на гэта, для ўкраінскіх навукоўцаў каштоўным ва Ўілсанавай працы можа быць і разгляд “альтэрнатыўнай” гісторыі, і ўвага да неўкраінскіх нацыянальных ідэалогіяў і тоеснасцяў. Заходні чытач знойдзе ў кніжцы багаты матэрыял пра ўкраінцаў, хоць тэндэнцыя прымяншаць узровень развіцця ўкраінцаў як нацыі можа трохі ўзмацніць скептыцызм адносна іхняй гістарычнай легітымнасці. Тым больш што дэканструкцыі Расіі і Польшчы на Захадзе яшчэ не было, хоць яна ўжо распачата ў апошніх працах такіх навукоўцаў, як Вера Толц.

Шмат хто ахвотна прачытае Ўілсанаву кнігу, і яна дапаможа глыбей зразумець сучасныя ўкраінскія рэаліі. Нават тыя, хто не пагодзіцца з Уілсанавай думкай, што “ўтварэнне [ўкраінскай нацыі] пачалося позна і дагэтуль працягваецца”, без ваганняў прымуць ягоныя доказы гістарычнай легітымнасці Ўкраіны ды ўкраінцаў і неабходнасці сур’ёзна ставіцца да іх. Безумоўна, кніга будзе мець істотны ўплыў на заходні вобраз Украіны. Таму і дзеля гэтага, і дзеля пытанняў, пастаўленых па-новаму, украінцам варта яе прачытаць — не заплюшчваючы вачэй на

немалую колькасць прыкрых хібаў.
Пераклаў з украінскай Сяргей Петрыкевіч
паводле часопісу “Критика”.
Друкуецца з ласкавае згоды часопісу і аўтара.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Лісты Васіля Рагулі да Юркі Віцьбіча

Васіль Рагуля нарадзіўся 16 ліпеня 1879 году ў вёсцы Ачукевічы Наваградзкага павету. Скончыў Маладачанскую настаўніцкую сэмінарыю (1898), затым — Віленскі настаўніцкі інстытут (1906). Падчас першай сусьветнай вайны служыў у царскім войску, потым — у Чырвоным войску. У 1921 годзе пасьля Рыскай дамовы вярнуўся дахаты. *“Удома я застаў толькі дзяцей. Жонка трагічна загінула — апалілася і памерла. На боты грошай не было, дый лапці не заўсёды былі цэлыя”*, — пісаў ён ва ўспамінах.

Выбарчая кампанія 1922 году штурхнула Рагулю ў палітыку. Ён быў абраны паслом у Сойм Рэчы Паспалітай. А ў 1925 годзе разам з Усеваладам Більдзюкевічам, Фабіянам Ярэмічам і Браніславам Туронкам заснаваў партыю Беларускі сялянскі саюз, што процістаўляла сябе пракамуністычнай БСРГ. У 1928 годзе Васіль Рагуля быў абраны сэнатарам, але па зьвінавачаньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці зьмешчаны ў турму. У 1930 годзе пасьля вызваленьня вярнуўся дахаты, дзе

да 1939 году займаўся сялянскай працай.
У чэрвені 1941 году яго, ужо настаўніка дзесяцігодкі, арыштавалі. Эшалён зь вязьнямі рушыў на ўсход, у невядомасьць, і толькі вайна зь немцамі выратавала ад сьмерці. Васіль Рагуля прыйшоў з-за Менску пешкі ў родныя мясьціны, дзе землякі абралі яго старшынём Любчанскай воласьці: *“Любча была першая мясьціна ў Наваградчыне, дзе быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг, які бесьперапынна вісеў да самага нашага адыходу на захад”*. Потым быў бурмістрам у Дзятлаве. Улетку 1944 году ён пакінуў Беларусь.
Тых палітыкаў і грамадзка-культурных дзеячаў — “пэнсіянэраў”, народжаных у XIX стагодзьдзі, што апынуліся на выгнаньні ў 1944 годзе, было ня так ужо і шмат: Леў Акіншэвіч, Радаслаў Астроўскі, Мікола Байкоў, Эдвард Будзька, Язэп Гладкі, Яўхім Кіпель, Франц Кушаль, Янка Станкевіч, Мікола Шыла… Але найстарэйшым зь іх быў Васіль Рагуля. У 1944 годзе яму было 65 год. У такім веку падавацца на чужыну... Не было паплечнікаў па БСС ці Беларускім пасольскім клюбе — яны ўсе загінулі або памерлі. Васіль Рагуля паціху адышоў ад усіх спраў, фіксуючы ўвагу на пісаньні ўспамінаў ды дапамагаючы пляменьніку Барысу. Стары сэнатар, жывучы ў Барысавым лювэнскім дамку, у аддзяку глядзеў ягоную дачушку. Потым старога забраў да сябе ў Нью-Ёрк сын Міхась. Там Васіль Рагуля і памёр 16 чэрвеня 1955 году.
Мэмуары пра палітычную дзейнасьць беларусаў у 20-х, запісаныя ў Лювэне, невялічкія, нават сотні старонак няма (надрукаваныя ў 1957 г. у Нью-Ёрку, перавыдадзеныя ў Менску ў 1993 г.). Аднак зьяўленьне кнігі, якую выдаў сын Міхась, справакавала палеміку ў эмігрантаў.
Рагуля, не зважаючы на аўтарытэты, апісаў беларускае палітычнае жыцьцё 20-х, пазначыўшы з горыччу ў прадмове: *“Я буду шчасьлівы, калі напісанае мною ўсьцеражэ нашых сучасных і будучых палітычных і грамадзкіх дзеячоў ад паўтарэньня памылак іх бацькоў”*. Ён пісаў пра хістаньні ад палянафільства да камунізму і наадварот, пра сваркі, камуністычны ўплыў, кволасьць нацыянальнага руху. Сам аўтар, у адрозьненьне ад Тарашкевіча, Луцкевіча, Астроўскага, зьмяніў погляды толькі аднойчы: *“…Да выбару ў Сойм быў русафілам, фэдэралістам з Расеяю, але не камуністычнай, дэмагогам, зацятым прыхільнікам дробнай сялянскай уласнасьці.*

*Ён [Рагуля — **А.Г.**] любіў у кампаніі выпіць, але не цярпеў тых, што зьяўляліся падвыпіўшы ў Сойм. Ён лічыў, што на беларускую справу можна браць грошы адкуль удасца, але не даваць за гэта ніякіх абяцаньняў*".

Іншым жа палітыкам дасталося, а найбольш — Антону Луцкевічу і Янку Станкевічу. "*Гэта [Антон Луцкевіч — **А.Г.**] быў чалавек зь вялікай хваравітай амбіцыяй, добры крытык, глыбокі знаўца беларускай літаратуры і слабы палітык. Кожнага, хто не пагаджаўся зь ягонымі поглядамі, ён уважаў за асабістага ворага і пісаў аб ім усялякія паклёпы, ня лічачыся з этыкай сапраўднага журналіста… Будучы арыштаваны ў справе Грамады, на допытах на пытаньне пра нацыянальнасьць адказваў: "białorusin-polak". Для ідэалёга Грамады — гэта непрабачальны грэх*". А вось пра Янку Станкевіча: *"Прайшоўшы ў Сойм… застаўся дзікім і не ўвайшоў ні ў адну беларускую групоўку, ды і яго ніводная і не прыняла б"*.

Янка Станкевіч, незадаволены ацэнкай падзеяў і асобаў, пачаў палеміку на старонках мюнхенскай "Бацькаўшчыны". За памерлага Рагулю заступіўся іншы беларускі пасол — Аляксандар Стагановіч...

У сваіх лістах Юрку Віцьбічу, якія мы тут друкуем, Васіль Рагуля апавядае пра сваё самотнае жыцьцё на эміграцыі.

16/II. 1951

Дарагі Юрка!

Шчыра дзякую за памяць. З усіх беларусаў, якія ў Амэрыцы, я атрымаў вестку ад Цябе аднаго. Усе забылі старога. Ідэя патрэбны быў падпісваць розныя паперы, падчас маімі поглядамі, але патрэбныя беларускаму вачэй далоў — і з сэрца вон. Сілы мае падаюць, засталося жыць. Сын[1] усё стараецца, каб сьцягнуць сябе. Я ўжо быў у дохтара IRO[2] і амэрыканскага ўперлася ў Siasi[3]. Чакаю другога вызаву, хочуць што я не камуніст (?!) Відаць, нехта нешта набрахаў, што заштопараць. Я гэтым не перайма жыцьцё ў Нямеччыне. Юрачка, калі спаткаеш Кавыля[4] або Пігулеўскага[5], скажы, што ўрэгуляваць рахунак са мной. Кавыль мяне 10 марак, а Пігулеўскі — 2 ангельскія ўрэгулююць, Бог зь імі. Ігнатовіча[6] заштопарылі

[1] **Ідэяцца пра сына Васіля Рагулі Міхася (1914–2002). У 1950 годзе Міхась Рагуля скончыў Мюнхенскую Політэхніку і выехаў у ЗША (Нью-Ёрк), дзе адразу ж пачаў працаваць на Фотасінтэзе і ажаніўся зь**

сям'ёю ў Бэрхтэсгадэне[7]. 28 студзеня са мной здарыўся нэрвовы прыпадак: страціў магчымасьць валодаць правай рукой. Але ўжо паправіўся, хаджу як бы здаровы, але бяздзейнічаю. Буду чакаць другога. Аб гэтым Мішы нічога не кажыце. Я яму не пісаў.

Скука страшэнная. Жыву сярод украінцаў у лягеры […]

Перадавай мой сэрдэчны прывет мамашы і тваёй сям'і.

Твой В.Рагуля

17/III. 1951

Дарагі Юрка!

Ня памятаю, ці пісаў я Вам, што DP-камісія[8] не прызнала мяне ў Амэрыку. Мой палітычны багаж аказаўся зацяжкім для ЗША. Выйшла, што дэмакрацыя не пусьціла беларускага дэмакрата. Сярод старэйшых беларусаў няма большага дэмакрата, чым я. Амаль ня ўсё жыцьцё я аддаў на барацьбу за дэмакратыю і, нарэшце, на табе: зь мяне зрабілі ці то камуніста ці то фашыста. Хто іх ведае. Сілы мае аслаблі, чуюсь дрэнна. Калі як-небудзь давалакуся да канца. Думаю, што дарога мая кароткая. Напішы, братка, мне адрас Сабалеўскага[9].

Паздраўляю ўсіх беларусаў з гадавінай абвяшчэньня незалежнасьці. Як стары дзяяч жадаю, каб гэты дзень стаў паваротным пунктам у нашых нутраных адносінах. Нехай адкінуць асабістыя амбіцыі для агульнай справы, пачнуць спатканьне з другім, забыць усё тое, што было ў Нямеччыне, працаваць для Бацькаўшчыны і стварыць агульны орган прадстаўніцтва. Гэтага вымагае час. Калатня ні да чога добрага не давядзе. Запамятайце, беларусы, урокі прошласьці.

Падзяліліся на Грамаду і Нацыянальны клюб. Нумо, што прынесла? Грамадоўцы загінулі на Салаўках, сэрца Багдановіч, Назарэўскі і Ўласаў, напэўна, загінулі на катаржных работах. Чарвякоў, Ігнатоўскі, Галадзюк — з жыцьцём. У духу яны былі нацдэмы. Калі ня ствараць маналітнай групы, то будзе тое, што сталася ранейшай мала, нашая патэнцыяльная вага ў Нямеччыне мае сілаў прывядзе да таго, што падчас вялікіх падзеяў прыйдуць да нас палякі, украінцы, расейцы і іншыя судзьдзі. Трэба гатавацца… Заклікайце да згоды і тварэньня цэнтру.

Выпісвайце мне "Трыбуну"[10].

займіцеся і **трымайцеся** **працай.**

[2] IRO (International Refugee Organization) — міжнародная арганізацыя, заснаваная ў 1947 годзе ў Жэневе, Швайцарыі, ЗША, Францыі і Аўстрыі для дапамогі ўцекачам, пражываючым у лягерах перамешчаных.

[3] Нацэўна, мабыць, ужываецца SIS (Secret Intelligence Service) — Англійская разведвальная служба.

[4] Міхась Кавыль (нар. 1915),

Прывет вашай сямейцы…
В. Рагуля

25/IV. 1951
Дарагі Юрачка!
Ад усёй душы дзякую табе і тваёй жонцы за падарунак”Як я атрымаў твой ліст з укладкай, дык надта ўсхваляваўся: ёсць яшчэ людзі, якія памятаюць старога. Наш лягер разбурыў. Цяпер старых сартуюць па рэлігіі: праваслаўных — адно месца, каталікоў — у другое, а лютэранаў — у трэцяе. У старэйшых дамах догляд надта добры. Нас, старых праваслаўных, здаецца, вывязуць у Дормштат, каля Ульму[11]. Ад першага мая вывезуцца. Новы адрас свой падам.
Учора быў у мяне Барыс Рагуля. Настойліва просіць ехаць да яго ў Бэльгію. Ён канчае мэдыцыну і спадзяецца мець працу. Я запісаўся ў дом старых у Англію, але Барыс настойліва просіць ехаць да яго. Візу, кажа, вы маеце.
Здароўе маё крыху палепшала. Але што я, стары дом. Надаела жыць, хочацца канца. Вы, маладыя, маеце мэту да жыцьця, я ўжо яе ня маю, а жыць бяз мэты, толькі каб жыць, — надта скучна і цяжка. Міша ўсё налягае, каб ехаў да яго. Пад ягоным націскам я злажыў апэляцыю. Якія будуць скуткі, паглядзімо. Хацелася бы прыехаць да яго. Можа, хоць бы і нячаста, але пабачыў бы сваіх людзей. Міша памагае мне матэрыяльна час ад часу.
Юрачка! Добра зрабіў, што адышоў ад беларускай палітыкі і заняўся літаратурай. Досыць лаянкі і ігры ў міністраў. Калі асягнем незалежнасьці, дык кандыдатаў у прэзыдэнты і міністры будзе аж занадта там на мейсцы. Падзяляю твой погляд на БЦР як павятовую ўправу. Дзякую за “Шыпшыну”[12]. Ігнатовіч дакумэнтуецца ў Канаду. Штовечар сядзімо ў аднаго беларуса і слухаемо радыё. Жывём у катлавіне, навокал горы, пакрытыя сьнегам. У нас яшчэ толькі настае вясна. Нядаўна ішоў сьнег.
Прывітаньне жонцы і мамашы. Як чуецца старуха? Прывітаньні беларусом, зь якімі спаткаемся.
Твой В. Рагуля

беларускі грамадзкі дзеяч, паэт. Рэдактар часопісу “Беларуская думка”, які выдаецца ў Саўт Рывэры. Ня быў тацэ зь менскай Беларускай думкай”.

Вераг одна, маецца на ўвазе Язэп Пігулеўскі, дзеяч нацыянальнага руху і грамадзка-культурны дзеяч на эміграцыі (памёр 4 чэрвеня 1984 году ў Канадзкім Таронта).

Мапэўна, маецца на ўвазе Мікола Ігнатовіч, прыхільнік Беларускай цэнтральнай рады, актывіст Беларускага

праваслаўнага аб’яднаньня.

[7] Бэрхтэсгадэн — курортны гарадок на паўднёвым усходзе Баварыі, на мяжы з Аўстрыяй. Знаходзіўся ў амэрыканскай зоне акупацыі Нямеччыны.

[8] DP (анг. displaced persons — “перамешчаныя асобы”) — людзі ненямецкага і неаўстрыйскага паходжаньня, якія пасьля 2-й сусьветнай вайны апынуліся на тэрыторыі Нямеччыны і Аўстрыі. DP-камісія займалася праверкай паходжаньня гэтых людзей (ці ня бралі ўдзелу ў злачынствах

супраць мірнага насельніцтва падчас другой сусьветнай вайны), а затым давала дазвол на выезд у трэція краіны.

[9] Юры Сабалеўскі (1889—1957), грамадзкі дзеяч. У 1922—1928 гг. — пасол польскага сойму, адзін з кіраўнікоў Беларускай сялянска-работніцкай грамады (1925—1927). Падчас нямецкай акупацыі — бурмістар Баранавічаў, віцэ-прэзыдэнт Беларускай цэнтральнай рады, старшыня Беларускай самапомачы. Зь лета 1944 году — на

эміграцыі (Нямеччына, ЗША, зноў Нямеччына). Браў актыўны ўдзел у эміграцыйным палітычным руху.
8 траўня 1948 году ў нямецкім Эльвангене было створанае Беларускае цэнтральнае прадстаўніцтва (у яго, між іншым, увайшлі Васіль Рагуля, Юры Сабалеўскі, Мікола Ігнатовіч), якое потым аднавіла распушчаную Радаславам Астроўскім Беларускую цэнтральную раду. Васіль Рагуля праз два гады адышоў ад палітычных спраў, пакінуўшы

БЦР.

10 “Беларуская Трыбуна” — друкаваны орган прыхільнікаў БЦР на эміграцыі. Выдавалася ў 1950-х. Рэдактар Міхась Кавыль.

11 Гарады ў Швабіі (зямля Бадэн-Вюртэмбэрг, Нямеччына).

12 “Шыпшына” — літаратурна-мастацкі часопіс, друкаваны орган літаратурнага аб’яднаньня беларускіх пісьменьнікаў “Шыпшына”, створанага

ўвесну 1946 году ў Заходняй Нямеччыне (горад Міхельсдорф). Юрка Віцьбіч быў галоўным рэдактарам часопісу.

Ragula Bazyli (13b) Berchtesgaden
DP lager Orlic Bl3 rim 86
Germany USA zone
15/X. 1951

Дарагі Юрка!

Даўно я пісаў Вам. Усё зьбіраўся. Я ўжо ў новым лягеры — старэчым доме. Тут нас, старога хламу, назьбіралі да 300 чалавек. Ёсьць палякі старыя, якія ня могуць хадзіць, а ёсьць яшчэ і досыць здаровыя, якія заводзяць амуры. Дзьве пары старыя ўжо пажаніліся. У адным выпадку нявеста мае 78 гадоў, ну і жаніх таксама адпаведнага веку. Дом наш знаходзіцца каля вёскі ў полі. Памяшканьне ідэальнай чыстаты, бульшыня ў адзін пакой на дваіх. Кожны мае шафу, начны столік, ложак — усё новае, пасьцель мяккая зь пярынаю і падушкаю. Калідоры засьцелены каўрамі. 30% — гэта немцы і немкі. Сапругі, дана царква і кірха. Ёсьць вялікі агарод, на якім шматгародніны ўсякага сорту. Ёсьць 12 кароў, 2 быкі і 50 сьвіней. Жэнзіі на паліцыі мы ня маем.

Ад сямі раніцы да 10-й вечара можна ісьці куды хочаш. Мацнейшыя едуць ува Ульм, а слабейшыя снуюць па полі і па пляцы, як мухі ў пачатку восені… Ужо пахавалі 4 асобы. Практычна ўжо загатовілі 13 грабоў у запас, якія стаяць у падвале.

Ежы хапае, але ёсьць і з воўчым апэтытам, якія суседзяць, што мала. Толькі і чакаюць, як дадуць званок ісьці на сьнеданьне, абед ці вячэру. Раз у тыдзень бывае кіно. Адзін раз на дзень даваў у нас канцэрт. Да Ульму ад нас 8 км. Мне хапае з матэрыяльнага боку някепска. Сын высылае штомесяц 15 даляраў, якіх мне хапае і на цыгаркі. Часам і хочацца выпіць

* *Ukrainian Nationalism in the 1990s: A Minority Faith.* Cambridge, 1997. Гл. рэцэнзіі на яе ў “Критиці”: 1998, ч. 5.

[13] **Відаць, маецца на ўвазе Міхась Канюль (сапр. Язэп Лявецкі-Лешчанка).**

чарку, але здароўе не дазваляе.
Высылаю Вам купончык на тры даляры, які мне прыслаў на лекі Ляшчынскі[13], думаю, Вы яго знойдзіце і падзякуеце яму ад мяне, бо адрасу свайго ня даў. Як іх атрымаў, то заплакаў ад радасьці, што ёсьць яшчэ беларусы, якія памятаюць старога дзеяча. Я прасіў бы, каб ён даў мне свой адрас, каб я мог напісаць яму.
Я надта прашу Вас пры спатканьні з Сабалеўскім [нрзб.], каб ён напісаў мне, калі атрымаў пасольскі мандат, калі арганізавалася грамада, быў суд над грамадоўцамі і як грамадоўцы ўцякалі ў Саветы. Мне гэта трэба для маіх успамінаў, якія я хачу напісаць па настойлівай просьбе некаторых беларусаў.
Я ўжо фізычна аслабеў, але духова чуюся нязгорш. Жыцьцё — старэчы дом. Жыву, можна сказаць, сярод чужых трупаў. Чуюся так, як асуджаны на кару сьмерці, які ня ведае дня і гадзіны, калі прыйдзе канец. Але ўсё гаворыць, што пара пакаваць чамаданы ў далёкую дарогу. Ніяк не магу пагадзіцца з тым, што я ўжо выжыў сваё. На днях атрымаю тэлеграму ў Бэльгію пабачыць пляменьніка — як ён там. Гэта значыць, зраблю зрабіць бэльгійскі кансулят — дае безыменную візу, быць, там выходзіць якая беларуская газэціна. Дапішыце, каб, каб на мяне высылалі.
Шчорсы, Касякі, Ясюкі[14] забыліся пра старога. Няхай жывуць ды спачуваюць намеры, якія ім будуць патрэбныя ў будучыні для вядзеньня беларускай справы. Чым больш усякі беларус абрасьце матэрыяльна, тым лепей для беларускай справы. Адно толькі каб сэрца ў іх не абрасло мохам, каб іх не праглынула пагоня за далярамі. Шлю гарачы прывет Вашай матцы і жонцы жадаю ўсяго найлепшага.
Ваш В. Рагуля

[13] **Ляшчынскі Вацлаў** — адзін з кіраўнікоў Беларускага нацыянальнага камітэта ў Нью-Йорку.

[14] **Мікола Шчорс** (1916—1995), **Іван Касякі** (1909—1989), **Эмануіл Ясюкі** (1907—1977), **грамадскія дзеячы, прыхільнікі БНР, на эміграцыі, з якімі Рагуля падтрымліваў сувязь, у тым ліку Васілём Рагулем, актывісты Беларускага нацыянальнага камітэта ў Нью-Йорку, дапамагалі**

25/12. 1951
Дарагі Юрка!
Паздраўляю Вас і зь сям'ёю з Народжаньнем Хрыстовым і Новым Годам. Чаго ж Вам пажадаць у Новым Годзе? Па-першае, жадаю Вам і сямейцы здароўя, як залогу добрага жыцьця. Ну і, канечне, зьдзяйсьненьня ўсіх Вашых жаданьняў. Жадаю, каб наступаючы год быў астатнім у Вашай тулячцы на чужбіне. Але на зьдзяйсьненьне гэтага пажаданьня я асабіста не спадзяюся.

Што датычыць мяне, то я не спадзяюся занесьці свае косьці на Бацькаўшчыну, бо здароўе з кожным месяцам пагаршаецца. Даўно я не пісаў Вам, а то з прычыны, што трохі абляніўся, ня быў пэўны ў месцы жыцьця, бо вёў цыганскае жыцьцё, пераяжджаў ад аднаго лягеру да другога. Астатнія дні пражыў у старэчым доме каля Ульму — Дормштаце. Там жылося добра: чысьціня, харчы надта добрыя, адносіны адміністрацыі (нямецкай) і абслугі (немак) надта ветлівыя. Дом ня дом — а гатэлі з аднапавярховых дамоў з малымі пакойчыкамі на двух жыльцоў, прыгожа абстаўленымі. Вось ня ведаў, што рабіць: ехаць у Бэльгію да Барыса ці чакаць сьмерці сярод старых. У ЗША мяне SIS не пусьціла, а Барыс настойліва дамагаўся майго пераезду да яго, запэўняючы спакойную і бестурботную старасьць. Міша таксама дакладаў усіх стараньняў, каб я прыехаў да яго. Я і пастанавіў паехаць у Бэльгію. Цяпер жыву ў Барыса. Пераяжджаючы, я пастанавіў ня путацца ў жадную палітыку, якая мне ўжо надаела, асабліва ў той форме, у якой яна вялася. Гэта была “мышыная вазьня” з значнай дамешкай лаянкі. Дробныя самалюбствы, зь міністэрскімі амбіцыямі, неадпаведных людзей і непачуваючых адказнасьці перад гісторыяй і народам.

Мне асабіста жывецца пакуль што вельмі добра. Барыс і Люда стараюцца ва ўсім дагадзіць мне і “скрасіць” астатнія гады жыцьця. Шкада, што ня маю права па здароўю выпіць чарку за Вашае і Вашай сямейкі здароўе. Я стараюся ў хаце быць карысным, чым магу: хаджу ў магазыны, памагаю па дому і галоўнае — даглядаю гадавую ўнучку (дочку Барыса), забаўляю яе і еду зь ёю на прагулку ў парк-горад. Дзяўчынка надта ажыўленая. Вясёлая. Матэрыяльна чуюся надта добра. Усё ўтрыманьне маю ад Барыса і Люды, якія катэгарычна адмовіліся ад усякае даплаты з майго боку. Міша кожны месяц высылае мне 15 долараў, якіх я ня маю куды дзяваць. Жыцьцё ў Бэльгіі ў два разы даражэй, чым у Германіі. Адным словам, жыву лепш ня трэба, але душэўна ня маю задавальненьня: ніяк не магу пагадзіцца, што стаў адпрацаваным хламам, што стаю на граніцы сабачага і абязьяньняга веку (75 гадоў), бо ўжо жыву 73-ці год. Шлю мой шчыры, гарачы прывет Вашай жонцы, старэнькай матцы.

Адрас на канвэрце.

Ваш В. Рагуля

Прадмова, укладаньне, камэнтары Алега Гардзіенкі
З архіваў БІНіМу

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]

Фэлікс Гавін

Становішча з правамі нацыянальных меншасьцяў і навучаньнем дзяцей на роднай мове ў Гарадзенскай вобласьці

Гарадзеншчына — шматэтнічны рэгіён Беларусі. Калі ў цэлым па краіне да нацыянальных меншасьцяў належаць 22 % насельніцтва, дык у Гарадзенскай вобласьці — 37,7 % жыхароў. У сувязі з гэтым Гарадзеншчыну можна лічыць характэрным рэгіёнам што да адлюстраваньня нацыянальнай палітыкі беларускіх уладаў як мясцовага, так і рэспубліканскага ўзроўняў.

У Гарадзенскай вобласьці нацыянальныя меншасьці сканцэнтраваныя ў канкрэтных населеных пунктах. Напрыклад, літоўцы, якіх у вобласьці толькі 0,2 %, жывуць у двух раёнах — Воранаўскім і Астравецкім, дзе ў шэрагу вёсак складаюць

большасць.

Кароткі аналіз заканадаўства Рэспублікі Беларусі, а таксама ратыфікаваных ёю міжнародных дакумэнтаў у галіне абароны правоў нацыянальных меншасьцяў і гарантыяў карыстаньня роднай мовай

Аналіз міжнародных дакумэнтаў у галіне абароны правоў нацыянальных меншасьцяў мы пачнём з таго факту, што Беларусь ратыфікавала Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, а таксама факультатыўны пратакол, які дае магчымасьць грамадзянам Беларусі зьвяртацца ў органы ААН з індывідуальнымі скаргамі ў выпадку парушэньня правоў, запісаных у гэтым Пакце. Такое права забясьпечваюць таксама артыкулы 8 і 61 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі.

У сыстэме ААН правы нацыянальных меншасьцяў запісаныя ў Агульнай дэклярацыі правоў чалавека ў артыкуле 2, што забараняе дыскрымінацыю асобаў, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў. Іншым важным дакумэнтам ААН зьяўляецца Міжнародны пакт палітычных і грамадзянскіх правоў, які сягае значна глыбей за Дэклярацыю і, апрача забароны дыскрымінацыі, гарантуе пэўныя правы, а менавіта права на спавяданьне рэлігіі і выкананьне абрадаў, права карыстацца роднай мовай і здабыткамі сваёй культуры (артыкул 27).

Важным дакумэнтам ААН зьяўляецца Дэклярацыя правоў асобаў, якія належаць да нацыянальных, этнічных, рэлігійных і моўных меншасьцяў. Дэклярацыя абавязвае (артыкул 4) усе дзяржавы паўсюдна гарантаваць меншасьцям умовы, спрыяльныя для вывучэньня роднай мовы або навучаньня на роднай мове.

Беларусь — сябар Арганізацыі бясьпекі і супрацоўніцтва ў Эўропе, таму тут дзейнічаюць дакумэнты АБСЭ, датычныя гарантаваньня правоў і свабодаў асобаў, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў. Сярод гэтых дакумэнтаў варта асабліва адзначыць Дакумэнт канфэрэнцыі ў Капэнгагене па тэме агульначалавечых каштоўнасьцяў, што адбылася ў 1990 годзе. У пункце 30 гэтага дакумэнту чытаем: “Дзяржавы — удзельніцы АБСЭ прызнаюць, што пытаньні, датычныя

нацыянальных меншасьцяў, могуць быць вырашаныя пазытыўна толькі палітычным і дэмакратычным шляхам пры разуменьні вяршэнства закону і пры ўмовах функцыянаваньня незалежнай судовай сыстэмы. [...] Дзяржавы-ўдзельніцы прызнаюць таксама важную ролю недзяржаўных арганізацыяў... у падтрымцы талерантнасьці, культурнае разнастайнасьці і ў вырашэньні пытаньняў, датычных нацыянальных меншасьцяў". Далей у пункце 34 дакумэнту чытаем: "Дзяржавы-ўдзельніцы будуць імкнуцца гарантаваць асобам, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў, незалежна ад неабходнасьці вывучаць дзяржаўную мову (дзяржаўныя мовы) адпаведнай дзяржавы, магчымасьць вывучэньня сваёй роднай мовы або навучаньня на роднай мове, а таксама там, дзе гэта магчыма і неабходна, выкарыстаньне яе ў дзяржаўных органах згодна з заканадаўствам. У кантэксьце выкладаньня гісторыі і культуры ў навучальных установах таксама будуць брацца пад увагу гісторыя і культура нацыянальных меншасьцяў".

У часе чарговых сустрэчаў дзяржавы — удзельніцы АБСЭ неаднаразова падкрэсьлівалі сваю добрую волю ў адносінах да захаваньня правоў нацыянальных меншасьцяў. Гэтак было ў Парыскай хартыі для Новай Эўропы, абвешчанай у 1990 годзе, у дакумэнтах Маскоўскае нарады. Асаблівае месца сярод дакумэнтаў, прынятых на нарадзе ў Капэнгагене, займае Дэклярацыя Хельсынскай сустрэчы 1992 году, на падставе якой была створаная пасада Высокага Камісара ў справах нацыянальных меншасьцяў.

Сярод міжнародных дакумэнтаў ёсьць двухбаковыя пагадненьні ў галіне абароны правоў нацыянальных меншасьцяў, у тым ліку пагадненьні з Польшчай, Літвой, Украінай ды іншымі дзяржавамі.

Усіх гэтых міжнародных дакумэнтаў і мэханізмаў абароны чалавека Беларусь мусіць прытрымлівацца.

Аналіз унутранага заканадаўства Беларусі трэба пачаць з Канстытуцыі. Зьмены, унесеныя ў Канстытуцыю прэзыдэнтам, пераважна датычаць разьдзелаў, якія рэгулююць дзяржаўны лад. Што да правоў і свабодаў грамадзянаў, разьдзелы I і II засталіся бязь зьменаў. У пытаньнях аховы правоў нацыянальных меншасьцяў важныя наступныя артыкулы Канстытуцыі: 2, 14, 15, 16, 17, 50, 61.

Артыкул 14 абавязвае дзяржаву рэгуляваць стасункі паміж

нацыянальнымі супольнасьцямі на падставе роўнасьці перад законам, павагі іхных правоў і інтарэсаў.
Артыкул 15 ускладае на дзяржаву адказнасьць за захаваньне гістарычна-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае разьвіцьцё культур усіх нацыянальных супольнасьцяў, што насяляюць Рэспубліку Беларусь.
Артыкул 16 абвяшчае роўнасьць рэлігіяў і веравызнаньняў перад законам.
Артыкул 17 паведамляе: “Дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусі зьяўляюцца беларуская і расейская мовы”. Гэты артыкул быў зьменены паводле рэфэрэндуму 1996 году.
Вялізнае значэньне мае артыкул 50 Канстытуцыі: “Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасьць, таксама як ніхто ня можа быць змушаны да вызначэньня і ўказаньня нацыянальнай прыналежнасьці. Зьнявага нацыянальнай годнасьці караецца згодна з законам. Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносінаў. Дзяржава гарантуе, у адпаведнасьці з законам, свабоду выбару мовы выхаваньня і навучаньня”.
Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі адпавядае міжнародным стандартам у галіне гарантыяў абароны правоў нацыянальных меншасьцяў, усталяваных Арганізацыяй Аб’яднаных Нацыяў і Арганізацыяй бясьпекі і супрацоўніцтва ў Эўропе.
Адносіны ў гэтай галіне рэгулююцца наступнымі законамі:
Законам Рэспублікі Беларусі “Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусі”, прынятым Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусі 29 кастрычніка 1991 году, са зьменамі ад 22.03.1995, 03.05.1996, а таксама 09.11.1999;
Законам Рэспублікі Беларусі “Аб нацыянальных меншасьцях у Рэспубліцы Беларусі”, прынятым Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусі 11 лістапада 1992 году;
Законам Рэспублікі Беларусі “Аб правах дзіцяці”, прынятым Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусі 19 лістапада 1993 году, са зьменамі ад 3.05.1996;
Законам Рэспублікі Беларусі “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусі”, выдадзеным прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі А. Лукашэнкам, ад 17.07.1998 году;
Законам “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусі” ў рэдакцыі 2001 году.
Аналіз законаў пачнём з Закону “Аб мовах”. Гэты заканадаўчы

акт асабліва важны. Па-першае, у адрозьненьне ад іншых вышэйзгаданых законаў, Закон “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусі” быў прыняты новым “парлямэнтам” і падпісаны А. Лукашэнкам. Трэба меркаваць, што ў сувязі з гэтым Закон павінен выконвацца цяперашнімі ўладамі (пра яго выкарыстаньне на практыцы гаворка пойдзе пазьней). Па-другое, гэты закон сыстэматызуе стасункі ў сфэры ўжываньня нацыянальных моваў і сваімі рэзалюцыямі часта дублюе іншыя нарматыўныя акты. Па-трэцяе, ён рэгулюе адносіны паміж дзьвюма дзяржаўнымі мовамі (вызначанымі артыкулам 17 Канстытуцыі, зьменены пасьля рэфэрэндуму 1996 году) і іншымі нацыянальнымі мовамі, якімі карыстаецца насельніцтва, што, згодна з артыкулам 2 Закону, ёсьць дзяржаўным клопатам.

Паводле артыкулу 3, грамадзяне Беларусі маюць права зьвяртацца ў дзяржаўныя органы на беларускай, расейскай або іншай, прымальнай для абодвух бакоў, мове.
Артыкул 6 Закону не дапускае абразы, зьнявагі дзяржаўных і іншых моваў, стварэньня перашкодаў і абмежаваньняў ува ўжываньні, выкліканьня варожасьці на моўнай глебе.
Артыкул 21: “Рэспубліка Беларусь гарантуе кожнаму жыхару неад’емнае права на выхаваньне і атрыманьне адукацыі на беларускай або расейскай мове. Гэта права забясьпечваецца сыстэмай дашкольных установаў, агульнаадукацыйных школаў, прафэсійна-тэхнічных вучылішчаў і вышэйшых навучальных установаў.
Права на выхаваньне і атрыманьне адукацыі на роднай мове маюць і асобы іншых нацыянальнасьцяў, якія жывуць у краіне. Кіраўнікі і іншыя супрацоўнікі сыстэмы адукацыі павінны валодаць беларускай і расейскай мовамі”.
Артыкул 23. “Мова навучаньня і выхаваньня, вывучэньне моваў у агульнаадукацыйных школах.
У Рэспубліцы Беларусі навучальная і выхаваўчая праца ў агульнаадукацыйных школах вядзецца на беларускай і (або) расейскай мовах.
Адпаведна з пажаданьнямі грамадзянаў па рашэньні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў могуць стварацца агульнаадукацыйныя школы або клясы, у якіх вучэбна-выхаваўчы працэс вядзецца на мове нацыянальнай меншасьці

або вывучаецца мова нацыянальнай меншасьці”.
Ува ўсіх агульнаадукацыйных школах Рэспублікі Беларусі абавязкова вывучаюцца беларуская, расейская і адна замежная мова.
Наступны закон, які забясьпечвае права навучаньня дзяцей на роднай мове, — гэта Закон “Аб нацыянальных меншасьцях у Рэспубліцы Беларусі”. Ён гарантуе грамадзянам рэспублікі, якія лічаць сябе прыналежнымі да нацыянальных меншасьцяў, “роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды, у тым ліку: а) права на атрыманьне дапамогі ад дзяржавы ў справе разьвіцьця нацыянальнай культуры і адукацыі; б) права вывучаць і карыстацца роднай мовай”. Артыкул 12 Закону забараняе дыскрымінацыю паводле нацыянальных прыкметаў.
Неабходна таксама ўзгадаць пра Закон “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусі” ў рэдакцыі 2001 году. Артыкул 10 гэтага Закону гарантуе асобам любое нацыянальнасьці і этнічнае групы права на разьвіцьцё культуры і мовы, стварэньне нацыянальнай школы, культурных аб’яднаньняў, асьветных таварыстваў і інш.
У Беларусі існуе таксама адмысловы дзяржаўны орган — Дзяржаўны камітэт у справах рэлігіі і нацыянальнасьцяў Рэспублікі Беларусі, статус якога быў зацьверджаны пастановай Савету Міністраў 17 красавіка 1997 году. Асноўныя задачы гэтага органу:
— спрыяньне гарманічнаму духоўнаму разьвіцьцю грамадзянаў Рэспублікі Беларусі розных нацыянальнасьцяў;
— ахова і спрыяньне ў рэалізацыі правоў грамадзянаў Рэспублікі Беларусі розных нацыянальнасьцяў у галіне культуры, адукацыі, мовы, інфармацыйнага забесьпячэньня, каардынацыя дзейнасьці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіраваньня па стварэньні ўмоваў і аказаньні дапамогі ў асьветнай дзейнасьці нацыянальных меншасьцяў;
— вырашэньне пытаньняў па забесьпячэньні канстытуцыйных гарантыяў свабоды веравызнаньняў.
Важным нарматыўным актам для рэалізацыі правоў асобаў, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў, ёсьць Інструкцыйна-мэтадычны ліст Аддзелу адукацыі Гарадзенскай вобласьці і Менскага выканкаму “Аб арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусі навучаньня дзяцей, якія належаць да нацыянальных

меншасьцяў”.
Можна дапусьціць, што, прымаючы Закон “Аб нацыянальных меншасьцях у Рэспубліцы Беларусі” ў 1992 годзе, беларускія заканадаўцы ўсьведамлялі, наколькі важная праблема дэмакратычнага рэгуляваньня пытаньняў, зьвязаных з абаронай правоў нацыянальных меншасьцяў. Хаця сама юрыдычная база гарантыяў абароны правоў нацыянальных меншасьцяў адпавядае стандартам, рэалізацыя іх застаецца адно на паперы.

Агульнае становішча ў нацыянальнай палітыцы на Гарадзеншчыне

Сёньняшні стан у справах, датычных захаваньня правоў нацыянальных меншасьцяў, цесна зьвязаны з гісторыяй пасьляваеннае Беларусі, з палітыкай татальнае русіфікацыі насельніцтва. Перш за ўсё дыскрымінавалася беларуская мова, таксама не магло ісьці гаворкі пра вывучэньне мовы **Паводле** **дадзеных** **перапісу** **насельніцтва** **1989 г.**

З 1948-га да 1988 году ў Гарадзенскай вобласьці насялялі 26,5 % палякаў, каля 0,3 % літоўцаў, каля 1 % украінцаў [1], а таксама іншыя народы — ні ў адной школе не было клясаў, дзе б вывучалі мову нацыянальнае меншасьці.
Пэрыяд 1989—1994 гадоў можна лічыць сапраўдным рэнэсансам нацыянальных культураў Гарадзеншчыны. Ствараецца вялікая колькасьць творчых нацыянальных суполак, нацыянальных выдавецтваў, узьнікаюць нацыянальна-культурныя няўрадавыя арганізацыі.
Сытуацыя пачынае зьмяняцца з 1994 году, а менавіта з 10 ліпеня 1994 году, калі прэзыдэнтам Беларусі стаў Аляксандар Лукашэнка, заўзяты прыхільнік “старога парадку”. Урадавая палітыка паступова становіцца ўсё менш прыхільнай у адносінах да нацыянальных меншасьцяў.

Расейцы. Прывілеяваная нацыянальная меншасьць, нават у адносінах да беларусаў, — расейцы. У 1939—1941 гадох адбываўся рост іх колькасьці. Сюды накіроўвалі чыноўнікаў усіх узроўняў з мэтай правядзеньня палітыкі русіфікацыі і барацьбы з “праявамі нацыяналізму”.
Цяпер вобласьць насяляюць 119 200 расейцаў, ці 10,1 % ад агульнай колькасьці насельнікаў. Яны займаюць трэцяе месца

пасьля беларусаў і палякаў. 14 чэрвеня 1995 году быў створаны мясцовы аддзел таварыства расейскай культуры.15 чэрвеня таго ж году быў створаны цэнтар “Расейскі стыль”. Прадстаўнікі расейскай супольнасьці бяруць удзел у сьвятах нацыянальных культураў, арганізуюць экскурсіі для дзяцей, адпачынак у санаторыях Смаленскай вобласьці, запрашаюць выступаць у Горадню калектывы з розных гарадоў Расеі. Грамадзяне Беларусі, якія лічаць сябе прадстаўнікамі гэтае меншасьці, ня маюць аніякіх праблемаў з навучаньнем дзяцей на роднай мове, з вызнаньнем праваслаўя. Больш за тое, сродкі масавай інфармацыі рознымі спосабамі прапагандуюць і расхвальваюць расейскую масавую культуру. Расейская мова пануе ў дзяржаўных установах, тэлебачаньні, радыё, друку, школах, вышэйшых навучальных установах.

Татары. Татарская меншасьць жыве пераважна ў Іўі, Наваградку, Міры і Лідзе. Ёсьць два дзейныя мячэты, а вывучэньне мовы адбываецца ў мясцовых школах.
У Гарадзенскай вобласьці жывуць 2155 татараў, ці 0,2 % ад усяго насельніцтва. Першае нацыянальнае таварыства было створана ў ліпені 1989 году. У 1990 годзе ад яго аддзяліўся ісламскі культурны цэнтар. У красавіку 1991 году паўстаў Гарадзенскі цэнтар татарскай культуры. Існуюць таксама музычны калектыў “Кіч-Ітуру”, рэлігійнае аб’яднаньне.

Украінцы. У Горадні дзейнічае ўкраінская арганізацыя “Барвінак”, якая займаецца арганізацыяй культурных імпрэзаў. Гэтая суполка была створаная ў 1997 годзе. У яе склад уваходзяць 30 чалавек, існуе аматарскі музычны калектыў, арандуецца памяшканьне для дзейнасьці. У вобласьці жывуць 21 166 украінцаў, ці 1,8 % ад усіх насельнікаў вобласьці. Што да польскай, габрэйскай і літоўскай меншасьцяў, іх становішча значна больш складанае (да праблемаў гэтых меншасьцяў мы вернемся ніжэй).
У 1999 годзе грамадзкія арганізацыі нацыянальных меншасьцяў Гарадзенскай вобласьці сутыкнуліся з супольнай праблемай, а менавіта — са спосабам правядзеньня перапісу насельніцтва. Дзеяньні лічыльнікаў наводзілі на думку, што

яны атрымалі ўказаньні ў адносінах да большасьці жыхароў у пятай графе “Мова” ў першым пункце “Родная мова” і другім “На якой мове размаўляеце дома” запісваць, што гэтая мова — расейская. Нягледзячы на тое, што ў гарадох Беларусі найчасьцей ужываецца расейская мова, такія паводзіны лічыльнікаў зьяўляюцца сур’ёзным парушэньнем правоў асобаў, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў. Гэтыя дзеяньні лічыльнікаў дыскрымінуюць ня толькі нацыянальныя меншасьці, але й сьвядомых беларусаў.

У сувязі з рэформай сярэдняй адукацыі і пераходам да дванаццацігадовага навучаньня.

Даведка Гарадзенскага аддзелу народнай адукацыі.

Дадзеныя на падставе пастановы мясцовага Савету народных дэпутатаў.

2
3
4

Польская нацыянальная меншасьць

Палякі, разам зь беларусамі і літоўцамі, здаўна насялялі землі Гарадзеншчыны. У 1939—1950 гг. у часе сталінскіх рэпрэсіяў у Сібір зь Беларусі было вывезена каля 600 тысячаў палякаў. Яшчэ 500 тысячаў каталікоў, паводле савецка-польскай дамовы, выехалі ў Польшчу. Перапіс насельніцтва 1989 г. паказаў, што ў Беларусі жыве 418 тысячаў палякаў, зь якіх 13,3 % прызналі польскую мову роднай.

Па дадзеных апошняга перапісу насельніцтва польская меншасьць у Гарадзенскай вобласьці склала 294 тысячы чалавек, або 24,8 % насельніцтва.

Больш за дзесяць гадоў таму быў створаны Саюз палякаў Беларусі, які сёньня налічвае каля 30 тысячаў чальцоў. Утварыліся больш за 50 аматарскіх музычных калектываў. Выдаецца газэта “Głos znad Niemna”. Пабудаваныя дзьве школы.

Пасьля рэфэрэндуму 1996 году ўлады Беларусі пачалі масаваную атаку ня толькі на ўсё, што зьвязана зь беларускай мовай, гісторыяй і культурай, але і пачалі абмяжоўваць правы нацыянальных меншасьцяў.

Галоўная праблема польскай нацыянальнай меншасьці ў тым, што як рэспубліканскімі ўладамі, так і мясцовымі не рэалізуецца права навучаць дзяцей на роднай мове. З 1988 году, пад уплывам актывістаў Польскага культурна-асьветніцкага таварыства імя Адама Міцкевіча, якія агітавалі бацькоў падаваць заявы з просьбай увесьці польскую мову як прадмет, улады пачалі арганізоўваць навучаньне польскай мове ў школах так, каб гэта было абмежавана толькі гурткамі і

факультатывамі. Гэтак, напрыклад, даючы адмоўны адказ на просьбу пабудаваць польскую школу ў Навагрудку, улады спасылаліся на тое, што ў горадзе ёсьць гурткі “Вывучаем польскую мову”. Безумоўна, узровень навучаньня ў гуртках вельмі далёкі ад узроўню вывучэньня мовы на ўроках, што ў сваю чаргу ўплывае на вынікі навучаньня.

Пачынаючы з 1988 году, Саюз палякаў Беларусі вядзе актыўныя перамовы з абласнымі і рэспубліканскімі ўладамі што да будаўніцтва польскіх школаў у Горадні, дзе жыве больш за 60 тысячаў палякаў. На сустрэчы, якая адбылася ў 1994 годзе паміж кіраўніцтвам Саюзу палякаў і прэм’ер-міністрам Кебічам, была падпісаная дамова, паводле якой у Горадні меркавалася пабудаваць дзьве школы, адну за кошт Рэспублікі Польшчы, другую за кошт Рэспублікі Беларусі. Пасьля таго як да ўлады прыйшоў А. Лукашэнка, Саюз палякаў атрымаў пісьмовую адмову што да выкананьня прынятых урадам Беларусі абавязкаў. Матывавалі гэта адсутнасьцю фінансавых сродкаў. Выказваньне дэпутата Сяргея Касьцяна, які адкрыта назваў палякаў грамадзянамі другога гатунку, паколькі яны перашкаджаюць інтэграцыі з Расеяй, добра ілюструе настроі, што пануюць сярод уладнай эліты ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў. Палякі ў Беларусі, па словах Касьцяна, гэта “пятая калёна, якая ў любы момант можа здрадзіць беларускаму народу”.

Старшыня СПБ зьвярнуўся да старшыні палаты прадстаўнікоў з просьбай патлумачыць выказваньне, але адказу не атрымаў. Прэзыдэнт Беларусі ў сваім “Звароце да Парлямэнту” абвінавацiў палякаў у імкненьні стварыць аўтаномію. Нягледзячы на тое што міжнародныя стандарты нават рэкамэндуюць дзяржавам падтрымліваць нацыянальныя аўтаноміі, у Беларусі аўтаномія асацыюецца з сэпаратызмам. Аляксандар Лукашэнка падзяляе палякаў на “простых”, якія знаходзяцца на ягоным баку, і “жменьку нацыяналістаў, якія спрабуюць навязаць польскае пытаньне”. Такія выказваньні гаранта Канстытуцыі могуць выклікаць сумнеў, ці выконваецца яна ўвогуле.

Адна з праяваў парушэньня правоў нацыянальных меншасьцяў — гэта працяглыя “гутаркі” функцыянэраў КДБ з актывістамі польскага нацыянальнага руху. Старшыня СПБ шматкроць зьвяртаўся да ўладаў з просьбай пакінуць у спакоі кіраўніцтва

СПБ, паколькі дзейнасьць гэтай арганізацыі адбываецца ў рамках дзейнай Канстытуцыі.
Пачынаючы з 1996 году і да сёньняшняга дня ўлады Берасьця, Наваградку, а таксама Горадні рэгулярна адмаўляюць СПБ у будаўніцтве польскіх школаў, прычым коштам СПБ.
Ініцыятыўная група бацькоў сабрала 3067 подпісаў пад адозвай да прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, у якой яны выказваюць занепакоенасьць прамаруджваньнем у будаўніцтве школы з польскай мовай навучаньня ў мікрараёне Вішнявец у Горадні, а таксама з нагоды таго, што “на працягу васьмёх гадоў ня быў выдадзены ніводзін падручнік для 2—8 клясаў”. Адказу яны не атрымалі.
У Наваградку ўлады робяць усё, каб ліквідаваць магчымасьць навучаць дзяцей на польскай мове, што ўжо атрымалася зрабіць зь першай клясай (1997/98) адной з наваградзкіх школаў. Па-першае, зьдзяйсьняўся ціск на бацькоў, якіх запалохвалі стратай працы. Па-другое, былі прыцягнутыя сродкі масавай інфармацыі, якія спрабавалі давесьці адсутнасьць пэрспэктываў такога навучаньня. Акрамя таго, улады Наваградку запатрабавалі ад бацькоў дзяцей, якія пачалі вучыцца на польскай мове, даказаць сваё польскае паходжаньне, што зьяўляецца сур’ёзным парушэньнем правоў чалавека. З прычыны такіх парушэньняў старшыня СПБ зьвярнуўся да старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму з просьбай запатрабаваць ад сваіх падначаленых трымацца закону. Аднак ніякія захады не былі прынятыя. СПБ зьвярнуўся таксама ў пракуратуру вобласьці, але там ня ўгледзелі парушэньня Закону “Аб мовах”.
Ужо чатыры гады СПБ спрабуе атрымаць дазвол ад уладаў Наваградку на будаўніцтва школы з польскай мовай навучаньня. Спачатку ўлады матывавалі адмову адсутнасьцю сродкаў у гарадзкім бюджэце. Таксама прычынай адмовы была невялікая колькасьць жыхароў Наваградку польскай нацыянальнасьці — 5,3 %.
Па гэтай справе зьвярталіся да А. Лукашэнкі, а таксама ў Дзяржаўны камітэт у справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Рэспублікі Беларусі і ў Каардынацыйную раду па справах нацыянальных меншасьцяў пры Савеце Міністраў. З боку ўладаў не было зроблена ані кроку ў кірунку канструктыўнага вырашэньня гэтага пытаньня.

СПБ арганізаваў пікет перад Домам ураду Рэспублікі Беларусі. Пасьля паўгадзіннага пікетаваньня на патрабаваньне міліцыі акцыя была спыненаная. Несанкцыяваны пікет быў праведзены таксама ў Наваградку. У сакавіку 1999 г. старшыня СПБ Тадэвуш Гавін быў пакараны за арганізацыю несанкцыяванага пікету на суму 115 000 000 рублёў, якая перавысіла ягоны гадавы даход.
З сакавіка 1999 году СПБ зьвярнуўся ў суд Наваградзкага раёну з пазовам скасаваць пастанову аб адхіленьні просьбы аб будаўніцтве школы і прызнаньні немэтазгоднасьці адкрыцьця 1-х клясаў з польскай мовай навучаньня.
Рашэньне суду не задаволіла СПБ.
Правы польскай нацыянальнай меншасьці парушаюцца таксама ў Воранаве, дзе каля 80 % жыхароў — палякі. Былі ліквідаваныя дзьве клясы: адна з польскай мовай навучаньня, другая — з польскай мовай як прадметам. Старшыня Воранаўскага раённага аддзелу СПБ зьвярнуўся да кіраўніка Воранаўскага райвыканкаму з просьбай захаваць польскія клясы і абавязаўся ўзяць на сваю грамадзкую арганізацыю ўсе выдаткі, зьвязаныя з навучаньнем дзяцей. Бацькі напісалі лісты, у якіх выказвалі такую самую просьбу, да кіраўніцтва Воранаўскага райвыканкаму і Гарадзенскага аблвыканкаму. Бацькі заявілі, што ня пусьцяць дзяцей у школу, пакуль гэтая праблема ня будзе вырашаная станоўча. Дзеяньні бацькоў і актывістаў СПБ не прынесьлі ніякіх вынікаў.
У Лідзе ўлады не дазволілі стварыць клясу з польскай мовай навучаньня, матывуючы гэта таксама матэрыяльнымі праблемамі.
Бязьдзейнасьць Міністэрства адукацыі ў пытаньні распрацоўкі дзяржаўнай праграмы навучаньня на польскай мове, а таксама тое, што ў Беларусі не выдаюцца падручнікі і дыдактычныя дапаможнікі на польскай мове, можна расцэньваць як абмежаваньне права навучацца на роднай мове.
У 1997 годзе адбыўся чарговы зьезд СПБ. Былі прынятыя адозвы да ўраду з інфармацыяй аб стане ў справах рэлігіі і з просьбай пабудаваць дзіцячы садок і школу з польскай мовай навучаньня. СПБ атрымаў пісьмовае папярэджаньне ад Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусі, у якім паведамлялася, што гэтыя адозвы парушаюць заканадаўства Рэспублікі Беларусі. Апошнім часам улады не даюць дазволу на

прыезд з Польшчы настаўнікаў польскай мовы.
У красавіку 1998 году Таварыства польскіх лекараў пры СПБ зьвярнулася да Гарадзенскага выканкаму з просьбай дазволіць правесьці навукова-папулярную канфэрэнцыю, прысьвечаную 200-годзьдзю з дня нараджэньня вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Адказ выканкаму быў адмоўны. Адмову абгрунтавалі клопатам пра лекараў іншых нацыянальнасьцяў, якіх таварыства нібыта дыскрымінуе паводле нацыянальнай прыналежнасьці.
Ёсьць у Беларусі грамадзяне краіны, былыя жаўнеры Арміі Краёвай, якія змагаліся з фашызмам падчас другой сусьветнай вайны. Яны не прызнаныя вэтэранамі і з гэтай прычыны пазбаўленыя льготаў, што маюць удзельнікі вайны. Прычым яны адзіныя з удзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі пазбаўленыя льготаў. Жаўнеры абарончай вайны, якую вяла Польшча ў 1939 годзе, маюць статус вэтэранаў, але таксама пазбаўленыя льготаў.

Літоўская нацыянальная меншасьць
Гарадзенская вобласьць мае доўгую мяжу зь Літвой. Нягледзячы на гэта, літоўцаў у вобласьці няшмат. Існуе 25 літоўскіх вёсак, дзьве парафіі. Дзеці літоўцаў, што жывуць у Горадні, вывучаюць літоўскую мову ў нядзельнай школе. Паводле перапісу насельніцтва 1999 году літоўская меншасьць на Гарадзеншчыне складае 2964 чалавекі, або 0,2 % ад агульнай колькасьці жыхароў вобласьці.
Аб'яднаньне літоўцаў Гарадзеншчыны "Tevine" было створанае ў 1995 годзе. Галоўная задача таварыства — асьветніцкая дзейнасьць. У Гарадзенскай вобласьці ў літоўцаў ёсьць дзьве школы з нацыянальнай мовай навучаньня — сярэдняя школа ў Рымдзюнах (Астравецкі раён) і школа ў вёсцы Пеляса (Воранаўскі раён).
Старшыня абласнога аддзелу "Tevine" Альгімантас Дзіргінчус называе наступныя праблемы, зьвязаныя зь дзейнасьцю таварыства, якія паўстаюць, на яго думку, зь віны ўладаў і парушаюць правы меншасьці: недахоп пэдагагічных кадраў, няпэўнае юрыдычнае становішча школы і Культурнага цэнтру ў Рымдзюнах ды цяжкасьці, зьвязаныя з арэднай памяшканьняў для нядзельных школаў. Да гэтага часу Міністэрства адукацыі Беларусі не распрацавала правілаў наконт нядзельных школаў,

хаця “Tevine” неаднаразова зьвярталася з гэтай просьбай. Мэтадычна-інструкцыйны ліст “Аб арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусі навучаньня дзяцей, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў” гаворыць пра школы вольнага дня, аднак канкрэтна не акрэсьлівае, што такой школай зьяўляецца. Улады накіроўваюць у літоўскія школы слаба падрыхтаваных настаўнікаў, і гэта зьніжае ўзровень навучаньня ў нацыянальных школах. У Беларусі няма ніводнай вышэйшай навучальнай установы з факультэтам літоўскай філялёгіі, больш за тое, у Нацыянальнай акадэміі навук няма аддзелу літуаністыкі (як няма і аддзелаў паляністыкі, украіністыкі і г.д.).

Сур’ёзнай праблемай для “Tevine” сёньня зьяўляецца няпэўны юрыдычны статус Цэнтру літоўскай культуры ў Рымдзюнах. Літоўскі бок сам пачаў фінансаваць будаўніцтва гэтага Цэнтру. Гэта значыць, што беларускі бок ня ўклаў у будаўніцтва цэнтру ніякіх сродкаў (укладаньні Літвы ацэньваюцца ў 10 млн. літаў, або прыблізна 2,5 млн. даляраў), затое прызначыў дырэктара будаўніцтва. Улады Астравецкага раёну зьвярнуліся да літоўскага боку з прапановаю правесьці перамовы наконт юрыдычнага статусу цэнтру, адначасова настойваючы на прыпыненьні будаўніцтва. Літва пагадзілася на перамовы, але будаўніцтва цэнтру не спыніла.

18 ліпеня 1995 году ў Менску адбылася размова паміж прэм’ер-міністрамі Літвы і Беларусі А. Шляжавічусам і М. Чыгіром, у часе якой было прынята, што ўласьнікам Цэнтру будзе Рэспубліканскае аб’яднаньне літоўцаў у Беларусі.

2 ліпеня 1996 году была створаная рабочая група экспэртаў, якія займаліся распрацоўкай мэханізму функцыянаваньня Літоўскага культурна-асьветніцкага цэнтру [5].

Цяпер існуе рэальная пагроза зьліцьця дзьвюх школаў і стварэньня на іх базе агульнай школы ў Рымдзюнах зь дзьвюма мовамі выкладаньня: беларускай і літоўскай. Спачатку рэфармаваньне плянавалася на 1 верасьня 1999 году, але дзякуючы пратэстам літоўскай грамадзкасьці дасюль не адбылося.

Пункт 7 Супольнага пратаколу міністэрстваў адукацыі Літвы і Беларусі ад 2 ліпеня 1996 году сьведчыць, што дырэктар і пэдагагічныя кадры школы прызначаюцца з улікам пажаданьня Таварыства літоўцаў Беларусі. Калі справа дайшла да

разьмеркаваньня пасадаў, дырэктарам школы стаў чалавек, зусім невядомы літоўскай грамадзкасьці (яна настойвала на прызначэньні на гэтую пасаду пэдагога з Гірскай школы, які меў досьвед працы ў школе зь літоўскай мовай навучаньня). Празь некалькі месяцаў на патрабаваньне тутэйшых літоўцаў дырэктар быў звольнены за п'янства. Насуперак дамове, заключанай паміж урадамі Літвы і Беларусі, Цэнтар ня быў перададзены ўва ўласнасьць рэспубліканскага таварыства літоўцаў. У дадзены момант улады разглядаюць прапанаваны літоўскім бокам варыянт стварэньня суполкі пад назвай "Літоўскі цэнтар культуры, асьветы і інфармацыі".
Паводле пастановы юрыдычнага аддзелу Гарадзенскага аблвыканкаму перарэгістрацыя "Tevine" адкладзеная на год. Як і Саюз палякаў Беларусі, кіраўніцтва "Tevine" вымушанае было зьмяніць пункт статуту, у якім фармулюецца задача таварыства — абарона правоў літоўцаў. Слова "літоўцы" было замененае на "члены", г. зн. "Tevine" можа абараняць інтарэсы толькі сваіх чальцоў, а ня ўсіх літоўцаў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі. Пры таварыстве дзейнічаюць нядзельныя школы, дзе літоўскую мову, гісторыю і культуру вывучаюць ня толькі дзеці, але й дарослыя, у якіх няма іншых магчымасьцяў вучыцца. Ніякае дапамогі ад рэспубліканскіх і абласных уладаў, за выключэньнем вызваленьня ад арэнднай платы за памяшканьне таварыства ў Горадні, літоўская меншасьць не атрымлівае.

Габрэйская нацыянальная меншасьць
Масавыя пасяленьні габрэяў на нашых землях датуюцца XIV ст., калі ў Заходняй Эўропе (Нямеччыне, Гішпаніі і інш.) пачаліся іх перасьледы. Яны знайшлі прытулак у Вялікім Княстве Літоўскім. Першыя суполкі ў Горадні зьяўляюцца пры канцы XIV ст. У 20-я гады XX ст. ідыш быў адной з чатырох дзяржаўных моваў БССР. За гады другой сусьветнай вайны праз генацыд загінула ня менш за 400 тысячаў габрэяў. У той час як у 1926 годзе яны складалі 8,2 % насельніцтва Беларусі, дык у 1959 годзе — толькі 1,8 %, а цяпер — менш за 0,3 %. Працягваецца іх эміграцыя.
У Гарадзенскай вобласьці цяпер жыве 937 габрэяў, што складае каля 0,1 %. Большасьць жыве ў Горадні. Існуе абласное аб'яднаньне габрэйскай культуры імя Лэйба Найдуса. У траўні 1997 году была створаная дабрачынная арганізацыя "Хесэд

Нохум”. Пры ёй дзейнічае нядзельная школа, у якой выкладаюць ідыш, ёсьць музычны калектыў для дарослых, моладзевы калектыў “Фрэйлах”.
Пры такой малой колькасьці габрэяў няма гаворкі пра адкрыцьцё клясаў з нацыянальнай мовай навучаньня. Дзейнасьць супольнасьці засяроджаная перш за ўсё на культурных мерапрыемствах і на арганізацыі заняткаў у нядзельнай школе. Аб’яднаньне імя Л. Найдуса плянуе стварыць групу ў дзіцячым садку. Згода на гэта атрыманая, але няма матэрыяльнай падтрымкі, безь якой рэалізацыя гэтых плянаў немагчымая.

Высновы

Сёньня ў Беларусі парушаюцца правы грамадзянаў, якія належаць да нацыянальных меншасьцяў, а таксама нацыянальна сьвядомых беларусаў.
Трэба памятаць, што апісаныя тут выпадкі парушэньня правоў нацыянальных меншасьцяў — гэта толькі частка рэпрэсіяў, якія варта разглядаць на шырокім фоне рэпрэсіўнае палітыкі дзяржавы што да беларускіх грамадзянаў. Ціск на актывістаў няўрадавых арганізацыяў, які чыніць КДБ, рэпрэсіі ў адносінах да ўсіх аб’яднаньняў таксама адбіваюцца на таварыствах нацыянальных меншасьцяў. Бясконцае ўзнаўленьне патрабаваньня перарэгістрацыі арганізацыяў, канфіскацыя абсталяваньня ўсё больш пагаршае становішча беларускіх грамадзянаў, прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў. Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусі не распрацоўвае і ня ўводзіць праграмаў навучаньня дзяцей на нацыянальных мовах, а таксама ня мае намеру друкаваць неабходныя навучальныя дапаможнікі.

[image]
[image]

№ 2 (22) – 2002
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**

майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 19-12-2002
[image]

Даніла Жукоўскі

Літаратура для добраахвотнага чытання

[1] Артыкул аўтара гэтых радкоў “Клямкі” ў “Нашай Ніве”, 25 лютага 2002

[2] Г. Бураўкін у “Беларускім часе”

На вокладцы аднаго заморскага бестселеру я некалі прачытаў: “Superior entertainment. Put in your beach bag.” (Выдатная забава. Пакладзіце сабе ў пляжную торбу.) На якую беларускую кніжку гэта можна змясціць? На якой напішаш: “Dazzling plot twists” (Ашаламляльныя павароты сюжэту)? Традыцыйная астоя нацыянальнае свядомасці — літаратура — прыносіць сёння болей расчараванняў, чым радасцяў. Беларускамоўная прадукцыя, якую спажывец можа знайсці ў кнігарнях, бібліятэках, шапіках і нават у гэтак званых “незалежных распаўсюднікаў”, настолькі малапрывабная, што хутчэй адштурхне чалавека ад беларускага, чым прыцягне да яго. Не дарма шмат адукаваных людзей не лічаць неабходным цікавіцца навінкамі айчыннай літаратуры. Бо тыя творы, з якімі ім даводзілася сутыкацца ў часопісах ці кнігах, найчасцей іх расчароўвалі, бо не адпавядалі іхнаму ўяўленню пра “літаратуру еўрапейскага ўзроўню”.

Пачуўшы ад мяне такога кшталту канстатацыі, беларускія

інтэлігенты звычайна імкнуцца абараняць беларускую літаратуру як з’яву. “Галоўная бяда, што яе не чытаюць”, — чуў я ў адказ на свае крытычныя заўвагі. Гэта факт: наша літаратура ператварылася ў каштоўны экспанат нацыянальнага пантэону. Ёй хочуць ганарыцца — але не хочуць чытаць.

1.

Літаратурны твор — складнік культурнай прасторы дадзенай нацыі — тады лёгка знаходзіць чытача, калі абуджае цікавасць пры першым знаёмстве, выклікае жаданне ўчытацца. Стаўленне аўтараў да аўдыторыі выяўляецца ў першых абзацах твораў. У большасці сучасных нам твораў беларускай літаратуры — расплывістыя ўводзіны ў запаволеным тэмпе [1]. Ствараецца ўражанне, што аўтары з нейкіх прычынаў перакананыя, што чытач нікуды не падзенецца. На што разлічвае пісьменнік, з першых радкоў прапануючы выпрабаванне слоўнай жуйкай? На свой аўтарытэт — збольшага прывідны? На любоў да роднай мовы і Бацькаўшчыны — якую, відаць, літаратура мае мацаваць, а не эксплуатаваць? На тое, што “іншага няма”? І гэта ў часы кніжнага буму ды Інтэрнэту?

На неспрыяльныя ўмовы спасылаюцца часта да непрыстойнасці [2]. Пра запозненае нацыянальнае развіццё, прыгнёт і адміністрацыйны ціск ведаюць усе, хто хоча ведаць. Але ж былі і творы Караткевіча, напісаныя ў тых неспрыяльных умовах. Значыць, якасць беларускіх мастацкіх тэкстаў залежыць не толькі ад знешніх чыннікаў.

Калі пісьменнік — нявінная ахвяра рэжыму, лагічна шукаць праяваў ягонага духоўнага супраціву ў выглядзе тэкстаў “у шуфлядах”. На паверхні — ціск і сервілізм, а ўсярэдзіне — прыхаваны да часу плён творчых высілкаў. Аднак у шуфляду беларускія савецкія пісьменнікі не пісалі, не вольнічалі яны і ў сваіх дзённіках. Адсутнасць палітызаваных тэкстаў тлумачаць страхам, апраўдваюць надзвычайнай сілай рэпрэсіўнага кантрольнага апарату ў Беларусі нават у параўнанні з іншымі часткамі імперыі; адсутнасць гістарычных раманаў — няскорай навуковай базы. Ну, а чаму тады не пісаліся дэтэктывы, фантастыка, творы пра экзатычныя краіны а la Ян Ларс Янсан?

[3] Уяўленне пра мінулае як сукупнасць нерухомых каштоўнасцей з якасць

Сцвярджаюць, што ўладнае цемрашальства перакрыла магчымым творам дарогу ў выдавецтвы. Але які цэнзар забараніць гэтыя бяскрыўдныя па вызначэнні творы *дзеля ўласнага задавальнення*? Падаецца, пісьменнікі не адчувалі сапраўднай патрэбы.

Мала было і перакладаў, у тым ліку й сусветнае класікі. *Для сябе* таксама ніхто не перакладаў, акрамя Васіля Быкава, чыя энергія ярка вылучаецца на агульным фоне.

У “працаўнікоў пяра” не заўважалася асаблівага жадання б за пісьмовым сталом выйсці за межы, вызначаныя ідэалагічным аддзелам ЦК. Пры ўсім прыгнёце ідэалогіі дзейнічаў жорсткі закон беларускае савецкае літаратуры: што выдаецца, тое й пішацца.

Свабода, якую прынесла перабудова, выпрабавала літаратурную супольнасць сваімі метадамі. Перш за ўсё было выпрабаванне галечай. Увадначассе абясцэнілася рытуальныя жэсты нязгоды з уладай, расплывістая мова, якой маскавалася адсутнасць уласнага — ад уладнай ідэалогіі — бачання грамадства. Сацыяльныя катаклізмы скаланулі літаратараў, але, па вялікім “рахунку”, не абудзілі. У галовах — як і ў шуфлядах — было запасу сугучнага грамадскім працэсам.

Адсутнасць у новых умовах вартасных тэкстаў спрабавалі не заўважаць і ўсяляк аспрэчвалі. Хоць у апытанні “100 беларускіх кніг XX стагоддзя” болей за 20 балаў (у гэтую катэгорыю трапіла траціна ўсіх названых пазіцый) набралі толькі тры кнігі мастацкай літаратуры, выдадзеныя пасля 1986 году: вершы Караткевіча, “Споведзь” Ларысы Геніюш (адна з нешматлікіх перлінаў “беларускай шуфляды”) і “Сцяна” Васіля Быкава – адзіная, напісаная непасрэдна ў разгляданы перыяд.

Тым не менш, нават у 1998 годзе большасць пісьменнікаў непрыязна сустрэла артыкул С. Дубаўца “Ружовы туман” (ЛіМ, № 2 за 1998), дзе ставілася пад сумнеў вартасць беларускай савецкай літаратуры. Фактычна, як піша Павел Абрамовіч [4], гэта быў заклік да дыскусіі пра вартасць савецкай спадчыны з прычыны ўтварэння перспектывы, з’яўлення гістарычнай дыстанцыі. Але “дыскусія не пайшла ў кірунку ацэнкі савецкай літаратурнай спадчыны, а засяродзілася на ацэнцы асобы Дубаўца і стылю дыскусіі”, — падсумоўвае П. Абрамовіч.

мовы можна аднаўляць каніц. Сулкейкова О.А. , Кортес Л.Л. 100 Сёмухелей Великобритании. Менск Вышэйшая школа, 1997, ўтрымліваюцца адпаведныя біблія графічныя звесткі. Калі і перакладалі ў савецкі час, дык найбольш “брахлівых” літаратур.

Дубавец і Лістоўскі. АЯСНЕ Сяўруш, № 6 2000.

Пакрыўдавалі і не пажадалі абмяркоўваць справу па сутнасці, бо імкнуліся пісаць і жыць, як пісалі і жылі раней. “...Галоўнае пытанне палемікі — пераацэнка творчай спадчыны беларускай савецкай літаратуры — так і не было вырашана... Апаненты Дубаўца прадэманстравалі... вернасць думцы аб вялікіх духоўных здабытках беларускай савецкай літаратуры, яе роўнасці з еўрапейскімі літаратурамі”, — з жалем адзначае П. Абрамовіч.

Стаўленне да перакладаў — таксама пробны камень пісьменніцкага клопату пра культуру. За перабудовачнае дзесяцігоддзе ў “ЛіМе” не з’явілася ніводнага праблемнага артыкула на гэтую тэму. Ніводнай спробы аналізу савецкай выдавецкай палітыкі ў гэтай сферы — каб падвесці пад ёй тлустую рысу. Ніводнага разважання, што і як перакладаць цяпер. У найлепшым выпадку — станоўчыя водгукі на выхад кніг з серыі “Скарбы сусветнай літаратуры”: аб тым, як добра пайсці ў краму ды набыць там том Шэкспіра. У горшым — публічныя (у газетах) заклікі пісьменнікаў не замяняць у школьнай праграме іхных уласных твораў на перакладныя. “Ружовы туман” стаўся падсумаваннем досведу, які творцы вынеслі з перабудовачнай завірухі. “Дубавец пераканаўся найперш у разгубленасці і раз’яднанасці беларускіх літаратараў, чытачоў штотыднёвіка “Літаратура і мастацтва”, іх няўпэўненасці ў заўтрашнім дні і няздольнасці адэкватна рэагаваць на выклікі сённяшняга дня” — лічыць сп. Абрамовіч. Не бачу падставаў абмяжоўваць гэтае кола чытачамі “ЛіМу”. Дыскусія выйшла па-за яго межы. Справядліва лічыць, што ў ёй адбілася — хаця б і праз дэманстрацыйны няўдзел у абмеркаванні — стаўленне ўсёй літаратурнай грамады.

Іншым перабудовачным выпрабаваннем стала свабода ў вызначэнні поля дзейнасці, асабістага творчага метаду. Свабодны верш, мініяцюры, запісы, занатоўкі, эсэ, нецэнзурная лексіка, натуралістычныя апісанні, моўныя эксперыменты — раней недасяжнае цяпер зрабілася аб’ектам злоўжывання. *Па старой звычцы* не надта задумваліся, хто гэта будзе купляць і чытаць. Не фармавалася разуменне, што са скасаваннем партыйнай замовы на літаратуру вызначальнай будзе замова сацыяльная.

З’яўленне элементаў рынкавай канкурэнцыі ў барацьбе за чытача прынесла новыя пагрозы. Штодня ўшчыльняўся

літаратурны рынак, і рубам паўстаў выбар паміж прафесійнай сумленнасцю і асабістым дабрабытам: пахваліць удалы твор калегі ці змаўчаць, дапячы кагосьці справядлівай крытыкай ці сваёй пахвалой зарабіць ягоную “ўзаемную” зычлівасць да ўласных твораў. Аўтары, якія не прывыклі да сур’ёзнае крытыкі, правалілі гэтае выпрабаванне разам з крытыкамі. Вынікам — адсутнасць здаровай крытычнай традыцыі пры *ахвотна прызнаваным* невысокім сярэднім узроўні твораў. Змены ў лепшы бок прынесла апошнім часам з’яўленне “ARCHE-Скарыны”.

2.

Ад 1987 году праляцелі тры пяцігодкі, а ў сучаснай прозе мы заўважаем тую ж неахвоту вызірнуць за межы добра вядомага — якую, аднак, ужо не патлумачыш партыйнай забаронай. “Нашы пісьменнікі пішуць пра тое, што добра ведаюць: пра трактарыстаў, пра “чарніла”, пра бессэнсоўнасць і нязнойдзеныя жыццёвыя арыенціры”, наракае Кастусь Травень [5]. Гэткія гісторыі нагадваюць салдацкія байкі пра п’янкі, бойкі, любоўныя прыгоды (Не ўсе яны заснаваныя на рэальных фактах, таму справядліва прыраўнаваць іх да літаратуры fiction.) Ды ў войску пра гэта расказваюць смаркачы з мізэрным жыццёвым досведам, што шчэ не мелі нагоды зведаць штосьці іншае. А калі гэтак паводзяцца саракагадовыя дзядзькі, ды яшчэ пісьменнікі, — нельга не задумацца.

[5] **Жыццё ніжэй ватэрлініі. Наша Ніва, 12 студзеня 2001.**

Пратэст выклікае верхаглядства, адмова ад аналізу і філасафавання ў творах. Мастацкая рэчаіснасць можа па волі творцы мець якія заўгодна рысы, але чытач заўсёды і ў самай неверагоднай фантасмагорыі, і ў дакладным пераказе рэальных падзеяў будзе шукаць аўтарскай пазіцыі — цэласнай, яснай і паслядоўнай паводле вызначэння. Між тым, стома ад савецкіх ідэалагічных канструкцыяў, якія так доўга навязваліся творцам, спрычыніла хранічнае грэбаванне паслядоўнасцю й сістэмнасцю поглядаў як такімі. Для твораў, асабліва вялікіх — аповесцяў, раманаў, п’есаў, — гэта згубна. Працуючы над творам, аўтар павінен спарадкаваць матэрыял. І чым складанейшая абраная тэма, чым больш кантраверсіяў (і адпаведна — цікавасці) выклікаюць у грамадстве апісаныя справы, тым дакладней аўтар павінен вызначыцца па ўсіх

цяжкіх і спрэчных пытаннях. На жаль, можна казаць, што пісьменнікі не разумеюць адказнасці, якая кладзецца на кожнага, хто прапануе сваё разуменне жыцця на разгляд грамадскасці.
“У сучасную беларускую белетрыстыку так і не трапіў новы настрой, новы змест, погляд новага адукаванага пісьменніка на рэаліі беларускага жыцця”, — піша Аліса Бізяева на папулярным у апошні час літаратурным інтэрнэт-рэсурсе http:\\litara.net. Не трапіў — бо не сфармаваны да тае ступені дасканаласці, каб стацца падмуркам мастацкага твору, даць яму апірышча без распісанай да драбніцаў афіцыйнай дагматыкі, абавязковай для ўсіх.
Вось і выходзіць, як у Леаніда Дайнекі ў ягонай фантастычнай аповесці “Чалавек з брыльянтавым сэрцам”, дзе грамадства будучыні мае цікавую гістарычную памяць: людзі памятаюць пра Радзівіла Сіротку, але, як вынікае з фіналу, забыліся пра падзеі другой сусветнай вайны. Гэта што ж павінна ў Беларусі здарыцца, каб адбыўся такі пераварот? Мусіць, пісьменнік палічыў, што простая адсылка да сакралізаваных у савецкую пару падзеяў вырашае ўсе праблемы намаляванай ім досыць эклектычна Эры Плюралізму.

Тыя ж карані мае схільнасць нашых пісьменнікаў пазбягаць усяго спрэчнага, абмяжоўвацца апісаннем дачыненняў асобы з найбліжэйшым колам сваякоў і калегаў у межах добра знаёмага побыту. Аўтарам страшна выпускаць герояў у шырокі свет. Яны самі не ведаюць, як у гэтым свеце паводзіцца. Ды здарылася непапраўнае: межы айкумены ўшчыльную наблізіліся да нашых вокнаў. На кавалку, у якім захаваўся ранейшы зразумелы парадак, засталіся “бессэнсоўнасць, безнадзейнасць і нязнойдзеныя жыццёвыя арыенціры”. Кастусь Травень у згаданым вышэй артыкуле ў “Нашай Ніве” горка іранізуе: “Верагодна, ніхто з іх [пісьменнікаў] не займаўся прыватным бізнесам, не ездзіў з хатулямі ў Стамбул ці Беласток... не дзёрся апантана ў парламент... не спаткнуўся” **Сяўчык Юры.** **Іхумруўдна-** **зялёных мухі /** **Любіць ноч —** **прадвеснага пацукоў.** файную чужую прыгажуню. Дык аб чым пісаць?” Пісьменніку не абавязкова асабіста праходзіць праз тое, што ён апісвае ў сваім творы. (Страшна падумаць, хто б з нас у раскладзе пісаў дэтэктывы.) Але, мяркуючы па тэматыцы кругагляд, абазнанасць, сфера зацікаўленняў сярэдняга

сучаснага творцы невытлумачальна вузкія ў параўнанні з кругаглядам, абазнанасцю і сферай зацікаўленняў сярэдняга чытача. Выключэннем, якое толькі падмацоўвае ліпаратура, закідаў сп. Травеня, можна лічыць хіба “бізнесовыя” апавяданні Леаніда Маракова (“Інтуіцыя”, “Самы ніжні Тагіл”). Поспеху паспрыяў, відавочна, асабісты досвед аўтара. Аднак у апавяданнях прысутнічае не толькі аўтэнтычная атмасфера, але й дакладная аўтарская ацэнка кожнага персанажа і з’явы — вынік асэнсавання перыпетыяў чаўнакоўскага жыцця. Не здзіўляе, што ў іншых апавяданнях той жа аўтар гэтак жа ўпэўнена разглядае далёкія падзеі сталінскіх часоў.

Юры Станкевіч грунтуе свае творы на філасофіі, якую з першага ўражання можна было б палічыць за ксенафобію: “Штогод, штомесяц, штодня мангалоідныя лейтэнанты і капітаны бралі з гарадка даніну — дзевак у жонкі” [6]. Але не так усё проста: Станкевіч акцэнтуе чыста біялагічныя падставы чалавечых паводзінаў. Гэткі рэдукцыянізм — антыпод Караткевічавага ўзнёслага нацыяналізму. У выніку свет паводле Станкевіча набывае рысы антыўтопіі. Аднак, нягледзячы на непрывабнасць такога свету, ход аўтарскай думкі трымае чытача, бо пісьменнік глыбока прадумаў сваю канцэпцыю, паслядоўна яе вытрымлівае. Гэты творца вызначыўся адносна рэаліяў новага ладу жыцця па-свойму, але цвёрда. І матэрыял паддаецца ягонай волі, што адзначаюць самыя суворыя крытыкі.

Паслядоўна вытрымліваецца ідэйная лінія ў гістарычных творах В. Іпатавай (нават канфліктуючы з гістарычнымі рэаліямі ў “Альгердавай дзідзе”), апавяданнях Л. Маракова з цыклу “Непамяркоўныя”. Такія творы не расчароўваюць чытача. Варта яшчэ згадаць раман А. Пашкевіча “Пляц Волі”, аповесць “Нічые” А. Федарэнкі, якая сталася заўважным крокам у мастацкім асэнсаванні падзеяў Слуцкага збройнага чыну. Абодва творы будуць мець і прыхільнікаў, і антыпатыкаў. Аднак нельга адмовіць ім у насычанасці фактамі: аўтарскія ацэнкі не бяруцца з паветра.

Вернемся да сумнага — да таго, што дзеянне ў большасці твораў, як і раней, мае вельмі вузкія геаграфічныя рамкі. У перадваенным даведніку для афіцэраў Чырвонай Арміі сярэдняя даўжыня падарожжаў насельнікаў Літвы вызначалася ў 50 км. Гэтаксама перасоўваюцца і героі беларускіх твораў.

Найбольш папулярны маршрут “горад — мая вёска” ды “кватэра — крама”. Ніякай экзотыкі, замежных вандровак, далёкіх падарожжаў. Калі пісьменнік усё ж выносіць дзеянне ў заморскія краіны, то цалкам ігнаруе нагоду апісаць заморскія рэаліі (А. Дашкевіч. Карфаген. // Крыніца. 2001, № 2). Сюжэтным канструкцыям уласцівая гэткая ж немудрагелістасць. Незразумела, чаму беларускаму чытачу адмаўляюць у патрэбе здзіўляцца. Не магу прыгадаць вялікага твору апошніх гадоў, у якім аўтар імкнуўся б заінтрыгаваць чытача, падтрымліваючы да перадапошняй старонкі атмасферу таямніцы. Нават у дэтэктывах Ф. Сіўко (“Апошняе падарожжа ў краіну ліваў”) найбольш інтрыгуе назва кніжкі. Далей — ніякіх нечаканасцяў.

3.

Светапоглядная нявызначанасць, пра якую казалася вышэй, штурхае аўтараў тлумачыць паводзіны чалавека[illegible] прымітыўнымі эмацыйнымі імпульсамі. Утварыўся [illegible] пэўны стандарт. Напрыклад, раман А. Пашкевіча “Пляцоўкі”, асабліва першая частка: рацыянальныя палітычныя матывацыі герояў саступаюць вызначальную ролю рамантычнаму патрыятызму. Ці сцэнічны “блакбастэр” “Князь Вітаўт”: найважнейшыя падзеі палітычнай гісторыі пададзены гэтак, быццам адзіным іхным рухавіком былі эмоцыі. Жарсці, жарсці — а дзе разлік, планаванне, развагі, логіка? “Засмучае... сюжэтная пустата сучасных беларускіх тэкстаў. Я маю на ўвазе не проста наяўнасць падзеі ў творы, а пэўную аўтарскую задуму, канцэптуальнасьць, існаванне стылёвай лініі, ад якой, калі яна ёсць у тэксьце, заўсёды бывае адчуванне ментальнай сувязі з аўтарам, пачуццё перадачы ім асаблівага светапогляду і адчування таямнічага сэнсу”, — зазначае тая ж А. Бізяева на http:\\litara.net. Каб перадаваць светапогляд, трэба яго сфармуляваць. Мо ва ўласнай разгубленасці крыецца прычына таго, што пісьменнікі больш схільныя апеляваць да эмоцый, а не да інтэлекту чытачоў?

Розум адпачывае. А шкада. Справа не ў пераборы жарсцяў (наўрад ці жарсці могуць шкодзіць займальнасці), не ў замкнёнасці ў межах усім добра вядомага побыту і нават не ў нейкіх фармальных прыкметах, якія апраўдана і неапраўдана звязваюць з постмадэрнізмам. Назіраецца ўстойлівая

[7] **С. Балахонаў. Наша Ніва, 12 красавіка 2002.**

схільнасць абіраць самы прымітыўны з усіх магчымых варыянтаў увасаблення задумы ў тэкст. “Нашыя пісьменнікі нібыта імкнуцца адно замацаваць за сабой, “закапірайціць” цікавую ідэю, незвычайны сюжэт, а на тое, каб развіць іх у больш-менш грунтоўны твор, часам не стае ці то энтузіязму, ці то намаганняў, а можа, і таленту”, — адзначае А. Бізяева.
На мой погляд, справа хутчэй у адсутнасці звычкі. Змены апошніх гадоў амаль не змянілі спосабу дачыненняў беларускага пісьменніка з чытачом. Савецкага літаратара, паслухмянага кожнаму слову партыйнага кіраўніцтва, пацясніў больш свабодны ў самавыяўленні творца — які пачуваецца свабодным у тым ліку і ад абавязку заваёўваць аўдыторыю. Гэтыя людзі адстойваюць сваё права не зважаць на чытача, “ствараць ды атрымліваць асалоду ад кожнага моманту натхнення” [7]. Кола крытыкаў, якія звяртаюць увагу на неабходнасць рабіць творы перадусім чытэльнымі, інтрыгоўнымі, захапляльнымі, — нешматлікае і неактыўнае ў публічнай дыскусіі (калі падставы гаварыць пра дыскусію ўвогуле ёсць: “ЛіМ”, “Наша слова”, “Наша Ніва” такіх падставаў не даюць). Для пісьменнікаў як сацыяльнай групы з амбіцыямі грэбаванне чытачом не можа не мець згубных наступстваў.

4.

Былы галоўны рэдактар “Полымя” С. Законнікаў на радыё “Свабода” адказвае на пытанне журналісткі “Каго вы бачыце чытачом свайго выдання?” — “Перадусім гэта настаўнік”. Лагічна арыентавацца на таго, хто чытае шмат і па сваёй волі, бо такі чытач непазбежна будзе прыахвочваць і іншых. Але хто шмат чытае, той мае густ і сякі-такі кругагляд, той будзе патрабавальным. І ці могуць такому чытачу спадабацца творы, разлічаныя на патрэбы сярэдняй школы? [8]**Звязда, 13 сьнежня 2001.**
Незвычайна шкодзіць беларускай літаратуры гэтая нежаданая традыцыяй стаўка на школу. Нават не на школу, а на праграму па беларускай літаратуры. Мо сп. Законнікаў мае на ўвазе настаўніка фізікі? Геаграфіі? Фізкультуры? Усіх разам? Не — адно беларускай мовы й літаратуры. Ён — Настаўнік. Іншым чытаць па-беларуску... неабавязкова? [9]**Звязда, 2 сакавіка 2002.**
А задачу абслугоўвання двух школьных прадметаў абрала сабе ладная частка літаратараў. Жахліва, што гэта не бянтэжыць сп.

Законнікава ці спн. Канапельку, былую галоўную рэдактарку “Крыніцы” [8]. Ганебная канцэпцыя “па-беларуску — толькі пра гісторыю і культуру”, адкінутая больш прагрэсіўнымі коламі інтэлігенцыі, вяртаецца ў выкананні... цяпер ўжо былых рэдактараў літаратурных часопісаў. Зрэшты, сп. Законнікаў працуе над стварэннем новага выдання.

Больш сучасны, але ня менш аблудны метад — падкрэслена разлічваць на вузкае кола чытачоў. Можна сцвярджаць, як Адам Глобус [9], што творы пішуцца для сцісла акрэсленай малой групы маладых мастакоў, але наўрад ці яго засмучае, што ягоныя творы чытаюць і іншыя людзі. Я не веру ў існаванне беларускага пісьменніка, які б лічыў, што ягоную кніжку прачыталі ўсе, для каго ён яе прызначаў, тым больш — усе, для каго яна прыдатная. Існуюць розныя трактоўкі, што такое “шмат чытачоў”, але цяжка паверыць, быццам сённяшні попыт на беларускую літаратуру можа задаволіць каго-кольвек з пісьменнікаў. Іншая справа, не кожны гатовы ахвяраваць часткаю творчай свабоды, каб дагадзіць аўдыторыі, большай за купку асабістых сяброў.

А менавіта на такую аўдыторыю былі разлічаныя шматлікія беларускамоўныя тэксты апошніх гадоў. У выніку ў нашых часопісах раз-пораз трапляеш на бязглуздзіцу ды безгустоўнасць з адценнем непрыстойнасці (Пінхасік Андрэй. Блін якая сексапільнасць // ARCHE. 2001. № 1) або нудоту, замаскаваную пад інтэлектуальнасць (А. Астраўцоў. Не казка, а міф // Крыніца. 2001. №№ 3, 4, 6). Літаратурная ніва дорыць не дэлікатэсы, а пустазелле ці нейкі малаядомы турнэпс. Аўдыторыя, гатовая купляць і чытаць, хоць і не абавязаная да гэтага сваёй прафесіяй, ёсць. Гэта звычайныя людзі — плацежаздольныя, адукаваныя, патрыятычныя, не расчараваныя ў жыцці. Іх можна толькі зацікавіць. Іншага шляху да іхнага вольнага часу, іхных грошай, сэрцаў і розумаў няма. Але прыахвочваць нашмат цяжэй, чым прымушаць, як адзначаў яшчэ Пісараў. Для гэтага трэба, прынамсі, шанаваць густы чытача. Аўдыторыя, якая мае грошы і ахвоту чытаць, бярэ ў рукі кнігі найперш для адпачынку. І не варта глядзець на гэта з пагардай. Наўрад ці можна чакаць, што пасля напружанага працоўнага дня чалавек будзе шукаць сабе цяжкага чытва, ды яшчэ вышукваючы яго ў няўлоўных (ведаю з уласнага досведу жыцця ў Горадні) “незалежных распаўсюднікаў”. Тым часам,

постсавецкія гады амаль не змянілі сітуацыі з дэтэктывамі ды іншымі творамі востраюжэтных жанраў, што карыстаюцца выдатным попытам пэўнага кола чытачоў. Адзінкавымі тэкстамі прадстаўленая і фантастыка (гл. агляд у: Полымя. 2001, № 10). Занядбаны, зведзены да патрыятычнага маралізатарства сусветна папулярны жанр біяграфіі. Сёння рэльефныя пераканаўчыя вобразы беларусаў лягчэй сустрэць у мемуарнай і дакументальнай літаратуры, чым у мастацкіх творах (што ў чарговы раз нагадвае пра недастатковую працу нашых пісьменнікаў з гістарычнымі крыніцамі). Незаслужана забыты ў нас псіхалагізм, хоць стварэнне папулярнага, прыцягальнага, культавага героя вымагае выкарыстання псіхалагічнага інструментарыю. У ягонай адсутнасці, на мой погляд, крыюцца прычыны слабасці большасці белетрызаваных біяграфій знакамітых дзеячоў нацыянальнага Адраджэння, што з'явіліся за апошнія гады. Яны заўсёды выходзяць нібы падзеленыя на "чалавека" і "беларуса". Кастусь Езавітаў у рамане А. Пашкевіча "Пляц Волі" ажывае, робіцца цэльнаю асобай хіба ў апошнім радку, калі, трапіўшы ў савецкі палон і даведаўшыся, што здрадніка, які яго прадаў, завуць не Багдановіч, вымаўляе з палёгкаю: "Дзякуй богу!"

Як тут не згадаць Караткевіча? Ягоныя героі — гэта звычайныя людзі, якія, дзякуючы найлепшым рысам свайго нацыянальнага характару, з гонарам выходзяць з незвычайных сітуацыяў. З такімі персанажамі з лёгкасцю самаідэнтыфікуецца чытач. У гэтым — звычайнасці герояў і незвычайнасці сітуацый — і заключаецца сакрэт іх поспеху.

5.

Творцы

беларускай
літаратуры
аніяк не хочуць
рабіцца
вытворцамі.
Адсюль іхнае
вечнае

бурчанне на адрас масавай і камерцыйнай літаратуры. Нейкі засцянковы комплекс перашкаджае ім ствараць прадукт, арыентаваны на спажыўца. А спажывец у краіне ўжо вырас: гэта добраахвотны чытач з сярэдняга класу, які хоча пачувацца беларусам. Не залічацца да ніжэйшага гатунку творы таго, хто будзе сумленна й адказна абуджаць у гэтым чытачу смак да жыцця (паводле Мілаша Формана: казаць праўду, але не даваць нудзіцца). Узнагарода такому пісьменніку будзе большаю,

чым літаратурная прэмія: людзі будуць з асалодаю цытаваць яго ў размовах, як цяпер цытуюць Караткевіча. “У той дзень я высакародна араў сваё поле”. Калі ж надыдзе *той дзень*?

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** дызайн: **mk**
майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2002 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **19-12-2002**
[image]